А. І. Бельскі, М. І. Навумчык, Л. К. Цітова

# Беларуская літаратура

# 6





***Віталь Дударэнка.*** Рагнеда і Ізяслаў



***Арлен Кашкурэвіч.*** Ф. Скарына ў Празе



***Фердынанд Рушчыц.*** Вясна



***Галіна Шапялевіч.*** У пушчы

А. І. Бельскі, М. І. Навумчык, Л. К. Цітова

# Беларуская літаратура

Вучэбны дапаможнік для 6 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2022

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721
Б44

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (прафесар кафедры, доктар педагагічных навук *В. У. Праскаловіч*);

настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 202 г. Мінска» *Т. Ф. Байраш*;

аддзел тэорыі і гісторыі літаратуры Цэнтра культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (вядучы навуковы супрацоўнік, доктар філалагічных навук, дацэнт *С. У. Калядка*);

намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 1 імя Ф. Скарыны г. Мінска» *Н. У. Целяпун*

На вокладцы рэпрадукцыя карціны У. Масленікава «Зямля дзядоў»

**ISBN 978-985-893-196-4**

© Бельскі А. І., Навумчык М. І., Цітова Л. К., 2022
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2022

Правообладатель Национальный институт образования

## ЗМЕСТ

*Кніга адкрывае свет* ........ 6

### Родная зямля. Мой род. Народ

**Пятрусь Броўка** ........ 9
«Прысяга сэрцам» ........ 10
**Алесь Казека** ........ 11
«Я — маленькая кропля з крыніцаў святых...» ........ 12
**Уладзімір Ліпскі** ........ 13
«Ад роду — да народу» *(З кнігі «Я: праўдзівы аповед пра твой і мой радавод»)* ........ 14
**Алесь Пісьмянкоў** ........ 18
«Продкі» ........ 19
**Уладзімір Караткевіч** ........ 20
«Лебядзіны скіт» *(Скарочана)* ........ 21

### Свет загадак і цудаў

**МІФЫ** ........ 31
**ПРА БАГОЎ** ........ 34
**ПРА МІФІЧНЫХ ІСТОТ (ДУХАЎ)** ........ 37
«Дамавікова ўдзячнасць» *(Народная легенда)* ........ 41
**Ян Баршчэўскі** ........ 44
«Вужыная карона» *(Пераклад з польскай мовы Міколы Хаўстовіча)* ........ 45
**Максім Багдановіч** ........ 50
«Вадзянік» ........ 51
**Казімір Камейша** ........ 52
«Камень ля вёскі Камень» ........ 53
**Якуб Колас** ........ 55
«Жывая вада» ........ 57

### Сэрцам народжаны спеў

**НАРОДНЫЯ ПЕСНІ** ........ 61
«Прыехала Каляда на белым кані...» ........ 65
«Вы, калядачкі, бліны-ладачкі...» ........ 65
«Благаславі, маці, вясну заклікаці...» ........ 66
«А на Купалу рана сонца іграла...» ........ 67
«А ў суботу проці нядзелі...» ........ 68



Правообладатель Национальный институт образования

«Каля месяца, каля яснага…» ........ 69
«Рэчанька» ........ 69
**ЛІТАРАТУРНЫЯ ПЕСНІ** ........ 70
**Алесь Ставер** ........ 72
«Жураўлі на Палессе ляцяць…» ........ 73
**Алесь Бачыла** ........ 74
«Радзіма мая дарагая…» ........ 75

## Каляндар роднай прыроды

**Змітрок Бядуля** ........ 77
«Зямля» ........ 78
**Паўлюк Трус** ........ 80
«Падаюць сняжынкі…» *(Урывак з паэмы «Дзясяты падмурак»)* 81
***Пра метафару*** ........ 82
**Рыгор Барадулін** ........ 84
«Уцякала зіма ад вясны…» ........ 85
***Пра ўвасабленне*** ........ 87
**Янка Брыль** ........ 88
«Над зямлёй — красавіцкае неба…» ........ 89
**Іван Мележ** ........ 91
«Першы іней» *(Урывак з рамана «Подых навальніцы»)* ........ 92
**Максім Танк** ........ 93
«Восень» ........ 95
**Іван Грамовіч** ........ 96
«Воблакі» ........ 97

## Чалавек — гэта цэлы свет

**Алена Васілевіч** ........ 102
«Сябры» ........ 103
***Пра апавяданне*** ........ 110
**Кузьма Чорны** ........ 112
«Насцечка» *(Скарочана)* ........ 113
***Пра аповесць*** ........ 146

## Покліч мінулых стагоддзяў

**Пятрусь Броўка** ........ 148
«Яшчэ ў дні старыя, у век наш лучынны…» ........ 149
**Іван Саверчанка** ........ 150
«Векавая мудрасць» *(Урывак з легенды «Скарб крывічоў»)* ........ 151



Правообладатель Национальный институт образования

**Уладзімір Бутрамееў** .................................................... 153
«Славутая дачка Полацкай зямлі» *(Скарочана)* .................. 154
***Пра мастацкую ідэю*** ............................................................ 156

## Вайна — боль і памяць народа

**Аляксей Пысін** .................................................................. 158
«Проня» ................................................................................ 159
**Анатоль Вярцінскі** ............................................................ 160
«Два полі» ............................................................................ 161
**Вячаслаў Адамчык** ............................................................ 163
«Салодкія яблыкі» ................................................................ 164
***Пра літаратурны вобраз*** .................................................. 177
**Аркадзь Куляшоў** .............................................................. 179
«Над спаленай вёскай» .......................................................... 180

## Зямля мая — зялёны дом

**Пімен Панчанка** ................................................................ 181
«Сармацкае кадзіла» ............................................................. 183
**Іван Пташнікаў** ................................................................... 185
«Алені» *(Скарочана)* ............................................................ 186
***Пра кампазіцыю*** .............................................................. 202
**Алесь Жук** ......................................................................... 204
«Стары Бабёр» *(Урывак з аповесці «Паляванне на Апошняга Жураўля»)* ............................................................................. 205
**Янка Маўр** ......................................................................... 211
«Багіра» ................................................................................ 211

## І досціп, і мудрасць

**Якуб Колас** ....................................................................... 218
«Конь і сабака» ..................................................................... 219
**Алесь Звонак** ..................................................................... 220
«Гарбуз» ............................................................................... 221
***Пра байку*** ........................................................................ 222
**Уладзімір Корбан** ............................................................... 223
«Малпін жарт» ...................................................................... 224

## Святло далёкай зоркі

**ПРА ФАНТАСТЫКУ** ............................................................ 226
**Раіса Баравікова** ................................................................ 228
«Гальштучнік» *(Урывак з «Аповесці чатырох падарожжаў»)* 229
***Кароткі слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў*** ................ 237



Правообладатель Национальный институт образования

# КНІГА АДКРЫВАЕ СВЕТ

***Дарагія шасціккласнікі!***

Вы разгарнулі кнігу, якая на працягу навучальнага года будзе вам дарадцам і спадарожнікам на ўроках роднай літаратуры.

Шчаслівы той чалавек, хто любіць чытаць. Ён заўсёды сярод добрых і надзейных сяброў — кніг. Кніга — найвышэйшы здабытак людской мудрасці, яна захоўвае памяць пра чалавечы род, нашых продкаў, падзеі мінулага.

Вам, напэўна, вядома, што доўгі час кнігі былі рукапіснымі. Вялікім дасягненнем стала для чалавека друкаваная кніга. У 1517 годзе славуты сын беларускай зямлі Францыск Скарына надрукаваў першую кнігу на роднай мове. Ён даў прыклад у кнігадрукарскай справе іншым усходнеславянскім народам. Так, першыя кнігі ў Расіі і ва Украіне былі надрукаваны на пяцьдзясят гадоў пазней.

«Кнігі — сябры...» — так лічыў пісьменнік Уладзімір Караткевіч. Ён добра разумеў, якім складаным быў лёс тых людзей, што імкнуліся даць свайму народу святло ведаў. У XIX стагоддзі гэта былі кнігановшы, якія, рызыкуючы воляй і жыццём, прыносілі або прывозілі кнігі з-за мяжы. Кніга адкрывае акно ў вялікі свет, узбагачае ведамі, яе прызначэнне — зрабіць чалавека адукаваным, добрым, чулым і сумленным.

Кніга падтрымлівае нас у цяжкую хвіліну, дапамагае разабрацца ў складаных жыццёвых сітуацыях, канфліктах, каб прадухіліць магчымыя памылкі. Прачытаем адну-дзве старонкі — і адбываецца цуд: перад намі выразна паўстаюць малюнкі жыцця, а героі ўспрымаюцца як жывыя, рэальныя людзі. Смелыя, высакародныя, гордыя, яны адкрываюць таямніцы прыроды, вандруюць па розных мясцінах, мінулых эпохах, спрабуюць зазірнуць у будучыню. І мы жывём разам з героямі кніг — хвалюемся, радуемся, сумуем. Мы нібыта бачым і чуем іх. Мы ўражаны сілай мастацкага слова, перажываем моцныя пачуцці.

Аднак знаёмства з мастацкім творам — гэта не толькі захапленне, задавальненне сваёй цікаўнасці. Гэта яшчэ і сур’ёзная праца розуму, душы. Каб спасцігнуць мастацкую карціну жыц-



Правообладатель Национальный институт образования

цыя, неабходна мець багатае ўяўленне, назіральнасць, жаданне зразумець героя. Патрэбна таксама ведаць некаторыя асаблівасці пісьменніцкага майстэрства, бо мастацкі твор — вынік глыбокага роздуму і перажыванняў аўтара, плён яго багатага жыццёвага вопыту, творчай фантазіі, працы над кожным словам і вобразам.

Гэты вучэбны дапаможнік пазнаёміць вас з творамі, напісанымі ў розныя часы. Чытайце іх не спяшаючыся. Думайце і разважайце над кожным творам, старайцеся знайсці адказы на пытанні, выканаць прапанаваныя заданні. Каб вам лягчэй арыентавацца ў іх, уведзены адпаведныя ***ўмоўныя абазначэнні***:

 — у свеце мастацтваў;

! — цікава ведаць;

 — абмяркоўваем разам;

 — прыкладныя тэмы для даследчых праектаў і творчых заданняў;

— спасылкі на заданні (QR-коды) для праверкі ведаў пры дапамозе смартфона ці планшэта. Дадатковыя матэрыялы да вучэбнага дапаможніка можна знайсці на сайце https://eior.by (Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс). Выберыце ў меню «6 клас», «Беларуская літаратура». У адпаведнай тэме націсніце кнопку «Дадатковыя матэрыялы».

Спрабуйце свае сілы ў літаратурнай творчасці. Калі што не зразумееце, звяртайцеся да настаўніка, карыстайцеся слоўнікамі і даведнікамі. І не забывайце наказ нашага славутага продка Францыска Скарыны, першадрукара і асветніка, мастака і пісьменніка, які вучыў нашчадкаў любіць кнігу — крыніцу ведаў і мудрасці чалавечай, шанаваць, як святыню, родную мову, берагчы сваю зямлю, годна служыць свайму народу.

Плёну і поспехаў вам на шляху пазнання свету, на шляху спасціжэння Дабра і Прыгажосці!

1. Чаму шчаслівы той, хто сябруе з кнігай, шмат чытае?
2. Як прыйшла да нас кніга? Хто паклаў пачатак кнігадрукаванню?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Якое прызначэнне мастацкай кнігі? У чым яе каштоўнасць?
4. Чым з'яўляецца для вас чытанне мастацкіх твораў? Выберыце адзін або некалькі варыянтаў:
   а) крыніцай разнастайных ведаў;
   б) задавальненнем сваёй цікаўнасці;
   в) знаёмствам з захапляльнымі гісторыямі, падзеямі, смелымі і высакароднымі героямі;
   г) сур'ёзнай і ўдумлівай працай;
   д) магчымасцю адпачыць, з карысцю для сябе выкарыстаць вольны час.
   Абгрунтуйце зроблены вамі выбар.
5. Разгледзьце на форзацы 1 вучэбнага дапаможніка малюнак Арлена Кашкурэвіча «Ф. Скарына ў Празе». Якім паўстае на ім наш славуты вучоны і першадрукар? Што вы ведаеце пра Скарыну?
6. У адным з твораў паэт Максім Танк зазначае, што сёння мы маем *ад Скарыны-бацькі кнігу.* Як вы думаеце, чаму ён называе Скарыну *бацькам*?
7. Складзіце вуснае выказванне на адну з наступных тэм: «Мая любімая кніга», «Кніга — сябар і дарадца», «Кніга навучыла, падказала, дапамагла...».
8. Падрыхтуйце ў класе выставу вашых любімых кніг беларускіх аўтараў. Парайце аднакласнікам твор, які вам найбольш спадабаўся, і патлумачце, чаму яго варта прачытаць.

! **Францыск Скарына** — асветнік-гуманіст, першадрукар, вучоны, пісьменнік, перакладчык, мастак эпохі Адраджэння. Нарадзіўся каля 1490 года ў сям'і полацкага купца Лукі Скарыны. Атрымаў выдатную еўрапейскую адукацыю ў Кракаве і Падуі.

Францыск Скарына вырашыў даць беларускаму народу друкаваную кнігу на роднай, старабеларускай, мове. 6 жніўня 1517 года ў Празе (Чэхія) была надрукавана першая кніга Бібліі — Псалтыр. Усяго ў 1517—1519 гадах Скарына выдаў 23 кнігі Бібліі з выдатным мастацкім аздабленнем, са сваімі прадмовамі і каментарыямі. Гэта сапраўдны подзвіг.

Скарына заснаваў у Вільні першую ва Усходняй Еўропе друкарню і выдаў «Малую падарожную кніжку» (1522) і кнігу «Апостал» (1525).

Кнігі Францыска Скарыны — шэдэўры славянскага кнігадруку, наша найдаражэйшая нацыянальная святыня.



Правообладатель Национальный институт образования



# Родная зямля. Мой род. Народ

## Пятрусь БРОЎКА



Беларусь! Хто любоў да цябе можа змераць?
Акіяны не маюць такой глыбіні.

*Пятрусь Броўка.*

Пятрусь Усцінавіч Броўка (1905—1980) — народны паэт Беларусі, пісьменнік, перакладчык, грамадскі дзеяч. Нарадзіўся ў вёсцы Пуцілкавічы Ушацкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пра сваё маленства Пятрусь Броўка ўспамінаў: «Яркія і незабыўныя ўражанні дзяцінства... Яно было такім самым, як ва ўсіх дзяцей сялянскай беднаты. Спачатку пасвіў гусей, пасля — авечак, а пазней — кароў, вадзіў коней на начлег... Да гэтага часу памятаюцца бясконцыя сцежачкі і дарожкі на лугах і палях вакол роднай вёскі, задумлівы гоман сасновага лесу, баравыя астравы сярод бяздоння адвечных балот. Безліч птушыных



Правообладатель Национальный институт образования

галасоў, напевы ветру, шум калматых ялін, нават шэпт лугавых траў навечна напоўнілі сэрца».

Вучыўся Пятрусь Броўка з цікавасцю і ахвотай. Пазней, згадваючы пра падзеі Першай сусветнай вайны (яму было ўсяго дзевяць гадоў), паэт зазначаў: «Я ўжо ўмеў крыху чытаць і пісаць. Упершыню тады знадобілася мне грамата. Па складах пісаў пад дыктоўку непісьменных салдатак пісьмы мужыкам на фронт».

З юнацтва Броўка захапіўся літаратурнай творчасцю, выйшлі з друку некалькі яго кніг вершаў і паэм. У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны ён добраахвотна пайшоў на фронт, быў ваенным карэспандэнтам.

Творчая спадчына пісьменніка надзвычай багатая, у ёй у паэтычных вобразах адлюстраваліся гісторыя народнага жыцця, багацце нацыянальнага характару беларусаў, прыгажосць роднай зямлі. Пятрусь Броўка — аўтар шматлікіх кніг паэзіі і прозы, твораў для дзяцей («Донька-Даніэль», «Маладым сябрам», «Наш музей» і інш.). Верш «Прысяга сэрцам» — адно з паэтычных прызнанняў аўтара ў любові да роднага краю.

1. «Зямля пад белымі крыламі», «Сінявокая Беларусь», «Азёрны край» — так часта называюць нашу краіну. Прыгадайце іншыя вобразныя назвы Беларусі. Падбярыце сінонімы да слова *Радзіма*.
2. Хто са славутых беларусаў, чые імёны вы ведаеце, складае гонар і славу нашай краіны?

## Прысяга сэрцам

Вечна я ўдзячны жытняму хлебу,
Чыстай вадзе з невялічкай крыніцы,
Лесу зялёнаму,
Сіняму небу,
Светлай рачулцы, што ў полі бруіцца,

Гулу кварталаў у сонца затканым,
Дзе я з гадамі ў жыцці гартаваўся,
Плошчам і вуліцам
Тым несціханым,
Дзе я з сябрамі здружыўся, пазнаўся,



Правообладатель Национальный институт образования

Людзям з адкрытай і шчырай душою,
З кім давялося ў жыцці мне сустрэцца,
Краю,
Што роднай завём мы зямлёю,
Што Беларуссю так люба завецца!

1. Якой паўстае Беларусь ва ўяўленні паэта? Прыгадайце малюнкі і вобразы, што раскрываюць яе адметнасць, непаўторнасць. Падмацуйце свой адказ вершаванымі радкамі.
2. Што ўкладвае мастак слова ў паняцце *родная зямля*? Прааналізуйце аўтарскія пачуцці, выказаныя ў вершы.
3. Разгледзьце на вокладцы рэпрадукцыю карціны Уладзіміра Масленікава «Зямля дзядоў». Якой уяўляе зямлю сваіх продкаў мастак? Прааналізуйце кампазіцыю, вобразы, палітру карціны. Зачытайце паэтычныя радкі, блізкія па настраёвасці да мастацкага палатна. Чаму, на ваш погляд, карціна атрымала такую назву?
4. Падрыхтуйце вуснае выказванне «Беларусь для мяне — гэта...».
5. Прачытайце артыкул «Сімвалы Беларусі», выканайце заданне па тэме.

## *Алесь КАЗЕКА*



О Беларусь, мая калыска,
Жыццё маё, прытулак мой!

*Пятро Глебка.*

Алесь (Аляксандр) Мікалаевіч Казека — пісьменнік, перакладчык. Нарадзіўся 4 жніўня 1958 года ў вёсцы Новы Юзін Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і лесніка. Пасля заканчэння школы паступіў у ваеннае вучылішча.



Правообладатель Национальный институт образования

Родная зямля для Алеся Казекі — уся Беларусь. З самага ранняга дзяцінства ён, як і ўсе мясцовыя дзеці, ведаў ад бацькоў і суседзяў, што іх вёску ў вайну поўнасцю спалілі ворагі. Ведаў, што было з навакольнымі сёламі і іх жыхарамі.

Паэзіяй захапляўся з юнацтва, але толькі ў пачатку XXI стагоддзя яна ўвайшла ў яго лёс так, што стала адным з самых галоўных заняткаў жыцця. Цяпер Алесь Казека ўзначальвае Магілёўскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Вялікую ўвагу ў сваёй творчасці паэт надае ўслаўленню роднай зямлі і беларускай прыроды, адлюстраванню жыцця сучаснай вёскі. Яго мара — каб беларусы жылі адной дружнай сям'ёй, шануючы спрадвечныя чалавечыя каштоўнасці: любоў, дабро, спагаду, згоду.

1. Каго мы называем патрыётам?
2. Чаму важна ведаць гісторыю, традыцыі свайго народа, шанаваць тое месца, дзе чалавек нарадзіўся і вырас?

* * *

Я — маленькая кропля з крыніцаў святых,
Што ваду жыватворчую маюць,
І зярнятка з мільёнаў зярняткаў жывых,
Што багацце Радзімы складаюць.

І, напэўна, я тут не зраблю адкрыцця,
Я — звяно неўміручага роду,
Што на ніве бясконцага поля жыцця
Беларускім завецца народам...

1. Што магло натхніць аўтара на стварэнне гэтага верша?
2. З чаго, на думку паэта, складаецца багацце Радзімы?
3. З чым атаясамлівае сябе ў творы аўтар? Раскрыйце мастацкі сэнс гэтых вобразаў.
4. Знайдзіце вобразна-выяўленчыя сродкі мовы ў вершы (эпітэты, параўнанні) і патлумачце іх мастацкую ролю.
5. Вызначце асноўную думку твора.



Правообладатель Национальный институт образования

**6.** Якую назву вы далі б вершу? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
**7.** Што значыць для вас быць беларусам?
**8.** Закончыце наступныя народныя выслоўі:
*Бацькаўшчыну не купляюць і не ... .*
*Жыць — Радзіме ... .*
*Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай ... .*
*Чалавек без Радзімы, як салавей без ... .*
*Родная зямелька — як змораному ... .*
**9.** Падрыхтуйце паведамленне пра ваш населены пункт. Чым ён адметны? Што было б варта паказаць і пра што расказаць таму, хто прыедзе да вас на экскурсію?
**10.** Прачытайце артыкул «Цікавыя факты пра Беларусь», адкажыце на пытанні.

# Уладзімір ЛІПСКІ



Адтуль вяду я свой жыццёвы след
І радаслоўную пішу спачатку...
*Васіль Вітка.*

Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі — беларускі празаік, публіцыст. Нарадзіўся 6 мая 1940 года ў вёсцы Шолкавічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пісьменнік згадвае: «Маё дзяцінства прайшло ў нястачы, але я знаў любоў бацькоў, шчырасць людзей, прыгажосць прыроды, асалоду чытання і ведаў... Маё пакаленне выхоўвалася ў працы, гэта нас фарміравала здаровымі і добрымі... Бацькі вучылі быць чалавекам: нікога не крыўдзіць, не падманваць, не браць чужога, шанаваць і людзей, і птушак, і дрэвы... Упэўнены, што па генах, па радаводу перадаецца ўсё лепшае, што было ў мінулых пакаленнях: сумленнасць, сціпласць, працавітасць, шчырасць».



Правообладатель Национальный институт образования

Уладзімір Ліпскі надрукаваў больш за 70 кніг, шмат з іх адрасавана дзецям: «Рыгоркавы прыгоды», «Марынчына казка», «Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска», «Пралескі ў небе», «Прыгоды нуліка», «Закаханы трэцякласнік», «Я тут жыву: дзецям пра Беларусь» і інш.

Аповесць пісьменніка «Я: праўдзівы аповед пра твой і мой радавод» (1998) выдадзена асобнай кнігай, якая створана аўтарам на аснове архіўных і дакументальных матэрыялаў пра ўласных продкаў.

1. Як вы разумееце прыказку: *Калі не ведаеш, адкуль прыйшоў, то не будзеш ведаць, куды пойдзеш*?
2. Назавіце пяць асацыяцый, якія ўзнікаюць у вашым уяўленні, калі чуеце слова *род*. Ці можна вызначыць, якія са згаданых асацыяцый, на вашу думку, найбольш важныя, значныя? Чаму?

## Ад роду — да народу

*(З кнігі «Я: праўдзівы аповед пра твой і мой радавод»)*

Я, Ты, Ён, Яна — людзі на планеце Зямля.
Што мы робім?
Жывём!

У прызначаны для нас гістарычны міг дыхаем і думаем, працуем і харчуемся, пазнаём свет і сябе, весялімся і плачам, спрачаемся і радуемся, кахаем і ненавідзім, ваюем і сябруем…

Вучоныя з Японіі збіралі звесткі пра гены[1] ў людзей розных рас на Зямлі. Вывад адназначны: усе галіны чалавецтва маюць адну прапрародзічку, агульную Маму. Яна жыла каля двухсот тысяч гадоў назад недзе ў Афрыцы. А мы, яе дзеці, жывём у розных краінах і ніяк не можам дамовіцца аб міры і згодзе…

Корань сілкуе дрэва, дае яму моц. Расце дрэва, множыцца і… гіне. Ці па ўзросце падае, ці ад сякеры дрывасека, ці ад хвароб, ці ад нядбайнасці гаспадароў. А на яго месцы вырастае новы ствол. Жыццё прадаўжаецца!

[1] *Ген* — часцінка спадчыннага рэчыва, з дапамогай якога прыкметы і ўласцівасці бацькоў перадаюцца нашчадкам.



Правообладатель Национальный институт образования

У кожнага сямейнага радаводу — сваё дрэва. У яго свае карані, ствол, галіны, лісце, насенне, плады.

У прыродным лесе растуць дуб, ліпа, граб, клён, бяроза, асіна…

У лесе чалавечым жывуць Дубовікі, Ліпскія, Ліпніцкія, Граблёўскія, Клёнскія, Асіноўскія…

Лес прыродны не можа расці без кустоў, парасткаў, зараснікаў. Ёсць дрэвы-волаты і карлікі, засохлыя і крывыя, кучаравыя і абкарнаныя[1].

Гэтак жа і ў лесе чалавечым…

А я веру: у кожнага чалавека сваё Я. Непаўторнае!

Кожны чалавек — Асоба!

Кожнае чалавечае жыццё — Кніга!

Я глыбока ўсвядоміў новую ісціну: чалавек — гэта цэлая планета.

Не верыце?

А давайце разам намалюем гэту чалавечую планету. У цэнтры паставім — Я. Гэта толькі ў алфавіце Я — апошняя літара. А ў жыцці кожнае Я — галоўная фігура на Зямлі, пуп зямлі, стрыжань, вакол якога адбываюцца ўсе падзеі…

Вакол Я правядзём дужку, вясёлку, карону, касмічны скафандр, адным словам, як хто ўяўляе той арэол над сабой. Але прызнаем галоўнае: як бы чалавек ні выстаўляў сваё Я, у якія б вышы ні ўзнімаўся, як бы нізка ні падаў, павінен помніць, улічваць бацькоўскае біяполе[2]. Хочам таго ці не, а нам з малаком маці, па спадчынных генах, перадаецца ўсё тое важнае і важкае, што рухае нас па Зямлі і ўтрымлівае ў вобразе чалавека.

І гэта абавязвае нас над Я правесці яшчэ адну дужку. Атрымліваем арбіту з дзвюх раўнацэнных палавін: бацька і маці. Яны далі жыццё нам. Мы ў вечным і неаплатным даўгу перад імі. На іх молімся. Яны сняцца нам, не пакідаюць нас, калі нават адыходзяць у вечнасць.

Над бацькамі — свая арбіта: нашы бабулі і дзяды. Іх у кожнага Я — чатыры. І гэта не залежыць ні ад якіх жыццёвых бед:

---

[1] *Абкарна́ны* — няроўна, коратка падрэзаны.

[2] *Біяпо́ле* — прастора дзеяння жыццёвых сіл.



Правообладатель Национальный институт образования

сіратой чалавек гадаваўся ці ў сям'і, з адной маці ці з адным бацькам. Усё роўна на гэтай вышыні яго «нараджалі» чацвёра людзей і перадалі яму свой генны набытак.

І калі далей будаваць арбіты вакол Я, то блізкія, роднасныя сувязі з кожным новым вітком удвойваюцца. У трэцім калене ў кожнага з нас ужо восем прабабак і прадзедаў. У чацвёртым — шаснаццаць, у пятым — трыццаць два. А ў дзясятым — 1024!

Калі ўлічыць, што за сто гадоў мяняецца прыкладна тры пакаленні людзей, то ў дадзеным выпадку наша Я атрымала спадчыну ад дзесяці пакаленняў — 1024 прародзічы! Яны на працягу трохсот гадоў «ляпілі» сённяшняга цябе, мяне, яго, яе...

Ці апраўдваем іх давер?

Ці ўдзячны ўсім тым людзям, якія па генах перадавалі нам жыццё?

Ці зрабілі крок да таго, каб нешта даведацца пра іх колішняе існаванне?

Заплюшчы вочы, сённяшняе Я, задумайся, не палянуйся разважыць — і цябе апануе цікаўнасць. Давай разам уявім, у якую эпоху жылі нашы 1024 блізкія прародзічы.

А яшчэ ўлічым, што ў кожнага з іх былі браты і сёстры, а нашы — прапрадзядзькі, прапрацёткі.

А ў тых — свае дзеці. Дык вунь які пласт радні меў кожны з нас трыста гадоў назад!..

Дзеці — спадарожнікі планеты Сям'я. На ёй яны напаўняюцца мудрасцю, сілай, жыццёвым зарадам. І, адчуўшы моц у крылах, з дапамогай бацькоў узлятаюць на сваю арбіту. Ствараюць сваю жыццёвую планету Я.

Так было.

Ёсць!

І будзе!..

Жывуць на Зямлі людзі.

Людзі згуртаваны ў народы.

У кожным чалавеку — сваё Я.

Я ўтрымлівае ядро са спадчыннымі генамі. А ў іх — нашы мінулае, сённяшняе, будучае.



Правообладатель Национальный институт образования

Я плюс Я — сям'я.
Сям'я плюс сям'я — род.
Род плюс род — народ.
Народ плюс народ — людзі Зямлі…

Хай гэта жывая карусель будзе вечнай, каб народ не згубіў повязь часоў, каб мацнелі сем'і, на якіх трымаюцца род і народ, іх слава і моц.

Хай кожнае чалавечае Я стане вобразам Дабрыні, Розуму і Любові. Тады і Зямля наша ператворыцца ў планету Шчасця. Тады і мы станем Людзьмі. І захочацца нам адзін аднаго называць родзічам.

Хай так будзе!

1. Паразважайце, ці можам мы назваць людзей, якія жывуць на нашай Зямлі, вялікай сям'ёй.
2. Ці згодны вы з думкай, што кожны чалавек — цэлая планета? Як вы разумееце сэнс выразу *быць на Зямлі Чалавекам*?
3. Што засмучае пісьменніка? Калі, на думку аўтара, *Зямля наша ператворыцца ў планету Шчасця*? А якой уяўляецца *планета Шчасця* вам?
4. Вызначце корань у слове *народ*. Хто складае народ?
5. Чаму кожнаму з нас трэба ведаць свае карані, памятаць продкаў, шанаваць і берагчы свой радавод?
6. Дзе і калі нарадзіліся вашы бацькі? Што вы ведаеце пра жыццё іх братоў і сясцёр?
7. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Эдуарда Белагурава «Партрэт бацькоў». Якія выразныя дэталі мастацкага палатна сведчаць, што яго героі прайшлі няпросты жыццёвы шлях? Падзяліцеся сваімі думкамі і разважаннямі.
8. Прыгадайце некалькі прыказак пра сям'ю, родзічаў, продкаў. Падрыхтуйце паводле адной з іх вусную замалёўку.



*Э. Белагураў.*
Партрэт бацькоў



Правообладатель Национальный институт образования

**9.** Прачытайце артыкул «Назвы ступеняў сваяцтва», выканайце заданне па тэме.

**10.** Распытайце бацькоў пра сваіх продкаў (дзеда, бабулю, прадзеда, прабабулю і г. д.) і запішыце месца і час нараджэння або гады жыцця, даведайцеся, дзе яны жылі. Складзіце (або намалюйце) радаводнае дрэва — выяву свайго радаводу па бацькоўскай лініі (вазьміце за ўзор радавод Янкі Купалы па бацькоўскай лініі).



# *Алесь ПІСЬМЯНКОЎ*

Не, продкі не адышлі. Яны тут і заўсёды будуць тут: як песня, якую мы атрымалі ад іх, як іхнія радасць і боль. Яны расквітаюць усмешкай на нашых вуснах, і іхні боль — гэта наш боль. І калі мы плачам — мы плачам іхнімі слязьмі.

*Уладзімір Караткевіч.*

Алесь (Аляксандр) Уладзіміравіч Пісьмянкоў (1957—2004) нарадзіўся ў вёсцы Бялынкавічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў рабочай сям'і. Вучыўся ў Бялынкавіцкай сярэдняй школе, пачаў рана пісаць вершы. Настаўнік мовы і літаратуры ўсяляк спрыяў развіццю ў яго паэтычных здольнасцей.

Краязнавец Віктар Арцем'еў зазначае: «Алесь Пісьмянкоў — пясняр нашага роднага краю. Ён ніколі не забываў родныя карані, сваё Прыбесяддзе з крыніцамі, якія жывілі яго талент. Ён захапляўся нават назвамі вёсак малой радзімы: "Таму й чытаю назвы вёсак, як загалоўкі мудрых кніг"».

Алесь Пісьмянкоў — аўтар зборнікаў паэзіі «Белы камень», «Чытаю зоры», кніг для дзяцей «Заўзятары», «Ласуны-веселуны», «Мы з братам». Асобныя вершы Алеся Пісьмянкова пакладзены на музыку. Верш «Продкі» напісаны ў 1992 годзе і змешчаны ў зборніку вершаў «Планіда».



Правообладатель Национальный институт образования

Патлумачце сэнс наступных выказванняў Уладзіміра Караткевіча:
а) *Чалавека няма без продкаў, народа няма без гісторыі*;
б) *Хто забыў сваіх продкаў — сябе губляе, хто забыў сваю мову — усё згубіў*.

## Продкі

Калі марнею ад нягод
І сэрцу цесна,
Я ўспамінаю радавод
І продкаў песні.

Яны ідуць за годам год
З мячом і з плугам.
О, мой нязводны род,
Ён моцны духам!

Імёны памяць берагла,
Вяла праз церні[1],
Каб я не сеяў зла,
А толькі — зерне.

Да іх іду я зноў і зноў,
Ім веру свята.
Таму й вяду сваіх сыноў
Да іх на раду[2].

1. Што гаворыць паэт пра сваіх продкаў? Якім бачыць іх жыццё?
2. Патлумачце выраз *нязводны род*.
3. Чаму продкі больш за ўсё цанілі і шанавалі працу?
4. Як вы разумееце словы: *Каб я не сеяў зла, // А толькі — зерне*? Сімвалам чаго з'яўляецца зерне ў вершы?
5. Якім павінен быць чалавек, каб быць вартым памяці продкаў? Падмацуйце свае думкі радкамі з верша.

---

[1] *Це́рні* — тут: цяжкасці, пакуты, якія сустракаюцца на жыццёвым шляху чалавека.

[2] *Ра́да* — парада, павучанне, як трэба зрабіць; тут: нарада, сумеснае абмеркаванне якіх-небудзь пытанняў.



Правообладатель Национальный институт образования

6. Чаму ў часы нягод людзі звяртаюцца ў думках да сваіх продкаў? У чым, на вашу думку, вытокі моцы і трываласці чалавека?
7. У кожнага народа ёсць свой гістарычны радавод. Прыгадайце імёны славутых беларусаў. Што вы пра іх ведаеце? Чым яны вызначыліся?
8. Раскрыйце сэнс слоў Якуба Коласа: «Толькі на ўласных каранях дае дрэва багаты плод». Як гэта выказванне можна суаднесці са зместам верша Алеся Пісьмянкова?
9. Падрыхтуйце вуснае выказванне «Я — галінка на дрэве свайго роду».
10. Вывучыце на памяць верш Алеся Пісьмянкова «Продкі».
11. Прачытайце артыкул «Радаўніца. Дзяды» і выканайце заданні па тэме.



# *Уладзімір КАРАТКЕВІЧ*

Беларусь мая, ты адзіная,
Перад кім на каленях стаю:
Мне, слузе твайму, цяжка загінуць,
Лёгка — жыць у славу тваю.

*Уладзімір Караткевіч.*

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч (1930—1984) — вядомы беларускі празаік, паэт, драматург, публіцыст, кінасцэнарыст. Нарадзіўся ў горадзе Орша Віцебскай вобласці. Рос цікаўным і здольным хлопчыкам, навучыўся чытаць у тры з паловай гады, а ў шэсць гадоў пачаў складаць вершы, спрабаваў пісаць апавяданні, сам іх ілюстраваў, меў выдатныя мастацкія і музычныя здольнасці.

Уладзіміра Караткевіча вабілі гістарычныя сюжэты, легенды нашага краю, гераічныя характары. Ён чэрпаў натхненне з вусна-паэтычнай творчасці, захапляўся чароўнай сілай мудрага народнага слова, маляваў мужных і самаахвярных беларусаў,



Правообладатель Национальный институт образования

спагадлівых, шчодрых, чулых, сардэчных. Пісьменнік быў нястомным вандроўнікам, шмат падарожнічаў па Беларусі і за яе межамі. Ён лічыў, што, толькі арыентуючыся ў падзеях сівой даўніны, чалавек можа зразумець сучаснае і прадбачыць будучае, адчуваць сябе не былінкай, што гнецца пад ветрам падзей, а моцным, трывалым дрэвам, якое ніхто і нішто не зможа зламаць. Уладзімір Караткевіч з болем зазначаў: «Сапраўды заваяванае народам, ім выпакутаванае забываць нельга... Яго трэба берагаць, песціць, любіць... Дзеці дрэнна ведаюць гісторыю. А мне б вельмі хацелася, каб людзі раптам адкрылі мора паэзіі ў беларускай гісторыі...». Ён імкнуўся выхаваць дзяцей патрыётамі сваёй зямлі, далучыць іх да гісторыі, духоўнай спадчыны свайго народа.

Талент Уладзіміра Караткевіча яркі, самабытны, непаўторны. Пісьменніка ведаюць і любяць не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Ён аўтар шматлікіх раманаў, аповесцей, апавяданняў, вершаў, нарысаў, п’ес, казак.

Апавяданне «Лебядзіны скіт» было напісана ў 1952 годзе.

Якія творы Уладзіміра Караткевіча вы прачыталі? Што вам асабліва запомнілася? Падзяліцеся сваімі ўражаннямі.

## Лебядзіны скіт[1]
### *(Скарочана)*

Даўным-даўно дзень аднойчы ўзышоў не ў сонечным святле, а ў зарыве пажараў, і чорная копаць панеслася на захад. Гэта рознапляменныя орды ўладара Батыя пайшлі навалай на рускую зямлю. Наперадзе яны сустракалі зялёныя палі, хаты ў садах і стракатыя гарады, а ззаду пакідалі толькі чорную пустэчу, па якой як жадаў хадзіў вецер, узнімаючы слупы попелу. І болей нічога не заставалася на калісьці зялёнай зямлі.

Хмарамі несліся стрэлы, пыл гарадоў дасягаў неба... і глядзелі на агонь з затоенай ухмылкай касыя вочы іх уладара. І была абдзёрта зямля балотнай Русі ўшчэнт. Тысячы палонных

[1] *Скіт* — тут: невялікая пабудова ў глухой мясцовасці для адзінокіх манахаў-пустэльнікаў, аддаленая ад чалавечага паселішча.



Правообладатель Национальный институт образования



валакліся на валасяных арканах[1] за іх коньмі, і не было каму плакаць над руінамі[2], бо ўся пустая стаяла зямля. І калі яны павярталіся назад — коням іхнім не хапала корму, і шмат якія падалі, і хан разаслаў у розныя бакі сваіх нукераў[3], каб пашукалі яны пашы для жывёл. Тры не знайшлі нічога, а чацвёрты сказаў, што ён бачыў на поўдзень возера і лясы вакол яго, і зялёныя лугі. І толькі стаўшы там, пабачылі на беразе возера скіт, змётаны з шэрага бярвення, ля якога завіхаўся нейкі старац.

Хан сам пажадаў паглядзець на рускага пустэльніка[4], а той, калі пабачыў яго, не затрымцеў ад жаху, а спакойна сказаў:

— Мусіць, гэта свету канец прыходзіць, што такі твар бачу я.

— Так, — адказаў хан, у якога бровы былі падобны да ляжачага сабакі, а вочы ззялі, быццам іржавая сталь, — я, хан Бату, нясу на зямлю смерць, і хіба вам, лягушатнікам, змагацца са мною. Калі хто паспрабуе — я знішчу яго. Калі хто не гнецца перада мною — я раблю яму хрыбет мяккім, падзяліўшы яго на дзве паловы. Літасціва гэта?

І паэты яго пачалі славіць, толькі паэт Юсуфі сказаў:

---

[1] *Арка́н* — доўгая вяроўка з рухомай пятлёй на канцы для лоўлі коней і іншай жывёлы.

[2] *Руі́ны* — рэшткі разбуранага збудавання, паселішча.

[3] *Ну́кер* — дружыннік, воін уласнай аховы хана.

[4] *Пустэ́льнік* — тут: чалавек, які з рэлігійных меркаванняў адмовіўся ад зносін з людзьмі і пасяліўся ў бязлюдным месцы.



Правообладатель Национальный институт образования

— Калі ўспыхнуў — згарыш, калі нарадзіўся — памрэш. Куды падзенуцца тады, хан, твае скарбы? Што ты возьмеш з сабою і што пакінеш на зямлі, акрамя гары чарапоў?

— А што пакінеш ты, слімак? — весела спытаў хан.

— Песню, — адказаў Юсуфі. — Далібог, гэта лепшая спадчына — сумленная песня. Зараз яны пяюць хвалу табе, заўтра — іншаму, а яшчэ праз пяцьсот гадоў, а можа, і раней люд будзе клясці цябе за тое, што ты вёў яго гэтым шляхам, поўным крыві і стогнаў. Што скажаш тады ты, які заваяваў палову зямлі, не пасадзіўшы на сваёй нават рэпы і задаволіўшыся той часткай яе, якая пасыплецца табе ў твой мёртвы рот.

Хан зарагатаў:

— Пакуль што я прымушаю другіх есці зямлю, бо што такое народ. Народ — гэта статак, у якім кожная жывёла думае толькі аб тым, каб есці другіх і не быць з'едзенай. Глядзі, гэтых людзей мы пабралі ў палон, і яны хутка забудуць мову сваю і сваю зямлю. Яны памерлі ўжо.

— Не, — сказаў Юсуфі, — яны яшчэ не нарадзіліся.

— І не народзяцца ніколі, — сказаў Бату, — бо мы павалачом іх у свой стэп, як павук муху, і дзеці іх памруць рабамі.

Юсуфі глянуў на яго са смехам:

— Хан, хіба ты забыў старую прыказку: «Дзіцёнак нараджаецца ад мацеры, а памірае за народ». Калі адно толькі калена застанецца ад народа — дык і ад яго пойдзе ён жыць.

І адказаў хан:

— У гэткага люду? Саромся. Іхнія правіцелі цураюцца сваёй мовы, іх папы — брахлівыя сабакі, у людзей яго, як у птушкі, адно жаданне — набіць свой валляк[1].

— Э, ды што гаварыць з вар'ятам, — сказаў Юсуфі, — птушкі любяць волю.

— Паспрабуем? — спытаў хан. — Вось стаіць чалавек, які не прарок і не цудатворац. Спытаемся ў яго, што яму болей даспадобы: загінуць і выратаваць сваіх людзей альбо наадварот.

---

[1] *Валля́к* — пашыраная частка страхавода ў птушак, насякомых, малюскаў, дзе папярэдне перапрацоўваецца ежа; тут: страўнік.



Правообладатель Национальный институт образования

Юсуфі плюнуў і змоўк, а хан звярнуўся да старога з тым жа пытаннем. Той сказаў панура:

— Калі ты сапраўды пусціш гэтых людзей — я гатовы да смерці.

— Чаму «сапраўды»? Хіба я зусім не маю чэсці?

— А хіба мае яе воўк, які забраўся ў статак? Ты не маеш чэсці, бо не верыш ва ўласную сілу.

— Добра, — сказаў хан, пачарнеўшы ад злосці. — Чаму ты згаджаешся на смерць?

— Я ўсё жыццё рабіў не тое, што трэба, і хачу хоць смерцю саслужыць на карысць сваёй зямлі. Я моцна жадаю гэтага, а калі моцна жадаеш — усё будзе па-твойму.

Хан усміхнуўся, і ўсім здалося, што дзве чырвоныя змяі пачалі рухацца ў яго пад рэдкімі вусамі:

— Колькі людзей ты жадаеш атрымаць за сваю скуру?

— Адпусці ўсіх.

— Ого, а ці не занадта гэта будзе дорага за дзіравую скураную торбу, якая зморшчылася ад год, як печаны яблык. Я дам табе дванаццаць душ.

Юсуфі разрагатаўся:

— О, вялікая мерка ханскай шчодрасці. Можа, таму і адбываецца выхад хана на нараду ў час мышы[1], што ў яго мозг і душа мышы. Сорам!

А старац стаяў і думаў напружана, а потым адказаў:

— Хіба хто прадае, не патаргаваўшыся нават за шэлег[2], а тут жа справа ідзе не пра бэркавец[3] мёду і не пра лашт[4] збажыны, а пра жыццё людзей.

І сказаў хан Бату:

— Добра! Але я не гандляр на базары і слова маё — ёсць апошняе слова. Хочаш, я падарую жыццё і волю столькім тваім

---

[1] *Час мы́шы* — метафарычны выраз, у якім адлюстраваны час дзеяння ў гэтым творы.

[2] *Шэ́лег (шы́лінг)* — дробная манета.

[3] *Бэ́ркавец* — мера вагі харчовых прадуктаў (прыкладна 164 кг).

[4] *Лашт* — мера масы (аб'ёму) сыпучых прадуктаў; тут: прыкладна 1965 кг збожжа.



Правообладатель Национальный институт образования

землякам, колькі іх памесціцца ў гэты твой скіт. Гэта апошняе слова... У скіт без прытвора[1].

— Дваццаць чалавек, — сказаў Юсуфі і спахмурнеў. — Праўду кажуць, што сумленне хана не варта гнілога гарбуза.

— Трыццаць пяць, — сказаў адзін цёмнік[2].

— Пяцьдзясят, — прыбавіў на вока нейкі нукер.

Але болей ніхто не даў, бо ўсе бачылі, што нават паўсотні людзей скіт размясціць не здолее.

Хан загадаў, каб нукеры адвялі старога ў прытвор і паставілі над ім варту, але Юсуфі сказаў, пачырванеўшы:

— Я саромлюся за свой народ, хан, перад гэтымі балотнымі жыхарамі. Той, хто не давярае чэсці людзей, — сам не мае яе.

— Маўчы, — раззлаваўся хан, але адазваў нукераў.

Падняўся стогн і плач: маці выштурхоўвалі наперад дзяцей, жаніхі імкнуліся выратаваць мілых нявест сваіх, дзеці — старых сваіх бацькоў. Гэтак цягнулася да тых пор, пакуль нукеры ўдарамі сваіх бізуноў не сагналі іх усіх у адну чаргу.

Маса людская папаўзла наперад пад ляскание бізуноў адной вялізнай змяёй. Стомленыя людзі спатыкаліся і падалі, іх паднімалі і цягнулі з сабою.

І здарыўся цуд: памыліліся, прыкідваючы на вока, і Юсуфі, і нукер, і цёмнік. Вось ужо паўсотні палонных зайшло ў скіт, вось сто чалавек знікла ў халоднай цемры яго, а людзі ўсё ішлі, а з-пад скіта пачаў выбівацца да возера струменьчык вады. Адзін татарын чарпануў вады шаломам[3] і пачаў пляваццa.

— Голая соль, — сказаў ён.

Хан пачынаў гневацца, а паток людскі ўсё плыў ды плыў у расчыненыя дзверы скіта, і няма, здавалася, яму ані канца ані краю.

Вось прабрылі полацкія людзі, людзі з Крычава, аршанскія паланянкі і паланянкі з берагоў Адрова, вось пацягнуліся палонныя з Менеска, і Ноўгарадка, і з Задзвінскай зямлі, нёманскія

---

[1] *Прытво́р* — тут: памяшканне за ганкам; калідор.

[2] *Цёмнік* — кіраўнік дзесяцітысячнага войска (ад *цьма* — вельмі шмат, безліч).

[3] *Шало́м* — шлем.



Правообладатель Национальный институт образования

рыбары, і пінскія лучнікі, і ваўкавыскія бортнікі[1]. Юсуфі пасміхаўся блажэннаю ўхмылкаю і мармытаў:

— Так, калі чалавек моцна захоча — ён зробіць нават немагчымае. Так і гэты дзед, хай пашле яму Алах лёгкую смерць.

Калі скрылася ў скіце палова палонных — раз'юшаны хан грымнуў:

— Трымайце, ён ашуквае нас. Астатнія пойдуць з намі!

Але пачалі нешта мармытаць нукеры і пасмейвацца цёмнікі, а паэт Юсуфі рагатаў не тоячыся, бо не баяўся нічога, акрамя знікнення свайго дару.

— Трымай, трымай слова, хан. Самае каштоўнае для мужчыны — чэсць, ці не так?

Рука хана сціснула аброць[2], але ён прамаўчаў, што б ён мог зрабіць? А людзі цягнуліся ў расчыненыя дзверы скіта і знікалі там, а на небе праяснялася, і знікалі хмары, і праз падлогу пачала прабівацца зялёная маладая трава, а дрэвы зашумелі новым лісцем.

— Хан, там унутры амаль пуста, — сказаў нейкі з яго асяроддзя.

— А дзе старац?

— Ён стаіць на каленях і плача.

— Добра, — сказаў упаўшым голасам хан, — хай заходзяць далей.

Здзіўленыя стаялі захопнікі, і зброя выпала з іх рук, а ў сэрцах людзей, няшчасных і закатаваных, нарадзілася надзея. Ляцелі над азёрамі дзікія лебедзі, і сумная загадкавая зямля адказвала іх крыку ціхім звонам сітнягу[3].

Вось і апошнія людзі зніклі, і адна варта асталася знадворку. Шалёна ўляцелі яны ў прытвор, падбеглі, схапілі за рукі ляжачую постаць.

— Сабака, — прарычэў Бату-хан, — ты памрэш ганебнай смерцю.

— Дарма, — адказаў з пагардаю[4] старац, — што мне смерць. Большай пакуты і большага шчасця, чым зараз, — не будзе.

---

[1] *Бо́ртнік* — пчаляр.
[2] *Абро́ць* — частка збруі, якая надзяваецца каню на галаву.
[3] *Сітнёг* — балотная расліна.
[4] *Пага́рда* — адсутнасць павагі; тут: без павагі, з гонарам.



Правообладатель Национальный институт образования

— Што ты зрабіў з імі? — спытаў нейкі воін.

— Паглядзіце.

І яны пабачылі апошніх юнака з дзяўчынай, якія глядзелі адно аднаму ў вочы, а потым раптам ператварыліся ў белых лебедзяў і вылецелі ў акно скіта. Белай істужкай цягнуліся лебядзіныя стаі над багнамі, лясамі, сінімі азёрамі, лугамі, над усёй мілай зямлёй сваёй, дзяліліся, ляцелі ў розныя бакі.

Дамоў, дамоў, да разораных гнёздаў!

З трубным гукам паляцела ім услед і апошняя пара, а старац, якога выцягнулі на бераг возера, сачыў за ёй цёплымі вачыма.

— Рыхтуйся да страты[1].

— Яны паляцелі на родныя гняздоўі. Ці спужаюся страты, калі слёзы і гора цэлай зямлі не спудзіўся я прыняць на свой карак. Яны цякуць да родных хат, будзе жыва родная зямля. Карайце.

— Як ты зрабіў гэта? — мякка спытаў Юсуфі.

— Верыў і любіў. Калі хоць адзін чалавек астаўся на роднай зямлі — яна не загіне. І зямля паслухалася мяне — яна не дала згінуць дзеткам сваім. На родных гняздоўях зноў у людзей ператворацца яны.

— Разбураны іх гняздоўі, — з сумам сказаў паэт.

Нукеры хана схапілі старога, а ён казаў адляцеўшым птушкам, быццам яны маглі чуць яго:

— Ляціце, белыя лебедзі, ляці, птаства. Падымуцца вашы хаты, і кветкі пакрыюць пажар. Не шкадуйце мяне, бо слёзы вашы ў камень абярнулі мяне, у камень, які плача.

Нукер вастрыў меч, а Юсуфі іранізаваў:

— Працуй, працуй, твой твар, як і твар твайго хана, з'яўляецца ступнёю, якая не мае сораму. Імёны вашы хай не апаскудзяць слыху патомкаў, бо на вачах вашых забіваюць багатыра, наваліліся цэлым войскам са зброяй на аднаго.

А старац стаяў на каленях і маліўся.

— Шчасця дай, маці-зямля, дзеткам сваім... Дай ім улетку цёплых дажджоў, увосень — сонца, утульнага снегу зімою

[1] *Стра́та* — тут: смерць.



Правообладатель Национальный институт образования



і кахання і працы вясной. Літасцівай будзь да яе воінаў, зрабі светлымі хаты і жыццё іх. Скамянеўшаму ад гора, дай мне каменем скончыць свой век.

— Уладар! — крыкнуў нукер хану. — Меч не бярэ яго шыі. Гэта святы.

І тут усе пабачылі, што твар дзеда становіцца шэрым, маршчыны застываюць на ім, камянеюць рукі.

Праз паўгадзіны на месцы старога ўжо стаяў камень, з-пад якога тачыліся слёзы, збягаліся ў ручаёк, струменьчыкам беглі да возера. Камень плакаў.

— Так, — сказаў узрушаны Юсуфі, — той, хто памірае за свой люд, — заўсёды святы. Памяць маці сваёй і героя ніхто не рашыўся зняважыць.

І раптам хан хвастануў бізуном каня і шалёна паскакаў прэч. Варта і палкі́ кінуліся за ім. Юсуфі дагнаў хана.

— Едзем з гэтай страшнай зямлі, дзе плачуць нават камяні і змагаюцца нават слабыя, — мармытнуў хан.

Юсуфі дабавіў:

— Едзем з гэтай добрай зямлі, хай светлае сонца ззяе над ёю.

Калі на бугры яны павярнуліся назад — камень ляжаў нерухомы, точачы бясконцыя слёзы, а над каменем, над возерам, над пушчаю безупынку кружлялі белыя лебедзі.



Правообладатель Национальный институт образования

Хан спытаў злосна:

— Чаму гэты старац не баяўся майго гневу?

Мудры Юсуфі адказаў:

— Што там ты! Самы моцны гнеў хана слабейшы за самую ціхую ўдзячнасць народа. Хіба, калі ён узнімаецца — не дрыжыць твая кібітка?

І хан прагаварыў ціха:

— Юсуфі! Калі-небудзь я зламлю табе хрыбет за праўду. І чакаць гэтага засталося нядоўга.

— Ну што ж. Такі, відаць, лёс паэта. А да таго часу я буду гаварыць яе, праўду. Што ты зробіш з ёю? Мо тое, што з тым старцам?

Яны пакідалі балотную зямлю, а за імі, быццам вішні, асыпалі лугі белым пухам сваіх кветак. Прызыўна трубілі лебедзі, кружлялі, падалі на ваду, і ў крыках іх гучала радасць.

Камень тачыў слёзы.

Кажуць, з таго часу Белая Русь і празываецца «белай». Ад лебядзінага апярэння стала белай вопратка ў яе людзей.

А кажуць і другое: быццам таму яна «белая», што пад татарамі не пабыла. Можа, й так... А калі мне веры не даяце — адшукайце самі ля Галошаўскага возера мясцовасць «лебядзіны скіт». Мо тады самі ўпэўніцеся, як калісьці мой дзед, са слоў якога я й апавядаю вам гэта. Трубяць лебедзі на балотах.

1. Як паводзілі сябе на захопленай тэрыторыі войскі хана Бату? Што пра гэта гаворыць Уладзімір Караткевіч?
2. Якім паказвае хана аўтар? Растлумачце сцвярджэнне Юсуфі, што ў хана *мозг і душа мышы*.
3. Перачытайце дыялог паэта Юсуфі з ханам у пачатку твора. Што гаварыў кожны з іх пра годнасць і свядомасць народа? Патлумачце думку Юсуфі, што людзі, здольныя хутка забыць сваю мову і сваю зямлю, *яшчэ не нарадзіліся*.
4. Чаму, на вашу думку, хан Бату дазваляў паэту Юсуфі пэўныя вольнасці? Растлумачце словы Уладзіміра Караткевіча: *Юсуфі... не баяўся нічога, акрамя знікнення свайго дару*.



Правообладатель Национальный институт образования

5. Што меў на ўвазе Юсуфі, калі сцвярджаў: *лепшая спадчына — сумленная песня?* Якую спадчыну, на яго погляд, пакіне пасля сябе хан? Пракаменціруйце словы паэта.
6. Хан Бату лічыў, што *народ — гэта статак, у якім кожная жывёла думае толькі аб тым, каб есці другіх і не быць з'едзеной*. Выкажыце свае адносіны да гэтых слоў. У якасці аргументаў зачытайце радкі з твора.
7. Як вы разумееце прыгаданую Юсуфі прыказку: *Дзіцёнак нараджаецца ад мацеры, а памірае за народ*?
8. Чаму старац пагарджаў смерцю? Як трымаўся ён у апошнія хвіліны жыцця? Прачытайце яго словы, звернутыя да маці-зямлі. Як гэта малітва характарызуе пустэльніка? Чаму нават варожы нукер назваў старога *святым*?
9. Што ўбачыў на чужой зямлі хан Бату, ад'язджаючы ад скіта? Чаму ён назваў яе *страшнай зямлёй, дзе плачуць нават камяні і змагаюцца нават слабыя*? Як назваў гэту зямлю Юсуфі?
10. Магчыма, вы ведаеце іншыя гістарычныя легенды (чулі, чыталі, бачылі сюжэты пра іх у кіно або па тэлебачанні) пра далёкія часы і падзеі, пра нашых продкаў. Перакажыце найбольш цікавыя з іх.
11. Выканайце заданні па тэме.

**Чаму Беларусь — Белая?**

У апавяданні «Лебядзіны скіт» Уладзімір Караткевіч расказвае пра дзве версіі ўзнікнення назвы «Белая Русь». Аднак існуюць і іншыя варыянты. Упершыню тэрмін «Белая Русь» упамінаецца ў летапісах у 1135 годзе. У старажытнасці колеры атаясамліваліся з напрамкамі свету: белы — з захадам, блакітны — з усходам, чорны — з поўначчу, чырвоны — з поўднем. Таму невыпадкова тэрыторыя Старажытнай Русі дзялілася на «Белую Русь», «Чорную Русь» і «Чырвоную Русь».

Значэнне слова *Белая* ў назве краіны тлумачыцца па-рознаму. Адны даследчыкі пад увагу бяруць шэраг адметнасцей: светлы колер скуры, русыя валасы, вочы светлых колераў, белая льняная вопратка беларусаў, белыя бярозавыя гаі, заснежаная зямля на працягу доўгай зімы... Іншыя навукоўцы лічаць, што назва «Белая Русь» азначае «вольная, незалежная, самастойная, светлая» дзяржава, выходзячы з таго, што ў старажытных славян словы *белы*, *беласць* сімвалізавалі волю, чысціню, дабрату і радасць.



Правообладатель Национальный институт образования



# Свет загадак і цудаў

## МІФЫ

Сплывае ўдаль, што маем…
А былое нібы набліжаецца да нас.
Пылінку праху раздзьмувае час —
І з мёртвага ўспыхвае жывое.

*Мікола Арочка.*

Міфы ствараліся на працягу многіх стагоддзяў. Нашы продкі жылі ў цеснай сувязі з прыродай, але былі безабаронныя перад яе стыхіямі. Адчуваючы непасрэдную залежнасць ад прыроды, старажытныя людзі верылі ў яе таямнічыя сілы. Яны хацелі ведаць, напрыклад, чаму дзень змяняецца ноччу, чаму на змену цяплу прыходзіць холад, як пабудаваны сусвет, хто стварыў чалавека. Старажытныя людзі шукалі адказы на гэтыя і іншыя пытанні, абапіраючыся на свой жыццёвы вопыт. Яны не ведалі законаў прыроды, таму звязвалі свае тлумачэнні са звышнатуральнымі сіламі. Спрабуючы спасцігнуць тое, што было незразумелым, нашы продкі адухаўлялі прыроду, надзялялі яе чалавечымі рысамі і ўласцівасцямі. Назіраючы за прыродай, яны тлумачылі з’явы навакольнага свету паводле свайго жыццёвага вопыту, сваіх уяўленняў, здагадак. У адным выпадку надавалі



Правообладатель Национальный институт образования

з'явам прыроды чалавечыя рысы (якасці), у другім — насялялі свет незвычайнымі істотамі, волатамі, багамі і духамі. Людзі складалі фантастычныя гісторыі пра навакольны свет. Ад дзеда ўнуку пераходзілі гэтыя легенды — вусныя аповеды пра мінулае.

***Міф*** — старажытны народны аповед пра паходжанне свету, жыццё прыроды і чалавека.

Так, міфы распавядаюць, што, як, адкуль і чаму бярэцца, па якіх правілах жыве сусвет, з чаго ўсё пачалося. Адчуваючы сябе часцінкай прыроды, людзі адухаўлялі яе, верылі, што яна можа дапамагаць чалавеку ў яго штодзённых клопатах або, наадварот, шкодзіць. Нашы продкі баяліся сваімі размовамі, дзеяннямі, учынкамі ўгнявіць сілы прыроды і таму стараліся ім дагадзіць, іх улагодзіць. Яны абагаўлялі птушак (зязюлю, бусла, ластаўку, жаўрука), іншых жывых істот (каня, ваўка, мядзведзя, вужа, змяю), пакланяліся кветкам (папараць-кветцы, зязюльчыным слёзкам, браткам), дрэвам (дубу, бярозе, рабіне, каліне, явару, грушы). Продкі верылі, што зламанае ці пашкоджанае дрэва можа жорстка і бязлітасна расправіцца са шкоднікам. Калі чалавек гінуў ад паваленага дрэва, лічылі, што гэта помста за нейкі нядобры ўчынак.

Да нашых дзён захавалася павер'е, што вялізныя густыя дрэвы — дуб, ліпа, вяз, бяроза — валодаюць розумам. А ў купальскую ноч дрэвы нібыта пераходзяць з месца на месца, размаўляюць паміж сабой, і чалавек можа падслухаць іх гаворку.

З міфаў і легенд можна даведацца, што калісьці даўным-даўно ў дрымучых лясах жылі незвычайныя людзі — асілкі. Яны былі высокія, магутныя, а голас мелі, як звон, гучны. Бывала, калі хтосьці з іх крыкне на ўвесь голас ды свісне, дык якое б дрэва ні было вялікае, а зваліцца.

Гаспадаркі асілкі не трымалі, не было ў іх ні свойскай жывёлы, ні прыпасу, ні запасу. Ні хлеба, ні лёну не сеялі. Карміліся тым, што лавілі па лясах звяроў ды ў водах — рыбу. Вопратку сабе яны шылі са звярыных шкур. Вось так і жылі.



Правообладатель Национальный институт образования

Інструменту ў іх амаль ніякага не было. Кажуць, што была на ўсіх адна сякера, ды і тая не жалезная. Але гарадзішчы[1] яны ўсё ж будавалі. Маючы ўсяго адну сякеру, асілкі перакідвалі яе з гарадзішча на гарадзішча, бо не хацелі траціць час на пераход. Крыкне асілак з аднаго гарадзішча ў другое: «Сякеру давай!» — а такі ж волат возьме сякеру дый кіне яму. Незвычайная была ў іх сіла, за тое і называліся яны асілкамі. Бывала, трэба на будынак бярвенне, дык пойдзе каторы ў лес, вырве дрэва з карэннем ды так і валачэ на гарадзішча. Або камень спатрэбіцца на будоўлі, дык ён возьме яго дый шпурляне за вярсту ці больш, проста на гарадзішча. Некаторыя кідалі такія вялізныя камяні, што былі велічынёю ў рост чалавека, але не заўсёды гэтакія камяні далятаді да гарадзішча. А то ёсць мясціны, што зусім закіданыя камянямі. Дзяды казалі: «Тут асілкі адзін супроць аднаго ваявалі...» Яны і на звяроў палявалі з камянямі, ад таго камяні і па сёння ляжаць у лясах. Калі перавяліся ў лясных гушчарах звяры і паменшала ў вадзе рыбы, асілкі пакінулі свае гарадзішчы, якія хутка апусцелі. Праз шмат гадоў прыйшлі ў тыя мясціны нашы дзяды, каб сеяць жыта і разводзіць жывёлу *(Паводле легенды «Асілкі»)*.

1. Як узніклі міфы?
2. Як вытлумачвалі прыродныя з'явы і прадметы навакольнага свету нашы далёкія продкі? На чым грунтаваліся іх уяўленні?
3. Калі і дзе, паводле легенды, жылі асілкі? Раскажыце пра іх лад жыцця, выгляд, заняткі, звычкі.
4. Разгледзьце ілюстрацыю Валерыя Славука «Волат». Якім паказаў мастак асілка? Прыдумайце імя волату. Пафантазіруйце, пра што ён гаворыць з людзьмі, куды далей ляжыць яго шлях, чым ён збіраецца займацца.
5. Прыдумайце ўласную вусную гісторыю «Сустрэча з волатам».
6. Чым цікавыя міфы для нас, сённяшніх людзей?



*В. Славук.* Волат

[1] *Гарадзі́шча* — месца, дзе сяліліся старажытныя людзі.



Правообладатель Национальный институт образования

# ПРА БАГОЎ

І камень, і дрэва, і дым —
Жывыя яны.

*Рыгор Барадулін.*

Свет, на думку нашых продкаў, быў населены багамі, добрымі і злымі духамі. У старажытных міфах багі і духі нагадвалі жывых людзей, кожны з іх меў свой характар, адметны выгляд. Людзі ж маглі толькі прасіць у багоў дапамогі ў сваіх справах і клопатах.

Наймагутнейшы і галоўны з багоў, творца жыцця, бог неба і ўсяго свету, меў некалькі імёнаў: Сварог, Стрыбог, Святавіт. Часам яго яшчэ называлі Родам (ад яго паходзяць словы *радзіма, народ, прырода, продак, нараджэнне, ураджай* і інш.). Паводле міфаў, *Сварог* перамог цемру і распачаў жыццё на Зямлі. Пасля Сварога сталі правіць тры яго сыны Сварожычы — Пярун, Ярыла і Дажбог. *Дажбог* — бог сонца, сонечнага цяпла і святла, апекаваўся над сейбітамі, даваў ім моц і здароўе. Ён лічыўся самым міласэрным з багоў, самаахвярным, добрым, шчодрым, спрыяў урадлівасці палёў, дабрабыту людзей. Раней верылі, што кожную раніцу Дажбог выязджаў на калясніцы са свайго палаца, што знаходзіўся на ўсходзе, за дзень аб'язджаў неба і ўвечары вяртаўся, рухаючыся на захад, у свой нябесны дом на адпачынак.

Старэйшы сын Сварога — *Пярун* (Грамабой) — бог грому і маланак — займаўся зброяй і вайсковымі справамі. Ён быў вельмі падобны да Сварога. Нашы прашчуры ўяўлялі яго магутным волатам з сівымі, чорнымі або вогненна-рудымі кучаравымі валасамі і доўгай барадой. Калі ён імчаўся на калясніцы па небе, раздаваліся страшэнныя грымоты. Лічылі, калі ўздыхне Пярун — узнімецца вецер, дзьмухне — усходзіцца навальніца. У руках ён быццам трымаў лук-вясёлку і стрэлы-маланкі, якія шпурляў на зямлю. Ударамі маланак грозны бог мог пакараць любога, на ўсіх ён наводзіў жах. Міфы сцвярджаюць, што на месцах бойкі Перуна з нячыстай сілай з'явіліся валуны, якія і зараз у Беларусі называюць ці Князем-каменем, ці Гаспадаром-каменем, ці проста Перуном. Грамабой паліваў зямлю дажджом, змушаў



Правообладатель Национальный институт образования

прыроду абуджацца, каб даць новы ўраджай. Пад канец восені ён засынаў, маразы закоўвалі яго ў хмары, і ён усю зіму спачываў на небе. І толькі з прылётам птушак зноў ажываў.

*Ярыла* (Яр) — бог урадлівасці і кахання — нібыта кіраваў на Зямлі стварэннем моцнага і здаровага роду. Ярылу лічылі богам веснавога агню, абуджэння прыроды. Калі ён спускаўся на зямлю, пачыналася вясна. Ярылаў агонь саграваў зямлю, якая нараджала дрэвы і расліны, гадавала ўраджай. Ярыла ўсім істотам даваў моц (ярасць): выразы *ярая сіла*, *ярая пчолка*, *ярына ў полі* паходзяць ад яго імя. Нашы продкі ўяўлялі Ярылу прыгожым маладым хлопцам на белым кані, у белай вопратцы, часам з чырвонай накідкай на плячах, у вянку з веснавых раслін, з зялёнымі галінкамі ў руцэ. Там, дзе ён ступаў басаном, адразу вырастала густое жыта.

Ярылу дапамагалі багіня веснавога абуджэння і кахання *Лада* (Ляля, Лёля), бог ураджаю і дастатку *Купала* і багіня лета *Цёця* — значна старэйшая за Лялю, мажная, прыгожая, прыбраная жытнёвымі каласамі, са спелымі пладамі ў руках. Ладу-Лялю ўяўлялі высокай прывабнай маладзенькай дзяўчынай, у белай сукенцы, упрыгожанай зялёнай лістотай, з вяночкам палявых красак на галаве. Яна вельмі шчодрая. Маладым дзяўчаткам яна штогод давала вяночкі, іх захоўвалі да наступнай вясны (а хто з дзяўчат выходзіў замуж, гэты вяночак зберагаў усё жыццё).

Нашы прашчуры пакланяліся нябесным свяцілам, і найперш — сонцу, якое было крыніцай жыцця. Людзі радаваліся сонечнаму святлу і цяплу, услаўлялі сонца ў абрадах, песнях, танцах. Маленькім сонейкам на Зямлі лічыўся агонь, што абаграваў людзей, ахоўваў іх ад драпежнікаў, даваў магчымасць прыгатаваць ежу. Бога агню *Жыжаля* (Зніча) высока шанавалі і разам з тым вельмі асцерагаліся. Яго лічылі апекуном падземнага агню і кавальскага рамяства. У сваёй вогненнай кузні пад зямлёй Жыжаль, непакорны і мужны, каваў зброю, каб скінуць Перуна. Калі магутны волат затрымліваўся ў кузні, зямля перагравалася, пачыналася засуха, гарэлі лясы і тарфянікі.

Нашы далёкія папярэднікі не толькі назіралі за зямнымі з'явамі і прадметамі, але і ўглядаліся ў начное бяздоннае неба.



Правообладатель Национальный институт образования

Зоркі былі сімваламі чалавечых душ. Прыходзіць на свет дзіця — і запальвае цудадзейная багіня жыцця і долі *Жыва* новую зорку, якая будзе гарэць, пакуль не скончыцца нітка жыцця. Памёр чалавек — скацілася з неба знічка-слязінка. Гэта багіня смерці *Мара* (Мора, Марэна) наслала на яго пагібель, мор[1] (адсюль і словы *замарыць*, *смерць*, *мёртвы*). Паводле міфаў, Мара — жанчына, здольная прымаць самыя розныя абліччы: ваўка, змяі, каня, жудаснай істоты.

Продкі верылі ў вечнае існаванне душы, яе несмяротнасць, былі ўпэўнены, што нябожчык на тым свеце сустрэнецца з памерлымі сваякамі. Кожнага чакае шчаслівае вечнае жыццё ў Выраі — казачна прыгожым зялёным садзе, напоўненым роўным мяккім святлом, птушынымі мілагучнымі спевамі, цудоўнай музыкай. Пекла ва ўяўленні старажытных людзей увогуле не існавала, таму яны не надта баяліся смерці.

Міфы апавядаюць пра спрадвечную барацьбу светлых і цёмных сіл (дабра і зла) за ўладарства над сусветам. Штогод адносіны паміж імі асабліва абвастраліся ў вераб'іную (рабінавую) ноч у сярэдзіне жніўня. Нібыта ў гэту страшную ноч усе добрыя багі і духі яднаюцца і даюць смяротны бой сілам цемры. Усю ноч неба разрываюць грымоты (перуны), несупынна асвятляюць наваколле бліскавіцы, лье праліўны дождж, і толькі пад раніцу цішэе вецер, супакойваецца навальніца, стомленыя светлыя багі вяртаюцца да сваіх штодзённых клопатаў. Чорныя сілы адступаюць, каб праз год ізноў сысціся з белымі сіламі ў смяротнай бойцы.

1. Чаму нашы продкі адухаўлялі прыроду?
2. Назавіце багоў беларускай міфалогіі. Прыгадайце, чым добрыя багі спрыялі нашым продкам.
3. Якія багі, згодна з міфамі, імкнуліся шкодзіць людзям? Якімі вы іх уяўляеце?
4. Раскажыце, што апавядаюць міфы пра спрадвечную барацьбу паміж светлымі і цёмнымі сіламі. Як нашы продкі спрабавалі ўлагодзіць багоў?

[1] *Мор* — павальная смерць, эпідэмія.



Правообладатель Национальный институт образования

5. Адкуль на зямлі, згодна з міфамі, з'явілася шмат камянёў?

6. Намалюйце аднаго з багоў (на выбар) і падрыхтуйце пра яго вусную замалёўку. Папрасіце вашых сяброў адгадаць, хто ўвасоблены на малюнку.

7. Разгледзьце ілюстрацыю Валерыя Славука, на якой адлюстравана Цёця — багіня лета. Якая яна ва ўяўленні мастака? Што вы ведаеце пра гэту багіню? Звярніце ўвагу на яе аблічча, на прадметы навокал.

8. Якіх багоў (багінь) антычнай міфалогіі вы ведаеце?

9. Прачытайце артыкул «Перуновага племені дзеці», выканайце заданне па тэме.



*В. Славук.* Цёця

## ПРА МІФІЧНЫХ ІСТОТ (ДУХАЎ)

Цудоўны скарб у творчасці народнай
Для нас сабраны мудрымі дзядамі,
Яго адкінуць — значыць, без пашаны
Паставіцца да продкаў працавітых.

*Уладзімір Дубоўка.*

Бліжэй да штодзённага жыцця нашых прашчураў стаялі духі — добрыя і злыя. Гэтымі істотамі быццам была напоўнена ўся навакольная прырода. Людзі лічылі, што фантастычныя істоты насялялі палі, лясы, рэкі, азёры, балоты, яны ўладкоўваліся ў хатах, хлявах, лазнях, абжывалі гарышчы, коміны, туліліся ў хаце пад печчу. На кожную пару года нашы продкі мелі сваіх багоў і духаў.

На палях і лугах валадарыў *Палявік* (Жыцень, Аўсень). Ён клапаціўся пра добры ўраджай на палетках і сенажацях, выганяў з іх шкоднікаў. Жыценя ўяўлялі худзенькім нізенькім дзядком, з кудлатымі валасамі і рэдзенькай бародкай. Ён меў тры вокі (напэўна, каб лепш пільнаваць, як працуюць сяляне), а з твару



Правообладатель Национальный институт образования

быў суровым. Руплівых хлебаробаў Палявік узнагароджваў добрым ураджаем. А для нядбайных гаспадароў прыдумваў рознае пакаранне: напрыклад, набываючы чалавечае аблічча (выглядаў то рослым светлавалосым хлопцам, то нямоглым вусатым старым або жабраком), палохаў, хаваючыся на ўзгорку, ля каменя, куста ці ў канаўцы. Зрабіўшыся страшным ценем, ён са свістам і рыкам гнаўся за ахвярай, заманьваючы яе на санцапёк ці ў нялюднае месца, і там часам закалыхваў да непрытомнасці. Узімку Палявік любіў пажартаваць: заносіў снегам канавы, каб падарожнік, збіўшыся са шляху, праваліўся ў іх.

У лясах гаспадарыў *Лесавік* (Лясун, Пушчавік, Баравік) — вялізны, у рост самых высокіх дрэў у лесе, барадаты стары, у звярыных шкурах на пакрытым поўсцю целе, з белым, як бяроста, тварам. Вушы ў Лесавіка надта вялікія, большыя за галаву, адтапыраныя ў бакі, таму ён часта чапляецца за кустоўе і дрэвы, а потым страшэнна злуецца і шыпіць ад болю. Вочы ў ляснога гаспадара невялікія, свецяцца нават удзень. Рукі доўгія, моцныя, імі ён можа ахапіць зара́з значны кавалак лесу, асабліва калі за некім гоніцца. Ногі ў Лесуна тоўстыя, велічэзныя. Абуваецца ён па-свойму: правы лапаць (ці бот) нацягвае на левую нагу, а левы — на правую. Лесавіку прыслужваюць вятры: калі ён куды-небудзь ідзе — наперадзе і ззаду ў яго равуць вятры, якія ўсё змятаюць на шляху гаспадара. Паваленыя дрэвы, высокія гурбы снегу людзі лічылі справай рук Лесавіка. Ён часам спрыяў людзям, выводзіў з лесу тых, хто заблудзіў, паказваў грыбныя і ягадныя мясціны, наганяў да паляўнічага звяроў і птушак, выбіраў бортнікам месца для ўстаноўкі калод з пчоламі. Разам з тым Лесавік часта здзекаваўся з чалавека, прымушаў яго доўга блукаць на адным месцы, мог пакараць за нядбайныя паводзіны ў лесе. Таму людзі стараліся не гнявіць ляснога гаспадара. Яны ведалі, што, каб падмануць Лесуна, варта апрануць вывернутую світку або кажух, а каб заблытаць свой шлях, трэба прайсці частку адлегласці задам наперад.

Поўнаўладным гаспадаром чалавечага жытла быў *Дамавік* (Хатнік, Падпечнік, Гаспадар). Яго ўяўлялі сівенькім дзядком у



Правообладатель Национальный институт образования

белай кашулі, падпяразанай дзягай ці лыкам, з доўгімі валасамі, доўгай сівой барадой. Лічылася, што ён жыў у хаце (пад печкай ці пад падлогай) або ў хляве, тады яго часам называлі Хлеўнікам. У кожнай хаце нібыта быў свой Дамавік, ён лічыўся заўсёды дбайным гаспадаром, ахоўваў дом, маёмасць, падтрымліваў агонь у печы, клапаціўся пра гаспадарку, карміў і песціў жывёлу, назіраў за хатнімі справамі. Пры апякунстве Дамавіка ў хаце ўсё ішло сваім парадкам. Людзі стараліся задобрыць яго, бо калі ён раззлуецца, то будзе шкодзіць — біць посуд, перастаўляць хатнія рэчы, прынясе разлад у сям'ю, неўраджай на ніву. Дамавік часта дазваляў сабе і пажартаваць: скакаў па лавах у хаце, сенцах, стукаў у сцены, казытаў ці шчыпаў уначы соннага. Аднак ён заўсёды чула ставіўся да гаспадарскай сялібы, папярэджваў сям'ю аб няшчасцях: пачынаў па начах стагнаць, плакаць, завываць, моцна грукаць у дзверы. Разам з тым Дамавік лічыўся надзвычай патрабавальным: за бескарыслівую дапамогу ён вымагаў пашаны і паслухмянасці ад гаспадара і яго сям'і. Дзейнічаў Дамавік звычайна ўночы: падсушваў збожжа, раздаваў сена жывёле, заплятаў коням грывы, ласкава гладзіў іх. Часам Дамавік, як здавалася нашым продкам, мог нават пераўвасабляцца ў вужа, змяю, жабу, ката ці сабаку.

Духі акружалі чалавека паўсюдна. У рэчках, азёрах або вадаёмах, дзе вада ніколі не прамярзае, гаспадарыў *Вадзянік* — стары з доўгай барадой, доўгімі валасамі на галаве ў форме кліна, гладкай бліскучай скурай. Усё цела яго пакрывалі ці то валасы, ці то водарасці, паміж пальцаў — перапонкі, рукі і ногі былі надзвычай доўгімі. Вадзянік мог жыць толькі ў вадзе, на сушы ён гінуў, прычым ад яго цела заставаўся шматок ціны ці водарасцей. Калі ж гэты шматок укінуць у ваду, Вадзянік зноў ажыве і будзе назаўсёды ўдзячны выратавальніку. Вадзянік, раз'язджаючы на соме, ірваў рыбацкія сеткі, раскрываў плаціны на млынах, падпільноўваў тых, хто купаўся, каб у любы момант забраць да сябе. Днём Вадзянік звычайна адпачываў на дне, і толькі як заходзіла сонца, ён пачынаў сваволіць. Злавіўшы ахвяру, ён доўга мучыў яе, цешыўся з яе адчайных спроб выплыць, пакуль яна, зрэшты знясіленая, не апускалася на дно. Дзяўчына-тапельніца станавілася



Правообладатель Национальный институт образования

русалкаю і мусіла аддана служыць свайму гаспадару. Мужчына рабіўся такім жа вадзянікам.

Беларускія міфы расказваюць пра духаў, часцей варожа настроеных да людзей. Духі «засявалі» палі камянямі, адбіралі ў кароў малако, насылалі хваробы і мор на людзей і жывёлу. Усім вядомая казачная *Баба Яга* сустракаецца ў многіх міфах. Гэта злая чараўніца, гаспадыня ўсіх ведзьмаў, страшная, чорная, раскудлачаная, заўсёды вымагала чалавечых ахвяраванняў. Дапамагалі ёй аднавокае *Ліха*, страхалюдны *Карачун*, усім вядомы яшчэ з ранняга дзяцінства *Кашчэй* і заўсёдныя спадарожніцы Ягі — *ліхаманкі*. Гэтых сясцёр-ліхаманак было дванаццаць, вечна галодных, агідных, кашчавых, злосных. Бязлітасныя ліхаманкі шукалі прытулку і спажывы ў чалавечых хатах, прыносілі хваробу.

Пазнаёміўшыся з персанажамі беларускай міфалогіі, вы, напэўна, пераканаліся, што нашы далёкія продкі былі людзьмі надзвычай уражлівымі, з чулай душой, багатай фантазіяй і паэтычным успрыманнем свету. Міфы з'яўляюцца часткай самабытнай беларускай культуры. Непасрэдна са старажытных міфаў узніклі казкі, легенды, народныя песні. Міфы і сёння хвалююць пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, якія выкарыстоўваюць міфалагічныя сюжэты і вобразы ў сваіх творах.

1. Якія з міфалагічных духаў вас найбольш уразілі, зацікавілі? Чаму?
2. Што ўяўлялі сабой духі ў старажытных міфах? Апішыце, паводле міфаў, іх аблічча.
3. Якімі чалавечымі якасцямі былі надзелены духі? Раскажыце пра адносіны міфічных істот да людзей. Хто з духаў быў варожа настроены да іх, а хто, наадварот, спрыяў людзям?
4. Адшукайце (у інтэрнэце, альбомах па мастацтве, энцыклапедыі «Беларускі фальклор») выявы міфічных персанажаў і падрыхтуйце вуснае апавяданне пра аднаго з іх (на выбар).
5. Разгледзьце ілюстрацыю Валерыя Славука, дзе намаляваны Дамавік і яго жонка Дама-



*В. Славук*. Дамавік і Дамавуха



Правообладатель Национальный институт образования

вуха. А якімі ўяўляеце гэтых персанажаў вы: агрэсіўнымі (варожымі) да людзей або добразычлівымі, спагадлівымі? Абгрунтуйце свае меркаванні.

**6.** Разгадайце крыжаванку.

Край беларускі — лясісты і балоцісты. Вось нам і трэба стварыць паэзію лесу, паэзію дрыгвы.

*Максім Багдановіч.*

## Дамавікова ўдзячнасць
### *(Народная легенда)*

Жыў у адной хаце вуж-дамавік. Гаспадар не крыўдзіў яго, гаспадыня, падаіўшы карову, не прамінала пачаставаць цёплым малаком, а дзеці прымалі ў супольныя гульні. І здарылася так, што знайшлі яны, гуляючы, у старой прызбе[1] каля хаты яйкі, якія той вуж склаў, каб выведіся з іх маленькія вужаняткі. Залекацела[2] ад болю вужачае сэрца, калі ён убачыў, што яго немаўляткам бяда пагражае. Кінуўся ён да дзяцей, віўся каля іх рук, імкнучыся адхіліць бяду, і жаласна сіпеў:

— Не крыўдзіце маіх дзетак! Аддайце іх мне!..

Але дзеці не разумелі вужачай мовы ды, каб ён не замінаў ім у гульнях, узялі гольку[3] і прагналі з падворка.

І папоўз, бядуючы, дамавік у пушчу. Паўзе, паўзе і плача над сваім няшчасцем. Ажно бачыць: выпаўзае са спарахнелага пня яго знаёмая — злая, ядавітая змяя.

— Чаго так сумуеш? — пытаецца яна ў вужа.

А той і кажа так і так пра няшчасце сваіх дзетак.

Змяя зларадна ўсміхнулася ды кажа:

— Не плач, я табе зараз памагу.

Не паспеў і азірнуцца вуж, як змяя — шусь на падворак ды ў сялянскую камору. Падпаўзла яна да аднаго гладыша, узнялася над ім, разявіла пашчу і ўпусціла ў яго кроплю атрутнага

---

[1] *Прызба* — земляны невысокі насып уздоўж знадворных сцен хаты.
[2] *Залекацець* — моцна спалохацца; зайсціся ад болю ці жаху.
[3] *Голька* — тут: драўляны пруцік, галінка без лісця.



Правообладатель Национальный институт образования

яду. Потым падпаўзла да другога гладыша, трэцяга, чацвёртага і кожны з іх атруціла. Анямеўшы ад жаху, вуж не толькі не змог выціснуць з сябе слова, але проста аслупянеў на парозе, на змяіныя злачынствы гледзячы. А тая жвава перапаўзла цераз парог на падворак, сыкнула вужу:

— Вось я і адпомсціла за тваіх дзетак! — ды шмыгнула з падворка зноў у пушчу.

Якраз у той час у хаце была гаспадыня і праз шчылінку ў дзвярах да каморы бачыла, што ўчыніла змяя-гадзюка. Зачыніла яна моцна на засаўку камору і пайшла шукаць мужа, каб сказаць яму пра ўбачанае.

Ажно на падворак увайшоў сам гаспадар, заўважыў, чым гуляюць дзеці, ды зараз жа загадаў:

— Асцярожненька збярыце і занясіце ўсе яйкі туды, адкуль іх узялі.

Дзеці паслухмяна сабралі свае незвычайныя забаўкі ды занеслі на прызбу.

— А цяпер закапайце іх у лісце і кастрыцу[1] так, як яны ляжалі раней.

Дзеці зрабілі ўсё так, як ім было сказана. Тады бацька і кажа ім:

— Гэта яйкі нашага вужа. Ён закапаў іх у прызбе на тое, каб праз некалькі дзён з кожнага яечка вылупілася маленькае вужанятка. Вось таму і нельга чапаць іх, нельга крыўдзіць вужа.

Вуж жа, убачыўшы, што яго яйкі ўратаваныя, адразу кінуўся да каморы. Але дзверы былі моцна зачынены. Ён, знайшоўшы мышыную норку, праціснуўся праз яе ў камору і пачаў выварочваць гладышы з атручаным малаком. Вывернуў адзін, вывернуў другі, трэці, а калі падпаўзаў да чацвёртага, дзверы раптам адчыніліся, і на парозе каморы паявіліся гаспадар з дзецьмі. Вуж нават і не заўважыў, як пільна і з якой удзячнасцю глядзела на яго ўся сям’я.

---

[1] *Кастры́ца* — адходы лёну і канапель, якія атрымліваюцца пасля іх перапрацоўкі; тут: іголкі хваёвых дрэў.



Правообладатель Национальный институт образования



І нездарма ж па сёлах, што параскіданыя вакол Белавежскай і Лядскай пушчаў, людзі кажуць: і самы люты звер за дабро дабром дзякуе.

1. Як жылося вужу-дамавіку ў сялянскай сям'і? Што можна сказаць пра адносіны да яго гаспадароў і іх дзяцей?
2. Прыгадайце, што за бяда раптам абрынулася на вужа. Якім чынам вуж спрабаваў яе пераадолець?
3. Чаму, на вашу думку, ядавітая змяя вырашыла так жорстка расправіцца з сялянскай сям'ёй?
4. Апішыце і ахарактарызуйце паводзіны вужа ў сялянскай каморы. Як успрынялі яго дзеянні гаспадары?
5. Падзяліце твор на часткі, падбярыце да іх адпаведныя загалоўкі-цытаты. Які сэнс заключаны ў апошніх радках легенды?
6. У творы акцэнтуецца ўвага на слове *дабрыня*. Растлумачце значэнне гэтага слова і падбярыце да яго сінонімы.
7. Падбярыце прыказку, сугучную са зместам твора, і падрыхтуйце паводле яе невялікую вусную замалёўку.
8. Выканайце тэставае заданне да легенды «Дамавікова ўдзячнасць».



Правообладатель Национальный институт образования



# Ян БАРШЧЭЎСКІ

Край мой, дзе горы паўсталі ўзнёсла,
Край сініх вод, чаратамі зарослых,
Пушчаў, дзе ў голлі хаваецца сонца,
Колькі прыгадак ты будзіш штодзённа,
Ў промнях вясновых, у барвах зялёных
Ты мне з'яўляешся казкай бясконцай...

*Ян Баршчэўскі.*

Ян Баршчэўскі (каля 1780[1]—1851) — беларускі і польскі пісьменнік. Нарадзіўся ў сям'і дробных шляхціцаў у вёсцы Мурагі Расонскага раёна Віцебскай вобласці. З дзяцінства чуў безліч фантастычных аповедаў пра даўнія часы і падзеі і з таго часу вельмі захапіўся беларускай гісторыяй і міфалогіяй, шмат чытаў.

Штогод вясной і летам Ян Баршчэўскі пешшу падарожнічаў па Беларусі, гутарыў з людзьмі, збіраў фальклор, маляваў пейзажы. Вандроўкі па родных мясцінах давалі пісьменніку жыццёвы досвед і натхненне.

Мастак слова зазначаў: «Сярод беларускага люду захоўваюцца яшчэ і цяпер асобныя паданні даўніх часоў, якія, пераходзячы ад чалавека да чалавека, зрабіліся такія ж цьмяныя, як і міфалогія старажытных народаў».

«Шляхціц Завальня» — зборнік апавяданняў, заснаваных на легендах роднага краю, дзе рэальнае пераплятаецца з выдуманым, фантастычным. У аснове гэтага твора — аповеды падарожнікаў, што часта спыняліся ў доме шляхціца Завальні, які быў гасцінным гаспадаром і надзвычай любіў слухаць незвычайныя гісторыі.

---

[1] Дагэтуль няма пэўнасці з датай нараджэння пісьменніка, разбежнасць дат ахоплівае час ад 1780 да 1796 года.



Правообладатель Национальный институт образования

## Вужыная карона

У маіх паноў быў лоўчы, зваўся Сямён; дом яго стаяў недалёка ад маёнтка, паншчыны ён не служыў, а ўвесь яго абавязак быў — вартаваць лес, хадзіць на паляванне з панам ды прыносіць дзічыну, калі, чакаючы гасцей або перад якім святам, накажуць з маёнтка.

Аднаго дня прыходзіць да яго аканом[1] і крычыць, стукаючы ў акно:

— Сямён, пан казаў, каб ты, што б там ні было, прынёс да нядзелі пару глушцоў, дзве пары цецерукоў і колькі курапатак. Дык не лянуйся, бяры стрэльбу, майго выжла[2] і ідзі на ловы.

Заспяшаўся Сямён, бо была ўжо серада. Бярэ стрэльбу, зайшоў у маёнтак і з выжлам ідзе блукаць па лесе. У нешчаслівы час выйшаў на паляванне: хадзіў дзень навылёт, а бачыў толькі дзятлаў, што дзяўблі сабе на сухіх хваінах. Начаваў у лесе, замерз, бо была ўжо восень. На другі дзень ад узыходу сонца туляўся па пушчы. Але дарма: нават здалёку не бачыў тых птушак, якіх шукаў, толькі вецер шумеў у дрэвах. Згаладалы сабака ўцёк да свайго гаспадара, і Сямён, змардаваны, хмурны, вяртаўся дадому, не ведаючы, што рабіць.

Сеў ён на калоду і думае сам сабе: «Кепска будзе: пан не дасць веры, што я надзвычай шчыраваў; пэўна, западозрыць мяне ў гультайстве; пакланіўся б і нячысціку, абы толькі паспрыяў мне сёння».

Ледзь гэтак падумаў — выбег аднекуль велізарны чорны сабака, сеў перад лоўчым і страшнымі вачыма ўтаропіўся на чалавека. Сямён кліча яго да сябе, але сабака не рушыць з месца, а толькі глядзіць, як шалёны; ахінуў лоўчага неспакой, і дрыжыкі пабеглі па целе. І тут бачыць: выходзіць з гушчару пажылы чалавек, валасы зблытаныя ў каўтун, бровы густыя, змарнелы, як быццам ад сонца і ветру, твар, вопратка да пят. Сядае на пень ля паляўнічага і гаворыць такія словы:

---

[1] *Акано́м* — кіраўнік гаспадаркі ў панскім маёнтку.
[2] *Вы́жал* — гончы сабака.



Правообладатель Национальный институт образования

— Бачу, што торба твая пустая і твар хмурны: пэўна, паляванне няўдалае.

— Хадзіў два дні па лесе, змарыўся сам, і сабака, згаладаўшыся, уцёк ад мяне; не ўдалося аніводнага разу стрэліць. Дзе ж падзелася птаства? Загадалі мне да нядзелі прынесці дзічыны, ды адкуль яе ўзяць? Бяда будзе!

— Не журыся, — кажа незнаёмы, — паслухай мае рады. Я дапамагу табе. Заўтра 14 верасня[1], дык увечары ідзі на Ласіную гару, на цэлую ноч будзе табе дарогі, бо сам ведаеш, што гэтая гара адсюль няблізка; стаіць яна сярод цёмных лясоў; падыдзеш да яе акурат на світанні і ўбачыш, што схілы яе пакрытыя вужамі; не палохайся, яны чапаць цябе не будуць; між іх сустрэнеш Вужынага Караля. Пасцялі перад ім белую хустку, укленч і пакланіся; ён кіне табе на хустку сваю Залатую Карону і з грамадою сваіх вужоў пойдзе ў зімовыя сховы. Слухай яшчэ, дам табе перасцярогу: ідучы ўначы на Ласіную гару, не палохайся нічога і нічому не дзівіся, інакш дарэмны будзе твой клопат.

Калі будзеш мець у сябе Вужыную Карону, дык гэты чорны сабака, які цяпер перад табою, заўсёды, як толькі пойдзеш на ловы, стрэне цябе і павядзе па лясных сцежках, і кожны раз настраляеш дзічыны столькі, колькі захочаш. Але ніколі не палохайся нічога і не дзівіся нічому, бо калі пахіснешся сэрцам або духам — будзеш нешчаслівы; не пускай у душу такія пачуцці.

Сказаўшы гэта, ён схаваўся ў гушчары, і сабака пайшоў за ім.

Сямён правёў поглядам незнаёмага, пастаяў задумаўшыся, пайшоў дахаты, узяў белую хустку і са стрэльбаю за плячыма скіраваў да Ласінае гары. Калі зайшоў у дзікую пушчу, дык ужо змяркалася, цямней і цямней рабілася сярод густых хвояў і ялін. А ён далей і далей ідзе ў глыб лесу. Усё вечарэла і вечарэла. Вось ужо і ноч. Глянуў угору — ледзь некалькі зорак на небе ўбачыў

[1] На 27 (14) верасня прыпадала свята Узвіжанне. Паводле народнага павер'я, у гэты дзень усе змеі хаваліся па норах, папярэдне збіраючыся ў адно месца, а наперадзе іх рухаўся змяіны цар. Змяіны яд у такую пару лічыўся смертаносным, таму ў гэты дзень сяляне пазбягалі наведваць лес.



Правообладатель Национальный институт образования

праз галіны. Адзін ён з людзей быў у той час у лясной пустэчы, вакол чуў толькі крыкі соў і пугачоў ды ў гушчары тупат перапалоханага звера. Не першы раз выпала яму блукаць уначы па лесе. І дарога гэтая не страшыла яго.

Апоўначы лютыя пачвары[1] акружылі лоўчага. Бачыць, як набліжаецца велізарны мядзведзь на задніх лапах, рыкае і хоча напасці; зграя ваўкоў, натапырыўшыся і свецячы вачыма, пагражае крывавымі пашчамі. Сямён адважна ідзе наперад. Заступіў яму дарогу вышэйшы за лес Волат, які вырваў хваіну і гразіўся, нібы пярун. Аднак лоўчы смела мінае ўсё гэта.

Месячык паказаўся з-за воблака. Здаецца Сямёну, што выходзіць ён з лесу і бачыць удалечыні палац, які свеціцца золатам і срэбрам; падыходзіць да той пекнай пабудовы праз чароўны сад, дзе як быццам вясна і лета сышліся разам: найпрыгажэйшыя кветкі і найвыдатнейшая даспявае садавіна. Зязюля сумным голасам абзывалася на дрэве; зацёхкаў салавей у хмызняку; чуваць дзіўныя галасы драздоў і шпакоў, і разумее Сямён іх вясёлыя спевы. Спаткалі яго дзяўчаты з вянкамі на галовах, танцуючы, вабілі да сябе. Ён мінуў усе гэтыя цуды, не здзіўляючыся і не зважаючы на іх.

Зніклі чароўныя здані; падзьмуў восеньскі вецер; і Сямён убачыў на ўсходзе чырвонае неба. Хутка ўзыдзе сонца — спяшае ён да Ласінае гары.

Калі прыйшоў на прызначанае месца, убачыў чараду вужоў. Яны, сыкаючы, саступалі з ягонае дарогі. А ўжо і сонца падымаецца. Страчае Сямён такога велізарнага вужа, якога ніколі не бачыў. Той смела паўзе, а на ягонай галаве зіхаціць золата. Сямён раскінуў белую хустку перад ім і ўкленчыў[2]. Вуж упусціў з галавы Карону на хустку і папоўз далей, а за ім і іншыя вужы хутка схаваліся за гарою. З радасцю разглядаў Сямён залаты скарб, падобны на два бліскучыя лісцікі, што канцамі зрасліся між сабою.

---

[1] *Пачва́ра* — казачная страшная істота.
[2] *Укле́нчыць* — стаць на калені.



Правообладатель Национальный институт образования

Ледзь пакінуў гару, як яго сустракае велізарны чорны сабака, які ўчора пабег за незнаёмым; пазірае ў вочы і, здаецца, кажа, каб ішоў за ім. Ідзе лоўчы за сабакам. Той спыняецца і позіркам паказвае на дрэве глушцоў. Разоў колькі стрэліў ён у тым месцы і колькі штук забіў. Ужо нёс дадому глушцоў, цецерукоў і курапатак, а як падышоў бліжэй да хаты, сабака застаўся стаяць на полі: глядзеў услед паляўнічаму, а пасля знік з вачэй.

Паны хвалілі лоўчага, яго спрыт на паляванні, а чэлядзь[1] і аканом дзівіліся з яго шчасця, з таго, як ён, не маючы сабакі, столькі змог упаляваць дзічыны.

З таго часу Сямён стаў найслаўнейшым паляўнічым. Той чорны сабака кожны раз сустракаў яго ў лесе, і Сямён столькі біў рознай дзічыны, што не толькі хапала панам у маёнтку, але і сялянам на продаж.

Па ўсёй ваколіцы разнеслася пагалоска, што Сямён — чараўнік, быццам некаторыя секлі дровы ў лесе ды бачылі, што ходзіць з ім нейкі чорны сабака, які ў лесе і застаецца. Акім, што некалі сябраваў з лоўчым, раз ціха падышоў пад акно ягонае хаты, каб даведацца, што той робіць; пачуў, нібыта з кімсьці размаўляе; зірнуў у акно: Сямён гладзіць чорнага сабаку, таго самага, што заўсёды сустракаў яго ў лесе. Сабака глянуў у акно крывавым вокам і знік, а Акім уцёк ад страху.

Ужо колькі гадоў уся воласць гаворыць, што Сямёну дапамагае на ловах сам нячысцік, якога трымае ён за памочніка, але паны адно смяяліся з гэтага і не давалі веры. Хоць пан быў неяк з лоўчым на паляванні, не бачыў чорнага сабаку, аднак змеціў, што дзікае птаства само ляціць да Сямёна і той ніколькі не схібіў.

Жыла ў вёсцы непадалёку Марыся, прыгожая і маладая дзяўчына, дачка набожных бацькоў. Шмат каму яна падабалася, і Сямён меў на яе вока; спадзеючыся на багацце ды на панскую ласку, меў надзею, што Марыся будзе ягонай.

Аднаго дня, калі ішоў на паляванне, убачыў ён Марысю. Тая мела вянок на галаве, і кветкі так ёй пасавалі, што выглядала яна надзвычай прыгожаю. Ходзячы непадалёку ад сваёй нівы,

---

[1] *Чэ́лядзь* — тут: дваровыя людзі, слугі памешчыка.



Правообладатель Национальный институт образования

збірала суніцы. Падыходзіць Сямён, просіць ягад; не адмаўляе яму дзяўчына; пытае лоўчы, ці падабаецца ён Марысі.

— Людзі кажуць, што ты чаруеш, — адказала тая, — а я баюся чараўнікоў.

— О, не, Марысю, нікога не чараваў і не ведаю гэтага ганебства.

— Калі праўду кажаш, — я крыжык нашу на шыі, пасвянцоны ў касцёле, які можа грахі адпускаць, — пацалуй мой крыжык.

— З ахвотаю, — адказаў Сямён.

І ледзь пацалаваў крыжык, як тут з травы падняў галаву велізарны вуж, нібыта хацеў зірнуць на Марысю. Перапалоханая дзяўчына закрычала. Сямён схапіў камень і выцяў[1] вужа. Той, сыкаючы, схаваўся ў траве. А пасля раптам з'явіўся чорны сабака, загаўкаў і знік. Марыся ад страху дрыжыць ледзь жывая. Сямён правёў яе дадому і адтуль зноў ідзе на паляванне. Толькі ўжо не сустрэў яго ў лесе чорны сабака.

Убачыў цецерука; стрэліў, але замест птушкі — пень гнілы ўпаў на зямлю. Спалохаўся Сямён, вяртаецца дахаты, аж там безліч вужоў, сыкаючы, паўзуць пад лаву і пад печ. Адчыніў скрыню, выняў Вужыную Карону, а яна ўжо не залатая: два пажоўклыя бярозавыя лісточкі. Стаіць як слуп і не ведае, што чыніць.

Доўга яшчэ дакучалі вужы небараку Сямёну. Не давалі спакою не толькі дома, але і на гасцінах. Калі завітваў да суседзяў, не раз, не баючыся людзей, з'яўляўся перад ім немаведама адкуль вуж.

*Пераклад Міколы Хаўстовіча.*

1. Прыгадайце эпізоды ў творы, што падаліся вам фантастычнымі.
2. Якім быў панскі лоўчы Сямён па характары? Раскажыце пра яго стаўленне да сваіх абавязкаў.
3. Чаму паляўнічаму не ўдалося выканаць даручэнне панскага аканома?
4. Як Сямён трапіў у залежнасць ад нячысціка?

[1] *Выцяць* — стукнуць, ударыць.



Правообладатель Национальный институт образования

5. Перачытайце апісанне ночы на Ласінай гары перад святам Узвіжання. Што прыйшлося там перажыць Сямёну? Як ён атрымаў Вужыную Карону?
6. Раскажыце пра змены ў жыцці лоўчага пасля сустрэчы з Вужыным Каралём. Ці стаў Сямён шчаслівейшым ад дапамогі нячысціка?
7. Прыгадайце, як паляўнічаму ўдалося вызваліцца ад палону чорных сіл.
8. Паразважайце, якім чынам чалавек можа пераадолець неспрыяльныя жыццёвыя абставіны.
9. Прачытайце артыкул «Мурагі», выканайце заданні па тэме.
10. Пастаўце цытаты ў адпаведнасці са зместам твора.



# Максім БАГДАНОВІЧ

Край паэм,
адвечных песень-казак —
дарагая сэрцу
Беларусь…

*Паўлюк Трус.*

Максім Багдановіч нарадзіўся 9 снежня 1891 года ў Мінску. Яго бацька Адам Ягоравіч — беларускі фалькларыст і этнограф, маці Марыя Апанасаўна — настаўніца. Раннія гады жыцця Максіма прайшлі ў Гродне, дзе ён спазнаў вялікае гора — смерць маці. Пасля гэтага сям'я Багдановічаў пераехала ў Ніжні Ноўгарад (Расія), дзе Максім паступіў у першы клас гімназіі. Хлопчык рос удумлівым, сціплым, не па гадах сур'ёзным. У школьныя гады шмат чытаў. Вельмі любіў паэзію, музыку, народныя песні і казкі. Кнігі браў з бацькавай бібліятэкі. Па сведчанні бацькі, паэтычныя здольнасці Максіма праявіліся рана. Вершы ён стаў



Правообладатель Национальный институт образования

пісаць з дзесяці гадоў. У 1913 годзе выйшаў з друку адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў паэта — «Вянок».

Даследчык творчасці паэта Алег Лойка назваў Максіма Багдановіча «песняром красы, святла, высокай духоўнасці, душэўнай ласкі, спагаднасці, веры і любові...».

Жыццё Максіма Багдановіча абарвалася 25 мая 1917 года далёка ад Беларусі. Пахаваны наш славуты паэт у Ялце (Крым).

Верш «Вадзянік» уваходзіць у паэтычны цыкл «У зачараваным царстве», змешчаны ў зборніку вершаў «Вянок».

## Вадзянік

Сівавусы, згорблены, я залёг між цінай
І гадамі грэюся — сплю на дне ракі.
Твар травой аблытаны, быццам павуцінай,
Засыпаюць грудзі мне жоўтыя пяскі.

Над вадой ля берага ціха спіць асока,
Ды лаза зялёная жаліцца-шуміць,
Хвалі ціха коцяцца і бягуць далёка, —
І ўсё навокала сном адвечным спіць.

1. Што, на вашу думку, магло абудзіць фантазію паэта і паўплываць на стварэнне верша пра міфічную істоту?
2. Чаму нашы продкі верылі ў існаванне істот, якія жылі ў вадаёмах (рэках, азёрах, балотах)? Чаму людзі баяліся іх?
3. Вызначце настрой верша (словы для даведкі: *самотны, задуменны, засяроджаны, сумны, разважлівы, роспачны, стоены*).
4. Якое аблічча мае Вадзянік? Зачытайце радкі з яго апісаннем. Як тропы — эпітэты, параўнанне, метафары — дапамагаюць стварыць гэты вобраз?
5. Апішыце месца, дзе жыве ўяўны гаспадар ракі. Якія ўласцівасці набываюць у вершы *асака, лаза* і *хвалі*?
6. Падбярыце ў інтэрнэце малюнкі з выявай Вадзяніка, што адпавядаюць створанаму паэтам вобразу, або намалюйце яго паводле свайго ўяўлення.
7. Падрыхтуйце невялікую вусную замалёўку (або казку, незвычайную гісторыю) пра Вадзяніка.



Правообладатель Национальный институт образования



# Казімір КАМЕЙША

Усё пакінуць след павінна,
Бо, як пачаўся белы свет,
Прамень, пясчынка і расіна
Нязменна пакідаюць след.

*Пятрусь Броўка.*

Казімір Вікенцьевіч Камейша нарадзіўся ў 1943 годзе ў вёсцы Малыя Навікі Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. З асаблівай цеплынёй згадваючы сваё маленства, маляўнічыя лясныя мясціны Занямоння, бацькоўскі дом, паэт адзначаў, што напоўніцу «спазнаў матчыну ласку і цяпло, там засталіся сны дзяцінства».

Казімір Камейша ўпершыню надрукаваў свае вершы ў васямнаццаць гадоў. Яго паэтычная спадчына багатая і разнастайная. На яго рахунку шмат кніг паэзіі, ён адзін з аўтараў фотаальбома «Непаўторныя імгненні».

У зборніку выбранай паэзіі «Я з пушчы...» паэт заўважае, што ўсе яго жыццёвыя пуцявіны вядуць у лясны край — Налібокі. Нездарма паэт Мікола Маляўка адзначае: «Казімір Камейша мне бачыцца ганаровым грамадзянінам Налібоцкага краю. У яго, слыннага майго земляка, пільны зрок, чуйны слых, уражлівая душа. І, вядома ж, талент ад Бога. Усё, напісанае ім для дарослых і дзяцей, засведчана сэрцам».

Паэт плённа працуе на ніве дзіцячай літаратуры (кнігі «Гаёўка», «Буслянка», «Добры дзень, шафёр», «Крыгагром», «Духмянае дзіва», «Дзятлава кухня» і інш.).

Казімір Камейша вядомы і як перакладчык, і як аўтар лірычных мініяцюр, артыкулаў пра творчасць беларускіх пісьменнікаў. Асобныя яго вершы пакладзены на музыку.



Правообладатель Национальный институт образования

Што вы ведаеце пра ледавікі?

## Камень ля вёскі Камень

Гэта не камень,
а чаравік.
А хто забыў яго?
Сам ледавік.
Гэта ж ён пеша
тупаў здалёк,
Сляды-каменні
здалёк
валок.
І раптам ён чуе
спеў салаўя.
Пусціўся у скокі:
— Ух, я!..
Ён так чаравікам сваім
грымеў,
Аж прарок Ілья
ў калясніцы нямеў.
Там, дзе скакаў ён,
прыблуднік той,
Засталіся крушні[1]
ляжаць гарой.
Стаміўся нарэшце:
— Ох ды ох!..
І ўслед ляцела:
— Каб ты каменем лёг!
Ён пачуў тыя словы.
І не лёг, а прысеў
На пушчанскай
вузенькай паласе.

[1] *Кру́шня* — куча (гара) камення.



Правообладатель Национальный институт образования

Расшчапіў на шыі
каменны аплік[1],
Зняў каменнай рукою
валун-чаравік.
І забыў пра яго,
не вяртаўся назад —
Было цяжару
і так зашмат.
Ішоў заваёўнік
дарогаю той,
Спыніў чаравік яго:
— Ты хто?
Спыніўся прыблуда,
потым прысеў
На пушчанскай
вузенькай паласе.
...Знік ледавік,
заваёўнік знік.
Засталіся сляды
і яшчэ — чаравік.

1. Як выглядае магутны ледавік паводле паэтычнага апісання? Зачытайце адпаведныя радкі з верша.
2. Што гаворыць паэт пра з'яўленне, паходжанне вялікага валуна-чаравіка каля вёскі Камень?
3. Паспрабуйце ўявіць ледавік як агромністага волата-асілка, які *зняў каменнай рукою чаравік*. Намалюйце гэтага незвычайнага персанажа або прыдумайце казачную гісторыю «Як Асілак-валун ворагаў на нашай зямлі запыніў».
4. Камяні называюць самымі старажытнымі сведкамі гісторыі. Пра што яны маглі б расказаць нам, калі б умелі гаварыць?
5. Разгледзьце і прааналізуйце рэпрадукцыю карціны Эдуарда Рымаровіча «Камяні». Прачытайце радкі верша, якія, на вашу думку, сугучныя з мастацкім палатном. Якую іншую назву вы прапанавалі б для гэтай карціны?

[1] *Аплі́к* — кручок для зашпільвання адзення.



Правообладатель Национальный институт образования



*Э. Рымаровіч*. Камяні

6. Падбярыце фразеалагізмы са словам *камень*, растлумачце іх значэнне.
7. Прыдумайце ўласную гісторыю пра камень-валун, ужываючы абраныя вобразныя выслоўі.
8. Наладзьце экскурсію (звычайную або завочную) у Музей валуноў у Мінску і падзяліцеся сваімі ўражаннямі.
9. Прачытайце артыкул «Музей валуноў» і адкажыце на пытанне да яго.

# Якуб КОЛАС



Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я...

*Якуб Колас.*

Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) — народны паэт Беларусі, адзін з заснавальнікаў нацыянальнай мастацкай прозы і беларускай літаратурнай мовы, выдатны педагог, вучоны, грамадскі дзеяч. Нарадзіўся 3 лістапада 1882 года ў вёсцы Акінчыцы (цяпер у межах г. Стоўбцы) Мінскай вобласці ў сям'і лесніка.



Правообладатель Национальный институт образования

Дзяцінства будучага пісьменніка прайшло ў лясной глушы на Нёмане. Уражлівая душа хлопчыка адгукалася на таямнічыя і незвычайныя гісторыі, пачутыя ад сваякоў і вяскоўцаў. Аднойчы цясляр, што дапамагаў бацькам у Альбуці ставіць новую леснічоўку, расказваў хлопчыку легенду пра чароўную папараць-кветку, пялёстак якой выпадкова дастаўся парабку Ясю. Кастусь перабіў аповед цесляра: «Калі б я знайшоў той пялёстак, дык папрасіў бы кніг... Яшчэ хацеў бы навучыцца разумець, аб чым пяюць птушкі, думаюць звяры, шэпчуцца дрэвы і краскі».

Пра свае першыя літаратурныя спробы Якуб Колас успамінаў: «У Альбуці, калі мне было 12 гадоў, я пачаў спрабаваць і свае літаратурныя сілы. Памятаю, прачытаў бацьку свой верш "Вясна". Ён праслухаў уважліва, потым запытаў, ці праўда, што гэта напісаў я, і даў рубель гасцінца».

Якуб Колас пачаў займацца літаратурнай творчасцю яшчэ падчас вучобы ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Любоў да роднага краю, захапленне яго маляўнічай прыродай, спачуванне простым беларусам, нястомная самаахвярная праца, самаадукацыя і прыродныя здольнасці дапамаглі Якубу Коласу стаць таленавітым і славутым пісьменнікам, стваральнікам неўміручых паэтычных шэдэўраў — паэм «Новая зямля» і «Сымон-музыка», шматлікіх вершаваных і празаічных твораў.

Імя народнага песняра з любоўю ўшаноўвае беларускі народ, яно прысвоена многім культурным і асветніцкім установам нашай краіны і вядома далёка за межамі Беларусі. 13 жніўня 1956 года не стала славутага паэта. Якуб Колас пахаваны ў Мінску на Вайсковых могілках.

Значнае месца ў творчай спадчыне пісьменніка займае зборнік «Казкі жыцця» — цыкл алегарычных (іншасказальных) апавяданняў. Казка «Жывая вада» была ўпершыню надрукавана ў 1907 годзе ў газеце «Наша ніва».

1. Якія творы Якуба Коласа вы чыталі? Падзяліцеся ўражаннямі.
2. Што такое *жывая вада* ў народных казках? Прыгадайце вядомыя вам казкі, дзе героі карыстаюцца *жывой вадой*.



Правообладатель Национальный институт образования

## Жывая вада

### I

Даўно-даўно, не за нашу памяць было гэта.

Шчаслівы то быў куточак белага свету.

Вольна жылося людзям у той краіне. Ніхто іх не гнаў, ніхто іх не крыўдзіў, нікому яны не належалі. Багатая, урадлівая была іх зямля. Шырока раскінуліся іх палі, зялёныя травы сенажацей калыхаліся на ветры. Ціха і весела смяяліся кветкі, пазіраючы сваімі пахучымі галоўкамі ў раку, якая паіла ўвесь той кут і тых, хто жыў і рос там, і давала яму жыццё. Усё жыло каля ракі, гэту раку людзі называлі Жывою Вадою. Усё жывое і нежывое любіла яе, і песні волі разліваліся па ўсіх кутках шчаслівай старонкі.

Але нядоўга астаецца шчасце на адным месцы. Пакінула яно і той слаўны куточак.

Нешта страшнае і незразумелае для чалавека зрабілася там. Нейкая сіла пазайздросціла шчасцю людзей.

У тым месцы, адкуль выцякала Жывая Вада, зямля стала ўспучвацца. Хутка, як грыб, вырастала гара. А Жывая Вада пачала павольна мялець і хутка зусім згінула дзесьці ў зямлі. Толькі след, дзе цякла яна, надоўга астаўся на зямлі і гаварыў людзям пра даўнейшае жыццё.

Гара ўсё расла. Праходзіў час, пусцела зямля, з гары сыпаўся жоўты пясок і засцілаў ураджайны грунт. Людзі збяднелі, птушкі разляцеліся. Не чутно ўжо было там вясёлых песень. Толькі арлы ды каршуны вілі свае гнёзды на высокай гары, што ўсмактала ў сябе Жывую Ваду.

### II

Бяднеў год ад году колісь багаты край. Ураджайны грунт засыпаўся пяском. Многа працавалі людзі, многа пралівалі поту, а праца іх прападала, і скупа плаціла зямля за іх работу і пакуту. Развяліся чэрві на іх агародах — некаму было зніштажаць іх, бо каршуны і ястрабы разагналі птушак.

Расказваў бацька сыну пра даўнейшае жыццё — пра багацце іх краю, пра гару, якая глынула іх Жывую Ваду, сама стала



Правообладатель Национальный институт образования

расці, а жыццё ўсяго краю прысудзіла да маруднай смерці. Глухая злосць на праклятую гару падымалася ў сэрцы людзей, бо памяць аб Жывой Вадзе не забывалася.

Нямала знаходзілася смелых людзей, якія ішлі на гару шукаць Жывой Вады. Бралі яны рыдлёўкі, акопвалі гару. Але з гары сыпаліся на іх камяні, разбівалі ім галовы. Каршуны і ястрабы зляталіся хмарамі, выдзёўбвалі ім вочы. А пугач і сава ўночы спявалі ім «вечны спакой» сваім жудасным крыкам.

Многа, многа людскіх касцей валялася навокал гары, а каршуны і крумкачы разносілі іх па ўсіх кутках спустошанага краю. І людзі празвалі сваю старонку Мёртвым Полем.

Дзіка і пуста стала ў Мёртвым Полі. Людзі хадзілі, як цені, галодныя, прыгнечаныя. Птушкі даўно перасталі там спяваць песні. Толькі каршуны кружыліся ў небе, каркалі крумкачы і наганялі нуду на душу людзей, невядомымі страхамі палохалі сэрца, розум.

Нават лес змяніўся: старыя дрэвы даўно згнілі і ляжалі ў зямлі, а новыя былі нізкія, крывыя, няўдалыя, — як сухотныя. Рэдка заглядалі туды хмары, і мала калі падаў дождж.

### III

Насталі сухія гады. Апошні выдаўся такі год, што ні разу не падаў дождж за ўсё лета. Кожны дзень неба аставалася чыстым, ясным, гарачым. Усходзіла сонца, хутка сушыла расу, што блішчала ранкам, як слёзы на лісцях расліны. А сухі вецер гуляў над зямлёю, падымаў гарачы пясок, высмоктваў апошнія сокі з зямлі. Лес, поле, луг з гаротнаю мальбою пазіралі на неба, прасілі вады прагнаць сваю смагу. Дрэвы глуха шумелі і злівалі свой шум у адну доўгую, невядомую людзям песню. Жаласнаківаліся каласы ў полі, то кланяліся зямлі, то падымаліся да неба, нібы просячы ратунку.

Ніхто не ішоў ім на дапамогу, і яны без пары старэлі, жоўклі і без жыцця хісталіся на сухіх сцяблінках. Трава і кветкі ціхутка шапталі ветру аб сваёй нядолі. Цярплівыя камяні і тыя нылі ад спёкі і лопаліся. Сама зямля зморшчылася, як старушка, пака-



Правообладатель Национальный институт образования

лолася і плакала. Яе слёзы апошнімі кропелькамі расы выступалі наверх, яе просьба белаватым туманам звісала над лесам і разносілася вятрамі па свеце. Пакутавалі людзі, сумавала зямля і ўсё, што расло і жыло на ёй. Неўзаметку падымаліся к небу іх слёзы, падымаліся не год і не два, а цэлыя вякі, а там недзе сплываліся ў адно месца. Тыя слёзы, горкія скаргі, усё гора зямлі — змяшаліся разам і завіслі над ёю страшнаю чорнаю хмараю.

## IV

А дзе ж дзелася Жывая Вада?

Яна была пад зямлёю, яна паціхеньку размывала зямлю, прабівала сабе дарогу на вольны свет. Ніхто гэтага не ведаў. Не ведала і гара, што вісела над бяздонніцаю. А Жывая Вада чакала толькі шчаслівага здарэння, каб скінуць з сябе цяжар — праклятую гару, што са шчаслівага кутка зрабіла Мёртвае Поле.

І настаў такі час, што пралітыя слёзы перапоўнілі неба і паліліся назад на зямлю. Не ў сілах было само неба стрымаць тыя слёзы. Самі яны рваліся туды, дзе радзіліся, патроху падымаліся ўгору.

Людская жалоба, гора, пакута, усё няшчасце зямлі, што збіраліся тысячамі гадоў, паліліся цяпер са слязьмі адной хваляй.

Адвечная скарга грымела ў небе страшным голасам грому і калыхала ўсю зямлю; стогны людскія, якіх ніхто не чуў, бліскалі маланкамі, а слёзы цяклі халоднымі, чыстымі ручаямі на зямлю і ажыўлялі яе. Вада збіралася ў адну раку і дружна стала напіраць на гару.

Зрушылася гара; моц яе, камяні, градам сыпаліся ўніз. Арлы, каршуны, крумкачы, ястрабы, совы пазляталі з гары, каб запыніць ваду.

Пачула і Жывая Вада, што робіцца над ёю. Сабрала яна ўсе сілы свае і ўскалыхнула гару, як купіну. Яе падхапіла дажджавая рака. Страшны шум пайшоў па Мёртвым Полі.

Усё жывое дрыжала ад страху і чакала пагібелі. Але згінула адна гара. Пяском і дымам развеялася яна па полі.

Гневалася неба, бушавала вада, трэслася зямля. Ліліся рэчкі на кожнай разоры і зліваліся з Жывой Вадою.



Правообладатель Национальный институт образования

Прайшоў страшны момант, і стала спакойна. Вада ўся злілася ў старое дно Жывой Вады, і жыццё, затрыманае праз доўгі час гарою, ізноў пайшло сваёю дарогаю, і ажыло Мёртвае Поле.

1. Якім паказаны ў творы *шчаслівы куточак белага свету*? Апішыце жыццё людзей у ім. Чым была для жыхароў краю рака Жывая Вада?
2. Што стала з тым слаўным краем, калі яго напаткала бяда? Падмацуйце свой адказ адпаведнымі радкамі з тэксту.
3. Раскажыце, як людзі спрабавалі выратавацца ад галоднай смерці. Што чакала іх на гэтым шляху?
4. Чаму жыхары назвалі сваю старонку Мёртвым Полем?
5. Прыгадайце, як ажыло Мёртвае Поле. Якія прыродныя сілы гэтаму дапамаглі? Вызначце кульмінацыйны момант у казцы.
6. У чым, на вашу думку, заключаецца алегарычны сэнс твора?
7. Падбярыце назвы да кожнай часткі гэтай літаратурнай казкі, падрыхтуйце сціслы пераказ твора.

**!** Казка «Жывая Вада» — твор алегарычны.

***Алегорыя*** — іншасказанне; мастацкі прыём, калі ідэя, думка, рыса характару раскрываюцца праз паводзіны жывёл, асаблівасці раслін, з'яў ці прадметаў.

Алегорыя дапамагае аўтару адлюстраваць самыя розныя падзеі, выказаць пэўныя думкі і нават пачуцці. Жывая Вада ў казцы — гэта алегарычны вобраз Беларусі, гісторыя жыцця грамадства.

У фальклоры і байках ёсць алегарычныя вобразы жывёл, птушак, прадметаў, якія выступаюць носьбітамі пэўных чалавечых рыс: баран — увасабленне тупасці, ліса — хітрасці, свіння — неахайнасці, конь — працавітасці, заяц — баязлівасці, асёл — упартасці і г. д.

Правообладатель Национальный институт образования



# Сэрцам народжаны спеў

## НАРОДНЫЯ ПЕСНІ

Штодзённымі клопатамі поўніцца жыццё людское.
Але калі зварухнецца душа чалавека, — толькі песня
здолее спатоліць яе. Шануйце ж песні свае.

*Максім Багдановіч.*

1. Чаму кожны народ шануе і зберагае сваю спадчыну?
2. Што вы ведаеце пра народныя (фальклорныя) песні? Чым яны адметныя?
3. Калі выконваюцца народныя песні?

Наша народная песня нарадзілася з сэрца, вуснаў усяго беларускага народа.

***Песня*** — вершаваны і музычны твор для выканання галасам (спявання).

Песні наш народ складаў на працягу вякоў у розныя моманты свайго жыцця. Ён увасабляў у песнях радасць і слёзы, смех і гора, долю і нядолю. Песня народная поўніцца шчырымі пачуццямі, у ёй, быццам працавітымі пчолкамі, сабрана ўсё багацце красы і непаўторных узораў роднага слова.



Правообладатель Национальный институт образования

З пакалення ў пакаленне народ ад дзеда — унуку, ад унука — праўнуку перадаваў у песні глыбокую праўду жыцця. Толькі кожнае новае пакаленне да дзедавай навукі-песні дадавала свой погляд на жыццё, сваё боль і жаль, смутак і радасць.

Таму для нас народная песня такая зразумелая, родная, блізкая сэрцу. У ёй мы чуем і клопат маці, і радасць брата, і надзею сястры, і свае ўласныя сны. Наша песня народная гучала ўлетку пры кожнай працы — ці то на полі, ці то на лузе, ці ў лесе, ці ў садочку. А прыходзіла зіма — дзьмулі халодныя вятры і завеі — народная песня тулілася пад страхой — у цеснай беларускай хатцы, жыла ў ёй разам з людзьмі, з іх думкамі і жаданнямі. Сэрцу чалавечаму песня дае ўцеху, а дзеткам, якія слухаюць яе, — жывую навуку *(Паводле Цёткі)*.

***Народная (фальклорная) песня*** — песня, створаная народам.

У залежнасці ад жыццёвага прызначэння народныя песні ўмоўна падзяляюць на абрадавыя і пазаабрадавыя. Надзвычай багатыя беларускія ***абрадавыя*** песні. **Сямейна-абрадавыя** песні суправаджалі найбольш значныя падзеі ў жыцці чалавека: нараджэнне, вяселле (шлюб), смерць. **Каляндарна-абрадавыя** песні выконваліся падчас свят, вызначаных земляробчым календаром селяніна — сейбіта і хлебароба. Сваім зместам і вобразамі гэтыя песні спалучаны з працоўнай дзейнасцю чалавека, яго адвечнымі клопатамі пра ўраджай як аснову жыцця, дабрабыту і шчасця. Пры дапамозе спеваў, танцаў, замоў нашы продкі імкнуліся паўплываць на сілы прыроды, каб своечасова засеяць ніву, вырасціць і сабраць добры ўраджай, палепшыць свой лёс. Каляндарна-абрадавыя песні надавалі святам весялосць, забаўляльнасць, непаўторнасць.

На першы погляд можа падацца, што народныя песні вельмі простыя па змесце, нешматслоўныя, асобныя словы і выразы ў іх паўтараюцца. Але гэта не так. Песні найперш выконвалі магічную ролю: людзі звярталіся з просьбамі, пажаданнямі, заклінаннямі да сіл прыроды, стараліся пераканаць іх, задобрыць, улагодзіць.



Правообладатель Национальный институт образования

Нашы продкі ўшаноўвалі Каляду, Купалу, прасілі спрыяння ў гаспадарцы, ладу ў сям'і, добрага здароўя сваім родным, шчаслівага лёсу дзецям. І каб быць лепш пачутымі, свае просьбы шмат разоў паўтаралі.

***Пазаабрадавыя*** песні не былі звязаны з пэўнымі датамі, святамі або гульнямі. Іх спявалі ў розных жыццёвых абставінах: на працы і ў час адпачынку, дома і ў полі, прылюдна і сам-насам. Гэтыя песні зразумелыя і блізкія ўсім людзям, у іх выявіліся лепшыя рысы беларускага нацыянальнага характару.

Прыгажосць песні можна адчуць, калі яна гучыць, спяваецца. Словы лепш успрымаюцца толькі разам з мелодыяй.

Надзвычай багаты вобразны лад народных песень. Амаль у кожнай з іх мы сустрэнем словы, ужытыя ў пераносным значэнні, — **тропы**: эпітэты, параўнанні, сімвалы, метафары, увасабленні, гіпербалы.

Найперш дапамагаюць стварыць выразную карціну ***эпітэты***. Часта сустракаюцца так званыя сталыя эпітэты, якія ўжываюцца толькі з пэўнымі словамі: поле *шырокае*, зорка *ясная*, ночка *цёмная*, слёзы *горкія*, рукі *белыя*.

У народных песнях надзвычай паэтычныя ***параўнанні***, яны сціслыя, выразныя, трапныя: светлая, *як зорка ясная*; чыстая, *як сляза*; прыгожы, *як месячык ясны*. Напрыклад, дзяўчына звяртаецца да свайго каханага. Звярніце ўвагу: параўнанне выражана словамі без параўнальнага злучніка, і яго не адразу можна распазнаць: *дробным дожджыкам* азначае *быццам дробны дожджык* і інш.

Ты хадзі ка мне ў госці:
Ты лесам ідзі — *дробным дожджыкам*,
Ты лугам ідзі — *буйным ветрыкам*,
Ты ў сад мой — *салавейкаю*,
На двор мой — *ясным сокалам*,
У хату маю — *дружком міленькім*.

Вельмі распаўсюджаны ў народных песнях ***вобразы-сімвалы*** — знакі, умоўныя абазначэнні з'явы праз вобраз, які нечым нагадвае гэту з'яву. Паэтычнымі сімваламі ў песнях выступаюць птушкі, жывёлы, дрэвы: размова бярозы з лістком сімвалізуе горкае расставанне маці са сваёй дачкой, якую аддаюць замуж:



Правообладатель Национальный институт образования

— А мой жа ты *лісточак*, мой зялёненькі,
Як жа мы расстанемся?
Ветрык павее, цябе пакоціць,
А я тут застануся, дожджыкам абальюся.

Характэрным мастацкім прыёмам стварэння вобразаў у народных песнях з'яўляецца ***ўвасабленне*** — перанясенне ўласцівасцей жывых істот на прадметы і з'явы прыроды:

*Гаварыла поле* шырокае,
*Жыта* ядраное:
— Жнейкі мае маладыя,
Сярпы залатыя,
Прыходзьце ка мне заўтра рана...

Сустракаюцца ў песнях і ***гіпербалы*** — вобразныя выразы, у аснове якіх ляжаць моцныя перавелічэнні (уласцівасцей, якасцей, памераў прадмета або з'явы) з мэтай узмацніць уражанне:

Дзе каза рогам,
Там жыта *стогам*,
Дзе каза хвастом,
Там жыта *кустом*,
Дзе каза нагою,
Там жыта *капою.*

Ажыўляюць і ўпрыгожваюць народную песню, надаюць ёй пяшчотнасць, прывабнасць, меладычнасць, лірызм ***звароты***, ***памяншальна-ласкальныя словы***, а таксама ***паралелізмы***, пры якіх дзве з'явы, чым-небудзь падобныя або процілеглыя, раскрываюцца ў супастаўленні, паралельна, у форме разгорнутага параўнання:

Над ракою ў спакою
*Расцвітала каліна*,
А ў сяле за ракою
*Вырастала дзяўчына*.

Беларускі песенны фальклор надзвычай багаты. У ім — душа нашага народа, светлая, прыгожая, чыстая. Народная песня ва ўсе часы была і застаецца жыватворнай крыніцай для прафесійнага мастацтва.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Як узніклі народныя песні? У якія моманты чалавечага жыцця яны звычайна выконваліся?
2. Назавіце віды абрадавых песень. Ахарактарызуйце кожны від.
3. Якія сродкі мастацкай выразнасці мовы найчасцей сустракаюцца ў народных песнях? Прывядзіце прыклады.
4. Калі ёсць магчымасць, запішыце ад старэйшых адну-дзве народныя песні з вашай мясцовасці. Пра што ў іх расказваецца? Калі яны выконваліся?
5. Разгадайце рэбус.

## Прыехала Каляда на белым кані...

Прыехала Каляда на белым кані,
Яе конічак — ясен месячык,
Яе дружачка — ясна зорачка,
Яе пужачка — ясна звёздачка,
Яе вазочак — з тоўстага лядку,
Яе кажушок — з белага сняжку.

## Вы, калядачкі, бліны-ладачкі...

Вы, калядачкі, бліны-ладачкі,
Ай, люлі-люлі, бліны-ладачкі.
А калядачкі — да у ліпнічку,
А прынадачкі[1] — у бярэзнічку.
А калядачкі, вы барджэй, барджэй[2],
Напячом блінцоў мы з дражджэй, з дражджэй.
А калядныя бліны ладныя,
А мікольскія[3] — не такоўскія.

---

[1] *Прына́дачка (прына́да)* — смачная ежа або ўсё, што прываблівае, вабіць.

[2] *Барджэ́й* (ад *бо́рзда*) — хутчэй.

[3] *Міко́льскія (бліны́)* — тыя, што пякуцца на свята святога Міколы: 19 (6) снежня.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Калі спяваюцца гэтыя песні? Што вы ведаеце пра гэта зімовае свята? Раскажыце пра традыцыі (абрады), звязаныя з Калядамі. Прыгадайце дзеянні, што суправаджаюць выкананне песень на Каляды.
2. Якой паўстае Каляда ў песнях? Адшукайце ў тэкстах песень сродкі мастацкай выразнасці мовы (эпітэты, параўнанні, гіпербалы, паўторы), растлумачце іх ролю ў стварэнні вобраза Каляды.
3. Паслухайце два аўдыязапісы песні «Вы, калядачкі, бліны-ладачкі...» — у выкананні ансамбля «Песняры» і спевака Івана Кірчука. Якія эмоцыі выклікала ў вас песня? Параўнайце, як перададзены святочны настрой каляднай песні ў розных выканаўцаў.
4. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Эдуарда Рымаровіча «Каляды». Які сюжэт ляжыць у яе аснове? Вызначце, які настрой перададзены на карціне. Звярніце ўвагу на падбор фарбаў, постаці калядоўшчыкаў, святочную атрыбутыку. Якая з калядных песень — «Прыехала Каляда на белым кані...» або «Вы, калядачкі, бліны-ладачкі...» — найбольш адпавядае сюжэту і настраёвасці карціны мастака? Абгрунтуйце свае меркаванні.



*Э. Рымаровіч*. Каляды

5. Паспрабуйце падрыхтаваць калектыўную інсцэніроўку святкавання Каляд (у класе або на школьнай вечарыне) або адшукайце ў інтэрнэце відэазапіс святкавання Каляд у адной з беларускіх вёсак і падзяліцеся ўражаннямі з сябрамі.
6. Прачытайце артыкул «Каляды. Грамніцы», адкажыце на пытанні.

## Благаславі, маці, вясну заклікаці...

Благаславі, маці,
Благаславі, маці! У-у-у!

Вясну заклікаці,
Вясну заклікаці! У-у-у!

Адамкнуць зямліцу,
Адамкнуць зямліцу! У-у-у!



Правообладатель Национальный институт образования

Выпусціць травіцу,
Выпусціць травіцу! У-у-у!

На ранняе лета,
На ранняе лета! У-у-у!

На буйнае жыта,
На буйнае жыта! У-у-у!

Прыйдзі, вясна-красна!
Прыйдзі, вясна-красна! У-у-у!

1. Пра што спяваецца ў песні-вяснянцы, якія чалавечыя пачуцці ў ёй раскрываюцца? Чаго чакалі людзі ад прыходу вясны?
2. Адзначце вобразна-выяўленчыя сродкі мовы, якія дапамагаюць стварыць вобраз вясны — прыгожай, вясёлай, шчодрай.
3. Раскажыце, што вы ведаеце пра народны абрад «Гуканне вясны». Якое яго прызначэнне? Калі і дзе звычайна праводзіцца гэта свята? Хто яго асноўныя ўдзельнікі?

## А на Купалу рана сонца іграла...

А на Купалу
Рана сонца іграла —
Рана сонца іграла,
На добрыя годы —
На добрыя годы,
На цёплыя росы —
На цёплыя росы,
На хлябы-ўраджаі —
На хлябы-ўраджаі.

1. На якое свята выконвалася гэта песня? Што вы пра яго ведаеце?
2. Растлумачце, як вы разумееце вобраз *сонца іграе*. Калі, паводле міфаў, у прыродзе назіраецца такая з’ява?
3. Як праяўляецца ў песнях жаданне чалавека засцерагчы ўраджай? Падмацуйце адказ прыкладамі.
4. Якія вобразы прысутнічаюць у песні? Пры дапамозе якіх сродкаў мастацкай выразнасці мовы яны створаны?



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Віктара Барабанцава «На Купалле». Вызначце, які настрой на ёй перададзены. Якія сродкі мастацкай выразнасці мовы дапамагаюць аўтару карціны раскрыць сутнасць народнага свята? Звярніце ўвагу на постаці дзяўчат і хлопцаў, дэталі карціны, яе палітру, святочную сімволіку.



*В. Барабанцаў.*
На Купалле

**6.** Прачытайце артыкул «Папараць-кветка», разгадайце рэбус.

## А ў суботу проці нядзелі...

А ў суботу проці нядзелі
Заснула Ганначка над кудзеляй[1].
Сасніўся дзеўчыне дзіўненькі сон:
Наляцела галубоў поўненькі двор;
Каля тых галубоў сіза паванька,
Каля той паванькі ясен сокал,
Каля таго сокала бочачка віна,
Каля той бочачкі залаты замочак.
— Мамачка родная, разгадай мой сон.
— Дачушка Ганулька, сама разгадаеш:
Галубы — сваты твае,
Сіза пава — твая сваццінка,
Ясен сокал — твой Якубка,
Бочка віна — слёзкі твае,
Залаты замочак — твой вяночак.

**1.** Назавіце выразныя прыкметы вясельнай песні.
**2.** Што, паводле твора, хвалюе дзяўчыну? Вызначце ролю эпітэтаў, параўнанняў, перавелічэнняў у абмалёўцы вобразаў.
**3.** Якім паказаны ў песні хлопец — жаніх дзяўчыны?
**4.** Што вы можаце сказаць пра вобраз маці нявесты ў песні? Якім ёй уяўляецца далейшы лёс дачушкі?

---

[1] *Кудзе́ля* — валакно для прадзіва верацяном.



Правообладатель Национальный институт образования

## Каля месяца, каля яснага...

Каля месяца, каля яснага
Усе дробныя зоркі.
А ў Іванькі на куце
Усе любыя госці.
Любыя госці, любыя госці!
Бабуля на куце сядзіць,
Харошую песню пяе.
Першую — нараджоную,
Другую — сужоную,
Трэцюю — хрэсьбінную.
Дай, Божа, нашаму дзіцяці
Хрэсьбінкі згуляці,
Хрэсьбінкі згуляці
І вяселля даждаці.

1. Якая жыццёвая падзея згадваецца ў песні? Дзе адбываецца дзеянне?
2. Чаго жадаюць дзіцяці запрошаныя госці?
3. Хто галоўны герой хрэсьбіннай песні? Чаму самае пачэснае месца на святе адведзена бабулі? Вызначце ролю вобразна-выяўленчых сродкаў мовы (эпітэтаў, паўтораў, паралелізмаў, памяншальна-ласкальных слоў) у паэтызацыі свята нараджэння дзіцяці.

## Рэчанька

Ой, рэчанька, рэчанька,
Чаму ж ты не поўная?
Люлі, люлі, люлі,
Чаму ж ты не поўная?

Чаму ж ты не поўная,
З беражком не роўная?
Люлі, люлі, люлі,
З беражком не роўная?

А як жа мне поўнай быць,
З беражкамі роўнай плыць?



Правообладатель Национальный институт образования

Люлі, люлі, люлі,
З беражкамі роўнай плыць?

Ясю коніка паіў,
Кася воду чэрпала.
Люлі, люлі, люлі,
Кася воду чэрпала.

1. Пазнаёмцеся з відэазапісам песні «Рэчанька». Якія думкі і эмоцыі абудзіла ў вас гэта песня?
2. Вызначце настрой песні, ролю сродкаў мастацкай выразнасці мовы (звароту, паўтораў, эпітэтаў, паралелізмаў, памяншальна-ласкальных слоў) у стварэнні вобразаў.
3. Разгадайце крыжаванку.

## ЛІТАРАТУРНЫЯ ПЕСНІ

Куды б ні прыйшлося паехаць, пайсці,
Песню бярыце з сабою!

*Ніл Гілевіч.*

Чым адрозніваюцца фалькłорныя творы ад літаратурных (напісаных пісьменнікамі)?

Беларускі край вельмі песенны. У народзе кажуць, што наша зямля спявае, звініць песнямі. Беларусы любяць не толькі народныя песні, але і песні, якія напісалі прафесійныя аўтары — паэты і кампазітары.

***Літаратурная песня*** — песня, створаная на словы паэта.

Музыка і словы шанаваліся здаўна. Старажытныя індыйцы, тыбетцы, кітайцы, грэкі спевамі лячылі людзей. У Грэцыі паэты чыталі свае вершы ў суправаджэнні музычных інструментаў — найчасцей пад гучанне ліры або кіфары (струнных музычных інструментаў).

У Беларусі народныя песні калісьці выконвалі вандроўныя музыкі — гусляры і лірнікі, дудары і цымбалісты. Самымі ран-



Правообладатель Национальный институт образования

німі літаратурнымі песнямі былі духоўныя (царкоўныя) песні. Пазней вершы-песні пачалі пісаць беларускія паэты. Сярод першых найбольш вядомых аўтараў песенных твораў вылучаюцца Францішак Багушэвіч і Янка Купала.

Шматлікія вершы нашых паэтаў паклалі на музыку беларускія кампазітары Мікола Равенскі, Ігар Лучанок, Уладзімір Алоўнікаў, Ісак Любан і інш. Дзякуючы іх таленту вершы загучалі цудоўнымі песнямі. Вядомымі сталі беларускія песні на словы Янкі Купалы «Явар і каліна», Максіма Багдановіча «Зорка Венера», Канстанцыі Буйло «Люблю наш край…», Якуба Коласа «Мой родны кут…» і інш.

Многія песенныя творы шырокавядомыя і вельмі папулярныя, без іх не абыходзяцца сямейныя святы, шчырыя сяброўскія бяседы, розныя канцэрты. Даўно любімай у народзе стала песня «Бывайце здаровы» (музыка Ісака Любана):

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
Ужо ж мы паедзем
Дадому, дахаты.

Ў зялёнай дуброве
Мы начаваць будзем,
А вашае ласкі
Павек не забудзем.

Аўтар слоў гэтай песні — беларускі паэт Адам Русак. Ён здолеў ярка раскрыць душу беларуса — шчодрую і добразычлівую, поўную жыццялюбства і ўдзячнасці людзям за гасціннасць.

Без песні цяжка ўявіць творчасць многіх беларускіх паэтаў. Сярод іх з’явіліся паэты-песеннікі, якія спецыяльна пішуць вершаваныя тэксты для кампазітараў. У сваю чаргу, той ці іншы кампазітар піша музыку на словы — і так нараджаецца песня. Выдатныя песні створаны на словы Максіма Танка, Ніла Гілевіча, Алеся Бачылы, Алеся Ставера, Уладзіміра Карызны і іншых паэтаў. У вершах аўтары ўслаўляюць родны край, яго людзей, беларускія гарады, рэкі і лясы, апяваюць красу прыроды, сапраўдную дружбу і каханне. Добрая песня заўсёды прыносіць



Правообладатель Национальный институт образования

чалавеку радасць, узнёслы настрой, дае душэўную цеплыню, надзею на ўсё самае светлае і прыгожае ў жыцці.

1. Якія песні называюцца літаратурнымі? Калі яны звычайна выконваюцца?
2. Якія папулярныя беларускія песні вы ведаеце?
3. Падрыхтуйце літаратурна-музычную вечарыну (або гасцёўню) «І песню родную люблю я». Арганізуйце выкананне і праслухоўванне любімых беларускіх песень.



# Алесь СТАВЕР

...Як кажуць сярод людзей,
Без песні няма надзей.
Народ без песні — не ўмее,
Народ без песні нямее.

*Анатоль Грачанікаў.*

Алесь (Аляксандр) Сяргеевіч Ставер (1929—1995) нарадзіўся ў прыгожым лясным краі — у вёсцы Маргавіца, што каля Бягомля (Віцебская вобласць, Докшыцкі раён). Падчас вучобы ў Бягомльскай сярэдняй школе пачаў пісаць вершы. Пазней, прыгадваючы свае першыя творчыя спробы, мастак слова адзначаў: «Як у вершах, так і ў прозе асновай для мяне служыў жыццёвы факт. Творчыя пошукі і намаганні праходзілі ў мяне пакутліва і няроўна. І, безумоўна, не выклікалі ніякага разумення ў маіх блізкіх і нават некаторых літаратараў».

Дзяцінства Алеся Ставера прыпала на гады вайны. У час блакады партызанскага краю падлетак страціў бацькоў. Фашысты вывезлі яго ў канцлагер у Германію. Толькі пасля вайны Алесь Ставер змог вярнуцца дадому. «Перадаць усе пакуты нявольніцкага жыцця ў вершах я не змог і таму ўзяўся за прозу. Некалькі разоў імкнуўся напісаць твор аб вязнях фашысцкіх канцлагераў.



Правообладатель Национальный институт образования

Але з-за недахопу літаратурнага вопыту спробы мае былі няўдалымі», — згадваў юнак.

У 1959 годзе выйшаў з друку першы зборнік вершаў паэта, пазней — шэраг вершаваных і празаічных твораў, сярод якіх і кнігі для дзяцей («Касцёр не гасне», «Пад вясёлкавай дугой» і інш.). Многія вершы паэта пакладзены на музыку і сталі вядомымі песнямі (зборнік песень «Мой край беларускі»). Сярод іх верш «Жураўлі на Палессе ляцяць…».

## Жураўлі на Палессе ляцяць…



Каб любіць Беларусь нашу мілую,
Трэба ў розных краях пабываць.
Разумею цяпер, чаму з выраю
Жураўлі на Палессе ляцяць.

Што ім тыя пагоды паўднёвыя!
Што ім пышны платанавы[1] рай,
Калі клічуць іх далі сасновыя
І азёрны рабінавы край!

Сакавітыя пожні[2] мурожныя
Не заменіш нічым і нідзе
І зямлю, дзе сцяжыначка кожная
У прыветлівы двор прывядзе.

Каб любіць Беларусь нашу мілую,
Трэба ў розных краях пабываць.
Зразумееш тады, чаму з выраю
Жураўлі на Палессе ляцяць.

1. Якія малюнкі беларускага краю паўсталі перад вамі? З якім пачуццём аўтар гаворыць пра родную зямлю?
2. Чаму, па словах паэта, жураўлёў не прываблівае вечназялёны *платанавы рай*?

---

[1] *Плата́навы* (ад *плата́н* — вялікае паўднёвае дрэва з зеленавата-шэрай карой і шырокім лісцем).

[2] *По́жня* — тут: сенажаць.



Правообладатель Национальный институт образования

3. Паводле верша Алеся Ставера, Радзіма — *азёрны рабінавы край*. Вобразна апішыце, якім вам уяўляецца Беларускае Палессе.
4. Паразважайце, ці абавязкова, каб любіць Беларусь, *трэба ў розных краях пабываць*. Чаму чалавеку бывае цяжка без роднага краю?
5. Паслухайце аўдыязапіс песні «Жураўлі на Палессе ляцяць...» на музыку Ігара Лучанка ў выкананні ансамбля «Песняры». Якія думкі абудзіла ў вас песня? Які зрокавы малюнак узнік пасля яе праслухоўвання?
6. Уявіце: вам трэба пазнаёміць замежных гасцей са сваёй Радзімай, і тыя папрасілі паслухаць песні пра Беларусь. Ці падыходзіць, на вашу думку, твор Ігара Лучанка і Алеся Ставера для таго, каб быць песеннай візітнай карткай Беларусі? Абгрунтуйце свой адказ.
7. Прыгадайце вядомыя песні на словы беларускіх паэтаў. Паспрабуйце назваць іх аўтараў і выканаўцаў.
8. Падрыхтуйце малюнак або фотасюжэт да песні «Жураўлі на Палессе ляцяць...».
9. Вывучыце верш Алеся Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць...» на памяць.
10. Прачытайце артыкул «Песня», выканайце заданні па тэме.



# Алесь БАЧЫЛА

О мой любы родны край,
Ты — прыгожы, нібы рай.
І нідзе ў другіх краях
Шчасным быць не змог бы я.

*Ніл Гілевіч.*

Алесь (Аляксандр) Мікалаевіч Бачыла (1918—1983) — беларускі паэт, драматург, перакладчык, крытык. Нарадзіўся ў вёсцы Лешніца Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

«У Лешніцы праходзіла маё маленства, — пазней успамінаў паэт. — Улетку цэлымі днямі бавіўся на рэчцы, а бліжэй да во-



Правообладатель Национальный институт образования

сені, калі паспявалі ягады і з'яўляліся першыя грыбы, прападаў у лесе. І толькі зіма з яе завеямі і маразамі надоўга заганяла ў хату. Тады ўжо вечарамі слухалі мы, як старэйшая сястра чытала кніжкі ці расказвала цікавыя казкі пра вадзянікоў ды чарцей... У школу пайшоў рана, у 6 гадоў, — карцела хутчэй навучыцца чытаць. Праўда, спачатку маці не адпускала. Але я не адступіўся ад свайго — хоць і без кніжак, а пайшоў. І... о нечаканасць! — мяне запісалі ў першы клас...

Нейк вычытаў, што набіраюцца студэнты ў аўтатранспартны тэхнікум. Прыёмных экзаменаў тады не было — і я ўжо амаль лічыў сябе студэнтам першага курса. Аднак у спіске прынятых маё прозвішча так і не трапіла. Мне было трынаццаць гадоў, а ў тэхнікум прымалі з пятнаццаці... Белпедтэхнікум аб'явіў дадатковы набор. Я ўхапіўся за гэта, як за выратавальны круг. Пры прыёме дакументаў ніхто нават не звярнуў увагі на мой узрост».

Пазней Алесь Бачыла скончыў Мінскі настаўніцкі інстытут, выкладаў беларускую мову і літаратуру ў школах на Міншчыне. Пісаў таксама творы для дзяцей.

Вершам Алеся Бачылы ўласцівы сюжэтнасць, напеўнасць, меладычнасць, многія з іх пакладзены кампазітарамі на музыку і сталі вядомымі песнямі.

Назавіце некалькі асацыяцый-азначэнняў, якія ўзнікаюць у вашым уяўленні, калі чуеце слова *Радзіма*. Ці можна вызначыць, якія з іх найбольш важныя і значныя?

## Радзіма мая дарагая...

Радзіма мая дарагая,
Ты ў шчасці жаданым жыві.
Я сэрцам табе прысягаю
У шчырай сыноўняй любві.

На рэках шырокіх і нівах,
Заводах, будоўлях — наўсцяж[1]

---

[1] *Наўсця́ж* — ва ўсіх напрамках, навокал.



Правообладатель Национальный институт образования

Народ наш працуе руплівы,
І край узвышаецца наш.

Навокал жыццё расцвітае —
І песня ўзлятае сама:
Мне лепей ад роднага краю
Нічога на свеце няма.

Чужое зямлі нам не трэба,
Пачуцці ва ўсіх нас адны:
Мы хочам, каб мірнае неба
Не знала пажараў вайны.

Мы дружбы народам жадаем
І шчырай братэрскай любві.
Радзіма мая дарагая,
Красуйся і ў шчасці жыві!

1. У якіх радках заключана асноўная думка верша? Зачытайце іх.
2. Растлумачце выкарыстанне ў вершы слова *прысягаю*.
3. Як вы разумееце выраз *край узвышаецца наш*?
4. Пракаменціруйце словы паэта: *чужое зямлі нам не трэба*.
5. Паслухайце песню «Радзіма мая дарагая...», якую лічаць адным з песенных сімвалаў Беларусі (музыка Уладзіміра Алоўнікава). Раскажыце пра сваё ўспрыманне мелодыі песні, падзяліцеся ўласнымі эмоцыямі.
6. Якога лёсу і якой будучыні жадае паэт Радзіме і свайму народу?
7. Што, на ваш погляд, аб'ядноўвае вершы Алеся Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць...» і Алеся Бачылы «Радзіма мая дарагая...»? Выкарыстайце інтэрнэт-рэсурсы і падрыхтуйце прэзентацыю ілюстрацый (рэпрадукцый карцін або мастацкіх фотаздымкаў) да гэтых вершаў.
8. Падрыхтуйце вуснае выказванне «Радзіма пачынаецца з...».
9. Прачытайце артыкул «Песенны сімвал Беларусі», выканайце заданне па тэме.



Правообладатель Национальный институт образования



# Каляндар роднай прыроды

## *Змітрок БЯДУЛЯ*



І сэрцу аб красе прыроды гаварыце...
*Максім Багдановіч.*

Змітрок Бядуля (1886—1941) — сапраўднае імя Самуіл Яфімавіч Плаўнік — нарадзіўся ў вёсцы Пасадзец (цяпер Лагойскі раён Мінскай вобласці) у сям'і арандатара. У шэсць гадоў дзед навучыў малога чытаць, і праз год бацькі аддалі хлопчыка вучыцца ў пачатковую яўрэйскую школу. «У мяне была вялікая схільнасць да малявання, — пазней успамінаў пісьменнік. — У вольны ад заняткаў час дапамагаў дзеду ў кузні. Асабліва любіў я раздзімаць кавальскія мяхі або майстраваць з кавалкаў медзі ножыкі і цацкі-пісталеты».

Тры гады хлопчык правёў у яўрэйскай духоўнай семінарыі — ешыбоце: «Ешыбоцкі перыяд быў самай маляўнічай парой майго дзяцінства. Своеасаблівы побыт, напаўгалоднае існаванне рана



Правообладатель Национальный институт образования

прывучылі мяне да самастойнага жыцця. Кожны раз уранку служка сінагогі будзіў мяне моцнымі плескачамі, каб я ачысціў лаўку для багамольцаў. Бялізну я мыў сам, навучыўся цыраваць падраныя штаны, а на снеданне і вячэру зарабляў уласнай працай. Пасля такой трохгадовай “адукацыі” я ўцёк з ешыбота». Некаторы час Змітрок Бядуля быў хатнім настаўнікам, дапамагаў бацьку ў яго лесапрамысловых справах.

Першы твор на беларускай мове — лірычны абразок «Пяюць начлежнікі…» — быў надрукаваны ў газеце «Наша ніва» ў 1910 годзе.

Змітрок Бядуля — аўтар шматлікіх вершаў, паэм, лірычных мініяцюр, апавяданняў, аповесцей, твораў для дзяцей (вершаваная казка «Мурашка Палашка», філасофская аповесць-казка «Сярэбраная табакерка» і інш.). Максім Багдановіч назваў яго «пісьменнікам з душой чулай і паэтычнай». Лірычныя абразкі і аповесці Змітрака Бядулі ўвайшлі ў залаты фонд айчыннай літаратуры.

## Зямля

Зямля…

Вялікі, бязмерны абшар зямлі адкрываецца воку майму.

Я падымаюся вышэй і вышэй на нейкіх крылах, з дзівам разглядаю велізарнае ўладарства зямлі…

Як у казцы, нясуцца перада мной шыры гэтай зямлі…

Як у казцы, нясуцца перада мной поры года: святая зялёная вясна, гарачае залатое лета, сытная багатая восень, бліскучая здаровая зіма…

І мяняюцца фарбы, і мяняюцца віды…

Усё жыве, усё рухаецца… шуміць…

Зямля! Маці наша! Чуецца заўсёды і ўсюды тваё цёплае, жыватворнае дыханне, каторае мёдам па жылах разліваецца…

Усе мы дзеці твае: і расліна, і жывёла, і чалавек…

Усіх ты нас родзіш, усе мы жывём на табе, усіх ты нас ізноў прымаеш…

І хто каранямі сваімі глыбей у зямлю стараецца ўлезці, у таго галава чуць не да самага сонейка даходзіць, у таго шчасце ракой-морам расшыраецца…



Правообладатель Национальный институт образования

1. З якім пачуццём аўтар апісвае родную зямлю?
2. Вызначце асноўную думку твора.
3. Чаму зямля — *маці наша*? Як чалавек звязаны з роднай зямлёй?
4. Якімі эпітэтамі Змітрок Бядуля характарызуе поры года?
5. Уважліва прачытайце апошні абзац (са слоў: *І хто каранямі сваімі*...). Растлумачце сэнс гэтага вобраза.
6. Абгрунтуйце, чаму аўтар лірычнай мініяцюры «Зямля» — патрыёт.
7. Разгледзьце рэпрадукцыі карцін Алены Бархатковай «Золата восені», Эдуарда Рымаровіча «Студзень», Віктара Каралёва «Вясна», Івана Шышкіна «Жыта».



*А. Бархаткова*. Золата восені



*Э. Рымаровіч*. Студзень



*В. Каралёў*. Вясна



*І. Шышкін*. Жыта

Што адлюстравана на карцінах? Вызначце настраёвасць гэтых палотнаў жывапісу. Якія фарбы на іх пераважаюць? Ці існуе пэўная сувязь рэпрадукцый карцін са зместам лірычнай мініяцюры? Прааналізуйце вобразы, створаныя мастакамі.

8. Падрыхтуйце вусную замалёўку «Мая зямля» («Мой край», «Мая Радзіма»).



Правообладатель Национальный институт образования



# Паўлюк ТРУС

Над Белаю Руссю — белы снег,
Нібыта чыстае сумленне...
*Анатоль Грачанікаў.*

Паўлюк (Павел Адамавіч) Трус (1904—1929) нарадзіўся ў вёсцы Нізок на Уздзеншчыне ў сялянскай сям'і. Хлопчык гадаваўся ў прыгожым кутку Беларусі — маляўнічых мясцінах ля вытокаў Нёмана. Пазней Паўлюк Трус прыгадае: «У дзесяць гадоў я ўжо хадзіў за бараною. Бацька сеяў, а я па свежых слядах баранаваў, і не толькі баранаваў, а нават пад'язджаў на баране, за што ад бацькі часта перападала. У дванаццаць — браў першыя ўрокі на аратага, праца куды менш цікавая, бо патрабавала пільнасці і вялікай увагі. У пятнаццаць гадоў я моцна трымаў касу ў руках і, як спрактыкаваны мастак, добра вымалёўваў шырокія пракосы на нашых прынёманскіх лугах».

У вясковай школе Паўлюк здзіўляў настаўніка сваімі выключнымі здольнасцямі, кемлівасцю і стараннасцю, добра маляваў, меў выдатны музычны слых, ведаў шмат народных песень, цудоўна спяваў і сам складаў песні. У школе ён напісаў і першы свой верш.

Падчас вучобы ў Мінску праявіўся паэтычны талент юнака. Цікавае літаратурнае жыццё ў сталіцы паўплывала на фарміраванне Паўлюка Труса як выдатнага паэта.

Паўлюк Трус сваё кароткае жыццё прысвяціў служэнню роднай літаратуры, нацыянальнай культуры, каб, па яго ж словах, «абудзіць любасць да Беларусі». Творы паэта глыбока лірычныя, песенныя, эмацыянальныя.



Правообладатель Национальный институт образования

Якія асацыяцыі ў вас узнікаюць, калі чуеце словы *сняжынкі, снегапад*?

## Падаюць сняжынкі...

*(Урывак з паэмы «Дзясяты падмурак»)*

Падаюць сняжынкі —
дыяменты[1]-росы,
Падаюць бялюткі
за маім акном...

Расчасалі вішні
шоўкавыя косы
І ўранілі долу
снегавы вянок.

Дзесьці у прасторах
празвінелі бомы.
Дацвілі пялёсткі
нечае тугі...

І здаецца, зноўку
еду я дадому
Пераведаць родных,
блізкіх, дарагіх.

Адхінае вечар
тонкія мярэжы[2],
На акне альвасы[3]
дагарэлі ў сне.
А ў душы квяцістасць
і такая свежасць,
І з вачэй усмешкі
сыплюцца на снег...

---

[1] *Дыяме́нт* — алмаз, брыльянт.

[2] *Мярэ́жа* — тут: лёгкая смуга, дымка, празрысты туман.

[3] *Альва́с (алья́с, ало́э)* — трапічная расліна, якую вырошчваюць у пакоях, аранжарэях і цяпліцах.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Праз якія вобразы паэт перадаў хараство зімовага краявіду? Як мастацкія тропы — эпітэты і метафары — дапамагаюць стварыць зрокавую карціну зімовага дня і перадаць душэўнае ўзрушэнне паэта?
2. Разгледзьце рэпрадукцыі карцін Вітольда Бялыніцкага-Бірулі «Зімовы сон» і Эдуарда Рымаровіча «Іней». Прааналізуйце іх кампазіцыю, вобразы і фарбы. Параўнайце настраёвасць мастацкіх палотнаў і вершаванага твора. Што ёсць роднаснае, блізкае ва ўспрыманні зімовага пейзажу мастакамі і паэтам? Падбярыце ў якасці эпіграфа да карцін паэтычныя радкі. Патлумачце свой выбар.



*В. Бялыніцкі-Біруля.*
Зімовы сон



*Э. Рымаровіч.*
Іней

3. Паслухайце песню «Падаюць сняжынкі...» у выкананні ансамбля «Песняры». Якія эмоцыі яна абуджае?
4. Вывучыце ўрывак з паэмы Паўлюка Труса на памяць.
5. Выканайце заданні па тэме.

## ПРА МЕТАФАРУ

Слова ў мастацкім творы не толькі расказвае, але і паказвае, малюе карціны жыцця, выяўляе пачуцці герояў, перадае стан душы аўтара. Нават у штодзённым жыцці мы гаворым: *жыццё ідзе, гады бягуць, рабіна гарыць* (параўнайце: *чалавек ідзе, дзеці бягуць, вогнішча гарыць*). Мы ўжываем словы не ў іх прамым значэнні, а ў пераносным — нібы пераносім якасці, прыкметы, дзеянні з адной з'явы на другую, падобную на яе. Гэта метафары.



Правообладатель Национальный институт образования

***Метафара*** — перанясенне ўласцівасцей адной з'явы на другую, чым-небудзь падобную на яе.

Метафары вельмі блізкія да параўнанняў. У параўнанні заўсёды відаць, што з чым супастаўляецца. А ў метафары параўнанне нібы схавана, стоена, пра яго мы толькі здагадваемся. Метафара выглядае як скарочанае параўнанне: *гады плывуць* (як вада ў рацэ); *дзень гарыць* (як яркае вогнішча); *жалезны характар* (цвёрды, як жалеза).

Прыгадаем радок з верша Максіма Багдановіча: *У небе ціха зоркі расцвілі*. У нашым уяўленні адразу паўстаюць зоркі, што на вачах расцвітаюць, як цудоўныя кветкі. А вось як перадае чароўнасць, непаўторнасць песні жаваранка Якуб Колас: *Снуючыся высока ў небе, раняла птушка мяккія, ласкавыя мелодыі, сатканыя са звону срэбных струн, з булькання лясных ручайкоў, з зумкання пчаліных крыльцаў, шолаху красак*. Чароўныя мелодыі песні, нібы дзівосная, лёгкая, надзвычай далікатная, казачна прыгожая празрыстая тканіна.

Метафара — адзін з самых распаўсюджаных тропаў. Яна вельмі кароткая, сціслая па форме і разам з тым вельмі ёмістая, багатая па сэнсе. Літаральна двума-трыма словамі метафара стварае яркі мастацкі вобраз *(І з вачэй усмешкі сыплюцца на снег)*. Метафару немагчыма пераказаць, перакласці на звычайную мову, бо знікне сам вобраз, страціцца яго чароўнасць, непаўторнасць. Зменіцца таксама і сэнс выказвання, згубіцца аўтарскае пачуццё.

Метафары — своеасаблівыя загадкі ў мастацкім творы. Яны робяць мову яркай, жывой, вобразнай, дапамагаюць больш яскрава ўявіць прадмет, з'яву, глыбей выявіць думку, пачуццё, стан душы аўтара.

1. Што такое метафара? Чым яна адрозніваецца ад параўнання?
2. Адшукайце метафары ў творы Паўлюка Труса «Падаюць сняжынкі...» і паспрабуйце растлумачыць іх мастацкую ролю.
3. Якія яшчэ тропы вы ведаеце? Прывядзіце іх прыклады з мастацкіх тэкстаў.



Правообладатель Национальный институт образования



# Рыгор БАРАДУЛІН

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
*Якуб Колас.*

Рыгор Іванавіч Барадулін (1935—2014) — народны паэт Беларусі, крытык, перакладчык, грамадскі дзеяч. Нарадзіўся на хутары Верасоўка Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. Пазней сям'я перабралася ў мястэчка Ушачы. Бацька паэта ў гады Вялікай Айчыннай вайны быў партызанам і загінуў у час прарыву нямецкай блакады. Выхоўвала хлопчыка маці Акуліна Андрэеўна. «Калі я што-небудзь і зраблю, дык гэта дзякуючы роднай мове, матчынай песні, дзякуючы той, ад каго з калыскі чуў непераўзыдзеныя па сваёй ранішняй чысціні, да скону дарагія сэрцу напевы, — маме Акуліне Андрэеўне», — прызнаваўся Рыгор Барадулін.

Хлопчык са школьных гадоў вёў дзённік, у якім занатоўваў і вершаваныя радкі. Першыя вершы былі надрукаваны падчас вучобы ва ўніверсітэце.

Рыгор Барадулін — адзін з самых значных і самабытных беларускіх мастакоў слова, яго талент непаўторны, унікальны, разнастайны. Яго хвалявалі лёс і будучыня Бацькаўшчыны, духоўных каштоўнасцей нашага народа. Паэт услаўляў самаахвярнасць і высакароднасць беларусаў у ваенны і мірны час, захапляўся прыгажосцю і непаўторнасцю роднай зямлі.

Рыгор Барадулін — аўтар шматлікіх кніг паэзіі, вершаў для дзяцей. Яго творы напісаны багатай, метафарычнай, сакавітай мовай. Яны вучаць высокай праўдзе, дабру, чалавечнасці.



Правообладатель Национальный институт образования

**1.** Як называюцца малюнкі або карціны, на якіх паказана пэўная мясцовасць: лес, луг, поле або балота?
**2.** Якія краявіды роднага краю вам найбольш падабаюцца?

* * *

Уцякала зіма ад вясны
Па кустах вербалозаў рагатых, —
Ёй каптан абарвалі яны,
І на голлі матляецца вата.

Уцякала зіма ад вясны,
Уцякала па рэках, азёрах,
Лёд затрэскаў, закрэктаў, заныў,
Здрадзіў лёд —
і вада на прасторы.

Толькі звон крыгалому ачах —
Брод шукаюць бярозы-бяглянкі
І трымаюць на ніцых[1] плячах,
Як дзяцей палахлівых,
буслянкі.

А вясна даганяла зіму;
Заяц скочыў у лужу блакіту,
Бо на хвост наступіла яму,
І пралескі распырскаў, раскідаў.

І ўцякала зіма ад вясны,
Пад нагамі ламачча затлела,
Парастрэсла па сцежках лясных
Снег апошні свой
з ландышаў белых.
Уцякала зіма ад вясны —
Уцякала.

[1] *Ні́цы* — той, які мае доўгія звісаючыя галіны (пра дрэвы і кусты).



Правообладатель Национальный институт образования

1. Ці згодны вы з тым, што верш «Уцякала зіма ад вясны...» нагадвае казачную гісторыю? Што падалося вам незвычайным?
2. З дапамогай якіх сродкаў мастацкай выразнасці мовы паэт стварае вобразы зімы і вясны?
3. Каго, на ваш погляд, нагадвае лёд, які *затрэскаў, закрэктаў, заныў*? Як вы думаеце, з якой мэтай аўтар пры абмалёўцы прыроды выкарыстоўвае шмат дзеясловаў?
4. Назавіце самыя яркія вобразы, якія вам спадабаліся. Чаму без іх верш страціў бы сваю прывабнасць і хараство?
5. Услухайцеся ў гучанне верша. Ці можна яго пакласці на музыку? Якой можа быць гэта музыка?
6. У вершы зіма не хоча пакідаць свае ўладанні, а вясна яе праганяе. Выканайце заданне (на выбар): а) прыдумайце працяг гісторыі — куды ўцякала зіма, і як пачала гаспадарыць на зямлі вясна; б) прыдумайце казку або стварыце калаж з малюнкаў (фотаздымкаў, рэпрадукцый) на адну з тэм: «Крыгаход на рацэ», «У чаканні буслоў», «Праводзіны зімы», «Вясна ідзе!». Падбярыце ў якасці подпісаў да малюнкаў радкі з твора Рыгора Барадуліна «Уцякала зіма ад вясны...» або з іншых пейзажных вершаў паэта; в) выберыце з прапанаваных азначэнняў словы, якія найбольш ярка і поўна раскрываюць сутнасць вясны як прыроднай з'явы:

| | | |
|---|---|---|
| непаўторная | звонкая | ранняя |
| цёплая | сонечная | доўгачаканая |
| прыгожая | бурлівая | радасная |
| нясмелая | маладая | квяцістая |
| гаманкая | іскрыстая | зацяжная |
| руплівая | адліжная | сцюдзёная |
| сарамлівая | смелая | раптоўная |

7. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Мікалая Ліханенкі «Сакавік». Які настрой перадае мастацкае палатно? Якая колеравая гама пераважае? Прааналізуйце кампазіцыю карціны. Што, на вашу думку, агульнае ва ўспрыманні ранняй вясны паэтам і мастаком? Якія радкі



*М. Ліханенка.* Сакавік



Правообладатель Национальный институт образования

з верша Рыгора Барадуліна «Уцякала зіма ад вясны...» найбольш падыходзяць у якасці назвы да гэтай мастацкай карціны: а) «Здрадзіў лёд — і вада на прасторы»; б) «А вясна даганяла зіму...»; в) «Толькі звон крыгалому ачах...»?

**8.** Прачытайце артыкул «Пейзаж», адкажыце на пытанне.

## ПРА ЎВАСАБЛЕННЕ

Вы ўжо ведаеце, што мастакі слова, каб стварыць яркія, жывыя, запамінальныя карціны жыцця і адначасова выказаць свае перажыванні, карыстаюцца рознымі мастацкімі прыёмамі. Шмат разоў вы заўважалі, што нежывому прадмету або з'яве (дрэву, воблаку, сонцу, дажджу і інш.) для большай выразнасці, нагляднасці надаюцца якасці і ўласцівасці чалавека. Прыгадайце, напрыклад, народныя песні. У іх прадметы і з'явы прыроды выступаюць як жывыя істоты, надзеленыя розумам, мовай, уменнем рухацца, выконваць пэўную работу, перажываць чалавечыя пачуцці:

*Хвалілася* калiначка за ракой:
— Ніхто мяне не высеча за вадой.
*Абазваўся* буйны ветрык на яе:
— Ды *я* ж *цябе* хоць *не высеку*, дык *зламлю*.

***Увасабленне*** — мастацкі прыём, калі нежывым ці неадушаўлёным прадметам і з'явам надаюцца ўласцівасці чалавека або жывых істот.

Увасабленне — разнавіднасць метафары. Увасабленні сустракаюцца вельмі часта. Прыгадайце ўжо знаёмыя вам радкі Якуба Коласа, дзе гаворыцца пра люты мароз:

...*Ідзе* сярдзіта, *пагражае*,
Па даху гонтамі *страляе*;
У завітушках дым бялявы
*Нясе*, як воблак кучаравы,
А потым з ім набок *рванецца*,
Бы пісар-вухар расчаркнецца.



Правообладатель Национальный институт образования

Да прыёму ўвасаблення часта звяртаюцца паэты. Рыгор Барадулін у вершы «Уцякала зіма ад вясны...» намаляваў запамінальную, зрокава выразную карціну, поўную рухаў, фарбаў, пачуццяў, эмоцый.

Увасабленні дапамагаюць аўтарам паўней раскрыць свае пачуцці, сваё паэтычнае бачанне прыроды і стварыць непаўторныя мастацкія вобразы, а чытачам — выразней уявіць карціны навакольнага свету, спасцігнуць задуму паэта, убачыць у звычайнай, будзённай з'яве высокую паэзію.

1. Што такое ўвасабленне? Прывядзіце прыклады з вершаў.
2. Якую мастацкую ролю выконваюць увасабленні ў літаратурным творы?
3. З якой мэтай аўтары выкарыстоўваюць увасабленне ў радках «Паслухайце, вясна ідзе!..» *(Максім Танк)*, «Вольная вясна... радасна ўсміхалася людзям» *(Алена Васілевіч)*?



# Янка Брыль

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая...

*Якуб Колас.*

Янка (Іван Антонавіч) Брыль (1917—2006) — народны пісьменнік Беларусі, празаік, публіцыст, крытык, перакладчык. Нарадзіўся ў Адэсе ў сям'і чыгуначніка. Потым сям'я пераехала на радзіму бацькоў у Заходнюю Беларусь у вёску Загор'е (Загора) (цяпер Карэліцкі раён на Гродзеншчыне). Новыя мясціны, сакавітая беларуская гаворка, народныя святы, абрады, песні моцна ўразілі хлопчыка, ён захапіўся чытаннем, складаннем вершаў (першы верш напісаў у дзевяць гадоў).



Правообладатель Национальный институт образования

Янка Брыль скончыў польскую сямігодку і паступіў у Навагрудскую гімназію, але не змог вучыцца з-за матэрыяльных цяжкасцей. «Кніга, а потым пяро не былі для мяне часовым захапленнем. З чатырнаццаці гадоў... я многа чытаў, настойліва займаўся самаадукацыяй... многія ночы праседжваў над першымі творамі. Пра тое, што я празаік, пачаў думаць даволі рана: захаваліся спробы, адносна нават прыстойныя, з тых дзён, калі я не ўмеў яшчэ як след касіць. Ад думкі, што я паэт — хоць бы, скажам, па сумяшчальніцтве, — канчаткова адмовіўся толькі ў Мінску... Паэты пачынаюцца, відаць, з тых дзён, калі яны наогул пачынаюць захапляцца хараством жыцця, шчасліва, яшчэ падсвядома пакутаваць ад жадання выказаць свае пачуцці. Гэта прыходзіць так рана, што нават хочацца думаць: ты быў заўсёды паэтам, бо ты ніколі не мог ім не быць. А да здзяйснення мары... у кожнага свой шлях... У мяне... было сваё — ціхае, патаемнае, найвялікшае шчасце — пісаць!..»

На пачатку вайны Янка Брыль быў прызваны ў Войска Польскае, служыў у марской пяхоце, трапіў у нямецкі палон, адтуль уцёк, вярнуўся ў Беларусь, быў партызанскім сувязным, разведчыкам, рэдактарам падпольных друкаваных выданняў. Пасля вайны Янка Брыль працаваў у рэспубліканскіх выдавецтвах. Аўтар шэрага аповесцей, апавяданняў, рамана «Птушкі і гнёзды», лірычных мініяцюр, твораў для дзяцей.

Лірычная мініяцюра «Над зямлёй — красавіцкае неба...» увайшла ў кнігу прозы «Жменя сонечных промняў» (1965).

**1.** Якія змены ў прыродзе адбываюцца ў красавіку?
**2.** Прыгадайце народныя прыкметы, звязаныя з надыходам вясны.

* * *

Над зямлёй — красавіцкае неба: ахапкі белых воблакаў, халаднаватая просінь і жаўранкі.

Зямля то светла-шэрая, дзе не хадзіў яшчэ сёлета плуг, то сакавіта-цёмная — і там, дзе яна раскрытая для новых зярнят, і там, дзе ўжо затоена грэецца безліч аўсяных парасткаў.



Правообладатель Национальный институт образования

Сёння ўранку ўжо значна смялей, як учора, ажывае зеляніна руні[1]. Лагодныя шэрыя ўзгоркі ўдалечыні пацягнуты смугой. Паміж вёскамі, на лугавой даліне, цячэ апетая ў сардэчнай песні рэчанька...

На шэрых коціках вербаў гаспадарліва завіхаюцца пчолы. На бярозах над стрэхамі хат ад радасці разводзяць крыламі шпакі.

За ўзгоркам з ночы грукоча трактар. Араты.

Іду на гэты гул. Па чыстай, маладзенькай пасля снегу сцежцы.

1. Ахарактарызуйце настрой, перададзены ў творы.
2. Знайдзіце прыклады ў тэксце, якія сведчаць, што пісьменніку ўласцівы тонкае бачанне і адчуванне прыгажосці прыроды.
3. На якія адметныя рысы красавіка звяртае ўвагу аўтар?
4. Вызначце вобразна-выяўленчыя сродкі мовы, што дапамагаюць Янку Брылю паказаць хараство вясновай прыроды, данесці да чытача свае пачуцці.
5. Разгледзьце на форзацы 2 вучэбнага дапаможніка рэпрадукцыю карціны Фердынанда Рушчыца «Вясна». Якой паўстае вясновая прырода на мастацкім палатне? Апішыце выгляд дрэў, неба, травы. Вызначце настраёвасць карціны. Параўнайце вобразы вясны, створаныя мастаком і пісьменнікам.
6. Падрыхтуйце вусную замалёўку «Першыя цёплыя вясновыя дні», выкарыстоўваючы ўвасабленні, эпітэты, параўнанні.
7. Выкарыстайце інтэрнэт-рэсурсы і падрыхтуйце прэзентацыю фотаілюстрацый «Вясновы настрой».
8. Паслухайце п’есу «Пралеска. Красавік» з фартэпіяннага цыкла Пятра Чайкоўскага «Поры года». Якія пачуцці абудзіла ў вас музыка? Якое пераважае гучанне — мажорнае (радаснае) або элегічнае (самотнае)? Што, на вашу думку, імкнуўся перадаць кампазітар у творы? Ці сугучная музычная п’еса з лірычнай замалёўкай Янкі Брыля і карцінай Фердынанда Рушчыца?
9. Разгадайце рэбус.

[1] *Рунь* — тут: усходы азімых культур.



Правообладатель Национальный институт образования

# *Іван МЕЛЕЖ*



Зямля Беларусі! Вачамі азёраў
Глядзіш ты ў празрыстыя высі нябёс,
Начамі, што яблыкі, падаюць зоры,
Знікаюць па водах, па чорных разорах,
Па травах, абсыпаных кроплямі рос.

*Пятрусь Броўка.*

Іван Паўлавіч Мележ (1921—1976) — народны пісьменнік Беларусі. Нарадзіўся на Палессі, у вёсцы Глінішча Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. Любоў і пяшчоту да бацькоўскай зямлі пісьменнік з цеплынёй і замілаваннем пранёс праз усё жыццё. Іван Паўлавіч гаварыў: «Ёсць у кожнага свой, мілы сэрцу куток, які з бегам гадоў не толькі не цямнее ў памяці, а становіцца як бы яснейшым... ён самы дарагі, самы шчымлівы! Куток гэты — тая хата, дзе мы вучыліся бегаць, дзе чулі цеплыню матчыных рук і цеплыню сэрца, — куток нашага маленства... Жыве ён успамінам у сэрцы...»

Дзяцінства Мележа было такім, як і ў многіх вясковых дзяцей. Вучыўся ў пачатковай школе. Вызначыўся сярод аднагодкаў тым, што здолеў зладзіць драўляны ровар. Колы былі зроблены з двух арэхавых абручоў, але са спіцамі і рамай.

Пазней пісьменнік успамінаў: «Вучыўся я ў ахвоту, амаль усе прадметы даваліся мне добра... З пятага класа мераў зямлю нагамі кожны дзень — і ў студжаньскі сівер, і ў красавіцкае разводдзе, калі, дабраўшыся да ганка школы, чуў, як вада хлюпае ў лапцях. Цяпер сам здзіўляюся той — ад бацькоў і дзядоў, пэўне, — цярплівасці, з якой браў тады ўсе нягоды, нібы і не заўважаў іх».

Першыя спробы Мележа ў літаратурнай творчасці адбыліся яшчэ ў школе. З пачаткам вайны юнак удзельнічаў у гарачых і жорсткіх баях. Ён мог нават страціць правую руку, але яе ўратаваў хірург. Першыя свае апавяданні мусіў пісаць левай рукой, «цяжка, пакутліва».



Правообладатель Национальный институт образования

Іван Мележ — аўтар шэрага апавяданняў, аповесцей, раманаў, п’ес. «Першы іней» — урывак з рамана «Подых навальніцы», напісанага ў 1966 годзе.

Што такое іней? Падбярыце блізкія па значэнні паняцці (сінонімы) да гэтага слова. Пры неабходнасці звярніцеся да слоўніка.

## Першы іней
### *(Урывак з рамана «Подых навальніцы»)*

Былі пагодныя дні. З сонцам ад ранку да вечара, з сінім небам. Днём яшчэ было цёпла, а пад вечар, калі чырвонае сонца сцякала за лес, апусцелая, няласкавая зямля стыла на холадзе. Пад поўнач бяліў яе іней, у ледзяныя звонкія раніцы і трава каля платоў і на выганах, і палі з загонамі яшчэ не скопанай бульбы, і панурыя, учарнелыя стрэхі — усё было па-зімоваму белае. Калі ўздымалася над чэзлым[1] балотным алешнікам сонца, светлае, прамяністае, ад інею аставаліся толькі цемнаватыя плямы вільгаці. Неўзабаве знікалі і яны. Іней трымаўся яшчэ ў цені дрэваў і хат, трымаўся ўпарта, пакуль сонечная цеплыня не дабіралася і сюды.

Неба гэтымі днямі сінела чыстае і глыбокае. Яно не было цяпер такое яркае, як раней, часта атульвала яго белаватая, нібы малочная, смуга, і яно здавалася бляклым, быццам выгаралым за ліпеньскую і жнівеньскую спёку. Сонца таксама было іншае. Аддаўшы амаль увесь свой пал[2] лету, яно берагло рэшткі цяпла, грэла мала, але на дзіва лагодна і пяшчотна. Гэтай лагоднасцю і пяшчотай было напоўнена ўсё ў прыродзе, усе дні.

У лагодным сонечным святле гарэлі сумным адвечным полымем ліпы і бярозы каля хат, дрэвы ў недалёкім лесе. Як сівізна ад былога, ад перажытага, бялела ўсюды павуціна. Яна вісела ў паветры, абчэплівала павялы і пасохлы бульбоўнік, калы і жэрдкі вакол агародаў, пажоўклыя кусты. Усё агартаў спа-

[1] *Чэ́злы* — які слаба расце, хілы (пра расліны).
[2] *Пал* — цяпло, гарачыня.



Правообладатель Национальный институт образования

койны, стары, як свет, смутак развітання з цяплом, з летам, набліжэння слаты[1], халадоў.

1. Вызначце агульны настрой твора. Назавіце эмоцыі, якія пераважаюць у аповедзе.
2. Чым адметная восень у абмалёўцы пісьменніка? Згадайце карціны, якія ўзніклі ў вашым уяўленні.
3. Што адбывалася з інеем, калі ўзыходзіла сонца? Апішыце неба, сонца, дрэвы. Якія вобразы найбольш цікавыя, адметныя?
4. Адшукайце ў тэксце эпітэты, якія абазначаюць колер. Назавіце метафары. Падзяліцеся сваім уражаннем ад вобразаў, створаных пры дапамозе гэтых мастацкіх тропаў.
5. Якімі здольнасцямі і якасцямі, на вашу думку, павінен валодаць пісьменнік, каб так тонка адчуваць і маляваць прыроду?
6. Падрыхтуйце выразнае чытанне твора.
7. Разгадайце рэбус.

# *Максім ТАНК*



Я толькі частку невялічкую
Змог праспяваць
Таго, што расказалі мне
Вятры, дарогі,
Валуны і рэкі,
Лясы і зоры...

*Максім Танк.*

Максім Танк (сапраўднае імя Яўген Іванавіч Скурко) (1912—1995) — народны паэт Беларусі. Нарадзіўся ў вёсцы Пількаўшчына (цяпер Мядзельскі раён Мінскай вобласці). У аўтабіяграфіі Максім Танк адзначаў: «Першую зіму я правучыўся дома, а другую — у вёсцы Шкленікова, дзе адкрылася ў той час польская

[1] *Слата́ (сло́та)* — вадкая гразь на зямлі, на дарогах.



Правообладатель Национальный институт образования

пачатковая школа. Цяжка было прывыкнуць да новай школы, дзе забаронена было дзецям гаварыць на рускай і беларускай мовах.

У чытанках, якія былі тут у нас, на першай старонцы красаваўся верш: “— Кто ты естэсь? — Поляк малы...”. Амаль кожны дзень нас выклікаў настаўнік і ў залежнасці ад таго, як вучань чытаў гэты верш, ставіў яму адзнакі па ўсіх прадметах: па польскай мове, арыфметыцы, геаграфіі, гісторыі, спевах і нават Закону Божаму.

Першая кніга, якая пакінула незабыўнае ўражанне, была кніга М. Гогаля “Вечера на хуторе близ Диканьки”. Потым Пушкін, Лермантаў, Някрасаў, Шаўчэнка... Я любіў вершы. Ведаў цэлыя паэмы на памяць... За гады сваёй вучобы ў Шкленікове і ў Сватках я прачытаў амаль усе кнігі ў школьнай бібліятэцы: Міцкевіча, Славацкага, Сянкевіча, Крашэўскага, Ажэшкі, Канапніцкай».

Максім Танк працягваў адукацыю ў гімназіях Вілейкі, Радашковіч, Вільні, аднак яго выключалі за вальнадумства. У Вільні юнак пазнаёміўся з лепшымі ўзорамі сусветнай паэзіі, змог атрымаць доступ у дзяржаўныя, грамадскія і прыватныя бібліятэкі.

Вялікая Айчынная вайна застала Максіма Танка ў Беластоку. Паэт папрасіўся на перадавую. Суровая праўда вайны ўвасоблена ў яго вершах, паэмах, газетных публікацыях. У аўтабіяграфіі Максім Танк адзначаў: «Не шмат каму з нас, хто пачаў свае песні ў гады няволі, выпала шчасце сустрэць сонца свабоды над сваёй Радзімай і быць не толькі песняром народнага гора, але і вялікага яго шчасця».

Паэтычная спадчына Максіма Танка надзвычай багатая і разнастайная. Яго паэтычнаму таленту былі падуладныя розныя жанры. Шмат твораў (вершаў, баек, казак) Максім Танк напісаў для дзяцей («Ірынка», «Галінка і верабей», «Як вясна прыйшла», «Бусел», «Журавель і Чайка», «Жук і Слімак» і інш.).

Верш «Восень» — адзін з маляўнічых паэтычных пейзажаў аўтара.



Правообладатель Национальный институт образования

## Восень

Над палямі хістаўся пашчэрблены месяц,
Вецер дзьмуў, і шумеў па-над Нёманам бор.
Восень вецце сухое зграбла і на ўзлессі
Падпаліла пагрэцца начлежны касцёр.

Падпаліла касцёр, прылягла у тумане,
Ды кароткім быў гэты пад зорамі сон:
Крык трывожны птушыны збудзіў яе рана,
Па зямлі ад кастра разліваўся агонь.

Загарэліся гнёзды, і іскры пажару
Пачала яна з птушкамі, з ветрам гасіць.
Толькі полымя ўжо разлілося ў імшарах,
Па лясах і палях, па курганах брусніц.

І па сённяшні дзень восень жару не можа
Пагасіць на зямлі, ходзіць з краю у край,
Залівaючы ліўнямі ў полі бярозы
І цалуючы кожны рабінавы гай.

1. Вызначце агульную настраёвасць верша. Якія эмоцыі і пачуцці (замілаванне, хваляванне, здзіўленне, трывогу, лёгкі смутак, шкадаванне, ціхі роздум, стоенае захапленне) выклікаў гэты твор?
2. Якой паўстае восень ва ўяўленні паэта? Прыгадайце карціны або дэталі паэтычнага пейзажу, што вас уразілі, запомніліся вам. Падрыхтуйце калектыўны кадраплан верша.
3. Пракаменціруйце паэтычныя радкі: *І па сённяшні дзень восень жару не можа // Пагасіць на зямлі, ходзіць з краю у край*. Пры дапамозе якога мастацкага прыёму створаны вобраз восені?
4. Знайдзіце ў вершы іншыя мастацкія тропы — эпітэты і метафары, вызначце іх ролю ў стварэнні паэтычнага малюнка.
5. Услухайцеся ў гучанне верша. Ці можна пакласці яго на музыку? Якая мелодыя, на вашу думку, адпавядае гэтаму твору? Вызначце характар яе гучання, тэмп, сілу гуку.



Правообладатель Национальный институт образования

6. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Юрыя Корнікава «Залатая восень». Ці сугучная яна па настраёвасці і вобразах з вершам Максіма Танка? Што надае карціне рэалістычнасць? Якія колеры пераважаюць на ёй?



*Ю. Корнікаў.* Залатая восень

7. Раскажыце пра сваё наведванне восеньскага лесу або парку. Што найбольш запомнілася? Узнавіце вашы ўражанні ў памяці і падрыхтуйце невялікую вусную замалёўку «Восень — чароўная пара».

8. Выканайце заданне па тэме.



# Іван ГРАМОВІЧ

А каб цанілі вас у свеце
(Я лепшых слоў не падбяру),
Шануйце дзіва на планеце —
Святую нашу Беларусь.

*Алесь Ставер.*

Іван Іванавіч Грамовіч (1918—1986) нарадзіўся ў вёсцы Закружка Мінскай губерні (цяпер Мінскі раён Мінскай вобласці) у сялянскай сям'і. Пачаў друкавацца з юнацтва. У час Вялікай Айчыннай вайны служыў у артылерыйскіх часцях палітработнікам і камандзірам, пісаў нарысы ў франтавыя газеты. Пасля вайны працаваў у рэдакцыях рэспубліканскіх літаратурных часопісаў, на кінастудыі «Беларусьфільм».

Творы Івана Грамовіча апавядаюць пра мужнасць і гераізм людзей у час вайны, пра цяжкасці, перажытыя імі ў пасляваенныя гады, падымаюць важныя праблемы. Пісьменнік тонка адчуваў і маляваў прыроду.



Правообладатель Национальный институт образования

Іван Грамовіч — аўтар шматлікіх аповесцей, апавяданняў, нарысаў, успамінаў, сцэнарыяў дакументальных фільмаў. Юным чытачам адрасаваны зборнікі апавяданняў «Першага верасня», «Сонца скрозь воблакі», «Як вясну рабілі». Творы для дзяцей прасякнуты рамантыкай, у іх аўтар перадае радасць жыцця, захапленне хараством свету. Апавяданне «Воблакі» — адно з іх.

Якія думкі, развагі, асацыяцыі ўзнікаюць у вас, калі глядзіце на воблакі?

## Воблакі

Калі што ёсць найпрыгажэйшае ў свеце, то, бадай, гэта воблакі...

О, як яны збіраюцца! Як плывуць і растаюць у сіняве! Не наглядзецца, не налюбавацца!

...Вось мая чарада авечак збілася ў гурт. Полудзень. Спёка.

Ляжыш на пагорку. Глядзіш у неба. Над табою — позіркам не абняць — блакітная шырыня. Ты адзін перад усёй гэтай бязмежнай, нямой глыбінёй, з вока на вока, толькі, здаецца, матухна-зямля злёгку трымае цябе за плечы. Ледзь-ледзь. Здаецца, адарвешся і паляціш у гэта блакітнае бяздонне...

Аж страшна.

Страшна, а хочацца паляцець, паплысці. Хораша!

Воблакі, нібы табун на сінім полі. Адкуль яны?

Куды нясуцца?

Не, яны не застылі. Яны плывуць.

Клубкамі растуць. Вырастаюць. Гэта, што было наперадзе, застаецца ззаду. Яго абганяе сярэдняе... Нібы рукой, абняло сяброўку. А сяброўка робіцца меншай, радзейшай. Ды яна ж нікне, растае! А побач белым круглым купалам шуганула, узнялася суседка-хмара...

Як цудоўна!

Не наглядзецца на воблакі ў бязветраны дзень. Яны могуць расці, вырастаць, могуць знікаць, як дым. Могуць клубіцца на адным месцы і разрастацца ўшыркі. І зрабіцца велічэзнай цяжкай



Правообладатель Национальный институт образования

хмарай. (Тады дзед кажа — збіраецца на дождж.) Гэта хмара насупліваецца, як бы згушчаецца, чарнее, і раптам грымне гром, і з яе ўмомант пасыплецца дождж. Буйныя серабрыстыя кроплі яго будуць сыпацца на зямлю, а непадалёку — глянеш — асветлены сонцам, стаіць зялёна-залаты лес. Дрэвы цешацца, пазіраючы ўгору. Ім свеціць сонца.

У ветраны дзень часцей бываюць нізкія воблакі. Яны імчацца па небе на адной вышыні, як ганцы. Шпарка, без аглядкі, гуртам. Сонца між іх то выгляне, то схаваецца.

На балоце між густых алешын пасуцца авечкі. Тут зацішак... А зірнеш угору, вышэй верхавіння дрэў, туды, дзе бягуць шпаркія воблакі, бягуць здалёк ці зблізку, і падумаеш: гэта жыццё імкліва бяжыць. Якое яно імклівае!.. Дзесьці стаяць людныя гарады. Людзі там спяшаюцца, мусіць, як і гэтыя воблакі... Тут не адчуваеш тых нястрымных плыняў. Наляціць віхор, кране вяршáліну алешыны. Яна зашапаціць і супакоіцца.

Толькі воблакі могуць расказаць пра нястрымны рух жыцця.

Іх трэба навучыцца чытаць і разумець. Воблакі бываюць высокія і нізкія. У два паверхі і нават у тры. Ёсць рэдкія і суцэльныя. Ёсць воблачкі. Ёсць хмаркі. Ёсць пахмаркі.

Адны прыносяць яснасць, пагоду, другія — непагадзь і навальніцу.

Воблакі ўпрыгожваюць неба, апранаюць яго. То, бывае, усё яго паб'е на груды. То воблачная града шлейфам-шалікам працягнецца ад небасхілу да небасхілу. То коўдрай зацягне ў адным баку. То серабрыстымі фіранкамі[1] перыстыя хмаркі доўга вісяць на вялікай вышыні...

Я яшчэ ніколі не бачыў гор. Дзе ім быць у нас на Міншчыне! А воблакі ў маім уяўленні малявалі стромкія кручы[2]. З воблакаў выраслі высачэзныя хрыбты і непраходныя цясніны. Зіхацелі беласнежныя шапкі вяршынь, і цямнелі пячоры з вечным змрокам. А калі сонца хавалася за лес, статак ішоў у сяло, — на супрацьлеглым ад захаду небасхіле віднеўся цэлы ланцуг гор. Сапраўдныя

[1] *Фірáнка* — занавеска, шторка з тонкай тканіны.

[2] *Крýча* — круты спуск, абрыў.



Правообладатель Национальный институт образования

хрыбты і недасягальныя пікі горных вяршынь. Так перада мной паўставалі яшчэ ніколі не бачаныя Казбек, Эльбрус, Эверэст...

Я ніколі яшчэ не бываў у заапарку або звярынцы, але слана ўпершыню чамусьці ўгледзеў у хмарах. Плыла такая вялікая шэрая хмара з галавой, з хобатам. І вочы мела. І ногі... Дзе мне бываць было ў казачнай краіне, там, дзе цёплыя воды, там, дзе растуць райскія дрэвы! Але пейзажы мора, сінь вечна бясхмарных нябёс я шмат разоў бачыў, наглядаючы воблакі...

Я не ведаў яшчэ, што такое вайна. А ўжо ў маленстве ў хмарах бачыў бойкі нашых з ворагам. Там грымелі гарматы. Імчалася чырвоная конніца. Тачанка з кулямётам. З-за пляча агромністым мячом замахваўся асілак у шлеме. А ля яго корчылася, выгіналася шэра-цёмная гадзюка. З пашчы ў яе бліскаў агонь... Потым гадзюка распадалася на кавалкі, што бруднымі плямамі яшчэ колькі часу плылі па небе...

Я не бачыў выбухаў бомб і снарадаў. А воблакі нагадвалі мне гэта. Аднойчы куст полымя і дыму вырас у небе, нібыта дзікая груша на палетку, і доўга шугаў перад маімі вачыма ў надхмар'і.

Я любіў глядзець на воблакі. Глядзець і думаць...

Найбольшая прыемнасць — глядзець на воблакі ў летнія, пагодлівыя дні, калі ў небе лётаюць птушкі. Вясною — жаваранкі. А ўлетку — ластаўкі і стрыжы. Ласкава чылікаючы, з імклівым свістам яны праносіліся над галавой.

А ўвосень надта падабалася, як высока-высока плавалі буслы. Павольна, не махнуўшы крылом, яны плавалі, збіраючыся ў вырай. Плавалі па крузе, узнімаючыся вышэй і вышэй... Вышэй воблакаў!..

Тады хацелася лятаць самому.

Толькі шэрыя і пахмурна-зімнія воблакі былі не па сэрцу.

Сэрца заўсёды хвалявала навальніца...

У навальніцу ўсё трапяталася ў грудзях. Я бачыў, як хмары ляцелі ў розным кірунку. Яны страчаліся. Усё бушавала. Усё ў паветры кіпела. Усе воблачкі, усе хмары і пахмаркі з-пад сонечнай вышыні. Навальнічныя перуны таўклі іх, як месіва, і секлі агністымі маланкамі. Гром адгукаўся ў сэрцы...



Правообладатель Национальный институт образования

Страшнавата было. Асабліва ў лесе…

А ў сонечны дзень, бывала, сяджу, гляджу… Здаецца, такіх воблакаў, як сёння, не бачыў ніколі. І, здаецца, не ўбачу…

Цудоўна!

І так штодня.

Бо воблакі, як само жыццё. Жыццё цячэ — хмаркі бягуць. То бываюць цёмнымі, то яснымі. То спакойнымі, то неспакойнымі… Не налюбуешся на іх, як на само жыццё.

Ці бачылі вы, як хаваецца сонца ў агністыя падушкі?

Або як ноччу месяц усплывае на неба… І зорачку каля яго малюсенечкую ўначы бачылі? А хмары падплываюць да месяца. Белыя, серабрыстыя краі, нібыта ўдзень.

Такога дзіва не знойдзеш і ў казцы. Хмары і воблакі — гэта мары маленства. Мары аб сталасці. Аб пазнанні нязведанага.

* * *

Калі я ўпершыню ляцеў на самалёце, пры пасадцы вельмі прасіў лётчыка праляцець скрозь воблакі. Або над самымі воблакамі, блізка-блізка…

Лётчык паслухаў мяне. Наш самалёт, у якім мы ўчацвярых, нядаўнія студэнты, ляцелі, раптам крылом дакрануўся да першага воблачка. Дзверы кабіны пілота адчыніліся, і лётчык крыкнуў, штосьці паказваючы пальцам. Але за грукатам матора голас нельга было пачуць. Я падумаў, што нешта здарылася. Усё магло быць… Я ўстаў і падышоў да пілота.

— Бяры воблакі рукамі! — крыкнуў ён.— Бяры, ты ж хацеў…

Я зразумеў яго. Упершыню пада мной плылі лёгкія, як туман на світанні, рэдкія воблачкі. Плылі мары майго маленства. І тут я згледзеў чараду кароў на лузе. Ля іх малюпасенькую кропку — пастушка…

Мы сапраўды ляцелі між хмар. Унізе воблакі маленства, а ўверсе — па-ранейшаму слаўся пласт зноў недасягальных аблокаў на вышынях.

1. Што незвычайнае ў абмалёўцы аўтарам воблакаў?
2. Ці ўсе воблакі аднолькавыя? Што яны нагадваюць аўтару? Якога памеру і колеру воблакі?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Вызначце сродкі мастацкай выразнасці мовы, якія дапамагаюць пісьменніку перадаць прыгажосць воблакаў і неба.

4. Паразважайце, чаму воблакі — *гэта мары маленства, мары аб пазнанні нязведанага*. Калі вам даводзілася бачыць незвычайныя воблакі, апішыце іх, звярніце ўвагу на дэталі, раскажыце пра свае адчуванні ад *найпрыгажэйшых у свеце воблакаў*.

5. Пракаменціруйце наступныя радкі: *Воблакі, як само жыццё. Жыццё цячэ — хмаркі бягуць. То бываюць цёмнымі, то яснымі. То спакойнымі, то неспакойнымі... Не налюбуешся на іх, як на само жыццё.*

6. У апавяданні ёсць сказы са шматкроп'ем. Чаму аўтар час ад часу «замаўкае»? Паспрабуйце развіць думкі пісьменніка, прадоўжыць іх.

7. Разгледзьце рэпрадукцыі карцін Уладзіміра Масленікава «Воблачны дзень» і Паўла Масленікава «Поўдзень». На мастацкіх палотнах — летні дзень. Звярніце ўвагу на кампазіцыю карцін, на колеры і іх спалучэнні пры стварэнні вобразаў кожным з мастакоў. Параўнайце пейзажы з літаратурным апісаннем поўдня (у пачатку твора). Якая са згаданых карцін больш сугучная з літаратурным творам? Выкажыце свае меркаванні.



*У. Масленікаў*. Воблачны дзень



*П. Масленікаў*. Поўдзень

8. Раскажыце, якімі ўяўляюцца вам аблокі ў розныя поры года, надвор'е, час сутак. Выпішыце з «воблака слоў» эпітэты, што найбольш дакладна перадаюць зменлівасць, харacтво, непаўторнасць аблокаў. Падрыхтуйце пра іх кароценькую замалёўку.

9. Разгадайце рэбус, выканайце заданне па тэме.






Правообладатель Национальный институт образования



# Чалавек — гэта цэлы свет



## *Алена ВАСІЛЕВІЧ*

Шануйце, дзеці, дружбу, гэта самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека.

*Кузьма Чорны.*

Алена Сямёнаўна Васілевіч (1922—2021) нарадзілася ў вёсцы Ліпнікі Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і ляснога аб'ездчыка. Дзяўчынка на восьмым годзе жыцця засталася без бацькоў і выхоўвалася ў сваякоў. Пра няпросты шлях сялянскай дзяўчыны-сіраты ў новае жыццё пісьменніца расказала ў аўтабіяграфічных аповесцях «Расці, Ганька», «Доля знойдзе цябе», «Новы свет», «Пачакай, затрымайся...».

Алена Васілевіч атрымала прафесію настаўніка. У час вайны працавала бібліятэкарам у шпіталі. Пасля вайны скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, працавала ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».



Правообладатель Национальный институт образования

Першы мастацкі твор Алены Васілевіч (аповесць «У прасторах жыцця») быў надрукаваны ў 1947 годзе. На яе пісьменніцкім рахунку шэраг твораў пра жыццё, працу, побыт, асабістыя ўзаемаадносіны людзей, выхаванне дзяцей. Дзецям прысвечаны шматлікія творы («Заўтра ў школу», «Калінавая рукавічка», «Горкі ліпавы мёд» і інш.).

Апавяданне «Сябры» пабачыла свет у 1958 годзе.

**1.** Каго можна назваць сябрам, прыяцелем, таварышам?
**2.** Прыгадайце вядомыя вам прыказкі пра сяброўства.

## Сябры

Лёня Саўчанка і Грыша Міхневіч вучыліся ў адным класе, сядзелі за адной партай і жылі на адной кватэры. У школе ўсе казалі, што іх і вадой не разальеш. І гэта сапраўды было так. Калі на вуліцы, гуляючы ў снежкі, Грыша адчуваў сябе пераможаным, то на дапамогу ён клікаў Лёню. І наадварот, Лёня, які вучыўся слабей за Грышу, па дапамогу звяртаўся таксама толькі да сябра. Грыша ніколі не адмаўляўся, а толькі трос Лёню за чуб і прыгаворваў:

— Эх ты, галава — два вухі!

Лёня вырываўся з сябравых рук і нязлосна пагражаў:

— Пусці, а то як трэсну!..

— Ану, давай паспрабуем, хто каго адолее... — зухавата падстаўляў плячук Грыша.

Лёню не хацелася паддавацца.

Хлопцы браліся дужацца і, падскокваючы, нібы два пеўні, намагаліся адзін аднаго перахітрыць, падставіць ножку і пакласці, як сапраўдныя барцы, на абедзве лапаткі. Нязлосныя тумакі[1], вядома, не ішлі ў разлік. Іх хапала і пераможцу, і пераможанаму.

Сварка, тая сварка, якая звычайна так прыніжае ў нашых вачах людзей, адбылася паміж імі зусім нечакана.

Грыша Міхневіч, якому вучоба давалася без асаблівых цяжкасцей, меў у сваім характары адну дрэнную рысу. Ён быў

[1] *Тумáк* — штуршок, удар кулаком.



Правообладатель Национальный институт образования

упэўнены, што выдатныя адзнакі заслужана ўпрыгожваюць толькі яго дзённік, а ўсім астатнім вучням яны ставяцца проста так, невядома за што...

Усё адбылося ў суботу, пасля раздачы кантрольных па алгебры. Быццам у насмешку, на гэты раз амаль палова класа атрымала пяцёркі, а яму, Грышу Міхневічу, лепшаму вучню ўсёй школы, паставілі нейкую там няшчасную чацвёрку! І за што? За адзін толькі прапушчаны знак!

Пяцёрку атрымаў і Лёня Саўчанка.

Не могучы схаваць сваё расчараванне, Грыша ўзяў Лёнеў сшытак і, насмешліва разглядаючы яго, голасна, каб пачуў настаўнік, сказаў:

— Цікава выходзіць: хто спісваў, у таго пяцёрка, а хто сам рашаў...

— А хто ў цябе спісваў? — загарэўся Лёня.

— Ты спісваў, — з незалежным выглядам сказаў Грыша. — Ты ж мінулы раз у такім ураўненні з двума невядомымі зрабіў памылку...

— Мінулы раз зрабіў, а на гэты раз вывучыў і не зрабіў!

Тут умяшаўся настаўнік і спыніў іх спрэчку.

А пасля ўрокаў, калі Грыша і Лёня ішлі дадому, у суседнюю вёску, — вучыліся яны ў мястэчку і жылі на кватэры, — тая спрэчка адчулася зноў.

Хлопцы спяшаліся завідна мінуць густы дрымучы лес. Тыдзень назад Лёнеў бацька сустрэўся тут з воўчай зграяй.

Грыша ішоў наперадзе, Лёня, які летам упаў з грушы і зламаў нагу, накульгваў з палачкай ззаду. Ісці было цяжка. Круціла і замятала дарогу мяцеліца. Ужо змяркалася, а да лесу заставаўся яшчэ ладны кавалак нялёгкага шляху.

— Давай адпачнём крышку, я не магу так хутка ісці, — сказаў Лёня.

Грыша зрабіў выгляд, што не пачуў, і нават не запаволіў кроку.

— Давай адпачнём, у мяне нага баліць, — мацней паўтарыў Лёня.

— Дома адпачнеш, — не спыняючыся і не аглядаючыся, буркнуў Грыша.



Правообладатель Национальный институт образования

— Да дому яшчэ далёка.

— Дык што ж, мы праз тваю нагу ў лесе будзем начаваць?

— Ну і можаш ісці...

Раней, бывала, калі хто-небудзь з хлопцаў стамляўся ці папраўляў абутак, другі абавязкова чакаў яго, бо ведаў: лепшая надзея і дапамога ў дарозе — таварыш.

Лёня кінуў партфель на снег, сеў на яго і выпрастаў хворую нагу.

Уперадзе, у сівой завірусе, ледзь бачна была постаць сябра.

Лёня доўга не сядзеў.

Як толькі адышла нага, ён устаў і, абапіраючыся на палку, рушыў далей. Постаць Грышы ўжо ледзь-ледзь віднелася ўдалечыні. Хутка яна і зусім знікла. Наперадзе чарнеў лес.

Хлопчык азірнуўся. Незразумела адкуль узяўся страх. Успомнілася воўчая зграя, ад якой ледзь уратаваўся бацька. І, мусіць, наўрад ці ўратаваўся б, каб не запалкі і салома ў санях. Міжвольна Лёня памацаў свае кішэні і ўспомніў: запалкі і смалякі, якія дала ім на дарогу гаспадыня кватэры, засталіся ў Грышы ў партфелі.

Хутчэй дагнаць яго! Або лепей гукнуць, каб пачакаў... Лёня наддаў кроку, але так і не гукнуў. Навошта? Грыша будзе потым у школе нос задзіраць і ўсім хваліцца, што Лёня без яго і дадому дайсці не мог.

А Грыша ішоў сабе наперад. Ён не бачыў, як садзіўся адпачываць Лёня. Ён думаў, што Лёня ідзе ззаду і не хоча гаварыць з ім, бо лічыць сябе пакрыўджаным. Аглядацца і пачынаць гаворку самому Грышу не хацелася. Зноў успомнілася Лёнева пяцёрка, і зноў нядобрае пачуццё завалодала Грышам. «Падумаеш, выдатнік знайшоўся. Больш чым на тройку не выцягнуў бы, каб не спісаў...»

Праўда, Грыша не быў цвёрда перакананы, што Лёня спісваў... Але ён ніяк не мог прымірыцца са сваёй чацвёркай і Лёневай пяцёркай па алгебры.

Зайшоўшы глыбей у лес, Грыша ўсё ж парашыў азірнуцца. Яму зрабілася страшна ісці лесам у такую завіруху аднаму. Ён пастаяў, пачакаў крыху. Лёні не было відаць. Тады Грыша



Правообладатель Национальный институт образования

вырашыў вярнуцца і пайсці сябру насустрач: відаць, і сапраўды ў яго моцна балела нага, калі ён застаўся гэтак далёка ззаду... Ужо зусім сцямнела. І раптам хлопца ахапіў страх. Было так страшна, што ў Грышы не хапіла адвагі гукнуць, паклікаць сябра... Дзе ён падзеўся? Можа, вярнуўся ў мястэчка, на кватэру? Трэба хутчэй бегчы дамоў і расказаць пра ўсё, што адбылося. Так, так. Хутчэй дадому!

І Грыша пабег.

...Праз лес ішлі дзве дарогі. Адна да вёскі, дзе жылі хлопцы, другая да балота, дзе стаялі стагі суседняга калгаса. Упоцемку лёгка было зблытаць дарогі, і Лёня, стомлены і пакрыўджаны, не заўважыў, як павярнуў направа, да балота...

* * *

У той вечар цётка Насця, Лёнева маці, прасявала на сіта муку. Бацька сядзеў на зэдліку[1], падшываў валёнкі.

— І трэба ж, гэтак мяце і круціць — свету белага не відаць, — ссыпаючы прасеяную муку, заклапочана прамовіла маці.

— Пара прыйшла, дык мяце і круціць. Летам не будзе месці, — азваўся Ігнат.

— Хаця б Лёня не надумаўся ў гэткую нягоду ісці.

— Не павінен, я казаў, каб не хадзіў...

У сенцах каля дзвярэй пачуўся шоргат. Відаць, ішоў нехта чужы, бо не мог знайсці клямку. Насця адчыніла дзверы, і парог пераступіла суседка.

— Добры вечар вам, — прывіталася яна. — А я ніяк клямку не намацаю.

— І не кажыце: я і сама часам паўгадзіны стаю пад дзвярыма, — падтакнула гаспадыня.

— Што гэта вы, пірагі надумаліся пячы, ці што? — звярнулася да Насці суседка.

— Ды вось малыя захадзіліся: спячы ды спячы. Хачу цеста паставіць.

[1] *Зэ́длік* — хатняя пераносная лаўка, услончык.



Правообладатель Национальный институт образования

— Яно ж пэўна, — паспешліва згадзілася суседка і з нейкай ненатуральнай цікавасцю запытала: — А дзе ж гэта ваш Лёня, хіба не прыйшоў яшчэ?

— Няма. Куды ён пойдзе ў такую непагадзь? У тую нядзелю я загадаў ім — і свайму, і вашаму, — каб сядзелі на кватэры і не хадзілі... — адказаў Ігнат.

— Бацюхны мае! — раптам губляючы ранейшы тон, спалохана пляснула далонямі суседка. — А мой жа Грышка прыйшоў і кажа, што ваш Лёня ў дарозе адстаў ад яго... Я і пабегла даведацца, ці не дома ён.

Насця ажно выпусціла з рук сіта.

— Дзе ж ён, мой сыночак?! І чаму ж гэта яны не разам ішлі?

— Не ведаю, што ў іх там здарылася, бо мой нейкі вельмі сумны прыйшоў. Нават нічога ў рот не ўзяў.

— А людцы ж мае! Апранайся, Ігнат, ды бяжы хутчэй наканюшню, едзь шукаць!..

Ігнат праехаў лес і, так і не сустрэўшы Лёню, вырашыў, што хлопцы ў дарозе, напэўна, пасварыліся, а мо нават і пабіліся, і Лёня вярнуўся назад на кватэру. Ён шпарчэй пагнаў каня... Уехаў у мястэчка. Трывожна пастукаў у дзверы дома, дзе кватаравалі хлопцы. На стук выйшла гаспадыня і, усхваляваная пытаннем Ігната, блытаючыся, пачала расказваць, што Лёня і Грыша адразу ж пасля ўрокаў разам пайшлі дадому. Яна казала ім, каб пераначавалі, але яны не паслухалі.

Тады Ігнат падумаў, што Лёня, напэўна, збіўся з дарогі і пайшоў на балота. Ад гэтай думкі яму аж горача зрабілася: балота яшчэ добра не замерзла і мясцінамі правальвалася.

Конь стаміўся і ўжо не мог бегчы, але Ігнат усё паганяў яго і паганяў. Вось нарэшце і балота. Вунь ужо зачарнелі стагі.

— Лёнька-а! — гукнуў у завіруху і цемень ночы Ігнат.— Сынок!..

— О-ок! — глуха адгукнулася яму ноч.

— Лёнька-а! Лёня-а! — зваў бацька.

— А-а-а! — тонкім голасам адклікнуўся яму нехта здалёку.

— Сынок! Лёня! — мацней закрычаў Ігнат.

— Я ту-ут! — усё гэтак жа тонка данеслася з цемры.



Правообладатель Национальный институт образования

Ігнат пагнаў каня на голас.

— Лёня-а! Лёня-а!..

...Лёня сядзеў пад стогам увесь мокры і скарчанелы. Здарылася якраз тое, чаго баяўся Ігнат: доўга блукаючы па балоце, хлопец праваліўся ў незамерзлую багну і, ледзь выбраўшыся з яе, насілу дацягнуўся да стога.

Бацька скінуў з сябе кажух, захутаў у яго Лёню і зноў хутчэй пагнаў каня.

— Патрымайся яшчэ, сынок. Зараз будзем дома.

Расцёрты спіртам і закручаны ў суконныя хусткі і коўдры, пад раніцу Лёня пачаў трэсціся ад холаду і трызніць. Пачыналася тое, чаго так цяжка было пазбегнуць: запаленне лёгкіх.

* * *

Неяк раніцай у нядзелю, калі Лёня ўжо ачуньваў, у сенцах пачулася нясмелае тупанне, потым дзверы адчыніліся, і ўвайшоў Грыша Міхневіч. Збянтэжаны, з пакункам у руках, ён доўга абмятаў ля парога валёнкі, ніяк не адважваючыся ні прывітацца, ні прайсці далей.

— Ну, даволі ўжо, праходзь, а то валёнкі парвеш, — не вельмі ветліва сустрэла хлопца Лёнева маці.

— Я, цётка, да вас... Можна?

— А чаму ж няможна? Ці даўно ты не вылазіў ад нас, а зараз гэтакі далікатны зрабіўся, што нават дазволу пытаеш...

Над Грышам злітаваўся Ігнат.

— Праходзь, брат, — падбадзёрыў ён хлопца. — Распранайся ды раскажы Лёню, якія вы ўрокі там прайшлі без яго.

— Я прынёс... я пакажу, — крыху пасмялеўшы, падышоў да стала Грыша.

Чамусьці не адважваючыся наблізіцца да Лёні, ён здалёку звярнуўся да яго:

— Я вось табе, Лёня, прынёс... Мая маці прыслала... — і, паклаўшы на стол пакунак, ён дастаў з яго некалькі яблыкаў і маленькі гладышык. — Гэта мама табе ліпавага мёду прыслала. Кажуць, вельмі памагае, калі з гарачым чаем піць...



Правообладатель Национальный институт образования

— Бач, які ты зараз добры зрабіўся, — зноў не стрымалася Лёнева маці.

Але бацька перабіў яе:

— Што было, тое быллём парасло. Усё прайшло, і няма чаго перагаворваць... Праходзь, брат, бліжэй да Лёні ды расказвай.

— Я зараз, — падсоўваючы да Лёневага ложка крэсла, ахвотна паабяцаў Грыша. — Я ўсё прынёс, усё пакажу...

Лёня глядзеў на Грышу шчаслівымі вачыма. Хлопцы даўно не бачыліся, даўно не вучылі разам урокаў, не дурэлі.

— Сядай сюды, на ложак, — Лёню здавалася, што так яны будуць бліжэй адзін да аднаго. — І ўсё расказвай...

— Раскажу! Усё раскажу.

Зразумеўшы, што ён памілаваны, Грыша перасеў на ложак да Лёні.

— Перш за ўсё скажу табе, брат: ну і даў тады мне бацька лупцоўку!.. — з выглядам самага шчаслівага чалавека на свеце пахваліўся Грыша.

— За што лупцоўку? — не зразумеў Лёня.

— За што, за што?.. Варта было, дык і даў... А класнаму я сам усё расказаў... Усё, як было.

— Ну, гэта ты ўжо зусім дарэмна зрабіў...

— Не дарэмна! Я тады нават хацеў, каб мяне са школы выключылі.

— Вось дурань!

— Дурань, ды не таму... Ну што, пачнём з геаметрыі?

— Давай з геаметрыі...

1. Як вы думаеце, чаму аўтар даў такую назву свайму твору?
2. У чым заключаецца сэнс сапраўднай дружбы? Выкажыце свае меркаванні на аснове зместу гэтага твора.
3. Што аб'ядноўвала Лёню і Грышу? Якім вы ўяўляеце Лёню?
4. Ці быў Грыша па сваім характары падобны да сябра? Чым Грыша вылучаўся сярод вучняў?
5. Як узнікла на ўроку сварка? Пракаменціруйце словы Алены Васілевіч: *Сварка, тая сварка, якая звычайна так прыніжае ў нашых вачах людзей, адбылася паміж імі зусім нечакана*.



Правообладатель Национальный институт образования

6. Раскажыце пра вяртанне хлопчыкаў дадому. Ацаніце паводзіны Грышы.
7. Як трымалася маці Грышы ў Саўчанкавай хаце? Як паставіўся бацька Грышы да ўчынку сына?
8. Прачытайце па ролях эпізод, калі Грыша прыйшоў наведаць хворага сябра. Як сустрэлі яго Лёневы бацькі і сам Лёня? Што адчуваў кожны з сяброў пры сустрэчы? Пастарайцеся пры чытанні перадаць іх унутраны стан.
9. Які жыццёвы ўрок атрымалі хлопчыкі?
10. Чаму гэта апавяданне з'яўляецца надзённым у наш час?
11. З «воблака слоў» выберыце якасці, якімі вам хочацца валодаць.
12. Раскажыце пра свайго сябра (сяброўку).
13. Разгадайце рэбус, выканайце заданне па тэме.




## ПРА АПАВЯДАННЕ

Вы прачыталі апавяданне Алены Васілевіч «Сябры». Героі яго — хлопчыкі-аднакласнікі Лёня Саўчанка і Грыша Міхневіч. У творы таксама дзейнічаюць іншыя персанажы — настаўнік, бацькі Лёні і Грышы. Асноўная падзея — спрэчка хлопчыкаў — адбываецца на працягу дня: пачынаецца на ўроку ў класе і працягваецца па дарозе дадому, калі Грыша пакідае Лёню аднаго. У выніку Лёня, пакрыўджаны, хворы і знясілены мяцеліцай, збіваецца ў цёмным лесе з дарогі і трапляе ў балота. Вечарам бацька Лёні знаходзіць сына, стомленага, змерзлага, далёка ад вёскі. Пра Лёневу хваробу, яго перажыванні мы можам толькі здагадвацца, бо аўтар пра гэта не расказвае. Апавяданне заканчваецца эпізодам, калі Грыша нарэшце прыходзіць наведаць хворага сябра.

Твор невялікі па памеры, аднак ён апавядае пра знакавы выпадак у жыцці хлопчыкаў. Падзеі аднаго дня прымусілі сяброў усвядоміць цану дружбы, зразумець, як яны неабходны адзін ад-



Правообладатель Национальный институт образования

наму. А Грыша за свой не варты павагі ўчынак атрымаў не толькі лупцоўку ад бацькі, але і згрызоты сумлення, пераасэнсаваў свае паводзіны, усвядоміў уласную віну і прыйшоў да Лёні мірыцца.

***Апавяданне*** — невялікі празаічны твор, у якім расказваецца пра асобную падзею, выпадак або здарэнне ў жыцці героя.

У апавяданні няшмат персанажаў, дзеянне адбываецца на працягу невялікага адрэзка часу. Галоўнае месца звычайна адводзіцца расказванню, аповеду. Мы імкнёмся зразумець стаўленне аўтара да герояў, аналізуем яго адносіны да падзей, погляды і перакананні, думкі і перажыванні — спасцігаем аўтарскую пазіцыю. Пазіцыя пісьменніка ў творы не заўсёды відавочная. Часам яе можна вызначыць толькі па ледзь заўважных дэталях, апісаннях, дыялогах.

У апавяданні кожнае слова, кожная дэталь маюць сваё значэнне, яны дапамагаюць лепш зразумець характары герояў, усвядоміць падзеі, глыбей успрыняць усё тое, што хацеў сказаць аўтар сваім творам.

Апавяданне прыйшло ў мастацкую літаратуру з вуснай народнай творчасці, яму папярэднічалі казкі, легенды, паданні, гумарэскі, анекдоты. Апавяданне лічыцца малой формай эпасу. Ад аповесці адрозніваецца тым, што яно меншае па аб'ёме і мае больш простую будову.

Выдатнымі майстрамі апавядання з'яўляюцца Якуб Колас, Кузьма Чорны, Міхась Лынькоў, Янка Брыль, Уладзімір Караткевіч, Васіль Быкаў і іншыя беларускія пісьменнікі.

1. Які твор называюць апавяданнем? Што для яго характэрна?
2. Дакажыце, што твор Алены Васілевіч «Сябры» — апавяданне.
3. Прыгадайце некалькі апавяданняў іншых аўтараў. Знайдзіце ў іх выразныя прыкметы жанру.
4. Успомніце, з якіх элементаў складаецца сюжэт. Падрыхтуйце невялікі вусны аповед пра выпадак, які вас уразіў, усхваляваў, вам запомніўся.



Правообладатель Национальный институт образования



# Кузьма ЧОРНЫ

І толькі тады становішся чалавекам,
Калі ўсе могуць спадзявацца
На цябе.

*Максім Танк.*

Кузьма Чорны (Мікалай Карлавіч Раманоўскі) (1900—1944) — празаік, драматург, публіцыст. Нарадзіўся ў маёнтку Боркі на Случчыне (цяпер Капыльскі раён Мінскай вобласці) у сялянскай сям'і. Гадаваўся ў мястэчку Цімкавічы, рос хлапчуком з уражлівай і чуйнай душой. Тут Мікалай Раманоўскі скончыў народнае вучылішча, дзе паказаў сябе вельмі здольным: ён добра маляваў, захапляўся музыкай, нават сам навучыўся іграць на балалайцы, піяніна, спяваў разам з маці ў царкоўным хоры, вельмі любіў кнігі.

У шаснаццацігадовым узросце хлопец паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, якая ў 1919 годзе была закрыта польскімі ўладамі. Каб зарабляць на жыццё, грузіў на станцыях дровы, наймаўся калоць іх, але з-за цяжкай працы захварэў, нават перанёс аперацыю.

Першае апавяданне «Гузік» надрукаваў у дзіцячым часопісе «Зоркі», потым у друку з'явілася шмат твораў, падпісаных псеўданімам *Кузьма Чорны*. Чорны — вулічная мянушка яго дзеда, вядомага ў Цімкавічах і ваколіцах майстра-сурвэтніка. Без родных Цімкавіч пісьменнік не ўяўляў свайго жыцця і сваёй творчасці. Замілаванне да роднай зямлі, вострыя ўражанні дзіцячай пары яскрава адбіліся ў многіх творах Кузьмы Чорнага. Ён прызнаваўся: «Там жывуць усе мае персанажы! Усе дарогі, пейзажы, дрэвы, хаты, чалавечыя натуры, пра якія я калі-небудзь пісаў. Гэта ўсё адтуль, сапраўднае».



Правообладатель Национальный институт образования

Кузьма Чорны — аўтар шматлікіх апавяданняў, аповесцей, раманаў, п'ес, крытычных і публіцыстычных артыкулаў.

Аповесць «Насцечка» была напісана ў 1940 годзе.

## Насцечка
*(Скарочана)*

### I

Нейк раптам усе пачалі заўважаць высокага старога чалавека. Ён часта відзён быў на тых вуліцах, што ляжаць каля гарадскога рынку. Гэты чалавек хадзіў павольна, быццам аб нечым раздумваючы, цвёрда апіраўся на выгнутую з маладога дубка палку; і заўсёды здавалася, што ён гэта не так сабе ходзіць, а мае нейкую справу. Раней яго не заўважалі. Вельмі можа быць, што ён нядаўна стаў жыць тут.

Была восень. Надвор'е стаяла мокрае, і вецер найчасцей павяваў ужо холадам. Стары чалавек заўсёды хадзіў адзеты ў паношанае цёмнае паліто, на яго быццам караткаватае, з цёплым каўняром. У яго была зусім сівая, маленькая, нізка падстрыжаная бародка, і такія ж сівыя выбіваліся з-пад суконнай шапкі валасы каля вушэй. Лоб яго быў высокі, нос арліны, і вочы, нягледзячы на старасць, ясныя. Відаць было, што ён ад старасці не вельмі ўжо моцны, але і ў паходцы яго, і ў выразе твару было нешта цвёрдае. Здавалася, што чалавек нечым ганарыцца. Не тое што ён быў горды перад людзьмі. Не. Наадварот. З выгляду ён быў ветлівы да ўсіх.

Адзін раз ён убачыў, як конь не мог зрушыць з месца цяжкі воз з дровамі і фурманшчык[1] неміласэрна біў каня пугаўём па шыі і жываце. Стары чалавек адразу падбег да фурманшчыка і моцна сказаў:

— Якое ж у цябе сэрца, калі ты не шкадуеш жывёлы? Ды і сам сабе ты гэтым горш зробіш, калі змарнуеш каня. Чаго стаіце? — Тут ён павярнуўся тварам да натоўпу. — Ты там, маладзейшы, падштурхні воз плячом, яго абы з месца зрушыць…

---

[1] *Фурма́ншчык (фурма́н)* — чалавек, які кіруе коньмі ў запрэжанай павозцы.



Правообладатель Национальный институт образования

Маладзейшы падштурхнуў воз плячом, і конь лёгка пайшоў. Стары чалавек рушыў у сваю дарогу, і на твары яго доўга трымалася ўсмешка. Здавалася, што гэты чалавек добра ведае, чаго ён сам варты на свеце.

На вуліцы яго бачылі кожны дзень па некалькі разоў. Зранку ён ішоў з накрытым газетай кошыкам. Удзень ішоў з пустымі рукамі, але таксама, як і зранку, здавалася, што ён некуды спяшаецца. А перад вечарам, на змроку дня, ішоў вельмі павольна, пастукваў дубовай палкай па тратуары; часам спыняўся і стаяў на адным месцы, гледзячы на якое-небудзь дрэва або гурт вясёлых дзяцей. Пасля, быццам адумаўшыся, ішоў далей, даходзіў да якога-небудзь завулка і варочаўся назад, робячы па тратуары сваю праходку.

Аднойчы на тым самым тратуары гулялі дзеці. Хоць, калі сказаць праўду, — гэта была не зусім гульня. Каля зялёнай брамы ў зарослым дрэвамі двары стаялі тры дзяўчынкі, і каля іх пакручваўся, на галавы дзве вышэйшы за кожную з іх, хлапчук. Ён быў высокі ростам, яму ўжо магло быць гадоў чатырнаццаць. Дзяўчаткам было гадоў па трынаццаць кожнай.

Апрануты... ён быў не тое што лепш за тых дзяўчатак, з якімі бесперапынна зачэпліваўся, але на ім усё ляжала нейк гладчэй, спрытней, дасціпней. Ён быў у высокіх боціках з блішчастымі мяккімі халяўкамі, на паліто каўнерык з нейкага шэранькага звярка. Ніводнай мінуты ён не мог устаяць на месцы. Ён усё круціўся на адной назе і за кожным паваротам даваў у галаву каторай-небудзь дзяўчынцы пстрычку. І кожны раз дзяўчаткі хорам крычалі яму:

— Серж, мы цябе не чапаем. Пусці, нам трэба ісці.

— Ідзіце, — гаварыў Серж, і калі дзяўчаткі, узяўшыся пад рукі, ішлі, ён зноў даваў адной з іх пстрычку ў галаву, і яны адступалі на ранейшае месца.

І ў гэты момант у вачах яго свяцілася гэтулькі самазадавальнення, гэтулькі ўцехі з самога сябе, што здавалася, — гэты маладзенькі францік[1] зараз заплюе вочы ўсяму свету і скажа:

---

[1] *Фра́нцік (франт)* — чалавек, які любіць модна апранацца; моднік.



Правообладатель Национальный институт образования

— Эй, вы, бачыце, які я спрытны і харошы. А вы ўсе перада мной нейкія пачвары, і больш нічога.

— Пусці, нам трэба ісці, — запішчалі дзяўчаткі.

— Ідзіце, — сказаў Серж.

Дзяўчаткі пайшлі, але Серж у момант вока перакруціўся на адной назе і даў самай меншай дзяўчынцы такую пстрычку ў лоб, што тая крыкнула і моцна заплакала.

— Ён жа адзін, а нас трое! — крыкнула самая большая. — Чаго мы будзем яго баяцца?

Самая меншая не пакідала плакаць. Серж падбег да самай большай з гнеўным крыкам:

— Вы не будзеце мяне баяцца?

І намерыўся ўжо даць пстрычку ў галаву большай, але тая яго так пхнула ад сябе, што ён хістануўся з тратуара і ўпаў на адно калена ў лужу. Дзяўчаткі зарагаталі і, падхапіўшы пад рукі сваю меншую сяброўку, пабеглі наўцёкі. Серж усхапіўся на ногі і тут жа ўбачыў, што яго калена і прыгожая халяўка ўся ў гразі. Поўны злосці, ён дагнаў дзяўчатак і з усяго размаху пхнуў у плечы самую большую, а пасля і самую меншую. Яны абедзве ўпалі на тратуар, і меншая так далася тварам аб мокрую асфальтавую пліту, што з носа і з дзяснаў у яе пацякла кроў. Убачыўшы гэта, Серж спалохаўся, але, каб не паказаць віду, закрычаў:

— Вось табе, цяпер будзеш памятаць!

І кінуўся ўцякаць дадому, але ў гэты час нечая моцная рука хапіла яго за плячо і над яго галавой прагучаў басавіты голас:

— Ах ты, хуліган, што гэта ты нарабіў?

Серж падняў угару вочы і ўбачыў, што яго трымае той самы стары і высокі чалавек, якога ён прывык кожны дзень бачыць на гэтай самай вуліцы.

— Пусці! — закрычаў Серж, ірвануўшыся з усёй сілы.

— Не, ты раней скажаш, як ты завешся і з якой ты школы, тады я цябе пушчу, — адказаў стары чалавек.

— Ён завецца Серж, а вучыцца ён разам з намі: у дваццатай школе, — запішчалі дзяўчаткі.

— Ідзі, хуліган, — гнеўна сказаў стары чалавек, пускаючы Сержа.



Правообладатель Национальный институт образования

Дзяўчаткі павялі сваю скрываўленую сяброўку да яе дома, а Серж, з паважным выглядам нявіннага пакутніка, паволі адышоўся ад старога чалавека на некалькі крокаў і засвістаў. Стары чалавек моўчкі паківаў галавой і хацеў ужо ісці, але Серж раптам крыкнуў яму:

— Стары чорт! Ты вечарам стаіш на вуліцы і на месяц глядзіш, як дурань. Ты думаеш, я цябе баюся?

І Серж пабег, азіраючыся, а стары чалавек доўга стаяў і ківаў галавой. Пасля ён паволі пайшоў тратуарам, звыкла сабе накульгваючы на левую нагу і пастукваючы палкай па мокрых асфальтавых плітах... Бадай што ўжо зусім змерклася... Стары чалавек азірнуўся навокал сябе, і на вачах яго бліснулі слёзы. Ён пайшоў шпарчэй, выпрастаўся, здаваўся яшчэ вышэйшы ростам...

У канцы завулка стаяў трохпавярховы вялікі стары дом... Чалавек увайшоў у адчыненыя дзверы цёмнага калідора і скрыўся там. Ён ні разу не азірнуўся і не бачыў, што Серж увесь час ішоў назіркам следам за ім, хаваючыся за сцены і платы, каб лепш падгледзець, куды гэты стары пойдзе. Серж тады толькі для віду адбегся ад чалавека, а пасля вярнуўся і пайшоў следам за ім. І цяпер ён радасна глядзеў, у які дом увайшоў ненавісны яму стары чалавек... Стары чалавек нават і не падазраваў нічога.

## II

Якраз каля таго часу, калі на вуліцах відзён стаў высокі стары чалавек, у дваццатай школе з’явілася новая вучаніца Насця Закрэўская. Ёй ішоў дванаццаты год, і вучылася яна ў пятым класе. Раней у гэтай школе яна ніколі не вучылася, і калі прыйшла з пачатку восені запісацца ў пяты клас, то сказала, што толькі нядаўна пераехала жыць у гэты горад.

Насця, ці, як пасля ўсе ў школе яе пачалі зваць, Насцечка, была бойкая і рухавая дзяўчынка, белатварая, з густымі валасамі, якія роўна ляжалі на яе галаве пад грабянцом...

Яна не была чым-небудзь адметнейшая ад іншых дзяцей. Таксама, як і ўсе, любіла бегаць па двары на вялікім перапынку, любіла слухаць расказы, гуляла ва ўсе гульні, у якія толькі гулялі дзеці, і заўсёды ўносіла ў гэтыя гульні весялосць. Яе звонкі



Правообладатель Национальный институт образования



голас і смех чуліся заўсёды — ці то ў калідоры, ці то на двары. Яна мела прывычку часта гаварыць: «Ой, дзевачкі!..»

Вучылася яна вельмі добра. Яна старалася вучыцца. Нешта дні праз два пасля здарэння на вуліцы паміж Сержам і старым чалавекам у пятым класе вучні рабілі арыфметычныя прыклады. Адзін прыклад асабліва здаўся цяжкім бадай што ўсяму класу. Насця Закрэўская стаяла ля класнай дошкі, ціснула ў пальцах крэйду, глядзела на слупок выпісаных ёю на дошцы лічбаў і думала. Нешта ў яе тут не выходзіла. Дзеці глядзелі ў свае сшыткі. Настаўніца сказала да ўсяго класа:

— Хто зрабіў прыклад?

— Я, — абазвалася адразу некалькі галасоў. Абазваўся таксама і Серж.

— Правільна робіць прыклад Насця? — запытала настаўніца.

— Правільна, — пачуўся голас...

— Яна няправільна робіць! — закрычаў Серж. — Я ўжо зрабіў і ведаю. Я выйду за яе зраблю, яна не зробіць.

— Цябе не выклікалі да дошкі, ты і сядзі, — пакрыўдзілася Насця. — Я сама без цябе зраблю.

— Ты не зробіш! — аж падскочыў Серж.

— Дзеці, ціха! — моцна сказала настаўніца.

— Яна толькі будзе час траціць і не зробіць, а я зраблю! — ужо зусім крыкнуў Серж.

Зняважаная Насця злосна глянула на Сержа і зачырванелася. Серж кпліва на яе глядзеў з гордым выглядам ад таго, што ён больш ведае за Насцю.



Правообладатель Национальный институт образования

— Сядзі, Серж, на месцы і маўчы. Ты перашкаджаеш Насці і ўсім, — сказала настаўніца.

У Сержа была такая натура, што ён прывык лічыць сябе лепшым і разумнейшым за ўсіх на свеце. Ён з такой пагардай глянуў на настаўніцу і пасля на Насцю, што настаўніца адчула ў душы прыкрасць. У Сержавым позірку было штосьці ўжо не дзіцячае. Здавалася, што на настаўніцу глядзіць дарослы чалавек, але па-дзіцячаму распешчаны і свавольны. Настаўніца на гэты раз змаўчала і перавяла вочы на Насцю, якая ў гэты час шпарка пісала на дошцы лічбы. У знак пратэсту супроць таго, што яму больш не надаюць увагі, Серж скамячыў кавалачак паперы, пажаваў яе і пстрыкнуў у акно. Настаўніца ўстала са свайго месца і падышла да Сержа. Грозна яна сказала:

— Калі ты не пакінеш хуліганіць, я табе загадаю выйсці з класа.

— Што, хіба я хуліганю? — сказаў Серж і зрабіў нявінныя, ягнячыя вочы. — Я зрабіў прыклад.

— Калі зрабіў, дык нашто сваволіць?

— Я зрабіла, — сказала Насця.

Настаўніца паглядзела на дошку і запытала ў класа:

— Правільна яна зрабіла?

— Правільна, — сказалі галасы.

— Няправільна, — сказалі другія галасы.

— Серж, правільна яна зрабіла? — запытала настаўніца.

— Не, — самаўпэўнена адказаў Серж.

— Ідзі зрабі правільна.

З паважным выглядам Серж выйшаў да дошкі і пачаў пісаць лічбы па-свойму. Але неўзабаве ён заблытаўся, падбег да свайго месца і ўзяў свой сшытак.

— А ты цяпер нанава зрабі, — сказала настаўніца.

— Я ўжо зрабіў, нашто мне другі раз рабіць?

І ён перапісаў на дошку тое, што было ў яго сшытку. Настаўніца дала некалькі пытанняў, дзеці на іх адказалі і раптам зразумелі ўсё. Насця дагэтуль стаяла каля дошкі збянтэжаная, думаючы, што, можа, гэта ў яе няправільна, а ў Сержа правільна. А цяпер яна радасна паглядзела на Сержа.



Правообладатель Национальный институт образования

— У Насці правільна! — крычаў увесь клас.

У гэты час зазвінеў званок, але настаўніца яшчэ паспела сказаць Сержу:

— Ты не прывыкаеш працаваць, а думаеш, што ты больш і лепш за ўсіх ведаеш. Ты няправільна зрабіў, а Насця правільна. А ты самаўпэўнена зневажаў яе. А калі я сказала табе, каб ты сядзеў ціха, ты і мяне пачаў зневажаць, і ўвесь клас сваім хуліганствам...

Заняткі ў школе скончыліся. Дзеці пайшлі дадому. Серж падпільнаваў Насцю на тратуары і заляпіў ёй граззю твар. Назаўтра Насця паскардзілася настаўніцы, і перад усім класам настаўніца прабірала Сержа. І адразу пасля гэтага Насця пачала заўважаць, што Серж стаў яе ворагам. Ён стараўся, каб яна адчувала на сабе яго помсту. Ён не хацеў спакойна прапусціць яе каля сябе. Ён ёй даваў пстрычкі, шчыпаў за шыю, біў кулакамі ў плечы. Стала так, што Насця баялася выходзіць са школы пасля заняткаў: яна ведала, што недзе за вуглом яе чакае Серж. І перад тым як ісці дадому, яна пачала выглядаць з калідора, чакаючы, каб хто-небудзь з дарослых быў паблізу, каб было ў каго папрасіць абароны. Так прайшло дні чатыры.

На наступным дні, перад самым вечарам, Серж стаяў на вуліцы, раздумваючы, куды яму пайсці. Раптам ён убачыў Насцю. Можа, ён гэтым разам і не зачапіў бы яе, каб не Насцін выгляд. Занадта ўжо яна была ў гэты момант вясёлая, смелая і самаўпэўненая. Яшчэ здалёк яна заўважыла Сержа, і вочы яе заблішчэлі. За апошнія дні Серж прывык да таго, што яна пры кожным спатканні палахліва хавалася або ўцякала ад яго, а гэта так смела ішла. Узбуджаны настрой апанаваў Сержам... І горш за ўсё было, што цяпер, на тратуары, Насця смела і заўзята пагразіла яму пальцам. Гэта ўсё вельмі выразна гаварыла Сержу, што Насця хоча сказаць яму: «Я цябе не баюся». І гэтулькі было ў Насціных вачах пагарды да яго, што ён не вытрымаў. Як гэта яна, гэтая нейкая Насця, можа так зневажаць яго?..

Серж грозна падбег да Насці і загарадзіў ёй дарогу. Ён ужо нарыхтаваў кулак, каб штурхануць Насцю пад бок... Яна шпарка адступіла на крок ад Сержа і бездапаможна азірнулася. Але,



Правообладатель Национальный институт образования

мусіць, яна, азірнуўшыся, убачыла нейкі свой паратунак, бо зноў смела зірнула на Сержа і нават крыкнула яму:

— Пусці, хуліган!

Серж не зводзіў з Насці вачэй і нічога навокал сябе не бачыў. Ён падняў кулак над Насцяй, і ў той жа момант моцная рука якраз, як некалькі дзён таму назад, хапіла яго за плячо. Ён шпарка ўскінуў угару вочы і жахнуўся: над ім стаяў той самы высокі стары.

— Дык выходзіць, што ты кожны дзень на паляванні бываеш?! Ах, гадзюк праклятым, — сказаў стары чалавек і злосна адштурхнуў ад сябе Сержа.

Серж адляцеў убок і ўскочыў у двор вялікага дома...

Якія няўдачы і якая ганьба спасцігглі Сержа за апошні час! А да гэтага ён не прывык.

Яму заўсёды ўсё ўдавалася, і заўсёды ён меў тое, што толькі захоча. Бацька яго быў даволі буйны работнік у горадзе, і многа людзей яго ведала. Ён быў заўсёды вельмі заняты працай, можна сказаць, што ён працаваў з цямна да цямна. Нават і ў выхадныя дні ён часта бываў заняты. А калі выдаралася яму вольная часіна, ён садзіўся ў машыну, браў з сабою свайго адзінага сына Сержа і выязджаў за горад адпачыць на прыродзе. Больш ён свайго Сержа бадай што і не бачыў. Ён прыходзіў з працы позна, калі Серж ужо спаў, а ўставаў тады, калі Серж быў ужо ў школе. Улетку ж Серж са сваёй маці жыў у вёсцы, а бацька аставаўся адзін у горадзе.

Маці глядзела Сержа, старалася не патураць усім яго капрызам, але бывала так, што бацька адным якім-небудзь учынкам у адзін момант разбураў усё тое, чаго дамагалася маці. Сержу часамі ўздумаецца тыя дзвесце крокаў, якія аддзялялі яго кватэру ад школы, не прайсці пяшком так, як усе дзеці, а праехаць у бацькавай машыне. Маці скажа, што гэтага не трэба, што ніхто з дзяцей у школу не едзе ў машыне. А Серж пачынае плакаць і крычаць. Тады бацька, каб адчапіцца, скажа шафёру завезці яго. І Серж тады гаворыць, што бацька лепшы за маці, што бацька добры, а маці злая, і з выглядам гордага начальніка над усімі людзьмі вылазіць з машыны каля школы тады, калі ўсе дзеці стаяць навокал і глядзяць на яго... І пакрысе ў ім укаранілася



Правообладатель Национальный институт образования

ўпэўненасць, што ён нейкая выдатная асоба, а ўсе перад ім нічога не варты. І калі часамі ў яго была якая-небудзь няўдача, ён злаваў і стараўся спагнаць злосць на кім-небудзь, замест таго, каб самому, сваімі сіламі, паправіць справу.

...Серж доўга стаяў за вуглом, раздумваючы аб сваёй няшчаснай асобе. Усялякія смелыя планы складаліся ў яго галаве. Ён павінен паказаць сябе перад усімі. А ўсе яны — гэта былі Насця і перш за ўсё той невядомы высокі стары чалавек, які, як здань, заўсёды з'яўляецца перад ім на вуліцы і ўмешваецца ў яго справы...

Вось ад гэтага ўсяго і мучыўся Серж, стоячы за вуглом. Свет яму не быў мілы... Выйшаўшы пасля на вуліцу, ён убачыў на тратуары свайго аднакласніка — белабрысага Мішку. Гэты Мішка вельмі ўзрадаваўся, калі апынуўся каля Сержа. Шырока расцягнуўшы ад усмешкі твар, ён сказаў:

— Я думаў, што ты дадому ўцёк, а ты тут быў. Што ты тут рабіў?

— А ты раней мяне бачыў?

— Дзіва што бачыў. Я вунь там ішоў, як гэты стары трос цябе за плячо.

І Мішка пляснуў сябе па халяве тоўстым скруткам тэлефоннага шнура.

— Дзе ты гэты шнур узяў? — хрыплым голасам абазваўся Серж, каб абы перавесці гаворку на што-небудзь іншае. Гэта ж вельмі дрэнныя справы, што яго ганьбу бачылі на вуліцы людзі...

— Адрэж мне палавіну гэтага шнура.

— Хітранькі. А што ты мне дасі за гэта?

Сержу ніякага шнура не трэба было. Яму абы-што гаварыць. Яны паволі ўжо ішлі тратуарам. Мішка кпліва і хітра пазіраў на Сержа, і таму гэта было горш за ўсё. Ён ведаў, што назаўтра Мішка на ўсю школу разнясе навіну, што яго на вуліцы трэслі за плячо. Ды каб жа толькі трэслі. Гэта было б яшчэ нічога. Але Мішка не такі хлопец, каб сказаць так, як яно было сапраўды. Ён у дзесяць разоў яшчэ ад сябе дадасць таго, чаго зусім не было. Ён будзе расказваць, што гэты стары круціў яго за вушы, цягаў за валасы. І расказваць будзе са страшэнным рогатам, а гледзячы



Правообладатель Национальный институт образования

на яго, і ўсе будуць рагатаць. Такой ганьбы і няславы Серж не мог вытрымаць... І ён ужо ведаў, што будзе рабіць. Мішка заўтра будзе расказваць пра яго як пра героя, як пра смельчака, а не як пра баязліўца, якога трэслі за плячо...

— Што ты будзеш рабіць? — запытаў Мішка.

— Я перапну шнуром у дзвярах, каб ён упаў, — растлумачыў Серж. — Ты адарвеш мне кавалак шнура.

Калі яны дайшлі да вядомага Сержу дома, Мішка сам узяўся наладжваць справу. З трухлявай дошкі ў плоце ён дастаў цвік і ўбіў яго ў вушак заўсёды адчыненых калідорных дзвярэй. Пасля ржавай бляшкай перапілаваў шнур. Серж вырваў кавалак шнура з Мішкавых рук: яму хацелася самому дзейнічаць, а то гэта ж будзе Мішкава геройства, а не яго. Ён завязаў за цвік адным канцом шнур, а другі канец ужо сам Мішка працягнуў за вугал дома. Удвух яны схаваліся там. Шнур ляжаў на зямлі, і хто ішоў у калідор ці з калідора, то або ступаў на яго, або пераступаў. Найбольш шнур пераступалі, бо на ўваходзе ў калідор стаяла вада ад дажджоў. Лужа была неглыбокая, але кожны стараўся абысці яе бокам, паўз сцяну. Мінут дзесяць Серж з белабрысым Мішкам чакалі за вуглом, стуліўшыся, як шчанюкі, і нарэшце ўбачылі, як стары чалавек варочаўся са свайго спацыру[1]. Ён падышоў да адчыненых калідорных дзвярэй, паглядзеў на цёмнае акно ў сцяне побач з дзвярыма і прагуў сам сабе пад нос:

— У акне цёмна, малая недзе забавілася. Што ж такое, што яна яшчэ не прыйшла?

І ступіў цераз лужу ў калідор, але ў той жа момант Серж з Мішкам нацягнулі шнур. Чалавек усім размахам нагі вытнуўся аб яго і ўпаў у самых дзвярах. Ногі яго паехалі назад на двор, і нагамі і жыватом ён апынуўся ў вадзе. Пакуль ён устаў, прайшло, можа, мінуты дзве, і ў гэты момант Серж, не могучы стрымаць свае радасці, зарагатаў за вуглом. Стары ўзняўся на ногі, а Серж, забыўшыся на ўсё, не пакідаў рагатаць і пасля, следам за Мішкам, кінуўся бегчы. Але ў гэты момант з-за рога вуліцы ў завулак завярнуўся аўтамабіль і асвяціў двух хуліганаў фарамі. У яркім

[1] *Спа́цыр (шпа́цыр)* — прагулка на свежым паветры.



Правообладатель Национальный институт образования

святле Серж перабег вуліцу, і стары чалавек пазнаў яго. Пасля гэтага чалавек, стогнучы, увайшоў у калідор, дастаў з кішэні ключ і доўга бразгаў ім, пакуль адамкнуў дзверы ў свой пакой…

Пакуль стары чалавек пераадзеўся ў сухое, ён адчуў холад ва ўсім целе. Стаўшы плячом да печы, ён стараўся абагрэцца. Яго пачала хіліць дрымота, у касцях стала ламаць, ён прылёг на пасцель і нацягнуў на галаву коўдру. Праз некалькі мінут ён спаў…

## III

Усе ў школе пачалі заўважаць, што з Насцяй пачало рабіцца нешта нязвычнае, чаго з ёй раней ніколі не было. Яна заўсёды была самая ўзорная вучаніца, а гэта пачала пазніцца ў школу… А адзін раз на вялікім перапынку яна паспела некуды са школы збегаць і прынесці ў школу нечага поўную торбу і палажыла ў парту разам са сваімі кнігамі. Гэта было дзён праз чатыры пасля таго, калі Серж з белабрысым Мішкам перапіналі шнуром уваход у дом, дзе жыў стары высокі чалавек. У адзін з гэтых дзён, зранку, Серж папрасіў у бацькі пяць рублёў. Бацька збіраўся ісці на работу і спешна пераглядаў нейкія паперы і складваў іх у партфель.

— Нашто табе пяць рублёў? — мармытнуў сабе пад нос бацька, заняты сваімі справамі.

— Трэба.

— Не трэба табе так многа.

— Ай, трэба! — закрычаў Серж такім прарэзлівым, піскλівым і распешчаным голасам, што бацька заткнуў рукамі вушы, пасля выхапіў з кішэні пяць рублёў і кінуў Сержу, а сам зноў паглыбіўся ў свае паперы.

Узрадаваны поспехам, Серж зноў сказаў:

— Я сёння хачу паехаць у школу на машыне.

— Не свавольнічай, ідзі так, як усе дзеці, — мармытнуў сабе пад нос бацька.

— Ай! На машыне! — яўкнуў Серж мацней яшчэ, як першы раз, і з радасцю ўбачыў, што бацька зноў заткнуў вушы. — Ай, ехаць на машыне! — запішчаў ён другі раз і яшчэ з большай радасцю ўбачыў, што бацька ўсхапіўся са свайго месца і выбег



Правообладатель Национальный институт образования

у другі пакой, дзе чакаў шафёр, каб неўзабаве везці Сержавага бацьку на працу.

— Завязіце яго ў школу, ён мне жыць не дае, гэты чарцюк, — сказаў бацька шафёру і пабег да сваіх папер...

З вельмі паважным выглядам Серж падкаціў на машыне да школы і вылез з яе... Так, як робяць вялікія начальнікі (ён гэта некалькі разоў бачыў), ён махнуў шафёру рукой, хоць шафёр і без гэтага ўжо заварочваў машыну.

Да заняткаў было яшчэ мінут дзесяць. Серж падышоў да буфета і запатрабаваў у буфетчыцы яблыкаў, цукерак і пернікаў на ўсе пяць рублёў.

— Нашто табе так многа? — сказала буфетчыца, выбіраючы з каша яблыкі.

— Колькі хачу, гэтулькі і купляю! — крыкнуў Серж, з арлінай гордасцю кідаючы вачыма і на буфетчыцу, і на дзяцей.

— Чаго ты крычыш? — абазвалася пакрыўджаная буфетчыца. — Я старая жанчына. Бач, які герой знайшоўся. Сам кату па пяту, а распараджаецца.

— Калі захачу, дык магу ўвесь гэты твой буфет купіць за адным разам! — гыркнуў Серж, распіхаючы па кішэнях ласункі.

У такіх выпадках заўсёды можа знайсціся які-небудзь падхалім, самы сапраўдны падлізнік. Падскочыў белабрысы Мішка, і палавіна купленых Сержам цукерак апынулася ў яго кішэні. Па дарозе ў клас Серж убачыў Насцю. З якой вялікай гордасцю ён паглядзеў на яе, на гэтую нейкую Насцечку, якая мала што калі і купляе ў буфеце, а найчасцей прыносіць сабе з дому хлеб і кілбасу ці што-небудзь падобнае.

Пачуўся званок, і Серж горда ўвайшоў у клас, з усмешкай паглядаючы на ўсіх. Сержу пачало здавацца, што ён многа зрабіў ужо для таго, каб на яго пачалі глядзець як на героя, які нікога і нічога не баіцца, які за ўсіх лепшы і выдатнейшы. Яму стала спакайней на душы, але тым большая злосць да Насці мучыла яго. Ён жа ёй нічога не зрабіў такога, каб яна адчувала яго сілу і перавагу над сабою... Так прайшлі першыя ўрокі.

Серж бачыў, што Насця на вялікім перапынку нешта паклала ў парту. Калі яна адышлася некуды, ён развязаў пакладзеную



Правообладатель Национальный институт образования

ў парту Насцяй торбу і паглядзеў у яе. Торба была поўна гароху. Серж торбы не завязаў, а паставіў яе так, каб гарох не высыпаўся, і за торбу завязаў нітку, а канец ніткі працягнуў да парты белабрысага Мішкі (сам ён сядзеў на першай парце — усялякае свавольства яго лёгка заўважыць настаўніцы). Калі пачаўся ўрок, Мішка пацягнуў за нітку, і гарох сыпануўся па ўсім класе.

— Што гэта? — крыкнула настаўніца.

— Гэта Насця Закрэўская цэлымі торбамі гарох у клас носіць! — закрычаў Серж.

— Насця, нашто ты гарох у клас носіш? — запытала настаўніца.

— Гэта я купіла суп варыць.

— Табе мама сказала купіць?

— Я сама. Мая мама жыве ў Маскве.

— І заўсёды ты так?

— Не, раней дзед усё купляў, а цяпер ён ляжыць хворы. Мне трэба і купіць, і суп зварыць, і ў аптэку пайсці, і яго дагледзець. А як я пасля заняткаў пайду купляць, калі мне адразу дадому бегчы, — можа, яму, хвораму, што трэба, — ён жа і так колькі гадзін, пакуль я тут, адзін ляжыць.

— А больш у цябе нікога няма тут?

— Нікога няма.

Гаворка з настаўніцай скончылася, але ў перапынку пачалася гаворка з дзецьмі. Усе пыталі Насцю:

— А чаму твая мама жыве не з вамі, а ў Маскве?

— Яна там давучваецца.

— Як гэта давучваецца?

— Бо яна вучылася дома, сама, у завочным інстытуце, а на ўсю гэтую восень і на пачатак зімы яна паехала трымаць апошнія іспыты і працаваць над дыпломнай працай. А калі яна скончыць, то прыедзе да нас…

— А дзе твой тата?

— Мой тата памёр, калі я яшчэ зусім малая была, і я яго не памятаю…

— А хто быў твой тата?

— Мой тата быў вясковы настаўнік, а мама была родам з той самай вёскі, куды прыехаў працаваць мой тата. Мама мая



Правообладатель Национальный институт образования

ледзьве ўмела чытаць і пісаць, а тата яе навучыў, і мама паехала на настаўніцкія курсы. Так і яна стала настаўніцай. Пасля нарадзілася я, а тата мой памёр, і мама пачала вучыцца ў завочным інстытуце. Яна ўсё сама вучылася і кнігі чытала і цяпер мне ўсё піша з Масквы, каб і я вучылася і кнігі чытала. А мой дзед — гэта татаў бацька, ён родам з гэтага самага горада...

— А што ён тут робіць?

— Ён мяне глядзіць. Ён і суп варыць, і ў печы паліць, і на рынак ходзіць.

— А як ён грошы зарабляе?

— Ён стары. Ён атрымоўвае пенсію. Ой, дзевачкі! Ён такі хворы, у яго запаленне лёгкіх. Ён мне сказаў, што адзін хуліган з нашай школы ўкінуў яго ў ваду на вуліцы, і ён з гэтага захаладзіўся...

— А хто гэта з нашай школы яго ў ваду ўкінуў?..

— Ён мне не сказаў хто, ён гаворыць, што мне трэба вучыцца, а не займацца такімі справамі...

Аднак жа дзяўчаткі ўсю сваю гаворку з Насцяй пераказалі настаўніцы. Настаўніца сказала дзяўчаткам пайсці да Насці і паглядзець, як яна жыве.

У той самы дзень з Насцяй здарылася непрыемная прыгода. Ідучы раніцой у школу, яна ўзяла з сабой трохлітровую бляшанку, каб пасля заняткаў купіць газы[1]. Бляшанку яна схавала ў раздзявальні ў самы цёмны куток. Але Серж падгледзеў гэта. Калі быў вялікі перапынак, ён панёс бляшанку на двор, схаваўся за сцірту дроў, узяў цвік і камень, прабіў дзірку і паставіў ціхом пасудзіну на ранейшае месца. Калі скончыліся заняткі, ён пахваліўся сваім учынкам белабрысаму Мішку, і яны зводдалеку пайшлі следам за Насцяй. Назіркам сочачы за ёю, яны бачылі, як Насця купіла газы і панесла дадому. Яны ўсё ішлі следам за ёю, а яна не бачыла, што з пасудзіны тоненькай нітачкай выліваецца газа. Яна мінула чыгуначны пераезд і тады заўважыла, што пасуда стала занадта лёгкая. Яна праверыла пасуду, убачыла, што робіцца і што газа бадай што ўся вылілася, і крыкнула:

[1] *Га́за* — гаручая вадкасць, якая атрымліваецца пры перапрацоўцы нафты і служыць для асвятлення.



Правообладатель Национальный институт образования

— Ой, дзевачкі!

І моцна заплакала і пабегла як толькі магла дамоў. З-за чыгуначнай будкі на пераездзе яна пачула рогат і, азірнуўшыся, убачыла павысаджаныя з-за сцяны галовы Сержа і Мішкі. Прыбегшы дадому, яна паскардзілася дзеду, дзед папрасіў паперу і аловак і, лежачы ў пасцелі, пачаў пісаць запіску дырэктару школы.

Насця пазычыла ў суседзяў газы і зварыла на прымусе[1] суп. З дзедам яны паабедалі. Насця ўзяла новы посуд і, азіраючыся, каб не спаткаць Сержа, прынесла з крамы газы, пасля зрабіла свае ўрокі і піла з дзедам чай. Дзед сказаў, што яму стала лепш, хвароба, мусіць, праходзіць, і ціхім голасам расказаў Насці, што за некалькі дзён да хваробы ён спаткаў на вуліцы свайго знаёмага.

— Гэта нават больш чым знаёмы. Гадоў таму назад дваццаць мы разам жылі; гэта быў тады яшчэ зусім малады хлопец. Я яго вельмі любіў, ён быў як сын мне. Мы з ім разам працавалі... Раз мы ехалі лесам, і на нас напалі бандыты. Мне прыйшлося яго ратаваць, і мяне ранілі ў нагу, з таго часу я злёгку кульгаю.

— Дык вось ад чаго ты кульгаеш, — заспявала Насця.

— Я табе, як папраўлюся, раскажу пра гэта.

— Раскажы цяпер.

— Мне цяпер, Насцечка, цяжка гаварыць многа. Раней гэты чалавек мне часта пісаў пісьмы, а апошнія гады неяк так выйшла, што мы не ведалі адзін пра аднаго. А цяпер я спаткаў яго. Мы так узрадаваліся. Ён працуе ў гэтым горадзе. Ён тут вядзе вялікую працу. Я яму даў адрас, і ён, мусіць, гэтымі днямі зойдзе да нас...

Назаўтра Насця занесла ў школу дзедаву запіску. Там было напісана, што хуліган завецца Серж...

Серж ужо спагнаў сваю злосць. І час пэўны прайшоў ужо, і ўсё перажытае ім прытупілася і ўжо стала надакучаць. Ён адчуваў сябе так, быццам разлічыўся ўжо з усімі сваімі непрыяцелямі. Ужо ён пачынаў займацца новымі справамі, як на яго галаву ўпалі новыя непрыемнасці.

---

[1] *Пры́мус* — прыбор для награвання і гатавання ежы, з помпай, якая падае гаручае (газу) у гарэлку.



Правообладатель Национальный институт образования

## IV

Сержаў бацька прыйшоў дадому са свае працы крыху раней, як звычайна, і ўвечары зусім нікуды не выходзіў з дому. Ён нават і справамі сваімі не займаўся. Да самага вечара быў маўклівы, задуменны, а як толькі Серж апрануўся, каб ісці на вуліцу, ён сярдзіта крыкнуў яму:

— Не хадзі нікуды, сядзі дома!

Серж, ведама, не прывык слухаць таго, што гаворыць бацька, і пайшоў да дзвярэй, але пачуў бацькаў голас:

— Каму я гавару — табе ці гэтай сцяне?

— Сцяне, — весела хіхікнуў Серж і адчыніў дзверы, але бацькава рука хапіла яго за плячо і ўцягнула назад у пакой...

— Распранайся, — сказаў бацька.

— Не хачу.

— Не, ты зараз захочаш!..

— А вось і не.

Бацька сарваў з Сержа паліто і шпурнуў у кут.

— Трэба было раней думаць пра гэта, а то ты патураў усім яго капрызам, а цяпер агледзеўся, што з яго выйшаў хуліган, — сказала маці і заплакала.

Гледзячы, як маці плача, Серж здагадаўся, што адбылося нешта непрыемнае, і ён устрывожыўся. Апусціўшы вочы ў падлогу, ён стаяў і маўчаў.

— Глядзі мне ў вочы, — сказаў бацька.

Серж утаропіў свае вочы на бацьку так, што той аж уздрыгануўся.

— У цябе хапае смеласці глядзець мне ў вочы?

— Ты ж казаў, каб я табе глядзеў у вочы.

— Ты здзекуешся з бацькі?

— Я ж цябе слухаю.

Бацька аж пазелянеў ад злосці і хапіў сына за каўнер кашулі. Серж, злосны і пакрыўджаны, горда сказаў бацьку:

— Чаго ты мяне мучыш?

— Гэта ты тату мучыш, — сказала маці.

— Што я яму кепскае зрабіў?

— Ты старога чалавека ў ваду ўкінуў — ён цяпер хворы.



Правообладатель Национальный институт образования

— І яшчэ раз укіну, калі будзе хапаць мяне на вуліцы за каўнер. Я яго не чапаў, ён першы.

— Ён бараніў ад цябе дзяўчатак.

— Цераз гэтых дзяўчатак я ў лужу ўпаў.

І раптам Сержа апанавала крыўда: ён успомніў, як запэцкаў у гразь новыя свае штаны. Да таго ж ён адчуў, што над яго галавой збіраюцца вялікія непрыемнасці, і трэба было ратавацца. І ён заплакаў. Ён ужо не слухаў, што крычаў бацька і што казала маці, і ўсё мацней і мацней плакаў. І чым больш ён плакаў, тым больш яму рабілася шкада самога сябе, і яму пачало нарэшце здавацца, што ён вялікі пакутнік, што яго ўсе крыўдзяць і ён ад усіх нявінна церпіць. Праз свае слёзы ён з нянавісцю глядзеў на бацьку і на маці, якія, замест таго каб пашкадаваць яго, абыходзяцца з ім так нядобра, што спачуваюць таму старому, які першы яго зачапіў... Ён кінуўся да пасцелі, упаў тварам у падушку і астаўся так ляжаць, пачмыхваючы і пахліпваючы носам.

— Можа, і праўда ён не вінаваты, — сказаў паціху бацька.

— Укінуць у ваду старога чалавека — дык гэта не вінаваты?! — не сцярпела маці.

— Можа, яго давялі да гэтага? Я яшчэ дазнаюся, як усё гэта было.

— Гэта мы яго давялі да гэтага. Я ж бачу, — ён нікога не паважае, апроч самога сябе.

— Паважаць сябе трэба.

— Паважае сябе толькі той, хто паважае іншых.

— Я гэта ведаю, што ты мяне вучыш?

— Калі ты ведаеш, дык трэба старацца, каб і Серж быў такі. Трэба старацца, каб з яго вырас такі чалавек, які ведаў бы, што калі ты пакасціш другому чалавеку, то лепш табе не жыць на свеце. Я ведаю, што тут выходзіць: калі ён пад'язджае на машыне да школы, то ён адчувае гэта не так, што машына аблягчае чалавеку хаду, беражэ яго сілы, а бачыць у гэтым толькі сваю перавагу перад дзецьмі. Ён прывыкае з пагардай глядзець на ўсіх... Такога чалавека любіць ніхто не будзе, а кожны будзе яго баяцца, а значыцца, і ненавідзець. Я не хачу, каб мой сын быў такі. Я адзін раз бачыла, як жанчына на вуліцы паслізнулася



Правообладатель Национальный институт образования

і ўпала і як два рослыя франты, бачачы гэта, зарагаталі... Сержу таксама і ў галаву не прыйшло б дапамагчы.

— Адкуль ты ведаеш?

— Табе ж казалі ў школе, што ён прабіў цвіком посуд, у якім дзяўчынка газу несла. Хіба можа быць большая пакасць? Няхай сабе яго першага зачапілі. Але ж гэта расправа гордага паніча. Тая дзяўчынка і вучыцца, і працуе, а ён не адчувае гэтага. Я сама пайду да таго старога чалавека і пагавару з ім. І, калі трэба будзе, я прымушу Сержа папрасіць у яго прабачэння. Няхай папросіць, каб стары чалавек дараваў яму.

— Добра, ты ідзі да таго чалавека, а я пагавару з Сержам.

— Калі мой сын зрабіў таму чалавеку прыкрасць, то для мяне гэта тое, што я сама пакрыўдзіла чалавека. Мне самой брыдка і горка.

Серж усё гэта чуў. Ён адчуваў толькі тое, што ён трапіў у бяду. Назаўтра бацька прыйшоў з працы таксама раней: ён хацеў як найбольш пабыць разам з Сержам. Ён выйшаў з ім на вуліцу, і яны пайшлі да чыгуначнага пераезда... Абапал чыгункі выходзілі сюды невялікія дамы з садкамі і агародзікамі. Тут многа было дрэў, яны стаялі зусім голыя, і на прымерзлай ужо зямлі ляжала іх высахлае лісце.

— Зараз будзе зіма, — сказаў бацька Сержу. — Зямля мерзне. — І Сержаў бацька падумаў пра сябе, што ён сам вельмі мала апошнімі гадамі аддаваўся вялікай прыемнасці заўважаць тое, як жыве прырода. Ён так быў заўсёды заняты працай, што дзень за днём ішлі для яго неўзаметку. «Таксама я не заўважаў, як расце Серж», — думаў ён. У яго з'явілася адчуванне, што быццам ён страціў нешта добрае і патрэбнае, нават такое, без чаго нельга яму жыць шчасліва, і гэта страчанае трэба вярнуць назад. Ён вёў Сержа за руку і адчуваў радасць ад таго, што вось пачынаецца вечар, і што ціхі вецер цягне з далечыні і абвявае яго твар, і што недзе там, за далёкімі дрэвамі, вецер расчысціў ад хмар неба. «Усё добра, — думаў ён, — добра, што ў вокнах вялікіх і малых дамоў запальваюцца агні, добра, што пагойдваецца галлё старой бярозы, пад якой яны цяпер ішлі, добра, што з коміна завода, недзе над дахамі дамоў, плыве струмень дыму і што там загуў



Правообладатель Национальный институт образования

гудок». Яны ішлі ўсё далей і далей, дайшлі бадай што да ўскраіны гэтага прыгарада і пайшлі назад.

— Калі я быў малы, такі, як цяпер ты, — сказаў ён Сержу, — я любіў такі час, калі блізіцца зіма. Але я і ўсялякі час у годзе любіў.

Гаворачы так са сваім Сержам, ён адчуваў патрэбу расказаць каму-небудзь аб сваім жыцці, аб сабе, аб тым, што было і ёсць у яго жыцці добрага, дарагога і слаўнага. І яму раптам стала крыўдна, што яго сын нічога не ведае аб сваім бацьку і што ён сам мала цікавіўся сваім сынам. Яму нават стала страшна ад таго, што паміж ім і яго малым няма дружбы. А без гэтай дружбы чагосьці вялікага і патрэбнага не хапае ў жыцці. Дружба павінна быць вялікая, моцная і вечная.

— Ведаеш, Серж, — сказаў ён, — мне трэба табе многа чаго расказаць.

— Ну, раскажы, — сказаў Серж.— Ты ж мне ніколі нічога не расказваеш.

— Я табе многа чаго буду расказваць.

— ...А што ты рабіў, як быў малады? Раскажы, як ты вучыўся. На выдатна?

— Я тады і не вучыўся... Гэта было дзясяткі два гадоў таму назад. Я тады недалёка ад нашага горада, у адным вялікім мястэчку, служыў парабкам у кулака[1]. Тут тады былі палякі, яны захапілі былі гэтую мясцовасць, з імі тады ваявалі. А як Чырвоная Армія іх адгэтуль прагнала, у наша мястэчка прыехаў з горада чалавек. Ён быў раней рабочы на заводзе. Гэты чалавек быў прызначаны на тое, каб сабраць хлеб у кулакоў для Чырвонай Арміі... Кулакі не хацелі даваць хлеба. Кулакі ішлі ў банды. А ў нашай воласці[2] было многа лясоў, і самы большы лес за кіламетраў дзесяць ад мястэчка. Там банда кулацкая і засела. Бандыты нападалі на савецкіх работнікаў і забівалі іх. Прозвішча таго чалавека, пра якога я табе тут гавару, было — Закрэўскі. І бандыты вельмі хацелі яго забіць...

---

[1] *Кула́к* — багаты селянін, які наймаў на працу парабкаў — беднякоў, батракоў.

[2] *Во́ласць* (уст.) — частка тэрыторыі, прыкладна роўная сучаснаму сельскаму савету.



Правообладатель Национальный институт образования

Адзін раз Закрэўскі са мною паехаў на далёкія хутары... Мы ўтрох ехалі на сялянскай фурманцы, Закрэўскі, фурманшчык — чалавек з нашага мястэчка — і я. У мяне была вінтоўка, Закрэўскі навучыў мяне добра страляць, у Закрэўскага быў рэвальвер, а ў фурманшчыка, вядома, апроч пугі, нічога не было. Мы ехалі шырокай дарогай, паабапал яе былі паплавы і часамі дробныя хвойнічкі...

У адным месцы дарога пайшла крыху ўгару, і злева дарогі мы ўбачылі вялікі кавалак засеянага маладога хвойнага лесу. Хвойкі былі вышынёй з чалавечы рост, не большыя, і раслі яны так густа, што праз іх, здавалася, цяжка было прабіцца...

— Ох, тут ваўкоў многа збіраецца, тут увосень іх цэлае зборышча, — сказаў фурманшчык, махнуўшы пугай на зараснік. — Я, прызнацца, баюся тут ехаць, яшчэ напорамся на бандытаў...

— Разумныя кажуць, што свет трымаецца на смелых людзях, — адказаў на гэта Закрэўскі.

Сержаў бацька змоўк. Яны былі ўжо непадалёку ад свайго дома. У бацькавым расказе Серж некалькі разоў чуў прозвішча Закрэўскі, і кожны раз, чуючы гэтае слова, ён з непрыемнасцю і нейкай незразумелай трывогай успамінаў Насцю Закрэўскую. І кожны раз стараўся не думаць аб ёй.

— Ну, расказвай далей, — сказаў ён бацьку.

— Мы праехалі яшчэ кіламетры два, як раптам убачылі, што з хвойнага зарасніку выйшаў чалавек...

— Ой, стаміўся ідучы, — сказаў чалавек, падыходзячы зусім блізка. — Ногі забалелі. Можа, падвезяце крыху?

...Тут мы заўважылі, што з зарасніку выйшаў другі чалавек і ідзе проста да нас.

— Падвязіце, ногі баляць, — сказаў ён.

Наш фурманшчык зірнуў на Закрэўскага, а пасля на другога незнаёмага і ўжо хацеў нешта сказаць, як раптам з зарасніку выйшлі яшчэ тры незнаёмыя, і гэтыя наперарэз пайшлі нашай фурманцы.

— Не хочуць падвезці! — гукнуў ім першы незнаёмы.

Тры незнаёмыя зарагаталі, і адзін з іх хапіў нашага каня за аброць і скіраваў у лес.



Правообладатель Национальный институт образования

— Ты што? — сказаў Закрэўскі. — Чаго ты хочаш, хто ты такі?

Тут мы ўбачылі, што з лесу да нас ідуць яшчэ чатыры, і ўжо не скрываючы, хто яны такія. У тых жа, ранейшых, раптам з'явіліся ў руках рэвальверы. Іх было дзевяць чалавек, а нас тры, калі лічыць і фурманшчыка, узброенага пугай. Яны ўсе акружылі наш воз і кіравалі каня ў лес; мы ўжо ехалі ў густым зарасніку…

— Што ж ты змоўк? — сказаў Серж. — Расказвай далей.

— Ну, мы прыйшлі ўжо дадому. Далей раскажу пасля…

— Ну, дык я з табою лягу спаць сёння, і ты мне ў пасцелі будзеш расказваць.

— Добра. Няхай будзе гэтак.

## V

— А далей было так, — пачаў зноў расказваць бацька. — Нас пратрымалі ў лесе да ночы. Мне было так страшна і так цёмна на душы, што як бы стапудовы камень сціскаў мае грудзі і жалеза душыла мне горла. І зоры над маёй галавой здаваліся мне як у тумане. Вельмі моцна пахла лісце на дрэвах, і ад гэтага мне было яшчэ цяжэй. Я гэты пах адчуваў як нешта такое, што для мяне ўжо скора скончыцца назаўсёды. Больш як калі-небудзь у сваім жыцці, я ў гэты момант адчуваў, якое шчасце жыць на свеце.

— Не зважай ні на што, будзь смелы, — сказаў мне Закрэўскі…

Доўга вялі яны нас лясной дарогай і прывялі ў нейкі лясны хутар. Нас увялі ў склеп і замкнулі…

Раптам мы пачулі, што фурманшчык плача.

— Нічога, братка, — пачаў цешыць яго Закрэўскі. — Яшчэ ж нас не страляюць, яшчэ ўсё можа быць. А яны цябе і чапаць не павінны, ты ж толькі фурманшчык.

Смелы тон слоў Закрэўскага і ўся яго вытрымка надалі фурманшчыку смеласці. Ён паспакайнеў і пачаў часта заглядваць у шчыліну ў дзвярах…

— Дзень блізка, — уздыхнуў фурманшчык, — на дварэ шарэй стала. — Тут ён павысіў голас: — Яны ідуць… Нейкая дзяўчына з імі…



Правообладатель Национальный институт образования

Мы па чарзе паглядзелі ў шчыліну і ўбачылі, што перад бандытамі стаіць дзяўчына і нешта ціха гаворыць ім. Відно было, як яна кудысьці паказвае…

І тут адбылося тое, чаго мы ніяк не чакалі: бандыты рвануліся з месца і адразу зніклі. Не паспелі мы адумацца, як пачулі, што па дзвярах грукаюць нечым цяжкім. Мы не ведалі, што гэта робіцца. Пасля дзяўчына прасунула нам пад дзвярыма ў шчыліну сякеру і сказала:

— Я не магу замка адбіць, разбівайце дзверы.

Фурманшчык хапіў сякеру і разоў пяць так грукнуў у дзверы, што замест іх толькі пашчапаныя дошкі асталіся.

— Бяжыце за мной, — сказала дзяўчына.

І яна нас вывела на лясную дарогу.

— Хто ты такая? — запытаў у яе Закрэўскі.

— Я тут служу за парабчанку. Я не спала і заўважыла, як вас прывялі. Я падкралася да склепа і падслухала, што яны гавораць. Я сказала, што за гумном каля паўсотні чырвонаармейцаў з'явілася. Я ўсё гэта выдумала, каб выратаваць вас…

Дзяўчына паказала нам, у якім баку бліжэйшая вёска. Мы з Закрэўскім пайшлі ў той бок лесам, а дзяўчына з фурманшчыкам ішлі за намі крокаў за пяцьсот.

Нам трэба было перайсці ўпоперак дарогу, а там, праз невялікі лясок, мы выйшлі б ужо ў адкрытую, людную мясцовасць. Але ў гэтым месцы мы наткнуліся на двух бандытаў. Мы іх пазналі, на гэтай самай дарозе яны ўчора падышлі былі да нашага воза. Відаць, бандыты разбрыліся цяпер па ўсім лесе, шукаючы нас; напэўна, яны ўжо ведалі, што дзяўчына іх ашукала… Трэба было прабіцца сілай. Як я шкадаваў, што ў мяне няма маёй вінтоўкі. Два бандыты нас яшчэ не бачылі. Закрэўскі закрыў мяне сваімі плячыма і сказаў так бегчы за ім. Мне стала так сорамна перад ім, што ён, старэйшы, закрывае мяне, маладзейшага, што я пачаў прасіць, каб ён даў мне свой рэвальвер, а сам ішоў за мною.

— Слухай, што я табе скажу, — сярдзіта скамандаваў ён мне моцным шэптам. — Марш за мной, і каб я ад цябе больш ні слова не чуў. Крычы разам са мной «ура».



Правообладатель Национальный институт образования

Я сябе так адчуў у гэты момант, што быццам бы мне было ўсяго гадоў пяць. Скажу табе, што незайздросная гэта справа, калі нехта цябе ратуе, а ты не можаш нават і памагчы яму, а не то каб самому сябе ратаваць. Мы закрычалі і пабеглі проста на бандытаў; бег я, хаваючыся за плечы Закрэўскага. Закрэўскі, крыкнуўшы, стрэліў з рэвальвера. Ад такой нечаканасці тыя два перапалохаліся. Можа, яны нават і не разгледзелі нас як трэба; адзін з іх стрэліў нам насустрач, і яны кінуліся бегчы. Я ўбачыў, што Закрэўскі раптам пачаў прыпадаць на адну нагу, але ў такой сумятні адразу не здагадаўся, што гэта такое. Мы перабеглі цераз дарогу, і Закрэўскі яшчэ раз стрэліў наўздагон тым двум. Яны недзе скрыліся ў лесе. Вельмі шпарка перайшлі мы праз прыдарожны лясок і выйшлі на поле. І тут Закрэўскі застагнаў. Нейк адразу ён абмяк, і я ўбачыў, што ў яго з нагі, вышэй калена, сочыцца кроў.

— Раніў, гад, мяне, — сказаў Закрэўскі і абапёрся на маё плячо. Я ўзяў з яго рук рэвальвер.

— Пусты, — сказаў Закрэўскі, — няма больш чым страляць...

Я трымаў яго пад плячо, і так мы дайшлі да вёскі. Адтуль на фурманцы мы прыехалі ў мястэчка, і Закрэўскі тады больш як месяц ляжаў у бальніцы. Паправіўшыся, ён стаў працаваць на тым самым месцы.

Нага яго асталася крыху папсаванай. Яна яму хоць і не балела, але ён на яе накульгваў, не вельмі моцна. Так у яго і асталося назаўсёды. З таго часу мы з ім сталі блізкімі людзьмі. Ён мне быў як родны бацька. Памагаў заўсёды і клапаціўся пра мяне. Пасля я паехаў вучыцца, а ён выехаў працаваць у іншае месца. Мы пісалі адзін аднаму пісьмы, а ўлетку я прыязджаў да яго ў госці. У яго быў сын, мой аднагодак, ён стаў маім блізкім таварышам. Аднойчы Закрэўскі напісаў мне страшную вестку: яго сын, зусім яшчэ малады чалавек, памёр, пакінуўшы маленькую дзяўчынку і асірацелую жонку. Сын яго быў у вёсцы настаўнікам. Прайшло яшчэ некалькі часу, і так здарылася, што мы не сустракаліся. Апошнія гады мы не ведалі адзін пра аднаго нічога. А нядаўна я спаткаў яго тут на вуліцы. Мы так узрадаваліся адзін аднаму,



Правообладатель Национальный институт образования

што абняліся проста сярод вуліцы, не зважаючы на тое, што на нас азіраюцца людзі. Ён пераехаў жыць у гэты горад. Ён даў мне свой адрас, а я яму — наш. І нешта ён да мяне не заходзіць, можа, ён хворы, ён ужо зусім стары. Заўтра выхадны дзень, заўтра я пайду да яго.

— І я пайду з табой, — сказаў Серж.

— Добра, і цябе вазьму…

— Пайшла б і я з вамі, але мне трэба ісці даведацца таго чалавека, якога Серж так скрыўдзіў. Ну, але я пайду да Закрэўскага другім разам, калі ён да нас скора не прыйдзе. Мне таксама яго вельмі хочацца пабачыць.

— А што стала з той дзяўчынай, якая тады выратавала вас ад бандытаў? — запытаў Серж.

— Я тады… — пачала гаварыць Сержава маці, але Серж перабіў яе:

— Пры чым тут ты! Не перашкаджай расказваць.

Маці ўсміхнулася, а бацька сказаў:

— А тая дзяўчына з фурманшчыкам дайшлі да вёскі пазней за нас…

— А цяпер яна дзе?

— Ты яе вельмі добра ведаеш. Толькі яна цяпер ужо не такая маладая, з таго часу прайшло дзясяткі два год.

— Як жа я яе ведаю? — аж падскочыў на сваім крэсле Серж. — Дзе яна?

— А вось яна. Гэта твая мама.

Серж адкінуўся на спінку крэсла і разявіў рот ад здзіўлення, не зводзячы вачэй са сваёй маці.

## VI

Насцечка Закрэўская апошнімі часамі ўжо пачынала сумаваць без сваёй мамы. Асабліва гэта здаралася тады, калі ўвечары, падрыхтаваўшы свае ўрокі, яна слалася спаць. Спала яна на канапе. У гэтыя часы дзед яе ўжо спаў, і яна была адна сама з сабою. Паслаўшы пасцель, перад тым як легчы, яна вылічвала, колькі яшчэ заставалася да сакавіка месяца, калі мама назаўсёды прыедзе з Масквы. Заставалася яшчэ многа часу, і Насцечка не



Правообладатель Национальный институт образования

магла вытрымаць: яна скоранька прысядала да стала і пісала маме пісьмо. Так было бадай штодзень. Кожнае пісьмо было кароткае... А тады тушыла святло і, узбуджаная, прыпадала тварам да аконнай шыбы. Позна яшчэ не было. Завулкам праходзілі людзі, часам праязджала машына. Насцечка любіла, калі вечарамі дзьмуў вецер. Тады, лежачы ў пасцелі, добра было слухаць, як шуміць голы клён каля іхняга акна, і здаецца, што гэта нейкая бясконцая песня ці доўгі-доўгі расказ... Шум ветру за акном пераходзіць у ціхую музыку, расплываецца ў штосьці невыразнае. Насцечка ўжо дрэмле ў сваёй пасцелі, і нарэшце прыходзіць сон, моцны, салодкі і здаровы.

Ноч праходзіць як адзін момант. Насцечка прачынаецца ўжо раніцай. Дзесяць мінут яна ляжыць і ўстанаўляе ў памяці, што яна будзе рабіць у гэты дзень, а пасля ўстае і шпарка адзяваецца. Ужо гатова снеданне, і дзед ужо клапоціцца ў куханьцы і весела падае адтуль голас:

— Расчухвайся, расчухвайся, малая, у школу скора.

А Насцечка заўсёды зробіць дзеду нечаканасць. Апранаецца яна ціха, каб дзед не чуў, а як толькі ён гукне з кухні, каб яна «расчухвалася», Насцечка ў адзін момант з'яўляецца на кухонным парозе, гатовая, адзетая.

— Я ўжо расчухалася, — смяецца яна і бяжыць мыцца.

— Ах ты, матыль, — дзед найчасцей патрымае сваю Насцечку з мінуту на руках.

— Ты, можа, будзеш трымаць мяне на руках і тады, калі я стану вялікая? — гаворыць Насцечка.

— О, каб я дажыў да таго часу, калі ты будзеш вялікая, — адказвае дзед...

А калі захварэў дзед, усё пайшло інакш. Насцечка ўставала гадзіны за дзве да таго, калі ёй ісці ў школу. Яшчэ была ноч, калі яна запальвала святло. Напаіўшы дзеда чаем і пакарміўшы яго, яна бегла ў школу, а прыйшоўшы дадому, варыла абед, хадзіла на рынак, прыносіла ў кухню дровы. Добра, што дзедава хвароба доўга не цягнулася. На дзясяты дзень ён пачаў уставаць і праходжвацца ад ложка да стала, а пасля сам пачаў грэць чай і падпальваць у печы. З кожным днём яму рабілася ўсё лепш.



Правообладатель Национальный институт образования

Але за час хваробы Насцечка была такая занятая, што ёй не было калі не толькі пісаць маме пісьмы, але нават і сумаваць па ёй. За работай дні прайшлі вельмі скора, і Насцечка не напісала маме ніводнага пісьма. Мама ў Маскве ўстрывожылася і дала тэлеграму Насцечцы, што тымі днямі прыедзе. Гэта было ўжо тады, калі дзед пачынаў рабіць усё сам і нават ужо выходзіў раз прайсціся па завулку, — без гэтай праходкі яму быццам нечага не хапала, так ён прывык да яе.

Ужо першы дзень, як нападаў першы снег, але яго было яшчэ мала, шмат дзе з-пад яго віднелася яшчэ мёрзлая зямля. Дзень быў хмурны, мяккі. Насцечка прачнулася рана, і ёй ужо не хацелася спаць. Яшчэ было, можа, больш за гадзіну да світання, а яна ўжо выспалася. Яна паднялася, каб запаліць святло, і заўважыла, што ў кухні гарыць лямпачка. Дзед там нечым займаўся...

— А ты чаго так рана ўстаў?

— Мне, старому, не спіцца. Я выспаўся.

— Ты думаеш, я не ведаю, чаго ты так рана ўстаў? Я хітрая, я ўсё ведаю. Я ж бачу, што ты там нешта перастаўляеш у кухні. Ты наводзіш там парадкі, каб усё было так, як было тады, калі мама адгэтуль паехала...

Гэта была праўда. Яму, сапраўды, з паўночы не спалася, і ён, як малы, чакаў, каб хутчэй прыйшла раніца, калі ён з Насцечкай пойдзе на вакзал сустракаць дарагога і роднага чалавека. Учора была тэлеграма, што Насцечкіна мама прыедзе сёння зранку...

Дзед адзеўся ў святочны гарнітур і доўга круціў перад люстэркам свае сівыя вусы. Насцечка таксама апранулася ў святочнае адзенне...

— Давай выйдзем на вуліцу, — сказаў дзед.

...Але тут сыпануўся ў дзверы дробны стук, і ў сенцах абазваліся хорам дзіцячыя галасы:

— Насцечка, адчыні.

— Ой, дзевачкі! — радасна крыкнула Насцечка і кінулася да дзвярэй, каб адчыніць іх.

Увайшлі тры дзяўчынкі — Рая, Фаня і Надзя.

— Скарэй, скарэй сюды, матылі вы мае, — радасна затрапятаўся дзед.



Правообладатель Национальный институт образования

## VII

Гэта былі тыя самыя тры дзяўчынкі, пра якія гаварылася ў пачатку гэтай аповесці. Гэта іх тады Насцін дзед бараніў ад Сержа Мілеўскага. Яшчэ да таго здарэння яны раз ці два былі на кватэры ў сваёй школьнай сяброўкі Насцечкі. А пасля таго як Насцін дзед абараніў іх на вуліцы, яны адчулі да яе яшчэ большую прыхільнасць. І калі настаўніца сказала даведацца пра Насцечку, як яна жыве са сваім хворым дзедам, Рая, Фаня і Надзя пачалі вельмі часта прыходзіць да сваёй сяброўкі…

Вось гэтыя тры дзяўчынкі і ўвайшлі цяпер у Насціну кватэру…

— Як добра, што вы прыйшлі, — сказала Насцечка, — а то мне нудна было чакаць цягніка.

— Якога цягніка? — запытала Надзя.

— Мая мама прыязджае. І ведаеце што? Яна ўжо раней пісала, што мае патэфон[1]. Яна, значыцца, яго сёння прывязе.

— А якія пласцінкі? — заспявала Фаня.

— А якія пласцінкі-і-і, — перадражніла яе Рая. — Адкуль жа Насця можа ведаць?

— От, каб была лезгінка[2], — зарагатала Надзя.

— Ой, дзевачкі! — крыкнула Рая. — Патанцуем лезгінку.

— А музыка? — паважна сказала Насцечка.

— А мы самі сабе выспеўваць будзем.

— Так вы патоміцеся, гэта цяжка так, — сказаў дзед.

Але хто яго там слухаў, калі справа ішла аб лезгінцы. Дзяўчаткі пачалі танцаваць. Дзед глядзеў на іх, і слаўная ўсмешка запоўніла яго твар. Усё было на свеце добра. Ён папраївіўся. Насцечка здаровая, вясёлая і вучыцца добра, а зараз будзе тут дарагі чалавек — Насціна мама…

Адчыніліся дзверы, і ў пакой увайшоў Сержаў бацька, а за ім Серж. Яны стукалі з калідора ў дзверы, але іх не чулі за танцамі, і яны адчынілі самі.

---

[1] *Патэфо́н* — музычны апарат з рупарам для ўзнаўлення гукаў, запісаных на пласцінку.

[2] *Лезгі́нка* — тут: музыка да народнага танца лезгін (аднаго з народаў Дагестана).



Правообладатель Национальный институт образования



— Ой, дзевачкі! — прапішчалі ў адзін голас Насця і Рая.

Танец умомант спыніўся, і дзяўчаткі ўставіліся вачыма ў Сержа. Запанавала маўчанне. Але тут радасным і ўзбуджаным голасам абазваўся дзед:

— Нарэшце я цябе дачакаўся. Чаму ж ты дагэтуль не прыходзіў? А я чакаў, чакаў…

Дзед і Сержаў бацька абняліся і пацалаваліся. Слёзы радасці стаялі ў дзедавых вачах.

— Я расказаў свайму Сяргею пра тое колішняе здарэнне з бандытамі і пра вас, — гаварыў Сержаў бацька. — І ён так палюбіў вас і аж плакаў, так прасіў, каб я яго ўзяў з сабою да вас… Сяргей, хадзі сюды, трэба ж вам пазнаёміцца.

Серж і стары Закрэўскі ступілі адзін да аднаго крок і глянулі адзін на аднаго. Дагэтуль яны яшчэ не бачыліся. Закрэўскі быў заняты вітаннем з Сержавым бацькам, а Серж спадылба пазіраў на знаёмых яму дзяўчатак і ў душы сваёй праклінаў тую часіну, калі ён сюды прыйшоў. Цяпер Сержавы вочы спаткаліся з вачыма старога Закрэўскага. І — які жах! Замест таго чалавека, якога ён ужо любіў пасля бацькавых расказаў, Серж убачыў перад сабой ненавіснага яму старога, якому ён так многа зрабіў зла. Абодва яны, і Закрэўскі, і Серж, збянтэжыліся. Серж густа пачырванеў і апусціў вочы ў падлогу, а ў Закрэўскага задрыжалі губы і пачырванелі вочы, але ён адразу ж справіўся з сабой і, каб не дапусціць да якіх бы там ні было непрыемнасцей, сказаў:

— Ну, вось і добра, што мы пазнаёміліся.



Правообладатель Национальный институт образования

— Ніколі з ім так не было, каб ён быў такі нясмелы, што спускаў вочы ў падлогу, — сказаў пра свайго сына Сержаў бацька. — Гэта, мусіць, ён пасля таго, што пачуў пра вас з майго расказу... Ну добра, Серж, ідзі гуляй з дзяўчаткамі.

— А мы тут сабе пасядзім і пагаворым, — сказаў Закрэўскі. — А ведаеш, хто да нас сёння прыязджае?..

І ён расказаў, каго яны чакаюць.

— Вельмі добра, — сказаў Сержаў бацька. — Я даўно яе не бачыў, будзе прыемнае і радаснае спатканне. Мы ж бачыліся яшчэ тады, даўно, калі цяжка жылося. Як я рад, што мы ўсе будзем жыць у адным горадзе... Серж, гуляй з дзецьмі, чаго ж ты стаіш як акамянелы?

Але ў тым была і бяда, што Серж не мог з чыстай душой падысці да дзяўчатак і зірнуць ім смела, па-таварыску, па-сяброўску ў вочы. Але ўсё ж гэтая прыкрасць была нішто ў параўнанні з тым, што рабілася ў яго душы з таго моманту, калі ён убачыў, да каго ён з бацькам прыйшоў і каго ён так моцна скрыўдзіў. Стары чалавек здаваўся яму цяпер нейкім магутным веліканам, перад якім ён, з усімі сваімі ганарыстымі капрызамі, нічога не варты. Ён так сябе адчуваў, быццам лепш было б яму ў гэтыя мінуты праваліцца скрозь зямлю.

— Насцечка, — сказаў дзед, — я адзін пайду на вакзал, а вы тут усе сядзіце і чакайце. Тры мінуты ходу да вакзала і тры мінуты назад. А цягнік вось павінен ужо прыйсці.

Закрэўскі надзеў паліто і шпарка выйшаў. Сержаў бацька астаўся адзін з дзецьмі. Насцечка захвалявалася, яна раз-пораз заглядвала ў акно. Жартачкі! Зараз будзе тут яе мама, якой яна ўжо колькі часу не бачыла. Дзяўчаткі акружылі Насцечку і зашчабаталі. Серж пачаў шаптаць бацьку на вуха: «Хадзем дадому», — але бацька і слухаць пра гэта не хацеў. Як жа ён мог пайсці дадому ў гэты момант, калі зараз ён убачыць свайго блізкага чалавека — Насціну маму, з сям’ёй якой, калі яшчэ жыў быў Насцін бацька, ён так дружыў. Многа гадоў яны ўжо не бачыліся, і ён радасна чакаў гэтага спаткання. І Сержа ён таксама нікуды адгэтуль не пусціць, ён пахваліцца блізкім людзям, які ў яго ўжо сын. У чаканні прайшло мінут дваццаць. І вось на двары каля дома



Правообладатель Национальный институт образования

пачулася гаворка, і Насцечка праз акно ўбачыла, як мама яе і дзед увайшлі ў сенцы. А іх даганяла нейкая жанчына і следам за імі таксама ўвайшла ў сенцы. Насцечка саскочыла з крэсла, на якім стаяла на каленях, каб лепш глядзець у акно, і падбегла да дзвярэй. З усяго размаху яна стукнула рукамі ў дзверы і адчыніла іх. Мама, захваляваўшыся, ледзьве ўвапхнула ў дзверы чамадан і кінулася да свае Насцечкі.

— Мама! — закрычала Насцечка і павісла на мамінай шыі.

Рая, Фаня і Надзя стаялі каля стала, і на тварыках іх расплылася чыстая, як усход сонца ў ціхі веснавы дзень, усмешка шчаслівага маленства.

Але дзверы ў сенцы нейкі час заставаліся адчыненыя, і незнаёмая жанчына гаварыла там дзеду:

— Гэта тут жыве стары чалавек са сваёй унучкай, які хварэў праз тое, што ўпаў у ваду?

— Тут, гэта я, — чула Насцечка голас свайго дзеда. — А чаму вы пытаеце?

— Вас кінуў у ваду малы хуліган, гэта мой сын, я прыйшла папрасіць у вас прабачэння.

— Э, што там, я паправіўся ўжо, — збянтэжыўся дзед.

— І вашай унучцы мой гэты хуліган...

Жанчына не скончыла, змоўкла, пачырванела тварам і адразу пасля гэтага збялела. Закрэўскі таксама глядзеў на яе, не могучы ад здзіўлення прагаварыць і слова. Нешта ён мармытнуў сабе пад нос і шпарка ўвайшоў у кватэру, пакінуўшы за сабой адчыненыя дзверы. Жанчына не смела ўвайсці і стаяла ў сенцах. Закрэўскі паставіў на падлогу патэфон, які ён нёс з вакзала, і павярнуўся да дзвярэй, ужо стараючыся паспакайнець:

— Ну, заходзь жа... (Канцы губ яго ўздрыгануліся.) А тут і Сяргей твой, і... Ну, заходзь жа, колькі гадоў я цябе не бачыў... (Твар яго засвяціўся радасцю.) Ты ж як дачка мне... Ну, чаго там... А памятаеш, як ты выратавала нас ад бандытаў?..

Жанчына ціха плакала. Насцін дзед пагладзіў яе па галаве і пацалаваў у лоб. Серж стаяў як акамянелы. Сержаў бацька ўстаў з крэсла так шпарка, быццам бы крэсла гарэла агнём. Ён стаяў, апусціўшы рукі і не ведаючы, дзе дзецца.



Правообладатель Национальный институт образования

— Дык вось каго гэта ты так пакрыўдзіў... — павярнуўся бацька да Сержа і змоўк...

Першая напружаная мінута прайшла. Насцечка стаяла на крэсле, абняўшыся з мамай так, што, здавалася, іх ніяк не адарвеш адну ад другой.

— А мама... Ой, дзевачкі, хадзіце сюды! — крыкнула Насцечка.— Мама, гэта мае сяброўкі.

— О, у іх вялікае сяброўства, — сказаў дзед. — Такая ў іх дружба, што толькі цешыцца можна.

— Добры дзень вам, дзяўчаткі, — сказала мама. — Хоць я вас і першы раз бачу, але ўжо люблю вас за тое, што вы дружыце з маёй Насцечкай.

— О, Насцечка маладзец, — сказаў дзед. — Яна і вучыцца, і весяліцца, і чытае, і гуляе, і такая сталая, і такая гаспадыня была, калі... (Ён хацеў сказаць: «Калі я быў хворы», але падумаў і сказаў: «Калі трэба было».)

— Ну, цяпер я ўжо тут гаспадыня, — сказала Насціна мама, — калі ласка, усе за стол. Добра, што вы тут не забывалі іх, — гаварыла яна да Сержавага бацькі і маці. — І вам, дзяўчаткі, дзякую за дружбу з Насцечкай. Дружба — вялікая справа. Без дружбы чалавеку цяжка жыць, чуеце, дзяўчаткі? Дружба робіць вялікія справы. І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць. Шануйце, дзеці, дружбу, гэта самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека. Вырастайце вялікія і аберагайце праз усё жыццё дружбу. І ведайце — асабліва моцная бывае тая дружба, што ўстанаўліваецца ў маленстве і ў маладыя гады.

Серж раптам зарыдаў і кінуўся да дзвярэй. Дзеці кінуліся да акна і ўбачылі, што ён шпарка пабег завулкам. Маці яго акінула вачыма ўсіх, і ў позірку яе гэтулькі было пакут за сваё дзіця.

— Што гэта за хлопчык? — сказала Насціна мама. — Я і не заўважыла яго адразу.

— Гэта... гэта... мой. Я пасля раскажу, — ціха прагаварыла Сержава маці.

— Ён цяпер пабяжыць дадому, — сказаў Насцін дзед. — Гэта і добра, няхай пабудзе сам з сабой, паспакайнее.



Правообладатель Национальный институт образования

— Ён больш такім не будзе, — сказаў Сержаў бацька моцна і вельмі рашуча, і тон яго голасу настроіў усіх на весялейшы лад.

Усе сядзелі за сталом, на які Насціна мама ўсё больш і больш ставіла ўсялякіх пачастункаў. Сержава мама пачала памагаць ёй. Надзя выскачыла з-за стала і пачала пераглядаць патэфонныя пласцінкі.

— Лезгінка! — закрычала яна раптам.

— Ой, дзевачкі! — крыкнула Рая.

А Насцечка зусім страціла сваю ранейшую гаспадыньскую сталасць. Ёй хацелася песціцца і быць каля мамы. І калі мама падыходзіла да стала, Насцечка прыхілялася да яе галавой. Нарэшце мама села каля сваёй Насцечкі. Праз паўгадзіны, пасля першай шклянкі чаю, паміж вялікімі за сталом ішла жывая і вясёлая гаворка. А дзеці завялі патэфон і пачалі танцаваць лезгінку. Дзед не вытрымаў. Ён адышоўся да сцяны, глядзеў на дзяцей, і твар яго свяціўся радасцю.

**Да І часткі:**

1. Якім паказвае Кузьма Чорны старога чалавека, што нядаўна з'явіўся ў горадзе? Апішыце яго знешні выгляд.
2. Патлумачце словы, выказаныя аўтарам пра Закрэўскага: *Здавалася, што гэты чалавек добра ведае, чаго ён сам варты на свеце*.
3. Якое ўражанне зрабіў на вас Серж пры першым знаёмстве з ім? Пракаменціруйце яго паводзіны з дзяўчаткамі.
4. Як аўтар характарызуе Сержа? Адказ падмацуйце радкамі з тэксту.
5. Што можна сказаць пра адносіны Сержа да старога чалавека?
6. Як Закрэўскі ацэньваў паводзіны і ўчынкі Сержа?
7. Для чаго Сержу спатрэбілася ведаць, дзе жыве стары чалавек?

**Да ІІ часткі:**

1. Знайдзіце ў тэксце апісанне знешнасці Насцечкі. Ці магчыма праз гэта апісанне (партрэт) дзяўчынкі скласці ўяўленне пра яе характар?
2. Прыгадайце паводзіны Сержа на ўроку. Якой была рэакцыя аднакласнікаў і настаўніцы на гэты выпадак? Ці згодны вы з аўтарскай ацэнкай хлопчыка: *У Сержа была такая натура, што ён прывык лічыць сябе лепшым і разумнейшым за ўсіх на свеце*? Абгрунтуйце сваю думку.



Правообладатель Национальный институт образования

3. Ад чаго пакутаваў Серж? Што, на вашу думку, было прычынай яго эгаізму (сябелюбства) і пагардлівых адносін да іншых? Што ён за чалавек?
4. Дайце ацэнку паводзінам Сержа і Мішкі ў адносінах да Закрэўскага. Чым, на вашу думку, хлопчыкі падобны паміж сабой? Што іх аб’ядноўвае?

**Да III часткі:**

1. Як рэагаваў бацька Сержа на паводзіны сына? Чаму так адбывалася?
2. Што даведаліся дзеці і настаўніца пра сям’ю Насцечкі? Пракаменціруйце іх стаўленне да гэтай навіны.
3. Прааналізуйце паводзіны Сержа дома і ў школе.
4. Раскажыце, як Насцечка даглядала хворага дзядулю.

**Да IV часткі:**

1. Чым былі выкліканы незвычайныя паводзіны бацькі Сержа ў адзін з вечароў?
2. Пра што разважаў бацька, гуляючы з сынам?
3. Якім бачыў Серж сам сябе? Чаму ён не мог правільна ацэньваць свае паводзіны?
4. Як Серж ставіўся да настаўніцы, да сваіх бацькоў?
5. Зачытайце словы маці Сержа, дзе даецца ацэнка ўчынкам сына. Ці згодны вы з яе меркаваннямі?

**Да V часткі:**

1. Чаму, на вашу думку, бацька Сержа вырашыў расказаць сыну пра сваю маладосць?
2. Што даведаўся Серж пра далёкія гады бацькавай маладосці? Раскажыце пра гэта ад імя трэцяй асобы.
3. Як Серж успрыняў бацькаў аповед? Што ўзрушыла яго, што ўразіла, якое жаданне ў яго з’явілася?
4. Якімі ўяўляліся Сержу невядомыя яму паплечнікі бацькі — Закрэўскі і дзяўчына-парабчанка, выратавальніца палонных?

**Да VI часткі:**

1. Як ладзілі Насцечка з дзедам паміж сабой?
2. Што змянілася ў жыцці Насцечкі падчас дзядулевай хваробы?
3. Апішыце рэакцыю Насцечкі і дзядулі на вестку пра хуткі прыезд маці дзяўчынкі. Як яны рыхтаваліся сустрэць яе?



Правообладатель Национальный институт образования

**Да VII часткі:**

1. Чаму сяброўства Насцечкі з дзяўчаткамі з яе класа можна назваць сапраўдным?
2. Што адчуваў Серж у кватэры Закрэўскіх? Падмацуйце адказ радкамі з тэксту твора.
3. Раскажыце пра сустрэчу Закрэўскага, Сержавага бацькі і маці Насцечкі пасля доўгіх гадоў разлукі. Што адчуваў кожны з дарослых?
4. Знайдзіце ў тэксце і перачытайце словы маці Насцечкі пра дружбу. Чаму, на вашу думку, чалавеку нельга жыць без дружбы, чаму трэба берагчы сяброў?

**Да ўсёй аповесці:**

1. Што новага вы даведаліся з твора пра чалавечыя характары і ўзаемаадносіны? Хто з герояў выклікаў у вас павагу і сімпатыі?
2. Чаму, на вашу думку, пісьменнік назваў сваю аповесць «Насцечка», а не, напрыклад, «Насцечка і Серж» або як-небудзь інакш?
3. Падбярыце назвы да кожнай часткі твора. Прыгадайце эпізоды, дзе найбольш поўна і ярка раскрываюцца характары Насцечкі, Закрэўскага, Сержа, яго бацькоў.
4. Падрыхтуйце вуснае выказванне пра аднаго з герояў аповесці (апішыце яго знешні выгляд, манеру трымацца, паводзіны, узаемаадносіны з аднакласнікамі, настаўніцай, бацькамі, старым Закрэўскім; выкажыце таксама свае адносіны да героя).
5. Ці не страціла аповесць сваёй надзённасці, актуальнасці ў наш час? Магчыма, і сёння нехта нагадаў вам герояў Кузьмы Чорнага. Падзяліцеся сваімі думкамі.
6. Уявіце, што вам прапанавалі паразважаць, як маглі скласціся лёсы Насцечкі і Сержа праз дзесяць гадоў. Якія жыццёвыя пуцявіны вы выбралі б для герояў аповесці? Паразважайце, якім чалавекам мог бы стаць Серж з цягам часу.
7. Разгадайце рэбус, выканайце заданне па тэме.

## ПРА АПОВЕСЦЬ

Вы прачыталі аповесць Кузьмы Чорнага «Насцечка». Гэта даволі вялікі па аб’ёме твор, у ім згадваецца шэраг падзей, далёкіх ад нас па часе, адбываюцца яны ў розных месцах. Разам з га-



Правообладатель Национальный институт образования

лоўнымі героямі — Насцечкай і Сержам — дзейнічаюць іншыя персанажы: дзядуля, маці і сяброўкі Насцечкі, бацькі Сержа, яго таварыш Мішка, настаўніца, фурманшчык, шафёр, буфетчыца. Асноўнае дзеянне — прыезд Насцечкі з дзядулем у горад, вучоба дзяўчынкі ў новай школе, яе знаёмства з аднакласнікамі і новымі людзьмі — развіваецца павольна. У творы прасочваецца некалькі сюжэтных ліній, згадваецца і пра гераічнае мінулае Закрэўскага і Сержавых бацькоў, пра бацькоў Насцечкі.

***Аповесць*** — мастацкі твор, пераважна празаічны, у якім расказваецца пра шэраг падзей, што адбываюцца на працягу значнага перыяду жыцця галоўнага героя, паказваюцца яго ўзаемаадносіны з іншымі персанажамі.

Аповесць мае своеасаблівую будову. Найчасцей дзеянне ў ёй развіваецца нетаропка, не так імкліва, як у апавяданні. У аповесці звычайна вылучаецца некалькі сюжэтных ліній, адносна самастойных, і распавядаецца пра значныя падзеі ў жыцці герояў.

Апавяданне і аповесць — эпічныя жанры, яны маюць шмат агульнага, нават паходзяць ад аднаго слова — *апавядаць*, гэта значыць паведамляць, расказваць пра што-небудзь.

Аповесць — надзвычай пашыраны жанр у беларускай прозе. Прыгадайце твор Міхася Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў». Гэта прыгодніцкая аповесць-казка. У ёй апісваюцца казачныя і незвычайныя здарэнні і прыгоды. І галоўным героем аповесці аўтар зрабіў не чалавека, а ляснога звера.

Аповесць прыцягвае нашу ўвагу шырокім паказам жыцця, рухам значных падзей, зменай шматлікіх эпізодаў, дэталёвай абмалёўкай герояў, іх перажыванняў і хваляванняў, учынкаў і паводзін.

1. Які літаратурны твор называецца аповесцю? Назавіце асноўныя прыкметы аповесці як літаратурнага жанру.
2. Згадайце аповесці, вывучаныя ў пятым класе, і тыя, што вы прачыталі самастойна. Падзяліцеся сваімі ўражаннямі пра адну з іх.
3. Разгадайце крыжаванку.



Правообладатель Национальный институт образования



# Покліч мінулых стагоддзяў

## Пятрусь БРОЎКА

З сівых камянёў мінуўшчыны складаюцца прыступкі будучыні.

*Мікалай Рэрых*[1].

Творы Петруся Броўкі глыбока патрыятычныя, надзвычай эмацыянальныя, палымяныя, гераічныя і лірычныя адначасова. У іх апяваюцца мужнасць і самаахвярнасць нашых продкаў, гучаць узнёслыя словы гонару за Бацькаўшчыну і яе слаўнае мінулае.

Верш «Яшчэ ў дні старыя, у век наш лучынны…» прысвечаны нашаму славутаму продку — Францыску Скарыне.

1. Чаму неабходна ведаць сваю гісторыю, помніць мінулае?
2. Як вы разумееце словы: *Мінулае робіць чалавека тым, хто ён ёсць*?
3. Што вам вядома пра Францыска Скарыну? Чым ён праславіўся ў свой час?

[1] Мікалай Рэрых — філосаф, мастак, пісьменнік.



Правообладатель Национальный институт образования

* * *

Яшчэ ў дні старыя, у век наш лучынны[1],
Аб горадзе Полацку слава ішла,—
Друкар там выдатны Георгій[2] Скарына,
Што зоры, рассыпаў па роднай краіне
Крыштальныя словы навукі-святла;

Нямала народаў з крыніц яго піла
І брала ад мудрасці вечны агонь,
У літарах першых знаходзячы сілу…
Ты слаўна, зямля, што вякам нарадзіла
Такога выдатнага сына свайго!

На грудзях тваіх, як скарбніцы жывыя,
Чалом выплываючы з даўняй імглы,
Стаяць гарадзенскія гмахі сівыя,
Муры Навагрудчыны, вежы Сафіі
І замкаў Заслаўля крутыя валы.

Аб славе народнай гамоняць зарніцы,
А думы яго захавалі ў сабе,
Як чыстыя перлы, азёры, крыніцы,
І неба вясёлкамі імі іскрыцца,
Што шлях асвятляюць яму ў барацьбе.

1. Пра якія мінулыя часы расказвае аўтар? Што пра іх вядома вам?
2. Растлумачце сэнс паэтычных радкоў: *Друкар там выдатны Георгій Скарына, // Што зоры, рассыпаў па роднай краіне // Крыштальныя словы навукі-святла*. Каму былі адрасаваны кнігі, выдадзеныя першадрукаром?
3. Пацвердзіце радкамі з верша думку, што выдавецкая дзейнасць Францыска Скарыны паўплывала на развіццё пісьменства, кнігадрукавання, асветы не толькі беларусаў, але і іншых народаў.

---

[1] *Лучы́нны век* — тут: ранейшы час (прыкладна IX—XVI стагоддзі).

[2] *Георгій* — такое імя Скарыны выкарыстоўвалася даследчыкамі і паэтамі ў ранейшы час. Даволі часта сустракаецца і форма імені *Францішак*. Але самае пашыранае імя, якое пазначаў сам асветнік, — *Францыск*.



Правообладатель Национальный институт образования

4. Пятрусь Броўка згадвае ў вершы *гарадзенскія гмахі сівыя, муры Навагрудчыны, вежы Сафіі, замкі Заслаўля*. Як вы лічыце, што яны значаць для нашай нацыянальнай гісторыі і культуры?
5. Якія вобразна-выяўленчыя сродкі мовы выкарыстоўвае паэт у вершы? Растлумачце іх ролю ў творы.
6. Францыск Скарына здзейсніў сапраўдны духоўны подзвіг. Кім з'яўляецца Францыск Скарына для нас, людзей XXI стагоддзя?



# Іван САВЕРЧАНКА

У падзеях мінулага — нашы карані. А дрэва без каранёў не можа ні існаваць, ні тым больш прыносіць плады.

*Уладзімір Караткевіч.*

Іван Васільевіч Саверчанка — пісьменнік, літаратуразнавец, гісторык. Нарадзіўся 2 красавіка 1962 года ў вёсцы Маліноўка Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Іван Саверчанка — доктар філалагічных навук, прафесар. Узначальвае філіял «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Іван Саверчанка — аўтар грунтоўных навуковых прац па старажытнай літаратуры, навукова-папулярных артыкулаў пра Кірылу Тураўскага, Францыска Скарыну, Міколу Гусоўскага і іншых знакамітых дзеячаў нацыянальнай культуры. Напісаў шэраг мастацкіх твораў — аповесці, легенды, эсэ, у якіх асвятляюцца гераічныя і трагічныя старонкі гісторыі Беларусі.

«Векавая мудрасць» — урывак з легенды «Скарб крывічоў», прысвечанай часу ўладарання князя Рагвалода.



Правообладатель Национальный институт образования

## Векавая мудрасць
### *(Урывак з легенды «Скарб крывічоў»)*

Рагвалод, нарэшце, вырашыў наведаць Скрыпторый — месца, дзе захоўваліся даўнія і пісаліся новыя кнігі. Ён ужо шмат чуў пра дзівосы, якія зберагаюцца ў Скрыпторыі.

Будынак кніжнікаў размяшчаўся на Ніжнім замку, насупраць палаца ваяводы. У ім штодня шчыравалі кніжнікі-летапісцы. Князь выбраў больш-менш вольны дзень. Разам са Звеніславай і сынам Святазарам накіраваўся да летапісцаў. Да іх прыходу належным чынам падрыхтаваліся.

Кніжнік-мудрэц па імені Любамысл расклаў перад гасцямі кнігі крывічоў. Яны былі напісаны на пергаменце — апрацаванай скуры — даволі вялікімі літарамі. Тэкст вельмі часта перамяжоўваўся каляровымі малюнкамі.

— Тут змешчаны расповеды пра галоўныя падзеі нашага роду, — патлумачыў Любамысл. — Напісана, галоўным чынам, пра даўніх герояў і іх подзвігі.

Рагвалод акуратна перагортваў старонкі, з цікаўнасцю разглядаў малюнкі, распытваў аб тым, што на іх намалявана. Захоплены Любамысл з ахвотай і веданнем справы распавядаў розныя цікавыя гісторыі, часам зачытваў фрагменты з кнігі.

Затым запрасіў Рагвалода і Звеніславу да стала, дзе ляжала кніга вялікіх памераў. Разгарнуў яе і прадоўжыў:

— Гэта «Праўда» — галоўная кніга роду. У ёй звод законаў крывічоў. Тут запісаны рашэнні старэйшын аб пакараннях за розныя правіннасці.

Пасля гарталі іншыя кнігі — пераклады мудрасцей егіпцян і халдэяў[1], грэкаў і лацінян на мову крывічоў.

Усе кнігі былі напісаны мяшаным алфавітам — лацінскімі і грэчаскімі літарамі, а таксама знакамі-сімваламі крывічоў.

«Сапраўды, каб іх чытаць, а тым болей пісаць — трэба вялікая мудрасць», — падумалася Рагвалоду.

---

[1] *Халдэ́і* — так у Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме называлі жрацоў.



Правообладатель Национальный институт образования

Святазар папрасіўся ў бацькоў застацца ў кніжнікаў. Яны дазволілі, бо бачылі ў яго схільнасці да навукі. Пасля гэтага Святазар часта завітваў у Скрыпторый і падоўгу там знаходзіўся, з ахвотай спасцігаючы кніжную мудрасць.

Князь з жонкай пакінулі Скрыпторый. Яны выйшлі за браму і накіраваліся да Дзвіны. Там прыселі на высокім беразе. Рагвалод глядзеў на задзвінскія лугі, аб нечым думаў.

— Хочаш, раскажу табе, адкуль пайшоў наш род? — запытала Звеніслава.

— Ты ведаеш пра гэта? — здзіўлена перапытаў князь.

— Мне ў дзяцінстве расказвала бабуля. Дык вось, слухай. Нашы далёкія прашчуры былі вельмі высокія і прыгожыя людзі. Яны спусціліся на зямлю з нябёсаў. З сабой яны прынеслі збожжа, авёс і ўсё чыста, што мы зараз вырошчваем. Мужчыны ўмелі лётаць у паветры, нібы птушкі, апрацоўвалі жалеза, маглі вырабляць металічныя рэчы. Усё, што зараз умеюць нашы людзі, пайшло ад іх. Наш род — абраны багамі! Мы — дзеці нябёсаў!



*А. Крывенка.*
Рагвалод

1. Прыгадайце імя першага вядомага летапісца ва ўсходнеславянскіх землях.
2. Пра якія часы расказваецца ў творы?
3. Што вы ведаеце пра крывічоў? Дзе яны жылі?
4. Хто такі Рагвалод? Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Анатоля Крывенкі «Рагвалод». Якім паказаны князь? Раскажыце пра сваё ўражанне ад гэтага партрэта.
5. Якія дзівосы зберагаліся ў Скрыпторыі?
6. Як называлася галоўная кніга роду? Чым яна была адметная?
7. Патлумачце значэнне выразу *спасцігаць кніжную мудрасць*.
8. Падзяліце твор на сэнсава закончаныя часткі, падбярыце да іх загалоўкі.
9. Перакажыце легенду пра паходжанне роду князя. Што ў ёй падалося вам незвычайным?
10. Разгадайце рэбус.



Правообладатель Национальный институт образования

# Уладзімір БУТРАМЕЕЎ



Беларусь!
Хто любоў да цябе можа змераць?
Акіяны не маюць такой глыбіні.

*Пятрусь Броўка.*

Уладзімір Пятровіч Бутрамееў нарадзіўся 20 сакавіка 1953 года ў вёсцы Расна Горацкага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. Скончыў геаграфічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута, Вышэйшыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў і Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве, дзе атрымаў спецыяльнасць кінадраматурга. Працаваў настаўнікам на Магілёўшчыне, у тэатры г. Слоніма, на Беларускім тэлебачанні.

Згадваючы пра Уладзіміра Бутрамеева, паэтэса Алена Руцкая зазначае: «Мяне ўражвала яго мэтанакіраванасць, эрудыцыя, працаздольнасць. Чытаў і пісаў ён многа, а таму ў мезаніне, які служыў кабінетам, быў і стол, і канторка. Адрываючы позірк ад рукапісу, ён бачыў лясы, нябесны прастор, дзе нічога не замінала свабоднай плыні думак. Валодзя быў немітуслівы, надзвычай арганізаваны, так многа паспяваў, што сябры жартавалі: “У Валодзевых сутках гадзіны даўжэйшыя, чым у нашых”».

Уладзімір Бутрамееў — вядомы празаік і драматург, піша на беларускай і рускай мовах. У рэспубліканскім друку выступае з 1982 года, аўтар некалькіх кніг аповесцей і апавяданняў, а таксама п'ес, сцэнарыя тэлефільма.

Дзецям адрасаваны створаныя пісьменнікам энцыклапедыі «Вялікія і славутыя старажытнага свету», «Вялікія і славутыя людзі зямлі Беларускай».



Правообладатель Национальный институт образования

Адкуль мы ведаем пра падзеі, што адбываліся больш за тысячу гадоў таму назад на тэрыторыі Беларусі?

## Славутая дачка Полацкай зямлі
*(Скарочана)*

Крывічы — адно з самых шматлікіх славянскіх плямён — пабудавалі свой галоўны горад на рэчцы Палата, якая і дала гораду назву — Полацк.

Першым полацкім князем, пра якога захаваліся летапісныя звесткі, быў Рагвалод.

На той час на поўнач ад Полацка ўжо існаваў славянскі горад Ноўгарад. А на поўдзень ад Полацка на Дняпры ляжаў старажытны славянскі горад Кіеў.

На прастоле[1] ў Кіеве сядзеў Яраполк, а ў Ноўгарадзе княжыў яго малодшы брат Уладзімір. Хутка паміж братамі пачалася вайна за тое, каму стаць галоўным князем. Полацк ляжаў на шляху абодвух братоў, што вось-вось павінны былі пачаць бойку. І Яраполк, і Уладзімір хацелі перацягнуць полацкага князя на свой бок і спадзяваліся на яго дапамогу.

У Рагвалода былі два сыны і дачка. Дачку звалі Рагнеда. Слава пра яе прыгажосць дайшла і да Ноўгарада, і да Кіева. Уладзімір паслаў у Полацк сватоў. Кіеўскі Яраполк таксама хацеў узяць яе за жонку. Рагвалод не стаў прымушаць Рагнеду і дазволіў ёй самой выбраць мужа. Гордая палачанка адмовіла паслам Уладзіміра.

Атрымаўшы адмову, Уладзімір наняў варагаў[2] і пайшоў на Полацк. Штурм цягнуўся некалькі дзён — палачане што ёсць сілы баранілі родны горад. У баі загінулі адважныя Рагвалод і абодва яго сыны. Ворагі ўзабраліся на сцены, падпалілі дамы. Полацк быў разбураны дашчэнту. Большая частка жыхароў загінула, а тых, хто застаўся жывы, забралі ў палон.

---

[1] *Прасто́л* — пасад, трон як сімвал улады князя.

[2] *Вара́гі (ві́кінгі)* — найбольш ваяўнічыя германскія плямёны, што жылі на поўначы і, адпраўляючыся на лодках у іншыя краіны, рабавалі народы Еўропы.



Правообладатель Национальный институт образования

Рагнеду Уладзімір сілаю прымусіў пайсці за яго. Заступіцца за яе не было каму, і ёй давялося стаць жонкай ненавіснага забойцы сваіх родных. А Уладзімір, каб яна заўсёды помніла пра паражэнне Полацка, даў ёй другое імя — Гарыслава.

Пасля разгрому Полацка Уладзімір асадзіў Кіеў, забіў свайго старэйшага брата Яраполка і стаў адзін княжыць у Кіеве.

...Аднойчы, калі Уладзімір заснуў, Рагнеда хацела забіць яго. Уладзімір прачнуўся і адабраў нож.

— Бацьку майго ты забіў, зямлю маю ты захапіў, а мяне як паланянку ўзяў за жонку! — усклікнула Рагнеда.

Раззлаваны Уладзімір загадаў апрануць ёй самае прыгожае адзенне, у якім яна хоча памерці, сесці на ложа і чакаць смерці, а сам пайшоў па меч. Рагнеда паклікала свайго старэйшага сына Ізяслава, зусім яшчэ хлопчыка. І калі Уладзімір увайшоў, каб забіць Рагнеду, сын аклікнуў яго:

— Бацька, ты тут не адзін!

Уладзімір убачыў сына, у руках якога быў аголены меч, сумеўся і не крануў Рагнеду. Ён сабраў баяр і расказаў ім пра тое, што здарылася. Баяры параілі яму адпусціць Рагнеду з дзецьмі на радзіму — у Полацкае княства. Полацк быў разбураны, і Уладзімір загадаў пабудаваць для сваёй былой жонкі новы горад і назваў яго імем сына, які ўратаваў маці ад смерці, — Ізяслаўлем (цяпер горад Заслаўе).

Праз нейкі час Рагнеда таксама прыняла хрысціянства. Яна заснавала каля Ізяслаўля першы на ўсходнеславянскай зямлі манастыр і жыла ў ім, прыняўшы манаскае імя Анастасія. Праз нейкі час Рагнеда-Гарыслава-Анастасія памерла. Усе гэтыя падзеі адбыліся вельмі даўно — у дзясятым стагоддзі, амаль тысячу гадоў таму назад.

...Кожны народ памятае заснавальнікаў княжацкіх і царскіх дынастый. У нас гэта Рагвалод і яго дачка Рагнеда, дзеці і ўнукі якой прадоўжылі дынастыю полацкіх князёў.

1. Якім паўстае Полацкае княства са слаўным горадам Полацкам у творы? Падмацуйце свае меркаванні цытатамі з тэксту.



Правообладатель Национальный институт образования

2. Што сведчыць пра свабодалюбівы характар Рагнеды, яе пачуццё ўласнай годнасці?
3. Апішыце пачуцці, якія перапаўнялі душу Рагнеды. Чаму яна адважылася на жорсткі ўчынак? Свае разважанні падмацоўвайце радкамі з тэксту.
4. Хто заступіўся за Рагнеду падчас помслівага намеру князя Уладзіміра і чаму? Якое пакаранне яе чакала?
5. Падзяліцеся сваімі думкамі падчас знаёмства з творам. Што выклікала асаблівую цікавасць: лёс Рагнеды і Рагвалода, учынак княгіні, мужнасць Ізяслава, паводзіны Уладзіміра? Над чым твор прымусіў задумацца?
6. Звярніце ўвагу на рэпрадукцыю карціны Віталя Дударэнкі «Рагнеда і Ізяслаў», размешчаную на форзацы 1. Якой паўстае Рагнеда на мастацкім палатне? Чаму, на вашу думку, мастак паказаў яе разам з сынам?
7. Асоба Рагнеды, яе лёс здаўна цікавілі мастакоў, паэтаў і музыкантаў. Карыстаючыся інтэрнэтам, адшукайце творы мастацтва, у якіх адлюстраваны вобраз славутай палачанкі.
8. Паразважайце, сімвалам чаго можа служыць Рагнеда для нас, людзей XXI стагоддзя.
9. Падрыхтуйце невялікае вуснае паведамленне пра Рагнеду (калі і дзе нарадзілася, чым займалася, як складваўся яе жыццёвы лёс).

## ПРА МАСТАЦКУЮ ІДЭЮ

Мастацкі твор нас па-сапраўднаму захапляе, калі цікавая яго *тэма* — жыццёвая з’ява або кола з’яў, якія адлюстраваны ў ім. Мы назіраем за падзеямі і іх удзельнікамі, хвалюемся за герояў, суперажываем ім. І задумваемся, што хацеў сказаць сваім творам аўтар, якімі ўласнымі роздумамі падзяліцца, якія перажыванні данесці да нас. Дакладней кажучы, імкнёмся зразумець асноўную думку літаратурнага твора — *мастацкую ідэю*.

Пазіцыя пісьменніка, яго меркаванні і ацэнкі звычайна не ляжаць навідавоку, і, каб іх зразумець, неабходна думаць, разважаць над зместам, уважліва ставіцца да ўсіх кампанентаў твора.



Правообладатель Национальный институт образования

***Мастацкая ідэя*** **— галоўная думка, асноўны сэнс літаратурнага твора, тое, што аўтар хацеў сказаць сваім творам.**

Мастацкая ідэя выяўляецца па-рознаму: *у паэтычных творах* — праз вобразны лад, агульную эмацыянальную настраёвасць, пачуцці і перажыванні аўтара або героя, ад імя якога прамаўляе ў вершы паэт, а таксама праз форму, мілагучнасць; *у празаічных творах* — праз выбар тэмы, адлюстраваныя падзеі, падбор герояў, спосабы іх абмалёўкі, апісанні карцін прыроды і побыту, пазіцыю аўтара.

Прыгадаем, напрыклад, апавяданне Алены Васілевіч «Сябры». Тэма твора — нязначная, на першы погляд, дзіцячая спрэчка, якая пасварыла лепшых сяброў-аднакласнікаў. Праз неабачлівыя, легкадумныя паводзіны аднаго хлопчыка (Грышы) гэта спрэчка магла б закончыцца трагічна для другога (Лёні). Што ж пісьменніца хацела сказаць сваім творам? Напэўна, нагадаць, што здароўе чалавека і тым больш яго жыццё — найвялікшыя каштоўнасці, якія можна паставіць пад пагрозу бяздумным учынкам, абразлівым словам, беспадстаўнай крыўдай, няўвагай ці абыякавасцю. І кожнаму трэба задумвацца над сваімі паводзінамі, вучыцца адказваць за свае ўчынкі. Няпроста далося Грышу прызнанне сваёй віны ў школьнай сварцы і ў Лёневай хваробе. Бацькі дапамаглі яму ўсё зразумець. Мастацкая ідэя гэтага апавядання — сцвярджэнне павагі, уважлівых і чулых адносін да людзей, і найперш — да сваякоў і сяброў.

Звычайна ў мастацкім творы побач з галоўнай думкай вылучаюцца і больш прыватныя, другарадныя думкі, якія яе дапаўняюць і ўдакладняюць.

1. Прыгадайце, што такое тэма літаратурнага твора.
2. Як выяўляецца асноўная думка твора? Паспрабуйце вызначыць тэму і мастацкую ідэю літаратурнага твора, які вы нядаўна самастойна прачыталі.



Правообладатель Национальный институт образования



# Вайна — боль і памяць народа



## Аляксей ПЫСІН

Дрэвы забылі пра буры і страты,
Раны свае загаіла зямля.
Толькі нічога забыць не змагла ты,
Памяць мая!..

*Максім Танк.*

Аляксей Васільевіч Пысін (1920—1981) нарадзіўся ў вёсцы Высокі Борак Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Вучыўся хлопчык у Палужскай сярэдняй школе, за восем кіламетраў ад роднай вёскі, якія штодзень прыходзілася пераадольваць пешкі ў рознае надвор'е. Першы верш надрукаваў у 1938 годзе ў газеце «Чырвоная змена».

Вялікую Айчынную вайну Аляксей Пысін прайшоў сувязістам, удзельнічаў у баях. Быў двойчы паранены. У пасляваенны час скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве, працаваў журналістам.

Аляксей Пысін — аўтар шматлікіх кніг паэзіі, твораў для дзяцей (зборнікі вершаў «Матылёчкі-матылі», «Вясёлка над плёсам»,



Правообладатель Национальный институт образования

«Колькі сонцаў», паэмы «Кавылёк», «Дзяўчынка Марыям» і інш.). Творы Аляксея Пысіна — вобразныя, эмацыянальныя, яны заахвочваюць чытачоў думаць, разважаць, перажываць. Зварот да гераічнага мінулага, драматызм ваеннага часу, памяць пра вайну — асноўныя тэмы паэзіі Аляксея Пысіна. Верш «Проня» (1959) — твор былога франтавіка.

## Проня[1]

Трымалі чужынцы яе у палоне:
— Ты наша навекі, прызнайся нам, Проня!

— Я вольная рэчка на вольнай зямлі,
І чыстымі хвалі заўсёды былі…

Прыгналі чужынцы і танкі, і коней,
Ваду ўсё муцілі ды кпілі над Проняй:

— Цяпер ты павінна згадзіцца сама,
Што чыстае плыні няма ўжо, няма!

— Няпраўда, ёсць многа крыніц пада мною
З празрыстай, чысцюткай, як слёзы, вадою.

Кідалі чужынцы на плёсы і тоні
І бомбы, і толу[2] грымучага тоны;

Фантаны ўзляталі з пяском і жалезам
Над полем счарнелым, над лугам і лесам.

…Ішлі мы паходам на захад тады,
І Проня дала нам напіцца вады.

Была яна светлай да самага дна,
І сонца, і неба адбіла яна.

---

[1] *Про́ня* — рака ў Віцебскай і Магілёўскай абласцях, правы прыток ракі Сож. Даўжыня яе 172 кіламетры. Шырыня ракі складае 15—20 метраў, а месцамі дасягае 50 метраў *(З энцыклапедыі «Блакітная кніга Беларусі»)*.

[2] *Тол* — выбуховае рэчыва, якое выкарыстоўваецца ў ваеннай справе і тэхніцы.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Рака паўстае ў вершы як жывая істота. Як называецца такі мастацкі прыём? Якія рысы можна вылучыць у вобразе Проні?
2. Перад якім выбарам апынулася рака?
3. Чаму Проня не жадае скарыцца ворагу? Падмацуйце свой адказ адпаведнымі радкамі з тэксту.
4. Як вораг вырашыў перамагчы непакорную Проню?
5. Звярніце ўвагу на тое, што адказвае Проня чужынцам на іх пагрозы і загады. Прачытайце яе адказы з адпаведнай інтанацыяй.
6. У які момант рака зрабілася *светлай да самага дна*? У чым вытокі мужнасці, гераізму, самаахвярнасці салдат на вайне?
7. Музыка ваенных гадоў натхняла людзей на барацьбу з ворагам. Яна гуртавала воінаў, дапамагала пераадолець цяжкасці франтавога жыцця, падымала баявы дух, надавала веры, сілы. Уявіце, што вы — кампазітар. Вам неабходна пакласці словы верша «Проня» на музыку. Паразважайце, якую мелодыю варта падабраць для песні.



# *Анатоль ВЯРЦІНСКІ*

Я вас прашу, не зведаў хто вайны,
Прашу вас, мае дочкі і сыны,
Узяць хоць долю памяці маёй —
Каб потым ёй не зарасці травой.

*Анатоль Вярцінскі.*

Анатоль Ільіч Вярцінскі (1931—2022) нарадзіўся ў вёсцы Дзямешкава Лепельскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Ён належыць да пакалення дзяцей вайны. Вайна адабрала ў Анатоля і яго аднагодкаў дзіцячыя радасці, прымусіла рана пасталець. На іх долю выпалі ваенныя нягоды, пасляваенныя цяжкасці і нястача.



Правообладатель Национальный институт образования

Вольга Русілка піша пра Анатоля Вярцінскага: «Як згадвае паэт, побач з трагічным вайна настройвала і на “геіраічна-ратны лад”. Адзінаццацігадовы хлапчук, мала ўсведамляючы сур’ёзнасць і небяспечнасць сваіх дзеянняў, падвозіў ноччу партызан у Саснягоўскую пушчу, а потым наклеіў на дрэве ў цэнтры вёскі лістоўку з заклікам “Ідзіце ўсе ў партызаны! Біце ворагаў!”. Драматызм сітуацыі добра перададзены Анатолем Вярцінскім у вершы “Яны да вайны гулялі ў вайну”».

Пісаць вершы Анатоль Вярцінскі пачаў пасля вайны. Ён сцвярджаў: «Мы, жывыя сведкі вайны, не маем маральнага права маўчаць».

Анатоль Вярцінскі — аўтар шматлікіх паэтычных кніг. Яго творам уласцівы высокае грамадзянскае гучанне, паглыбленае асэнсаванне жыцця. Дзецям адрасаваны п’есы «Дзякуй, вялікі дзякуй!», «Скажы сваё імя, салдат», «Гефест — друг Праметэя» і інш. Асобныя вершы паэта пакладзены на музыку і сталі вядомымі песнямі, у тым ліку і верш «Два полі».

**1.** Якія творы пра вайну вы чыталі? Хто іх аўтары?
**2.** Што зближае змест і гучанне твораў, прысвечаных ваеннай тэме?

## Два полі

Было ў салдата два полі,
поле, дзе кветкі ірваў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён ваяваў.

Ціха было і чыста
у полі яго дзяцінства,
былі агонь і дым
на полі ратным[1] тым.

Два полі было ў салдата.
Адно зелянела травой,

[1] *Ра́тны* (уст.) — ваенны, баявы.



Правообладатель Национальный институт образования

другое было ўзарата
вайной і паліта крывёй.

Было ў салдата два полі,
поле, дзе кветкі ірваў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён паміраў.

1. Якія два розныя вобразы поля стварыў паэт у сваім вершы? Як яны абмаляваны?
2. У вершы адсутнічае партрэт воіна-змагара. Ці можаце вы ўявіць гэтага салдата? Як вы разумееце выраз *у полі яго дзяцінства*?
3. Зачытайце радкі з апісаннем поля бітвы. Якія вобразы выступаюць у рэзкім кантрасце (супрацьпастаўленні) з карцінай зялёнага квяцістага поля?
4. Вызначце радкі з трагедыйным гучаннем. Адшукайце вобразна-выяўленчыя сродкі мовы, што дапамагаюць больш выразна раскрыць аўтарскую задуму. Падбярыце эпітэты, метафары, параўнанні да слоў *вайна*, *Перамога*.
5. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Міхаіла Савіцкага «Поле» і падзяліцеся сваімі ўражаннямі. Прааналізуйце яе вобразы і кампазіцыю. Сімвалам чаго з'яўляецца жыта? Як фарбы і колеры карціны дапамагаюць раскрыць мастацкую задуму жывапісца?



*М. Савіцкі.* Поле

6. Паслухайце запіс песні на верш Анатоля Вярцінскага «Два полі» (музыка Эдуарда Ханка). Падзяліцеся сваімі думкамі і разважаннямі.
7. Што аб'ядноўвае твор Анатоля Вярцінскага «Два полі» з раней вывучаным вершам Аляксея Пысіна «Проня»?
8. Каб ушанаваць памяць ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, па ўсёй тэрыторыі Беларусі ўзведзены помнікі, абеліскі, мемарыяльныя комплексы. Раскажыце, якія з іх ёсць на тэрыторыі вашага насе-



Правообладатель Национальный институт образования

ленага пункта, апішыце іх. Складзіце картатэку «Помнікі Вялікай Айчыннай вайны раёна (горада)».

9. Вывучыце верш Анатоля Вярцінскага «Два полі» на памяць.

10. Разгадайце рэбус.



# Вячаслаў АДАМЧЫК



Ты кажаш, я не ведаю вайны,
Што мне было тады гадоў замала.
Чаму ж яна мае забрала сны?
На ўсё жыццё наперад сны забрала?

*Ніл Гілевіч.*

Вячаслаў Уладзіміравіч Адамчык (1933—2001) нарадзіўся ў вёсцы Варакомшчына (цяпер Дзятлаўскі раён Гродзенскай вобласці) у сялянскай сям'і.

Дзяцінства будучага пісьменніка абпаліла Вялікая Айчынная вайна, паўплывала на яго далейшы лёс. Пазней пісьменнік успамінаў: «Помню маладое лета 41-га года. Гарэла наша вёска. Сонца праз густы дым было мутна-жаўтаватае, як перад зацьменнем. Помню ядавіты свіст куль».

Вячаслаў Адамчык скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве, працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм», у выдавецтве «Мастацкая літаратура», галоўным рэдактарам дзіцячага часопіса «Бярозка». Пачаў друкавацца ў 1957 годзе. Ён аўтар шматлікіх празаічных твораў пра падзеі ваеннага і пасляваеннага часу, пра заходнебеларускую рэчаіснасць. Пісьменнік разумее і тонка адчувае чалавечыя перажыванні. Тэмы яго ранніх апавяданняў — жыццё вёскі, лёсы дзяцей і моладзі, душэўныя памкненні герояў, чалавечыя ўзаемаадносіны, пошукі свайго месца ў свеце. Пра адзін з эпізодаў свайго дзяцінства Вячаслаў Адамчык расказаў у апавяданні «Салодкія



Правообладатель Национальный институт образования

яблыкі» (1964). Імкнучыся перадаць складанасць ваенных падзей, аўтар паказвае, што вайна жорсткая сама па сабе. Яна не разбірае, хто вінаваты, а хто — не, і можа забраць жыццё выпадкова, праз збег пэўных абставін.

Чаму вайне няма апраўдання?

## Салодкія яблыкі

### I

«Старасту» — абструганую яловую палку з накарэлым на ёй цестам (мусіць, нехта мяшаў свінням і коням) — да Папялішыных прынёс стары Цурусь. Папялішыных якраз не было дома: на дзвярах вісеў замок — жалезнае конскае пута[1]. Стары Цурусь пастаяў каля парога, аддыхаўся, паставіў палку каля вушака і пасунуўся дадому.

Стараста[2], пасля таго як партызаны застрэлілі Івана Якімчыка, ішоў па вёсцы радоўкаю[3]. Сёння адбыла адна хата за старасту, назаўтра другая.

На трэцім тыдні чарга дайшла да Папялішынай Марылі. Яна жыла адна з дзесяцігадовым Тонікам...

Закарэлую ў цеста яловую палку — знак, што гэтая хата сёння за старасту, — Марыля ўбачыла тады, калі вярнулася з поля даіць на вечар карову. Гэту палку, яна добра помніць, прыносілі пад дзверы, калі ў вёсцы ўвялі варту.

— Які ж з мяне стараста? — закрычала на ўвесь надворак Марыля, каб, мусіць, чулі і суседзі. — Хіба ж у вёсцы пазводзіліся мужчыны?

Яна ўзяла палку і пайшла шукаць свайго Тоніка, каб занёс «старасту» да Мартына Жолудзя, з якім яна ўжо нешта з год не гаварыла, пасварыўшыся за калодзеж.

---

[1] *Пу́та* — вяроўка, якой перавязваюць пярэднія ногі каню падчас пасьбы.

[2] *Ста́раста* — выбарная або назначаная асоба для вядзення спраў якога-небудзь невялікага калектыву, групы.

[3] *Радо́ўка* — тут: выкананне па чарзе якога-небудзь абавязку ў вёсцы.



Правообладатель Национальный институт образования

Марыля выглянула за гумны і, нікога там не ўбачыўшы, пайшла ў канец вёскі на грудок, адкуль усе мацяркі клікалі сваіх дзяцей, калі трэба было палуднаваць і выганяць на пашу быдла. Папрыганяўшы на дзень, пастухі цэлаю плоймай моклі ў рэчцы.

— Тонік, каб ты не даждаў, дадому ідзі, — гукнула Марыля і, засланяючыся рукою ад сонца, стала глядзець туды, пад алешнік, пад рэчку, дзе па беразе бегалі голыя, як бізуны, дзеці. Адыходзячыся аж да самых гародаў, яны набіралі разгон і скакалі, мусіць, у рэчку.

— Не чуе, — сказала Марыля і гукнула яшчэ раз. — Тонік, каму я кажу, дадому ідзі!

Тонік якраз сядзеў пад берагам — адтуль была відаць яго вострая худая спіна — і, засунуўшы руку ў слізкія, паабрастаныя зялёнаю бадзягаю карчы, толькі чуў, як мякка біліся аб яго растапыраныя пальцы нямоцнымі хвастамі вёрткія плоткі. Тут іх заўсёды цэлую торбу набіраў Сямён Мокуць. У карчах былі глыбокія і патаемныя лёхі[1]. Тонік падшыўся далей пад бераг і засунуў руку аж па самую паху. Але там яго востра і моцна, як кляшчамі, схапіла за мезенец. «Выдра», — спалохаўшыся, падумаў Тонік. Ён ведаў, што выдра вялася пад Сцяпанаваю алешынаю ў завоінцы ў карчах і, кажуць, нават паела ў некага шчанят. Тонік ірвануў руку назад і збялелы выскачыў з-пад берага: на мезенцы вісеў вялікі без аднае кляшні рак.

— А во Паплісты рака злавіў, — закрычалі на беразе.

Але рак пстрыкнуў хвастом, адарваўся ад пальца і ляпнуўся ў ваду. Тонік толькі бачыў, як ён вёртка шмыгануў назад пад бераг.

— Вот пусці мяне, — папрасіўся Мокуцеў Арсенік, што стаяў на беразе, увесь ссінелы, скорчыўшыся, і ў яго ад холаду дробна дрыжала барада. — Там мой бацька вунь колькі налавіў. Цябе ж усё роўна маці кліча дамоў.

— Дзе? — спытаўся Тонік, вылазячы з рэчкі, бо ведаў, калі ён не паслухаецца, то маці будзе ісці сюды з абшморганаю лазіною, ад якое надта ж пячэ, калі секануць па нагах.

---

[1] *Лёха* — падземны ход.



Правообладатель Национальный институт образования

— Ну, ідзі лаві, — сказаў Тонік і пачаў апранацца.

Бялявы, з выцвілымі валасамі і аблупленым чырвоным ад сонца носам, Арсенік быў старэйшы за Тоніка, але надта рахманы[1] і не вельмі разважлівы хлопец. Пазаўчора Тонік з двума Жолудзевымі, падмануўшы, адвялі яго ад дому і залезлі ў іхні, Мокуцеў, сад: там былі на адной яблыні хоць яшчэ маленькія, не раўнуючы, як арэхі, але ўжо салодкія яблыкі. Але яблыкаў яны не нарвалі: з хаты выскачыў, расшпіляючы на бягу папружку, Арсенікаў бацька — Сямён Мокуць.

Ён злавіў большага Жолудзевага якраз на яблыні. Ён, Тонік, з меншым, прашыўшыся пад дрот, паспелі ўцячы. Праўда, Тонік зачапіўся за калючку і разлупіў на спіне новую, маці яшчэ і не мыла, паркалёвую[2] кашулю. І пазаўчора яму добра ўляцела дома. Але Тонік болей пабойваўся Сямёна Мокуця. Што маці — яна паганяла наўкруг грубкі, і яму дасталося толькі трохі, калі ён, не паспеўшы адчыніць дзверы, уцякаў на двор. Але венік, які ён звязаў у полі з бярозавага вецця, быў яшчэ сыры і мяккі. Мужчыны, пэўна, б'юцца не так. Старэйшы Жолудзеў вунь колькі плакаў, калі яго нашастаў па вушах Сямён Мокуць.

Тонік ішоў дадому са страхам, думаючы, як мінуць Арсенікаву хату, каб часам не нарвацца на яго бацьку. Ён ужо трэці дзень асцерагаўся Сямёна Мокуця...

На вуліцы добра што нікога не было, але Мокуцеву хату Тонік мінуў подбегам.

На надворку, мусіць, ужо выкінуўшы карове траву, маці абівала аб плот дзяружку. На частаколе густа асядаў пыл.

— Ну чаго? — яшчэ з вуліцы спытаўся Тонік, усё ж пабойваючыся падыходзіць бліжэй да маці.

— Дзе ж гэта ходзіш, каб хто ведаў? — Марыля павесіла на плот дзяружку і ўзяла з прызбы доўгую палку.

---

[1] *Рахма́ны* — дабрадушны, згаворлівы, памяркоўны ў адносінах да іншых.

[2] *Паркалёвы* — зроблены з паркалю — лёгкай баваўнянай тканіны.



Правообладатель Национальный институт образования

Тонік адступіўся, ужо аглядаючыся, як шмыгануць назад на вуліцу.

— На, занясі да Жолудзяў. Вот прынеслі «старасту», — яна шпурнула палку ў траву пад плот. — Хіба ж няма мужчын? Каб іх ліха абстарасціла.

Тонік падняў палку і, стракочучы ёю па плоце, пабег да Жолудзяў. Сенцы ў Жолудзяў былі адчынены. Там немаведама што нарабілі куры. Яны паляцелі з крыкам на двор, паднімаючы вецер, калі Тонік увайшоў у сенцы. На абабітых старою дзяружкаю дзвярах, з-пад якой пучкамі тырчала старая парудзелая салома, павольна паднялася, бразнуўшы, жалезная клямка. Дзверы адчыніліся, і ў сенцы неўзабаве высунулася чорная калматая галава. Гэта быў сам Жолудзь — нябрыты, з апухлымі ад сну вачыма.

— «Старасту» вам прынёс, — замест «дзень добры» сказаў Тонік, тут жа апомніўшыся, што яго мама вучыла: як зойдзеш да каго ў хату — трэба найперш павітацца.

«Такое бяды, тут жа не хата, а сенцы», — падумаў ён.

— А хіба ж вы былі за старасту? — спытаў Жолудзь, не выходзячы ў сенцы.

— Не, — пакруціў галавою Тонік.

— То чаму цераз хату? Раз усе, так усе, — сказаў Жолудзь, хаваючыся за дзверы.

Тонік выйшаў з сенцаў і папхнуў перад сабою палку, пакідаючы на Жолудзевым надворку неглыбокую баразну.

— Нашто ж прынёс дадому? — спытала праз акно маці, калі Тонік кінуў палку на прызбу.

— Ай, не бяруць! — моцна крыкнуў Тонік, каб, мусіць, чутна было ў хаце. Ён ірвануся скарэй туды, пад рэчку, ён успомніў, што сёння ўсе хлопцы збіраліся ў Ельнік — гразкае з рудою вадою і рэдкімі лазнякамі балота, дзе кожны год у асацэ на купінах вяліся дзікія качкі і дзе ён, Тонік, летась выбраў з аднаго гнязда поўную шапку яек.

— Куды ж ты паляцеў? Гэта ж палуднаваць час, — пастукала ў раму маці, але Тонік ужо не чуў.



Правообладатель Национальный институт образования

## II

Кожны вечар, прыгнаўшы з поля, Тонік катаў па вуліцы рэхву[1]. Старую ад рассохлага кола рэхву ён знайшоў на гарышчы. Рэхвы каталі ўсе, толькі ў Арсеніка быў вялікі ад жалезнай бочкі абруч. Арсенік апярэджваў усіх, але толькі на цвёрдай сцежцы, бо на пяску абруч загразаў і падаў. Але як далёка ён бег з таго грудка ў канцы вёскі, калі яны ўсе разам пускалі свае коткі пад рэчку. Тонікава рэхва не дакочвалася нават да загарадаў. Але сёння ён ледзь знайшоў яе ў высокай траве. А Арсенікаў абруч, як ні шукалі яны ўсе разам, — не знайшлі. Ён закаціўся недзе ў асаку. Праўда, нехта сказаў, што калі пачнуць касіць, то ён знойдзецца. Бо хто-небудзь, вытупіўшы касу аб жалеза, выкіне яго з сенажаці на дарогу. Але Арсенік не даў веры. Ён застаўся шукаць свой абруч. Усе ж хлопцы паехалі дадому, бо ўжо добра сцямнела, а ён, Тонік, успомніў, што не загнаў яшчэ на седала курэй. Мама сказала, што вернецца зацемна. Падаіўшы нанач карову, яна пайшла на хутары, што пад Азяранамі, пазычаць мукі — сёння ў іх нават не было чым падкалаціць шчавель. «Глядзі ж з агнём, — прыказала мама, — не запальвай, бо і газы так толькі на якую пільную патрэбу. А калі будуць страляць, то на печы не сядзі». Ды Тонік і сам ведаў, што калі страляюць, то трэба хавацца за печ. Праз цэглу, казалі, нават не праходзіць снарад, а не то што куля. Куля нават не прайшла праз іхнюю сцяну, калі немцы стралялі па вёсцы. Яна засела ў трухлявай дзеравіне, і ён выкалупаў яе дроцікам. Але яму тады ніхто не паверыў, што куля не пройдзе праз сцяну. Тонік доўга насіў гэтую кулю ў кішэні, покуль яе не агледзела маці і не накрычала. «Няхай крые Бог, гэта ж калекаю праз якое ліха застанешся. Ніколі не бяры». Ды ён, Тонік, не вельмі браў. Гэта большыя хлопцы. Сёння яны нават прынеслі вялікі снарад, не раўнуючы, як парася. Ён доўга ляжаў у агні, покуль узарваўся. Яны ўжо адбегліся аж пад самую вёску, як убачылі спачатку дым, а потым моцна, нібы гром, стрэліла — каровы паднялі вушы і сталі нюхаць вецер. Большыя хлоп-

---

[1] *Рэ́хва* — жалезны абруч ад кола воза (дзеці выкарыстоўвалі стары абруч у сваіх гульнях).



Правообладатель Национальный институт образования

цы яшчэ вярнуліся паглядзець, што засталося ад агню і снарада. Іх, меншых, не пусцілі. Казалі, што снарад пракапаў вялікую, можа, на метраў сто, канаву.

Засынаючы на цёплай яшчэ пад анучамі печы (ён заўсёды, калі не было мамы, спаў на печы і ніколі не чуў, як яна пераносіла яго на ложак), Тонік думаў, як раніцаю ён пабяжыць на тое месца, дзе сёння яны клалі агонь. І яму ўжо снілася Лука, тое балота, куды прыганялі сваё быдла аж тры вёскі. І ён ужо бачыў, як у агні яшчэ ляжаў снарад, як усе ўцякалі, а толькі ён, Тонік, ніяк не мог варухнуць нагамі. І снарад узарваўся, і Тоніку раптам здалося невядома чаму, што ўзарваўся ў сенцах. Тонік адкрыў вочы — нехта моцна грукаў у дзверы.

«Пэўна, маці», — думаў ён, ссоўваючыся з печы на лаўку.

Тонік выбег у сенцы: «Хто там?» — хацеў спытаць ён, але на надворку, яму здалося, гаварылі чужыя. Нечая рука адтуль ізноў моцна страсянула дзверы.

«Каб не стралялі!» — Тонік нават перастаў дыхаць.

— Староста тут? — спытаўся знадворку нехта тоўстым голасам.

— Няўжо спяць? — загаварыў другі асіпла і тонка, мусіць, нізенькі.

— Мамы нямашака дома, — сказаў Тонік. Ён помніў, што мама наказвала не адчыняць нікому чужому — пастукае ды пойдзе.

— А дзе ж жыве староста? — спытаўся той самы тоўсты голас.

— У нас! — адказаў Тонік, нарэшце здагадаўшыся пра тую яловую палку, якую ён насіў да Жолудзяў і якая ляжала цяпер на прызбе, і пасмялеў.

— Дык адчыняй, чаго ты баішся, — здаецца, ужо добра сказаў той самы, мусіць, высокі.

Тонік намацаў у поцемках засоўку і, націскаючы плячом на дзверы, з грукатам яе адсунуў.

На двары іх было куды болей — ужо потым разгледзеўся Тонік, калі яны перасталі свяціць яму ў вочы ліхтарыкам, — і ўсе ў чорным, з аўтаматамі на грудзях, з нейкімі малаватымі на булаватых галовах пілоткамі.



Правообладатель Национальный институт образования

«Паліцыянты[1]... Яны хоць па-нашаму гаворацць».
— Дык дзе ж той стараста? — спытаўся асіплым тоненькім голасам якраз самы высокі з іх, той, што свяціў у вочы ліхтарыкам.
— Наша сёння хата за старасту.
— Як?
— Да нас дайшла радоўка, — сказаў Тонік, ужо адчуваючы, што яго ці ад холаду, ці ад страху пачынае калаціць.
— Хрэн з ёю, з гэтаю радоўкаю! — загаварыў намнога ніжэйшы за таго большага, але тым самым тоўстым голасам. — Ты ведаеш, у каго ёсць коні?
— Ведаю, — сцішана адказаў Тонік, раптам успомніўшы, як ён ледзь не наскочыў сёння на Арсенікавага бацьку, Сямёна Мокуця, калі той вёў да рэчкі паіць каня.
— Ну, ідзі, пакажаш!
На вуліцы каля плота іх цямнела многа. Недзе гаварылі, чуваць было, і ў другім канцы вёскі. «Аблава», — падумаў Тонік. Гэтакае было на згоне зімы, тады, калі нямецкія салдаты бамбілі Ліпава, што пад лесам, і ў іхняй вёсцы хацелі застрэліць Піліпавага Ваську, што скоса глянуў на немца.
— Во, у іх ёсць конь, — паказаў Тонік на Мокуцеву хату, калі большы мінуў Арсенікаву брамку.
— Хлопцы, ідзіце сюды, — спыніў высокі, пэўна, загадваючы тым, што стаялі, падпёршы плячыма частакол.
— А ў гэтай няма? — паказаў рукою меншы на Жолудзяў, убачыўшы, што Жолудзеву хату невядома чаму мінулі.
— Не, — сказаў Тонік, бо ведаў, што Марціну Жолудзю садзіў бульбу і вывозіў гной стары Піліп, што жыў у другім канцы вёскі.
— Конь у Хведаравых ёсць, — у Хведаравых быў пярэсты — чорны з белым конь: ён кульгаў на адну нагу і кусаўся, — і ў Шакуна, што за імі, — яшчэ ўспомніў Тонік.
— А дзе гэтыя Хведаравыя? — пацікавіўся той высокі.

---

[1] *Паліцыя́нт (паліца́й)* — здраднік, паслугач з мясцовага насельніцтва, які пайшоў на службу да гітлераўцаў.



Правообладатель Национальный институт образования

— А вунь пад бярэзінаю. — У Хведаравых на надворку расла старая бяроза, і ўсе ў вёсцы казалі на гэтае месца «пад бярэзінаю».

— Скажы, а ў партызанах з вашай вёскі ёсць хто? — пацікавіўся раптам меншы.

У партызанах быў Верчын Сяропа. Ён нават прыходзіў дадому і танцаваў на вечарынцы з Жолудзеваю Волькаю, і ўсе гаварылі, што яны любяцца.

— У нас партызанаў няма, — сказаў тое самае Тонік, што гаварыў аднаго разу стары Піліп на вуліцы чырвонаму немцу; Тонік ніколі не бачыў, каб былі гэтакія чырвоныя, як жар — і валасы, і бровы, — людзі.

— Ну ладна, бяжы дадому, — махнуў рукою большы.

І Тонік пабег. Мінуючы Мокуцяў, бачыў, што ў тых у хаце паліцыянты бліскалі ліхтарыкамі, і чуў, што гаварыў сам Мокуць: «Паночкі, ды я ж учора толькі ездзіў».

«Мне ўжо не будзе каго баяцца, калі Мокуця забяруць у абоз», — радаваўся Тонік і тут жа ўспомніў, што дадому, пэўна, ужо вяртаецца маці — адна, гэтакаю цемнатою. І каб яе не застрэлілі — раптам спалохаўся ён. І ўжо дома не спаў, покуль яна не вярнулася з Азяранскіх хутароў, так і не пазычыўшы мукі.

### III

На трэці дзень паявіўся Мокуцеў конь, але без воза. Раніцаю яго ўбачылі пастухі: ён піў у рэчцы ваду, за ноч, мусіць, добра выеўшыся на чужых сенажацях.

Выйшаўшы на бераг, на сухі пясок, конь укленчыў на пярэднія ногі, выцягнуў шыю, прылёг на бок і, брыкаючы нагамі, перавярнуўся на спіну. Потым конь устаў. Шырока расставіўшы ногі, страсянуў з сябе жоўты пясок, пакруціў галавою, фыркнуў і памалу пайшоў у вёску.

— А вунь ваш конь, — паказаў Арсеніку большы Жолудзеў.

Арсенік паправіў на плячы шлейку, выцер рукавом нос і пабег лавіць каня.

«А дзе ж Мокуць? — гледзячы ўслед Арсеніку, падумаў Тонік, і раптам яго апанаваў страх: — А што будзе, калі не вярнуўся?



Правообладатель Национальный институт образования

Гэта ж усе ведаюць, што я быў за старасту, і адразу падумаюць: удаў Мокуця».

Конь тым часам быў ужо ў вёсцы.

— Глядзі сюды! — штурхануў Тоніка большы Жолудзеў. — Хіба не бачыш, карова дзе?

Тонік аглянуўся: яго карова стаяла ў аўсе, якраз на сярэдзіне палетка. Вырываючы авёс з карэннем, яна жавала толькі мяцёлкі.

Тонік выгнаў з аўса карову і пачаў зноў глядзець у бок вёскі. Арсенікава галава мільгала ўжо на вуліцы за частаколам.

«Ліха не возьме гэтага Мокуця», — плюнуў нарэшце Тонік і пачаў мераць свой цень — ці не пара гнаць дадому.

— Яшчэ ранавата, — махнуў рукою большы Жолудзеў і дастаў з кішэні складны ножык. — Давай во лепей гуляць у ножыкі.

Яны згулялі аж тры разы, але Арсеніка ўсё не было.

Тонік зноў пачаў мераць свой цень. Цяпер ён налічыў пяць ступняў: можна было гнаць дадому.

Каровы ўжо самі пацягнуліся на дарогу, пад рэчку, яны хацелі піць. Толькі авечкі, млеючы ад гарачыні, ляжалі пад алешынай. Тонік стрэльнуў пугай — авечкі нехаця падняліся і пабеглі, збіўшыся ў кучу і адпіраючы адна адну бокам.

— А дзе ж Арсенік? — услых спытаў Тонік.

— Дома, дзе ж. Нашто ён табе? Вот лепей глядзі за каровамі, а то твая ізноў павядзе ў авёс. — Большы Жолудзеў, мусіць, не думаў пра Арсеніка і яго бацьку.

«Няўжо не вярнуўся Мокуць?» — Тонік падкасаў штаны і палез у рэчку выганяць кароў.

Трымаючы ў руцэ кусок пасінелае бульбянае кашы, на вуліцы іх ужо чакаў Арсенік.

— Дай пакаштаваць, — папрасіў большы Жолудзеў.

Арсенік адламаў яму і Тоніку.

— Ну што, прыйшоў твой бацька? — спытаўся Тонік і крадком глянуў на Арсеніка.

— Не... можа, яшчэ прыйдзе, — сказаў Арсенік і зрабіўся раптам сціпшны.



Правообладатель Национальный институт образования

## IV

Папалуднаваўшы, Тонік выйшаў на вуліцу. Стаяла гарачыня. У гародчыках вяў бэз. Ля плота, параскрываўшы дзюбы, хадзілі куры, ім, пэўна, было млосна. Толькі адна матылька хіба не баялася гарачыні: яна ўсё вілася над вуліцаю, нізка, пры самай зямлі, нібы шукала, згубіўшы што.

«Мо схадзіць на рэчку?»

Тоніку было сумна.

На плоце каля свае хаты сядзеў Арсенік. Тонік падняў вочы і ўбачыў яго.

«Ён чакае бацьку», — раптам падумалася Тоніку.

— Ідзі сюды! — клікнуў яго Арсенік.

Тонік нехаця падышоў.

— Хочаш, я табе гняздо пакажу? — хітра прыжмурыўся Арсенік.

— Дзе?

— Пад рэчкаю.

— Хадзем.

Вузенькаю сцежкаю, што бегла праз Цурусеў надворак і якою бабы з цэлае вёскі хадзілі паласкаць бялізну, яны пачалі спускацца да рэчкі...

— Глядзі, не наступі на шкло! — крыкнуў Тонік, спускаючыся ўслед за Арсенікам.

— Я ведаю, — адгукнуўся Арсенік ужо каля рэчкі.

Тонік не ўтрываў і пабег таксама.

Рэчка сёння была роўная з берагамі — недзе ў млыне адкрылі ўсе застаўкі. У карчах шумела і булькала вада. Пад навіслаю алешынаю кружылася жоўтая шапка пены.

Каля берага цэлаю плоймаю стаялі вадзяныя камары.

— А дзе яны зімуюць? — спытаўся Тонік, сашморгваючы з алешыны лісце, каб разагнаць камароў.

— Не ведаю, — задумаўшыся, адказаў Арсенік. — Вот як прыйдзе мой бацька — спытаем.

Тоніку зноў зрабілася сумна. Ён спытаў:

— А дзе ж гняздо?



Правообладатель Национальный институт образования

— Хадзем сюды, — Арсенік пашыўся ў альховыя кусты.

«А што будзе, калі ўсе дазнаюцца, што праз мяне не вярнуўся Арсенікаў бацька?» — Тоніку ўжо расхацелася глядзець тое гняздо.

— Вось! — крыкнуў з куста Арсенік.

«А можа, сказаць? Можа, будзе лепей?» — Тонік уздыхнуў і, заплюшчыўшы вочы, палез у куст на Арсенікаў голас...

— Во, бачыш, — Арсенік падсунуўся да густога куста, што рос над самаю вадою.

На тонкім пруцiку калыхалася звітае з аднаго конскага валосся шэрае гняздзечка. Голыя, у рэдкім пушку, птушаняты нямогла паднялі сляпыя на тонкіх шыях галоўкі і раскрылі мокрыя чырвоныя раты. Галоўкі смешна хісталіся.

Недзе зусім блізка пырхала і ціўкала птушачка.

— Во, прынесла есці, — Тонік першы вылез з алешніку. — Уцякайма, а то адаб'ём ад гнязда птушку. Купацца пойдзем пад Сцяпанаву алешыну.

Арсенік зморшчыў аблуплены нос:

— Я нікуды не пайду.

— Чаму?

— Пайду гляну, мо вярнуўся бацька.

Арсенік падцягнуў на плячо з'ехаўшую шлейку і бокам, каб не апячыся ў крапіве, пачаў паднімацца тою самаю вузкаю сцежкаю ў вёску.

— А ведаеш, хто сказаў паліцыянтам, што ў вас ёсць конь? — крыкнуў Тонік, калі ён адышоўся.

— Ведаю, — агледзеўся Арсенік і сцішыў голас, мусіць, каб не было чутно ў вёсцы, — мама казала — Цурусь, ён усіх удае немцам.

— Я, — хацеў крыкнуць Тонік, але ў яго перахапіла дух.

### V

Што немцы застрэлілі Арсенікавага бацьку, Тонік дазнаўся ў той самы дзень, як наказалі ў вёску. Гаварылі, што Арсенікаў бацька, забіўшы паліцая, перабягаў да партызанаў.



Правообладатель Национальный институт образования

У той самы дзень было чуваць, як недзе на панадворку галасіла Арсенікава маці, Тонік нават баяўся паказвацца на вуліцу. Ён сядзеў у сваім гародчыку, паглядаючы праз частакол, што робіцца на вуліцы каля Мокуцяў. Але каля варот бачыў толькі вялікага чырвонага Мокуцевага пеўня. Певень, горда падняўшы галаву, гучна кудахтаў, да яго, высока падлятаючы, з усіх надворкаў беглі куры.

У той самы дзень Тонік першы раз не пагнаў у грамаду[1]. Ён знайшоў на гарышчы вяроўку, прывязаў яе карове за шлейку на шыі і павёў карову на ўзмежкі. На ўзмежках, ён ведаў, была нявыпасеная, па калена, трава.

Дадому ён прыгнаў позна, нават маці спыталася, чаму не разам з усімі. Яна ўжо чакала з даёнкаю каля хлява.

Тонік пастаяў пры маме, паслухаў, як недзе ў канцы вёскі крычаць і смяюцца дзеці, і пайшоў пад хату, думаючы, з кім ён сёння будзе забаўляцца, калі ўсе, напэўна, ведаюць, што праз яго немцы застрэлілі Арсенікавага бацьку.

Тонік прыпыніўся каля сенцаў, у хату не хацелася ісці. Ён высунуўся на вуліцу.

— Тонік! — блізка за спінаю крыкнуў Арсенік, і Тонік аж падскочыў. — Чаго ты спалохаўся? — Арсенік быў увесь спацелы і задыханы.

— Я не… — ледзь вымавіў Тонік, адчуваючы, як у яго моцна дрыжыць і стукае сэрца.

— Хадзем да дзяцей.

— Не, я не пайду, я ўдаў твайго бацьку. — У Тоніка раптам пачала макрэць спіна.

— Што ты пляцеш, — Арсенік яшчэ ўсё цяжка дыхаў. — Бацьку майго ўдаў стары Цурусь.

— Не, гэта я, калі быў за старасту. Але ж я не ведаў, што яго застрэляць… — сказаў яшчэ Тонік, адступаючыся на свой надворак.

---

[1] *Грама́да* — тут: агульны статак кароў вяскоўцаў.



Правообладатель Национальный институт образования

...Ноччу Тонік захварэў. Ён пачаў стагнаць і кідацца ў сне. Марыля ссунулася з печы, памацала яго лобік — ён гарэў як агнём. Яна намачыла ручнік і прыклала Тоніку да галавы — хлопец крышку паспакайнеў. Усю ноч Марыля сядзела над ім і прыкладала да яго галавы мокры ручнік. Жар у Тоніка пачаў спадаць. Але раніцаю Марыля ўсё роўна палезла на гарышча за гарнікам, там у яе сохла яшчэ ад леташняга года некалькі каліў гэтага зелля, што памагае, як яна ведала, ад усіх хвароб.

1. Якім вы ўяўляеце Тоніка? Што надзвычай усхвалявала вас у лёсе хлопчыка?
2. Чым займаўся Тонік, як ён бавіў час з вясковымі дзецьмі?
3. Што за чалавек быў Сямён Мокуць — сусед Тоніка? Чаму хлопчык баяўся і недалюбліваў яго? Наколькі абгрунтаванымі былі яго адчуванні?
4. Чаму, на вашу думку, так вабілі вясковых дзяцей забаўкі і гульні ў вайну? Якая ў іх была небяспека? Прыгадайце сон Тоніка, калі ён адзін застаўся ў хаце, і пракаменціруйце яго.
5. Што змянілася ў самаадчуванні Тоніка пасля сустрэчы з няпрошанымі гасцямі — паліцаямі? Знайдзіце ў тэксце цытаты з пацвярджэннем сваіх думак. Як гэта здарэнне паўплывала на заўчаснае сталенне Тоніка?
6. Калі да Тоніка прыйшло ўсведамленне, што ён стаў прычынай знікнення Сямёна Мокуця? Апішыце душэўны стан хлопчыка.
7. Апавяданне падзелена на часткі. Падбярыце да іх загалоўкі.
8. Чаму, на вашу думку, апавяданне атрымала назву «Салодкія яблыкі»? Паразважайце, які сэнс нададзены гэтаму вобразу.
9. Падрыхтуйце вуснае паведамленне пра Тоніка. Звярніце ўвагу на тое, як аўтар малюе знешнасць галоўнага героя, паказвае яго звычкі і забавы, адносіны з іншымі персанажамі, як выяўляе яго пачуцці і хваляванні (праз успрыманне навакольнага свету і людзей, праз учынкі і ўнутраныя перажыванні).
10. Прыдумайце невялікі аповед пра цікавую жыццёвую падзею. Арганізуйце ў класе конкурс на лепшы твор, падвядзіце яго вынікі.



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРА ЛІТАРАТУРНЫ ВОБРАЗ

Літаратура — гэта мастацтва слова. У літаратурным творы значныя і тэма, і мастацкая ідэя. Яны найперш увасабляюцца ў літаратурных вобразах. Самая істотная адметнасць мастацкай літаратуры — *вобразнасць*. Пісьменніцкае майстэрства здольна рабіць цуды, паказваючы жыццё ў форме намаляваных словам карцін, вобразаў.

***Літаратурны вобраз*** — мастацкае адлюстраванне з дапамогай слова чалавечых характараў, падзей, прадметаў, з'яў у канкрэтнай, індывідуальна-пачуццёвай форме.

Літаратурны вобраз — карціна твора вельмі *канкрэтная* (паказвае пэўны, канкрэтны, прадмет, з'яву, малюнак прыроды ці асобу чалавека) і адначасова *абагульненая* — перадае характэрныя або тыповыя рысы многіх падобных прадметаў, з'яў, жывых істот, людзей.

Літаратурны вобраз ствараецца пры дапамозе творчай фантазіі, жыццёвага вопыту, пісьменніцкага майстэрства аўтара. Пісьменнік з мноства рэальных людскіх характараў выбірае тыя, што яго надзвычай уразілі, усхвалявалі, і малюе вобразы ў адпаведнасці са сваімі ўяўленнямі. Вымысел дапамагае яму зрабіць вобразы нагляднымі, адметнымі, жывымі. І чытачы вераць ва ўсё, што адбываецца з героямі, успрымаюць іх як рэальных людзей.

У стварэнні літаратурнага вобраза асаблівая роля адводзіцца *слову*. Па-майстэрску карыстаючыся ім, пісьменнік перадае ход падзей, паводзіны і пачуцці людзей, апісвае іх знешні выгляд (партрэт), выяўляе ўласную (аўтарскую) пазіцыю, малюе карціны прыроды з яе фарбамі і адценнямі (пейзаж). І перад намі ўзнікаюць яркія, непаўторныя вобразы: *падаюць сняжынкі — дыяменты-росы, уцякала зіма ад вясны па кустах вербалозу рагатых*…

У літаратурных творах сустракаюцца розныя вобразы:

- *вобраз-персанаж (літаратурны герой)* — вобраз чалавека (напрыклад, Насцечка, Серж, стары Закрэўскі) або



Правообладатель Национальный институт образования

жывой істоты (сабака Дзік, мядзведзь Бурык, лясны жаваранак і інш.);

- *вобраз аўтара (апавядальніка)*, ад імя якога вядзецца аповед;
- *вобраз-пейзаж* — карціна прыроды (зімовы лес, восеньскі парк);
- *вобраз-з’ява* (летні дождж, навальніца, завіруха);
- *вобраз-прадмет* (яблыкі, васількі, хмарка, рака Нёман);
- *вобраз-перажыванне* — найперш у лірычных вершах, дзе аўтар перадае эмоцыі і пачуцці (радасць, захапленне, смутак, роспач і інш.).

Тэрмін «вобраз аўтара» (інакш — апавядальніка) у дачыненні да мастацкага твора выкарыстоўваецца даволі шырока. Найчасцей аўтар (апавядальнік) нібыта прысутнічае пры апісаных жыццёвых падзеях, з’яўляецца іх сведкам, збоку назірае за тым, што адбываецца, а потым расказвае пра гэта (як, напрыклад, аўтар у аповесці «Насцечка»). У ролі апавядальніка таксама можа выступаць і *герой* твора, які сам прымаў удзел у апісаных падзеях (як, напрыклад, Сяргей у апавяданні Уладзіміра Караткевіча «Былі ў мяне мядзведзі», Стась у апавяданні Генрыха Далідовіча «Страта»). А ў аўтабіяграфічных творах апавядальнікам выступае *канкрэтны пісьменнік*, які праўдзіва і дакладна пераказвае падзеі, што на самай справе адбываліся з ім, у яго ўласным жыцці (як у аповесці Максіма Лужаніна «Добры хлопец Дзік»).

Паралельна з тэрмінам «літаратурны вобраз» ужываецца паняцце «мастацкі вобраз» (ім таксама карыстаюцца падчас разгляду твораў іншых відаў мастацтва — жывапісу, скульптуры, музыкі, тэатра, кіно). Мастацкія вобразы дапамагаюць аўтарам паказваць жыццё ва ўсёй яго разнастайнасці.

1. Што такое літаратурны вобраз і як ён ствараецца? Якія віды вобразаў вы можаце назваць?
2. Ад чыйго імя можа весціся аповед у празаічных творах?
3. Ахарактарызуйце аднаго з персанажаў літаратурнага твора, які вы прачыталі самастойна. Чым вам запомніўся гэты герой?



Правообладатель Национальный институт образования

# *Аркадзь КУЛЯШОЎ*



Сябры, каго вайна скасіла кулямі,
Дыханне ваша чую за спіной.

*Аркадзь Куляшоў.*

Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў (1914—1978) — народны паэт Беларусі. Нарадзіўся ў вёсцы Саматэвічы (цяпер Касцюковіцкі раён Магілёўскай вобласці) у сям'і настаўнікаў. Сыну перадалася схільнасць бацькоў да музыкі, спеваў, мастацкага слова. Цікавіцца паэзіяй і пісаць вершы Аркадзь Куляшоў пачаў з ранняга дзяцінства. Першы свой верш — «Ты мой брат» — хлопчык убачыў надрукаваным, калі вучыўся ў шостым класе.

У студэнцкія гады летнія канікулы Аркадзь Куляшоў заўсёды праводзіў у родных мясцінах, сярод сяброў маленства, шмат пісаў пра жыццё вёскі. Усё часцей юнак бачыў свае творы на старонках газет. Яго калегі і крытыкі аднадушна адзначалі, што ў літаратуру прыйшоў таленавіты паэт.

У першыя дні вайны Аркадзь Куляшоў пакінуў ахоплены полымем Мінск, пешкі дабраўся да Оршы і добраахвотнікам пайшоў на фронт. Ваенная тэма ў яго творчай спадчыне гэтага перыяду — асноўная. У творах паэта раскрываюцца гераізм і мужнасць воінаў, іх вернасць і адданасць Радзіме, салдацкаму братэрству. Героі Аркадзя Куляшова — асобы рэальныя і легендарныя, яны, не шкадуючы жыцця, змагаюцца за Бацькаўшчыну, сваіх родных, сяброў, у баях набліжаюць перамогу.

Пасля вайны Аркадзь Куляшоў працаваў рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва», галоўным рэдактарам на кінастудыі «Беларусьфільм», рыхтаваў сцэнарыі кінафільмаў, шмат часу аддаваў уласнай творчай працы. Яго паэзія напоўнена глыбокімі перажываннямі, пільнай увагай да духоўнага свету чалавека.



Правообладатель Национальный институт образования

Аркадзя Куляшова хвалявалі праблемы вайны і міру, існавання чалавецтва, захавання планеты ад глабальнага знішчэння.

Верш «Над спаленай вёскай» напісаны ў 1970 годзе.

## Над спаленай вёскай

Над спаленай вёскай,
адзетай жалобным гранітам,
Званы абзываюцца
рэхам вайны незабытым.
Хай Вечны агонь,
што запалены ў памяць Хатыні,
Як рунь і як неба,
палае — зялёны і сіні,
Няхай яго полымя
жытам спякотным і спелым
Схіляецца ў ногі
Хатыні дварам скамянелым,
Парогу халоднаму,
прызбе маўклівай пры хаце,
Хай гора, заснуўшае ў камні,
прачнецца ў набаце.

1. Падзяліцеся сваімі пачуццямі і эмоцыямі, выкліканымі вершам. Вызначце яго тэму і мастацкую ідэю.
2. Якія словы падкрэсліваюць трагічнае гучанне твора?
3. Знайдзіце вобразна-выяўленчыя сродкі мовы (эпітэты, параўнанні), выкарыстаныя аўтарам, вызначце іх мастацкую ролю ў творы.
4. Жыта ў народных песнях заўсёды звязвалася з жыццём, мірнай працай, шчасцем. Які сэнс набывае ў творы вобраз жыта, што *схіляецца ў ногі // Хатыні дварам скамянелым*?
5. Як гучаць званы ў Хатыні? Ад чаго засцерагае іх звон і да чаго заклікае нашчадкаў? Падзяліцеся сваімі меркаваннямі.
6. Што вы ведаеце пра лёс вашых прадзедаў, іншых сваякоў падчас Вялікай Айчыннай вайны і пасля яе?
7. Прачытайце артыкул «Мемарыяльны комплекс “Хатынь”», выканайце заданні па тэме.



Правообладатель Национальный институт образования



# Зямля мая — зялёны дом

## Пімен ПАНЧАНКА



Не люблю я слова «пакарыцель»,
Не люблю я слова «ўладар».
Вось зямля зялёная — бярыце
Для жыцця, і працы, і для мар.
*Пімен Панчанка.*

Пімен Емяльянавіч Панчанка (1917—1995) — народны паэт Беларусі. Нарадзіўся ў Таліне (Эстонія), куды бацькі паехалі на заробкі. Пазней сям'я вярнулася ў Бягомль, дзе прайшло маленства хлопчыка. Велічны лес, дзівосныя краявіды Бягомльшчыны глыбока кранаді дзіцячае сэрца і на ўсё жыццё засталіся для паэта жывой крыніцай любові да роднай зямлі. Юнак стаў сур'ёзна захапляцца мастацкай літаратурай, пачаў сам пісаць вершы. Першыя публікацыі яго вершаў прыпадаюць на 1934 год. Пімен Панчанка скончыў Бягомльскую школу, педагагічныя курсы, Мінскі



Правообладатель Национальный институт образования

педагагічны інстытут, бо вырашыў звязаць сваё жыццё з настаўніцкай працай.

У верасні 1939 года Пімена Панчанку прызвалі на вайсковую службу. У гады Вялікай Айчыннай ён быў ваенным карэспандэнтам. Паэту давялося ваяваць на чатырох франтах, а Дзень Перамогі сустракаць ажно ў Іране, куды ён нечакана трапіў разам са штабам арміі і рэдакцыяй франтавой газеты. Яго вершы ваеннага часу напоўнены болем за страчаных сяброў, за зруйнаваныя гарады і спаленыя вёскі, горыччу расстання з Беларуссю, прасякнуты палымянай верай у вызваленне роднай зямлі.

Пасля вайны Пімен Панчанка працаваў у рэспубліканскім друку, узначальваў часопіс «Маладосць». Яго паэзія — эмацыянальная і лірычная, мужная і сумленная, яна, па словах Васіля Зуёнка, «саткана з жывога агню: і саграваe, і апякае душу, яе не возьмеш у рукі — і яна заўсёды з табою».

Пімен Панчанка — адзін з выдатных беларускіх паэтаў XX стагоддзя. Яго творчы рахунак надзвычай багаты і разнастайны. Ён аўтар шматлікіх паэтычных кніг. Пераклаў сусветна вядомыя творы на беларускую мову. У многіх вершах яскрава ўвасоблены думкі паэта — грамадзяніна і патрыёта. Пімен Панчанка быў заклапочаны надзённымі праблемамі, хваляваўся і трывожыўся пра жыццё, стан грамадства.

Верш «Сармацкае кадзіла» прысвечаны адной з найбольш вострых экалагічных праблем — зберажэнню прыроды, уважліваму стаўленню да ўсяго жывога на Зямлі.

1. Як вы думаеце, ці ўсе палявыя кветкі можна зрываць? Чаму некаторых раслін (кветак) у Беларусі засталося зусім мала?
2. Што вы ведаеце пра Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь[1]?

---

[1] Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь — афіцыйны дакумент, які змяшчае сістэматызаваныя звесткі пра пэўныя віды жывёл і раслін, што з’яўляюцца рэдкімі або знаходзяцца пад пагрозай знікнення на тэрыторыі Беларусі. Першае выданне кнігі выйшла ў 1979 годзе.



Правообладатель Национальный институт образования

## Сармацкае кадзіла

Адспявалі трубы залатыя,
Лета захлынулася ў расе.
Кветкі ў лесе ёсць,
Але не тыя:
Да Чырвонай кнігі збеглі ўсе.

Дзе ты, *кураслеп лясны*[1]?
Дзе *ворлік*?
Дзе *мядзведжая цыбуля — чарамша*?
Ходзіш, ходзіш —
І пяршыць у горле...
Плач, асірацелая душа.

А калісь было ўсяго на дзіва!
Як збяднеў у нас зялёны свет.
Дзе знайсці *сармацкае кадзіла*,
*Сон-траву, і меч-траву, і познацвет*?

Вінаваты ў гэтым не сарматы[2],
Вінаваты ўсе мы: ты і я.
Каб адчуць сцюдзёны водар мяты,
За сто вёрст ляціць мая сям'я.



Душна ад жалезнага прагрэсу:
Дружна падразаем жылы лесу,
Траў і кветак топчам карані,
Ад зялёнай адракаемся радні.

Што ты плачаш па траве і кветках?
Адрадзілі ж мы зуброў, баброў...
Ну, а чорны бусел? Вельмі рэдкі,
А заўсёды быў з людскіх сяброў.

---

[1] Адметным шрыфтам (курсівам) у тэксце верша выдзелены зёлкі і расліны, унесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.
[2] *Сарма́ты* — старажытны народ Усходняй Еўропы.



Правообладатель Национальный институт образования

Многа ліха — ды усюды ціха.
А зямля дакуль будзе цярпець?
А нашчадкам нашым
Чым жа дыхаць? —
Мы ўжо задыхаемся цяпер.

Трэба нам і захады, і меры,
Каб між светлых беларускіх рос
Зноў расцвіў *чаравічок венерын*
І *званочак сіні* ў лесе рос.

1. Што так усхвалявала, узрушыла аўтара? Пад уплывам якіх пачуццяў ён напісаў гэты верш?
2. Каго паэт лічыць вінаватым у тым, што прырода з кожным годам страчвае свае багацці, становіцца бяднейшай? Як пра гэта гаворыцца ў вершы?
3. Пракаменціруйце радкі верша: *Кветкі ў лесе ёсць, // Але не тыя: // Да Чырвонай кнігі збеглі ўсе*.
4. Раскажыце пра стаўленне аўтара да *жалезнага прагрэсу*, які шкодзіць прыродзе, прымушае *адракацца ад зялёнай радні*?
5. Якая спадчына, на думку паэта, застанецца нашчадкам, калі не спыніць знішчэнне прыроды?
6. Як можна выратаваць і захаваць прыроду? Якімі павінны быць паводзіны чалавека на зямлі?
7. Сфармулюйце асноўную думку (мастацкую ідэю) верша.
8. Якія новыя фарбы, гукі, карціны адкрыліся вам пасля знаёмства з вершам? Падзяліцеся сваімі адчуваннямі.
9. Твор быў напісаны шмат гадоў таму назад. Чаму ён не страціў сваёй актуальнасці і сёння?
10. Пазнаёмцеся з Чырвонай кнігай Рэспублікі Беларусь. Падрыхтуйце свае прапановы (памятку), як зберагчы тыя расліны, якія растуць у вашай мясцовасці.
11. Прачытайце артыкул «Адкуль назва?», адкажыце на пытанне.



Правообладатель Национальный институт образования

# *Іван ПТАШНІКАЎ*



У прыродзе колькі хараства!
Куды ні глянь, — усюды чары.
*Алесь Гурло.*

Іван Мікалаевіч Пташнікаў (1932—2016) нарадзіўся ў вёсцы Задроздзе (цяпер Лагойскі раён Мінскай вобласці) у сялянскай сям'і. Да вайны ён скончыў тры класы пачатковай школы. Потым іх вёска некалькі гадоў знаходзілася пад гітлераўскай акупацыяй, якую перажыла і сям'я Пташнікавых. Вайна пакінула балючы, нязгасны ўспамін і надзвычай глыбокі след у жыцці і творчасці пісьменніка. Тэме гераічнай, самаахвярнай барацьбы народа прысвечаны многія яго апавяданні, аповесці «Тартак», «Найдорф».

Пасля вайны Іван Пташнікаў скончыў Плешчаніцкую беларускую сярэднюю школу, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, працаваў настаўнікам, займаўся літаратурнай працай. Творы пісьменніка — прыкметная і самабытная з'ява ў беларускай літаратуры. Ён аўтар шматлікіх кніг прозы, раманаў «Мсціжы» і «Алімпіяда».

Іван Пташнікаў — выдатны знаўца псіхалогіі чалавека, майстар літаратурнага пейзажу. Пісьменнік і яго героі імкнуцца да жыцця ў згодзе з прыродай, адчуваюць яе прыгажосць і гармнічнасць. Свет прыроды ў творах Івана Пташнікава — жывы, адухоўлены, таямнічы.

У апавяданні «Алені» (1962) пісьменнік паказаў праўду пасляваеннага жыцця. Прырода ў творы абмалявана з тонкай назіральнасцю і любасцю, аўтар хвалюецца пра яе беражэнне.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Як вы разумееце сэнс слова *гуманізм*?
2. Каго можна назваць гуманным чалавекам? Чаму неабходна быць гуманным і ў адносінах да прыроды?

## Алені
### *(Скарочана)*

Як толькі пераехалі ў Бярэзавец, Ірка ўбачыла, што на дварэ восень. А ў вёсцы яе яшчэ не відаць.

Бярэзавец — кіламетра паўтара ад вёскі, ля ракі Бярэзаўкі, што цячэ лугам і ўпадае недалёка за Ліпнікамі ў Вілію. У Бярэзаўцу пачынаецца пушча — Палік. Тут яны жылі да вайны, Ірка помніць, пасля пераехалі ў вёску. Бацька ў Іркі быў ляснік, і жылі яны ў лесе. Ірчын бацька яшчэ вартаваў і карміў зімою ласёў і аленяў у запаведніку, які быў недалёка ад Бярэзаўца за Высокім Берагам.

Ірка любіла лес, і калі пасля вайны яны зноў пераехалі жыць у Бярэзавец, Ірка была рада. У вайну з Бярэзаўца разбегліся алені і ласі. Бацька казаў, што яны пайшлі Віліяй далёка, аж у Аўгустоўскія лясы, дзе не было гэтулькі партызанскіх лагераў і блакад.

У Бярэзаўцу ў вайну немцы спалілі іхнюю хату, астаўся толькі хлеў, які быў недакончаны — без страхі — і не ўзяўся гарэць. З яго цяпер Ірчын бацька склаў хату, нават з чатырма вокнамі. Вокны ён прывёз у вайну з заставы[1], якая была на Высокім Беразе ля Віліі, і схаваў у хляве. Заставу тады ўсе разбіралі — немцы ж усё адно спаляць. Цэлыя ў хляве асталіся толькі два акны; з іх, перарэзаўшы напалам, зрабілі чатыры, і не зусім каб малыя. Ірка праз акно бачыць увесь луг ля Бярэзаўца і нават далёкія Старыя Вольхі, ля якіх рака паварочвае да Віліі, там яна глыбокая, і ў ёй — рабыя шчупакі.

Ірка любіла восень. Можа, таму, што ў Бярэзаўцу тады было ціха-ціха. Цішыня плыла недзе адтуль, з Паліка, з пушчы, плыла ракою, гэткай жа ціхай, як і сам Бярэзавец. Рака ніколі не разлівалася і не стагнала, вясной у час паводкі ў ёй толькі падымалася вышэй цёмная вада.

---

[1] *Заста́ва* — тут: месца, дзе стаіць воінскае падраздзяленне, якое ахоўвае дзяржаўную мяжу.



Правообладатель Национальный институт образования

Увосень у Бярэзаўцу рака мялела і рана жаўцелі бярозы, бо раслі на балоце. Жаўцелі заўсёды знізу, паволі, не так, як вольхі, якія чакаюць першых маразоў, тады чарнеюць і асыпаюцца за адну ноч.

Цішыня стаяла ўсюды: і ля хаты, і на пасецы[1], і на балоце — з вёскі сюды не далятае ніводнага гуку. Затое тут жыло сваё рэха — дзень і ноч, зіму і лета, асабліва ўвосень.

— Гэ-гэй! — так заўсёды гукаў Ірчын тата, калі адыходзіўся ад дома, так гукала і Ірка. Яе дражніў тады Бярэзавец, рэха плыло на Палік, на вёску, а надвячоркам яно вярталася назад — зноў дражнілася і плыло далёка-далёка, толькі цішэй, — адкуль жа яму набрацца сілы? Ірка ж малая яшчэ, ёй толькі пайшоў дванаццаты, мала што яна рослая, падцягнулася за вайну, затое тонкая. І крычаць яна, мусіць, добра не ўмее — ціхенька і дзярката, і заўсёды тады папярхаецца, бо дзярэ ў горле. Вось каб крыкнуў тата, тады б рэха варочалася ў Бярэзавец не адзін раз, але тата ніколі блізка ля хаты не крычаў і не даваў Ірцы, каб не палохала аленяў, і так за вайну, якія асталіся, нацярпеліся страху, — чалавека сталі баяцца.

Увосень у Бярэзавец злятаюцца сарокі і сіваваронкі. Сарок Ірка не любіла: яны зладзеі і стракочуць без аддухі, лезуць на двор у карытца да парасяці, хоць тады яны і «варожаць на госця», як кажа маці. Нехта ж выдумаў — сарок дык тых хоць ты палкай гані, а гасцей з той пары, як пераехалі ў Бярэзавец, ні разу не было.

Увосень, калі стаіць пагода, шапаціць пад нагамі мох і трава-сівец, гараць сіняватыя хвойкі верасу на пасецы — верас высокі, што трава ў лучках. Па ім поўзаюць мурашкі, вялікія, з крылцамі, і лётаюць пчолы. Сядзе пчолка на верасовую галінку, калышацца, пасля нахіне яе аж да самай зямлі, абдыме ножкамі, перагнецца ўся, адтапырыць крылцы і лезе з галоўкай у маленькую кветачку. Пасля застыне, не кранецца, як памерла, — п’е.

З балота ад ракі прылятаюць вялізныя зялёныя стракозы, лапочуць над верасамі сваім доўгім бліскучым крыллем, але пчолы іх не баяцца.

---

[1] *Па́сека* — тут: высечаная дзялянка лесу.



Правообладатель Национальный институт образования

Ірка любіць пчолак: яны збіраюць мёд…

На пасецы яшчэ зялёная трава і мох, але пастарэлі ўжо грыбылісіцы, пабялелі, пачалі сохнуць. Затое ў Бярэзаўцу — маладыя баравікі: бурыя, цвёрдзенькія і круглыя — як хто іх высеяў у адну ноч. У вайну тут гарэў лес, а яны любяць гарэлае. Маладыя жаўтаватыя апенькі і варушкі абляпілі пні. Іх няшмат: не іхняя яшчэ пара. Далей, пад лагі ў бярэзніку, — чырвоныя падасінавікі і белыя чашчавікі. Маладзенькія, на тоўстым корані і з тоненькай галоўкай, — зусім як напарстак на пальцы. На грыбах — слімакі-смаўжы. Яны — Ірка вычытала — сеюць грыбы. Смаўжоў няма толькі на мухаморах… Але дзе мухаморы — там і казлякі. На пясчанай горцы за хатай іх не злічыш. Казлякоў надта не бяруць. Не бяруць і сыраежак, яны паразрасталіся на зямлі, як рэшаты…

З бярозамі растуць вольха, асіна і маленькія дубкі. Ім тут сыра, і яны дробныя. У жоўтым бярозавым лісці чырванеюць рабіны і спеюць каліны — іх у Бярэзаўцу шмат. Іх, калі балота ляжа аблогай пад снегам, доўга яшчэ будуць кляваць сарокі і гілі[1]. Але цяпер рабіны горкія, і гілі іх не чапаюць; яны дзяўбуць сасновыя шышкі — на моху, на грыбах-рудзяках панацярушана сухога сасновага насення.

Ёсць яшчэ познія маліны, але пачырванела ўжо мядзведжае вушка і пачалі чарнець ажыны. На ажынніку калючкі і павуцінне. І ягады яшчэ не выспелі.

Найсмачнейшыя цяпер брусніцы — як вінныя яблыкі, не раўня ім маліны. Ірка ўмее збіраць брусніцы. Яны на пасецы растуць шышкамі, як бабок[2] на балоце. Сасмаргнеш шышку — поўная жменя. А ля пнёў іх — як хто ўзяў ды рассыпаў з кошыка.

У імшарах[3] на куп'і — змеі і журавіны. Пахаваліся ў мох. Ірка не так ужо і баіцца змей, але журавіны яшчэ толькі пачалі ружавець. Па іх пазней яна пойдзе з мамай, калі ўжо асыплецца бярэзнік, і пойдзе на ўвесь дзень аж туды, дзе Старыя Вольхі,

---

[1] *Гіль* — птушка снягір.

[2] *Бабо́к* — балотная травяністая расліна з сакавітым лісцем.

[3] *Імша́ра* — мохавае балота.



Правообладатель Национальный институт образования

узяўшы мех. Увечары падыдзе тата: адны не дадуць рады прынесці, журавіны цяжкія, як бульба.

Калі ў Бярэзаўцу стане ціха-ціха, Ірка чуе тады, як высока ў небе за маленькімі воблачкамі грукае рэактыўны самалёт, за ім ззаду цягнецца белая дарожка. Такія самалёты над Бярэзаўцам сталі лётаць нядаўна. Ірка чуе яшчэ, як за Высокім Берагам гудуць машыны — там леспрамгасаўцы[1] згружаюць лес. Ірцы хочацца на Высокі Бераг, яна там яшчэ не была, але ж мама паслала яе з кошыкам па бабок парасяці, ды і таты няма дома ад раніцы: сышоў у пушчу да сваіх ласёў, а ў каго адпросішся — мама яе ніколі не пускае.

Ірка чуе, як шастае сухая трава ля ракі, як нехта пляскае там на ўвесь рот. Дзікі. Яны прыходзяць з пушчы аж сюды ў бабок.

Шваргочуць у траве дзікія качкі, недзе над галавой дзяцел дзяўбе сухую без верху сасну — яна аж звініць у цішы. Ля яго цінькаюць сініцы, пырхаюць з сучка на сучок, на ляту ловяць пыл і кавалачкі кары.

Да імшар падкралася ліса, падняла хвост і нюхае мох — чуе мышэй. Пасля, падняўшы хвост, схавалася ў папараці — пачула, як Ірка ішла, і зноў стала ціха-ціха. Сонца вярнула на захад, у небе застылі ружовыя хмары, і на пасеку з балота прынесла халадок.

Загудзеў над галавою жук, ткнуўся ў шчаку і ўпаў на мох пад ногі. І тады Ірка пачула, як за двума чырвонымі ад смалы карчамі мые лапамі вушы заяц. Пачула, а тады ўгледзела яго, шэрага-шэрага. Нацёршы вушы, ён пакруціў мордачкай і паскакаў на горку.

— Зайчо-о... Мылася нанач, во зайчо, — Ірка глядзела, як устае ля пня прымяты мох, як поўзаюць па чырвоных карчах жукі-разакі і мурашкі, хаваючыся ў паточаных дзірках. — Мяне, мусіць, пачула.

Угледзеўшы раптам аленяў, Ірка выпусціла з рук кошык. Мусіць, спалохалася: аленяў яна ніколі не бачыла. Яны ішлі якраз на яе і грукалі нагамі па карэнні.

---

[1] *Леспрамга́саўцы* — рабочыя лясной прамысловай гаспадаркі.



Правообладатель Национальный институт образования

Іх было чацвёра, і ішлі яны адзін за адным. Пярэдні быў сівы і ў чорныя латы[1]. Вялікі і прыгожы, ён дыбаў, задзёршы галаву. Рогі ў яго ляжалі аж на спіне, як загнуты абруч для вялікага кошыка. За ім ішла бязрогая, мусіць, аленіха, азіраючыся на сваіх, такіх жа бязрогіх, цялят. Яны кіраваліся да ракі і не баяліся Іркі. Толькі, калі пабліжэлі, зафыркалі насамі і схаваліся ў бярэзніку.

— Гэ-гэй!.. — пачула Ірка, як крычыць тата, прыйшоў ужо з Высокага Берага і, мусіць, шукае яе.

Вечарэла. У тым баку, дзе вёска, заходзіла сонца і, здавалася, загарэўся лес. Над ракой, дзе Старыя Вольхі, засінеў туман, як дымок. Над пасекай нізка праляцелі дзікія качкі — цяжкія, ледзь неслі сябе, — падаліся ў далёкі кут Бярэзаўца, дзе пачынала цямнець.

— Гэ-гэй!.. — неслася па лесе рэха.

Ірка прыклала да шчакі далонь, як рабіў яе тата, і закрычала:

— Гэ-гэй! І-ду-у-у...

Высокі Бераг — застава, і туды да вайны не пускалі. Ды Ірка была тады малая, не дайшла б: да заставы далей, чым да вёскі.

Тут самае высокае месца. Стаіш — як узлезшы на хату, на страху. Недзе ўнізе ў кустах — глыбокая рака, за ёй лог, дзе рудыя стагі, а далей поле, жоўтае на сонцы, аж блішчыць. На ім жнуць жанчыны ў белых хустках і зносяць у кучкі снапы. Некалі там, за ракой, жыла Ксеня, Ірчына цётка, і перад вайной прыходзіла да іх.

Ксеню забілі немцы.

На небе ні хмурынкі; сонца пячэ, як летам; па маладым сосніку на пасецы плыве на белых нітках, як на павуціне, насенне высокай чырвонай травы-рабінкі, што расце ля пнёў.

Пахне сасной, зямлёю і мокрай глінай. Гэта з пажарышча.

Заставу спалілі паліцэйскія ў сорак першым годзе. Нехта «падаткнуў», што ў ёй хаваецца стары шавец з Даўгінава — Шлёма. Забралі тады і Шлёму — павезлі на машыне.

Цяпер на тым месцы, дзе некалі была вялікая будыніна, парос густы сасняк. Ён вышэйшы за той, што на пасецы, вышэйшы за Ірку...

[1] *Ла́та* — тут: пляма.



Правообладатель Национальный институт образования

Прыгожыя лозы ля ракі ўвосень. Яны — чырвоныя, зялёныя, бурыя, жоўтыя, аж блішчаць на сонцы і цягнуцца лугам далёка-далёка, пакуль не хаваецца за лесам рака. Ірцы хочацца ісці і ісці туды, куды схаваліся лозы, дзе ў далёкай сінечы лясы, яшчэ большыя, чым у іхнім Бярэзаўцу, дзе зусім невядомы свет…

Як хочацца паплыць туды, дзе Палік, ракою… Не. Ірка не хоча плыць ракою, яна хоча ісці дзень і ноч, і ўсё лесам. Яна пойдзе туды некалі з татам.

На Высокі Бераг вядзе пясчаная дарога праз усю пасеку. На дарозе сляды ад леспрамгасаўскіх машын: яны яшчэ ўчора вазілі на бераг лес, цяпер іх не чуваць. Сёння Ірка, калі ішла на бераг, бачыла на пяску вялікія воўчыя сляды. Воўк перайшоў дарогу. Ваўкоў Ірка, можа, і баіцца, але ж днём воўк не стаіць на адным месцы.

На беразе за дарогай вялікія шліхты[1] бярвення. Адтуль, калі павее вецер, пахне свежай смалой, як ад падсочкі.

«Гэтулькі выразалі… Пасека недзе адна асталася…»

Ірка шкадуе лес і не любіць ні леспрамгасаўцаў з піламі, ні іхніх машын з прычэпамі і печамі… Не было б іх — не рэзалі б гэтулькі лесу.

Ірка не хоча глядзець шліхты: пара дамоў, яе ж ніхто сюды не пускаў…

Першага выбуху яна не пачула: пасека неяк застагнала сухім рэхам і запыліла, схаваўшы з вачэй дарогу. Ірка ўся сціснулася, прыпала аж да зямлі і пабегла, нічога не бачачы.

Ёй раптам успомнілася, як яны ў блакаду з татам беглі так з вёскі ўзлессем па пасецы, дзе былі бульбяныя ямы, а ўсюды рваліся міны. Такі ж ад іх сухі трэск і выбухі, такі ж дым і пыл. Тады яны з татам ледзь праскочылі, тады ў таты на руках забіла маленькую Верачку, яе сястру.

Яна бегла і бегла цяпер па карчах і пяску, не чуючы пад сабою ног, закрываючы вочы, бо па твары секла нечым калючым, мусіць, жвірам, і ад дыму аж блажыла.

Выбухі сціхлі раптоўна, як і пачаліся. Стала зноў ціха-ціха.

---

[1] *Шлі́хта* — складзенае ў штабель (стос) бярвенне.



Правообладатель Национальный институт образования

Ірка тады апусцілася на халодны, свежы пясок ля неглыбокай ямкі і выцерла вочы. Яны калоліся, мусіць, ад пылу і поту. Суха было на языку.

«Здурнела... — Ірка пачала страсаць пясок з кофты. — Гэта ж леспрамгасаўцы. Карчы дзяруць».

— Адбой, Прахор! Перакурым... — пачула яна і баялася паказацца на вочы мужчынам, што ўдвух, сагнуўшыся, падымалі з дарогі сякеры і торбачкі...

«Хаця б не сказалі тату... Заб'е».

Трава на пасецы была ўсыпана белым пяском. Валялася тоненькае карэнне ад маладых сасонак, бы яго хто надзёр на кошыкі.

Ірка ўгледзела толькі цяпер каля сябе ямы, як ад мін, і велізарныя, чырвоныя, пашчапаныя сасновыя карчы, што ляжалі на пасецы ля дарогі, як заморaныя ў плузе быкі...

Ірка ўскочыла з зямлі і пабегла саснячком да дарогі; калі і ўбачаць мужчыны — не пазнаюць.

Яна бегла, не аглядаючыся, па разоры ля дарогі, бегла доўга і пачала задыхацца. Тады спынілася, каб перавесці дух, і ёй здалося, што за ёю нехта бяжыць. Яна пусцілася зноў і, азірнуўшыся ўжо аж на дарозе, ля лужка, дзе драбнеў лес і ад расцяробу пачынаўся бярэзнік, які вёў на балота ў Бярэзавец, убачыла, што ззаду бягуць алені. Бягуць з пасекі, аж чатыры.

Пярэдні быў з рагамі-абручамі, закінутымі на плечы, і ў плямах; заднія трое беглі за ім, збіўшыся ў кучку.

Ірка спынілася — сталі і яны. Дыхалі часта-часта, бакі ў іх хадзілі хадуном.

«Пазналі...» — Ірка хацела выставіць руку, але пярэдні, у чорныя латы, адскочыў раптам назад, спалохаўшыся. Тады яна саступіла ім з дарогі, і яны, не зварочваючы, пабеглі ў Бярэзавец.

Больш Ірка не бачыла «сваіх» аленяў аж да зімы.

У Бярэзаўцу на балоце вымерзла вада, лёд пабялеў, патрэскаўся, асыпаўся, і яго выдзьмуў вецер. Чорная трава палегла на груду, высахла і шасцела пад нагамі, як сена.

Стала рака. Вада пад тонкім лёдам была чыстая, і праз яе свяцілася жоўтае глеістае дно. Лес стаяў заінелы, пусты і халодны, як парожняя пуня. Пабялеў, насупіўся, трашчаў — яго даймаў



Правообладатель Национальный институт образования

мароз. Каркалі ўдзень над ракой вароны, і стукалі без аддухі па дрэве дзятлы — грэліся. Мароз узяўся і пёк, не адпускаючы: зіма пачалася ранняя. Днём ярка свяціла нізкае чырвонае сонца, і аднекуль з чыстага неба сыпаўся сіні іней; ночы стаялі месячныя, ядраныя[1] — была поўня, зоркі дрыжалі і мітусіліся, падалі густа на лес, як іскры з коміна на страху, калі гарыць сажа. Ноччу вылі ваўкі, але далёка-далёка, на самым Паліку; было чуваць, як у вёсцы рыпелі вароты і ляскаталі на грудах калёсы. У небе гулі самалёты; успаміналася тады, як некалі па начах партызаны палілі агні і пераймалі парашуты.

Зніклі з Бярэзаўца звяры — падаліся ў пушчу: там цяплей.

Аднойчы з ночы ўсхадзіўся вецер. Ірка чула, як ён стагнаў у коміне — яна спала на печы, — стукаў у вокны, шастаў па шыбах, як хто вадзіў калючай саломай. Шумеў лес, трашчалі сосны: здавалася, нехта бегаў па гары. Ірка не спала.

Раніцай яе не хацелі пускаць у школу — мяцеліца. І двор, і дарога, і лес — усё было занесена белым снегам, ад яго балела ў вачах. Ірка дастала з гары самаробныя лыжы. Іх зрабіў у вёсцы тата; яна на іх бегала лепш за ўсіх. Школа ў вёсцы, недалёка; а хіба Ірка збаіцца мяцеліцы? У яе цёплая чорная матчына хустка, старая фуфайка; на нагах буркі, пашытыя з суконак, на бурках — бахілы[2], склееныя з гумы і слізкія-слізкія. Кнігі Ірка носіць у пафарбаванай чорнай торбачцы; яе можна перакінуць цераз плячо, калі едзеш на лыжах.

Раніцай у школу трэба выязджаць зацемна, затое вечарам Ірка прыязджала дамоў, калі яшчэ відна. Урокі Ірка робіць хутка: пайшла ў трэці клас, а за вайну ж пасталела, магла б пайсці і ў чацвёрты, ды ў вёсцы чацвёртага няма, трэба ісці аж у Камена — гэта за пяць вёрст. Ірка магла б туды ездзіць на лыжах, але адну не пусціла мама, а налета з вёскі пойдуць яшчэ дзеці.

Пасля ўрокаў Ірка дома карміла парася, але яго на тым тыдні прадалі, нават буракоў усіх не скармілі, ляжаць кошыкі са тры ў парозе пад ложкам: сабе вараць. Парасяці няма чым карміць.

---

[1] *Я́драны* — тут: ясны, свежы, марозны.

[2] *Бахі́лы* — самаробныя глыбокія гумовыя галёшы на валёнкі.



Правообладатель Национальный институт образования

У саміх вунь колькі той бульбы з буракамі. Бацька за парася прывёз з базару жыта. Жыта сушылі, панясуць у вёску малоць у жорны[1]. На вячэру будуць варыць толькі зацірку[2]. Тата гаворыць, што яму не пашанцавала. Думаў, што купяць цялушку на зіму, нават стажок сена назапасіў. Але ж да цялушкі і ўвосень, і цяпер на базары было не падступіцца. Тата яшчэ думаў, што яму, можа, удасца забіць ваўка, за шкуру добра плацяць і даюць прэмію, але ж і ваўкі, як на ліха, сышлі з Бярэзаўца. Тата за восень падстрэліў толькі двух зайцоў. Мяса патроху клалі ў булён, які варылі на полудзень. Які з таты паляўнічы? У яго нават сабакі няма. Абы-якога тата не думаў карміць, а дзе дастанеш добрага? Хацеў прывезці раз з раёна, дык жа трэба было аддаць увесь стажок сена. Ліха з ім, з такім сабакам, а сена хай стаіць. Прадасца пад вясну, не прападзе.

Пасля ўрокаў Ірка цяпер хадзіла глядзець, ці цэлы стажок, бо бацька заўважыў раз, што стажок знізу аб’елі, відаць, алені, і абгарадзіў яго. Толькі алені ўсё адно даставалі сена. Ірка бачыла іх сляды…

Сёння Ірка не адразу пабегла на балота — падалася на пасеку. Там яна ставіла петлі на зайцоў. Колькі яна накруціла іх і навязала, і ўсё попусту. Ніводнага не злавіла.

— Дурныя зайцы… — Ірка злуе і цяпер іх ужо зусім не шкадуе. Яна з імі яшчэ справіцца. Вось толькі петлі апусціць ніжэй і зробіць большыя. — Дурное зайчо! І сена яму ў пятлю паклала, а не зачапіла ж. Касое. Не бачыць зусім. Касое і дурное. — Ірка хукае ў пальцы, якія мерзнуць нават у рукавіцах. — Ну і мароз. Нос адкусіць. — Яна пачынае церці свой маленькі чырвоны ад холаду носік. І ў хаце надта не нагрэешся цяпер. Мама, як толькі выпаліць печ, адразу закладае юшку[3]. А тады ў Іркі баліць галава. Толькі ж маму ніяк не ўпросіш.

---

[1] *Жо́рны* — ручны млын з двух гладка абчэсаных круглых камянёў, пры дапамозе якіх пераціраюць зерне на муку.

[2] *Заці́рка* — рэдкая страва з дробных мучных камячкоў, згатаваная на вадзе або малацэ.

[3] *Ю́шка* — металічная пласціна, якой закладваюць адтуліну ў коміне, каб не выходзіла цёплае паветра.



Правообладатель Национальный институт образования



— Палілі-палілі цэлы дзень, а цяпер неба будзем грэць? Што? Агонь сіні ў пячурцы? Ліха з ім. Учадзець[1] баішся? На двор пайшла, праветрыся… Марш на двор!

Мама ніколі не слухала Іркі…

Пачынала цямнець, неба стала густое, чорнае. Нанач браўся мароз, і пад нагамі скрыпеў снег — прасіўся — аж рэха ішло па лесе…

Яна спынілася, але ёй доўга здавалася, што снег усё скрыпіць пад нагамі. Тады яна ўслухалася: нехта далёка ў лесе стукаў сякерай і недзе рыпеў снег. Мусіць, тата хадзіў сам да стажка… Яна хацела крыкнуць, але перадумала: можа, усё ёй здаецца.

Пасля адышлася далей на балота і пачула, што ля стажка шастае сена.

«Недзе з таго боку. Ад пушчы…»

Яна адышлася яшчэ далей на балота і тады ўгледзела аленяў. Здалёку яны былі ўсе чорныя і маленькія. Яна пазнала іх і пабегла да стажка. Верхняя жэрдка была скінутая, а яны стаялі, уткнуўшыся галовамі ў стажок, як цяляты карове пад вымя. Пачуўшы яе, адскочылі, пасталі. Трое. Чацвёрты быў яшчэ ля

[1] *Уча́дзець* — атруціцца чадам — едкім удушлівым дымам.



Правообладатель Национальный институт образования

стажка, стаяў, паклаўшы рогі на спіну. Ён быў увесь у чорныя латкі, іх яшчэ можна было разгледзець.

Яны... Яе алені...

Ірка падышла да самага стажка. Рагаты тады паволі вылез з загарадкі і не ўцякаў. Стаялі і другія. Ірка падышла блізка-блізка да яго. Ён кратаў вушамі, выцягнуў да яе шыю і адставіў нагу. З храп у яго ішла пара, і яны былі белыя-белыя — заінелі.

«Холадна яму...» — Ірцы стала яго шкада, шкада і тых маленькіх, што стаялі, прытуліўшыся адзін да аднаго, воддаль.

Яна выцягнула руку. Рагаты панюхаў рукавіцу, лізнуў языком. Тады яна дастала з кішэні акрайчык купленага ў магазіне хлеба — яго сёння прынёс тата — і падала рагатаму. Ён панюхаў яшчэ раз руку, лізнуў цёплым языком за палец, а хлеба не зачапіў.

— Цяля-цяля... — паклікала тады Ірка. — Дурненькі... Гэта ж хлеб...

І другі раз хлеба ён не зачапіў.

Тады яна, выставіўшы руку, пайшла да тых, што былі воддаль. Але тыя крутнуліся і, падняўшы снег, панесліся па балоце. Рагаты дагнаў іх.

Ірка паправіла ў стозе сена і падняла на калкі жэрдку.

— Гэ-гэй!.. — крычаў тата. На ўвесь лес.

...Яна яму нічога не сказала.

Назаўтра алені зноў прыйшлі да стога. Ірка карміла рагатага буракамі — узяла з сабой з гаршка з-пад прыпечка. Рагаты браў бурак з рукі вялікімі адтапыранымі губамі і жвакаў, не адкрываючы рот. Галава ў яго была зусім малая, вочы — сівыя, мутныя, поўсць блішчала, гладкая-гладкая, бы яе прычасаў хто. Грудзі ў яго ўсе аб'інелі, — відаць, дыхаў на іх.

Ірка аж здзівілася была: як гэта такія вялікія рогі могуць быць на малой галаве?

Рагаты ад яе ўжо зусім не ўцякаў. Яна гладзіла яго па гарбатым носе, па халодных рагах, нават па шыі — ён стаяў і слухаў.

Алені назаўтра ўпрыцемку зноў былі на балоце.

Аднойчы Ірку не пусцілі да стажка.

— Вучы ўрокі!.. — крыкнуў на яе тата. Ніколі з ім такога не было.



Правообладатель Национальный институт образования

Ірка ўсё роўна вырвалася вечарам на балота, але аленяў не застала. Калі яна вярнулася ў хату, угледзела, як маці ў парозе ў вялікіх новых драўляных начоўках накрывала засланкай кішкі... Ірка здзівілася: як парася ўсё роўна закалолі... У печы ярка гарэлі смалякі, і на прыпечку стаяла патэльня. За сталом сядзелі яе тата і Язэп з вёскі — рыжы і злосны мужчына.

— Неблагія галавіны, Андрэй, — ківаў ён сваёй вялікай галавой. — ...Нясі, баба, з прыпечка, тут астыне...

Угледзеўшы Ірку, ён змоўк, але тата махнуў рукой, і Язэп паклікаў Ірку да стала, даў відэлец.

— Садзіся з намі і ты, маладая гаспадыня. У такім разе, я табе, Андрэй, скажу, — крануў ён тату за плячо, — усіх за стол.

Бацька маўчаў, Ірка вунь як хацела есці: на стале была вараная бульба — яе пасыпалі на абрус — і ў патэльні мяса пахла на ўсю хату.

Ірка ніяк не магла даўмецца, пра што гаварылі: думала ўсё, чаму не прыйшлі сёння алені. І калі Язэп, панюхаўшы відэлец, сказаў: «Лясное лесам і пахне», — яна спытала ціха, як сама ў сябе:

— Дзе ўзялі?

За сталом ніхто не крануўся, усе як застылі. Павярнулі толькі галовы.

— Дзе ўзялі? Не буду есці! Не зачаплю... — яна ўскочыла, адсунула лаўку і выбегла з-за стала.

Маці дагнала яе ля печы:

— Паскудніца. Яна не будзе! Дзеля яе дзень і ноч стараюцца, дзеля яе на ўсё... дзеля яе... а яна... Ану, марш на печ! Я з табой пагавару, пачакай, хай чужы чалавек з хаты пойдзе. Вырасла... Капрызы... Не ўгадзілі ёй, не з таго боку падышлі, скажы ты... Я з табой, шчаня...

— Не трэба, маці... Крык тут лішні. Яна ж не ведае, што Язэп купіў нам бычка... За сена вытаргаваў. А яна чорт ведае што падумала. Расце нейкая далікатная. Тое ёй не так, тое не гэтак. І-ірка! Доўга цябе будзем клікаць? Не зважай, Язэп... Бывае...

Ірцы раптам стала балюча і чагосьці шкада; яна залезла на печ у куток і не стрымалася — заплакала.



Правообладатель Национальный институт образования

— Кінь хныкаць, нябітая!.. — крычала на яе з-за стала маці, пасля Ірка суцішылася і задумалася: «Чаму не прыйшлі алені?»

— Супакоілася. Заснула. Нічога, пасля павячэрае, не зважай надта, сусед, — чула яна, як упрошваў Язэпа бацька. Пасля яна пачула, як зашаптаў Язэп:

— А шкуру ты, Андрэй, — пад лёд. Пад лёд яе, сам ведаеш, усё бывае. А я ў вёсцы буду прыслухоўвацца.

— Язэп, праз цябе, Язэп. І ты ведаеш, чым гэта пахне. Адзін бы я... ніколі ў свеце. Калі ж у хаце посніца[1]. І то, каб не ты, ніколі б я не зачапіў. Першы і апошні...

— Ну, запеў. Хто іх лічыў пасля вайны? Бегаюць па лесе, і ўсё. А шкуру... — Язэп зноў пачаў шаптаць.

Ірынка засынала. Яна чула, але не ведала, пра што гавораць.

І назаўтра яе алені не прыйшлі. Не прыйшлі яны і праз дзень. Ірка больш не магла чакаць...

Балота прысыпана снегам, на снезе — жоўтая карыца ад сасны, яе прынесла сюды з бору ветрам; дробныя жоўтыя яловыя іголкі, зялёны, у клубочак, мох-паўзун — яго прыкаціла па шэрані. На куп'і снег стаіць ворахам, пад ім старая, сухая і пруткая балотная мятліца і хвошч — яны вытыркаюцца, і па іх цяжка ісці на лыжах. Спатыкаешся, не памагаюць і кійкі[2].

Баляць ногі: Ірка прыбегла са школы і, не распранаючыся, нават добра не пад'еўшы, схапіла ў сенечках лыжы. Як добра, што дома нікога не было. Бацька ў пушчы, маці, мусіць, пайшла ў вёску.

Ірка прабегла на лыжах усю пасеку, але нічога не знайшла. Учора ноччу valіў снег, пазамятаў усё на свеце, добра, што сёння хоць перастаў. Але ж зноў узяўся мароз: там, дзе заходзіць сонца, — чырвонае неба і ўгары раз'ехаліся хмары. Яны цяжкія, густыя і цёмныя. І нізкія-нізкія, за сосны чапляюцца. Холадна ў пальцы: настыла дрэва. Ірка часта бярэ кійкі пад паху і тады бяжыць па снезе, хукаючы ў рукі. Заінелі вейкі, не чуваць шчок, пякло,

---

[1] *По́сніца* — посная ежа, нішчымніца.

[2] *Кіёк* — прамая (роўная) тонкая палачка; тут: служыць замест лыжнай палкі.



Правообладатель Национальный институт образования

цяпер перастала; добра, што яна надзела бацькаву старую вушанку — хоць не холадна ў вушы.

Ірка часта спыняецца ля рэчкі, прыкладае да шчакі руку і крычыць на ўвесь лес:

— Цяля-а... Цяля-а... Цяляты мае, цяляты...

«Я-я-а...» — дражніцца з Паліка рэха, глухое, далёкае.

Ірка баіцца крычаць — яшчэ пачуе тата. Але ціха. Нехта ля вёскі стукае сякерай; каркае ля стажка на калку варона; дзяцел над галавой стукае ў гнілую сасну, як у сухую шчапу. Вунь ён, варочае галавой з боку на бок і дзяўбе, як усё адно цясляр высякае паз. На Высокім Беразе гудзе трактар, калі адтуль зойдзе вецер, і зноў робіцца ціха.

— Цяля... Цяля-а... — Ірка ідзе ля ракі, яна пойдзе аж туды, дзе старыя чорныя вольхі, пад Ліпнікі; не страх, калі і сцямнее. Яна ведала, што алені ходзяць да вады, яна ўгледзіць іх. Яна ведае яшчэ, што ў запаведніку іх няма, казаў тата, не мог жа іх хто злавіць і заперці ў загарадку. А можа, яны маразамі сышлі ў Аўгустоўскія лясы?..

Чым далей ад дому, тым меней гілёў са сваімі чырвонымі грудкамі — не пырхаюць з куста на куст. Затое пад зялёным пад'ялоўцам, дзе сухая трава-сівец, і ў лазовых кустах — сляды зайцоў. Зайцы гойсалі па балоце і згрызалі галоўкі сухой травы, з якіх на снег высыпалася насенне...

Цямнелася. Ірцы хацелася плакаць, хацелася вярнуцца дамоў. Яна доўга стаяла, пачынаючы мерзнуць. Падгіналіся разамлелыя ногі, хацелася сесці, марыў сон. І тады яна неяк знянацку ўбачыла аленяў. Глядзела на іх і не верыла.

— Мае алені... Цяля, цяля-а... — паклікала яна і хацела ўжо бегчы, але сумелася.

Алені выйшлі з расцяробу, што вёў з пасекі ад Высокага Берага, і падаліся пад Старыя Вольхі. Іх было толькі трое. За бязрогай маці бегла двое малых.

«Дзе ж рагаты?»

Ірка стаяла і доўга клікала яго, пасля пусцілася следам за імі. Яны ўбачылі яе і сталі ўцякаць. Яна тады зноў пачала іх клікаць. Яны тады выбеглі на балота і пусціліся берагам ля ракі. Ёй было



Правообладатель Национальный институт образования

здалося, што яны спыніліся і чакаюць яе; яна тады забывалася, што цяжка дыхаць, бегучы, што баляць у каленях ногі, што трэба было адшпіліць ля шыі гузік — ён вунь як душыць, і бегла, бегла. Ля кустоў трапіўся глыбокі снег, грузлі лыжы, правальваліся кійкі аж недзе на той свет — яна зноў узяла іх пад паху.

Алені беглі адзін за адным, як і кожны вечар. Яе алені. Дзе ж рагаты? Ён зараз выскачыць ім напярэймы, заверне і пагоніць назад, у самы кут Бярэзаўца, дзе стажок... Хутчэй бы ён выбег. Ірка не можа так спяшацца — задыхаецца.

Цямнелася хутка. У небе запаліліся зоркі, дрыготкія-дрыготкія і — зялёныя. Алені ўжо зліваліся ў адну цёмную пляму, стаялі на адным месцы, як куст, пасля разбягаліся і зноў беглі адзін за адным...

Тады Ірка зноў клікала. Яна баялася, каб не згубіць аленяў. Яны збягуць. Збягуць у Аўгустоўскія лясы. А можа, рагаты збег ужо туды, кінуўшы сваіх? Рагаты — добры, ён не збяжыць. Толькі чым яна цяпер пакорміць яго?

Ёй часам здавалася, што ён сам бяжыць наперадзе, уцякае ад яе. Яна тады спынялася і клікала — моцна, на ўсе грудзі.

Аленяў было толькі трое, і яны блізка былі ад яе. Яна дагоніць іх, ёй бы толькі дагнаць, а там яна заверне іх сама ў Бярэзавец...

Ірка хрыпла і не магла больш крычаць. Горка стала ў роце. Неба пачало рабіцца зялёным-зялёным... Гэта зоркі...

«Вунь ужо Старыя Вольхі. Гэта ж далёка ад дому», — думае Ірка...

Ірка пачула, як яе нешта душыць, сціскаючы горла. Пракляты гузік, не адшпіліла. Ірка выпусціла кійкі і хацела зняць з галавы шапку, каб можна было адвязаць рагі ў хустцы. Але рукі не слухаліся... Падвярнула раптам пад грудзі і моцна-моцна стукнула ў галаву.

Па полі бегалі зялёныя алені.

Ірка, знямоглая, упала на снег...

Ноччу, калі ўжо ўзышоў вялізны месяц, Ірку знайшоў тата. Ён прыйшоў у Старыя Вольхі па следзе, пазнаў лыжы. Ірка была жывая. Прынёсшы перад сабой дадому, ён доўга адціраў яе снегам.



Правообладатель Национальный институт образования

Усю ноч Ірка кідалася спрасоння — гарачая, не падступіцца, — і клікала сваіх аленяў.

Назаўтра раніцай Андрэй пабег у вёску, каб паехаць па доктара.

У Іркі было запаленне лёгкіх.

1. Калі адбываюцца падзеі, адлюстраваныя ў творы? Што гэта быў за час? Як пра гэта апавядае аўтар?
2. Якой вы ўяўляеце Ірку? Чым так вабіць яе прырода? Раскажыце пра свет захапленняў дзяўчынкі.
3. Прыгадайце эпізод сустрэчы Іркі з аленямі. За што палюбіла іх дзяўчынка? Як дапамагала яна рагатаму і яго сям'і ратавацца ад голаду?
4. Якія душэўныя якасці Іркі праявіліся ў адносінах да аленяў?
5. Што здарылася з рагатым? Якія адносіны да гэтага меў бацька Іркі? Ці ёсць апраўданне яго ўчынку?
6. Якімі паказаны адносіны дзяўчынкі з маці? Чаму, на вашу думку, жанчына не разумела сваю дачку?
7. Прасачыце, як паказвае Іван Пташнікаў перажыванні дзяўчынкі, як перадае яе стан у крытычнай сітуацыі.
8. Хто вінаваты ў хваробе Іркі?
9. Вызначце ролю малюнкаў прыроды ў творы. Прывядзіце прыклады з тэксту.
10. Разгледзьце на форзацы 2 вучэбнага дапаможніка рэпрадукцыю карціны Галіны Шапялевіч «У пушчы». Якім паўстае свет прыроды на мастацкім палатне? Што сугучнае ва ўспрыманні пушчы і яе жыхароў мастаком і пісьменнікам? Звярніце ўвагу на будову карціны, яе вобразы, асобныя дэталі, фарбы, агульны настрой. Знайдзіце ў тэксце і зачытайце радкі, якія, на вашу думку, найбольш адпавядаюць сюжэту карціны.
11. Якую галоўную думку выказаў пісьменнік у творы? Ці блізкая вам яго пазіцыя?
12. Падзяліце твор на часткі, дайце назву кожнай з іх. Падрыхтуйце сціслы план апавядання, выкарыстайце яго для вольнага пераказу (як запомнілася).



Правообладатель Национальный институт образования

13. Прыдумайце больш аптымістычны фінал апавядання. Абгрунтуйце яго верагоднасць. Ці магло б скласціся інакш жыццё Іркі, калі б алені з яе дапамогай перажылі галодную зіму і засталіся ў пушчы? Пафантазіруйце пра далейшае развіццё падзей. Якой магла б вырасці дзяўчынка, дзе б яна жыла, чым захаплялася б?

14. Разгадайце рэбус, выканайце заданне па тэме.

## ПРА КАМПАЗІЦЫЮ

Майстэрства пісьменніка праяўляецца ў выбары жыццёва значнай тэмы, расстаноўцы галоўных і другарадных персанажаў, размяшчэнні эпізодаў, дыялогаў і маналогаў, апісанняў прыроды і побыту. Мастацкі твор — непадзельнае цэлае, усе яго часткі размешчаны ў пэўным парадку, звязаны паміж сабой і разам утвараюць закончаную карціну жыцця. Пісьменнік злучае ў адно цэлае партрэт героя і яго разважанні, дыялогі і маналогі, аўтарскую характарыстыку з паказам паводзін і пачуццяў героя, апісанне прыроды з выяўленнем унутранага стану персанажа. І кожнаму элементу твора адведзена адпаведнае месца.

***Кампазіцыя*** — будова твора, размяшчэнне і спалучэнне ўсіх яго частак, раздзелаў, эпізодаў, сцэн.

Гаворачы пра кампазіцыю, трэба мець на ўвазе наступныя моманты: у якой паслядоўнасці паказваецца дзеянне, як развіваецца сюжэт твора, як расстаўлены героі, якія вобразна-выяўленчыя сродкі мовы выкарыстаны пры іх абмалёўцы, якія спосабы раскрыцця зместу (аўтарскі аповед, дыялог, маналог, апісанне) ужыты. А галоўнае — як усё гэта служыць *раскрыццю аўтарскай задумы, выяўленню мастацкай ідэі твора*.

Падзеі ў літаратурным творы часцей падаюцца ў такой паслядоўнасці, як яны маглі б адбывацца ў жыцці. Такая кампазіцыя ў апавяданнях Якуба Коласа «У старых дубах», Алены Васілевіч «Сябры» і іншых творах. Але часам пісьменнік свядома парушае



Правообладатель Национальный институт образования

звыклы парадак падзей і пачынае твор з «канца», гэта значыць, з развязкі або з самага напружанага моманту.

Прыгадаем апавяданне Міхася Лынькова «Васількі». Вясёлыя і радасныя хлопчыкі (сярод іх і галоўны герой) вяртаюцца з лесу. На падворку Міколка з жахам заўважае забітых маці і сястрычку, твар у твар сутыкаецца з гітлераўцамі. Ён вырашае адпомсціць ворагам за злачынства: бярэ гранату, ідзе ў мястэчка і ўзрывае аўтобус з ненавіснымі ворагамі. Пры гэтым гіне сам.

Надзвычай балючае, шчымлівае пачуццё тугі і шкадавання выклікае заўчасная гібель хлопчыка. Сама па сабе тэма твора не можа не ўсхваляваць чытачоў. Аднак дасягнуць такога моцнага трагічнага эфекту дапамагае і будова апавядання. Калі б аўтар пачаў твор з апісання прыезду ў вёску акупантаў, то чытачы былі б трохі падрыхтаваны да ўспрымання трагічных падзей: хіба можна чакаць ад фашыстаў дабрыні і спачування?! Пісьменнік жа пайшоў іншым шляхам. Уражанне ад падзей узмацняецца тым, што твор пачынаецца з апісання цудоўнага жнівеньскага дня. Аўтар паказаў бесклапотную чародку хлопцаў, што вярталіся з лесу, і сярод іх — шчаслівага Міколку з паўнюткім кошыкам баравікоў і букецікам васількоў для маленькай сястрычкі. Міхась Лынькоў вырашыў пабудаваць твор на кантрасце душэўнага стану героя: спачатку радасць, весялосць, бесклапотнасць, і раптам — бязмежнае, ні з чым не параўнальнае і непапраўнае гора.

Невыпадковы і фінал апавядання. Каб узмацніць пачуццё болю і роспачы ад трагічнай смерці хлопчыка, пісьменнік спыняе ўвагу на мастацкіх дэталях: раструшчаным салдацкім ботам школьным пенале і сініх васільках, што выпалі з-за пазухі Міколкі ў дарожны пыл. Аўтар параўноўвае вочы забітага хлопчыка з кветкамі: *Сінімі васількамі адцвіталі і вочы хлопчыка.*

Кампазіцыя мастацкага твора залежыць ад задумы аўтара і абумоўлена жыццёвым матэрыялам — тым, пра што пісьменнік збіраецца расказаць і да якіх роздумаў прывесці чытача.

1. Дайце азначэнне кампазіцыі літаратурнага твора.
2. Прыгадайце адзін з прачытаных твораў і прааналізуйце яго кампазіцыю.



Правообладатель Национальный институт образования



# *Алесь ЖУК*

Высякаюць лясы,
І няшчадна вытоптваюць боты
За дзялянкай дзялянку —
Верасы, і багун, і чарот,
На мяжы растапталі
Жывую яшчэ берасцянку,
Што будзіла над полем світанні
Штогод...

*Сяргей Грахоўскі.*

Алесь (Аляксандр Аляксандравіч) Жук нарадзіўся 1 красавіка 1947 года ў вёсцы Клешаў Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Пісаць пачаў яшчэ ў школьныя гады. Першыя яго апавяданні з'явіліся ў рэспубліканскім друку, калі юнаку было 18 гадоў.

Алесь Жук скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, займаўся літаратурнай творчасцю, працаваў у выдавецтве «Мастацкая літаратура», часопісах «Маладосць» і «Полымя», узначальваў штотыднёвік «Літаратура і мастацтва» і часопіс «Нёман».

Алесь Жук — адзін з арыгінальных і цікавых сучасных празаікаў, аўтар шматлікіх апавяданняў і аповесцей. Яго творы разнастайныя паводле жанраў і тэматыкі. У іх асэнсоўваюцца жыццёвыя, надзённыя праблемы, створаны адметныя чалавечыя характары, выяўляецца клопат пісьменніка пра лёс роднай зямлі. Алесь Жук — таленавіты мастак слова, які стварае яскравыя пейзажныя замалёўкі.

У 1982 годзе пабачыла свет кніга прозы Алеся Жука «Паляванне на Апошняга Жураўля».

1. Чаму пытанні экалогіі павінны хваляваць кожнага чалавека?
2. Да якіх змен (станоўчых ці адмоўных) у прыродзе прыводзіць меліярацыя[1]? Як яна мяняе «твар» (аблічча) зямлі?

[1] *Меліярáцыя* — сістэма мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне зямель шляхам асушэння або арашэння.



Правообладатель Национальный институт образования

## Стары бабёр
### *(Урывак з аповесці «Паляванне на Апошняга Жураўля»)*

...Стары бабёр выправіўся ў дарогу цёмначы. Толькі недзе далёка на ўсходзе крыху абазначылася светласць на небе, але была яшчэ ноч, кароткая, летняя. Над вадою слаўся туманок, рэдкі, празрысты, які знікне адразу, як толькі прагляне сонца. Стары бабёр ціха, не плюскануўшы, выйшаў з-пад вады недалёка ад свае хаты, доўга прыслухоўваўся, паволі падгрэбваючы да невялікага астраўка. Вылез на яго, сядзеў, прыслухоўваўся і прыглядаўся.

Недалёка сонна крыкнула вадзяная курка, зашалпаталася ў траве, ціха, як незадаволена, адазвалася на яе крык за трысцягом[1] крыжанка[2], і зноў усё супакоілася.

Стары бабёр яшчэ раз азірнуўся на хатку, сышоў з астраўка і паплыў, нячутна, толькі лёгка разыходзілася па вадзе хваля.

Плыў да самага берага, дзе пачыналася тупкае[3] і куды яны, бабры, не любілі выходзіць. У іхняй калоніі былі накапаны норы, забалочана, і туды ніхто не мог дабрацца. Тут быў чысты бераг, палоска адкрытае, не захінутае нічым вады.

Стары бабёр доўга стаяў на месцы, прыслухоўваўся, потым усё ж быццам пераступіў мяжу, вылез на бераг, прысеў.

Тут віўся маленькі ручаёк. Выцякаў ён з крыніц за кіламетры два адсюль, з-пад двух вялікіх, як горы, узгоркаў. На адным з іх стаяў стары панскі будынак. Цяпер яго цяжка пазнаваць. Ён даўно перароблены пад школу. Некалі ў лагу ляжалі вялікія сажалкі[4]. Цяпер яны зараслі трысцягом, чаротам, але з іх выцякала вада, бегла ручаём, які пакрысе большаў і які перапынілі плацінаю невялічкага заводзіка, дзе рабілі газіраваную ваду. Нявычышчанае азерца густа зарасло трысцягом, толькі перад самаю плацінаю, на глыбейшым, быў плёс[5]. А далей, дзе ручаёк

---

[1] *Трысцёг* — вадзяная ці балотная шматгадовая расліна сямейства злакаў з каленчатым цвёрдым сцяблом і раскідзістай мяцёлкай.

[2] *Крыжа́нка* — дзікая качка.

[3] *Ту́пкае* — тут: цвёрдая, утаптаная зямля.

[4] *Са́жалка* — штучны вадаём.

[5] *Плёс* — шырокі ціхі ўчастак ракі.



Правообладатель Национальный институт образования

рабіў завоіны[1], у балотнай лагчыне, парослай алешнікам, яшчэ адну плаціну даўным-даўно паставілі бабры. Там, дзе яны забалоцілі сабе месца, і жыла іх невялікая калонія. З аднаго боку ад рэчачкі стаяў на ўзгорку бор, пад ім хат з пяць маленькае вёсачкі. І гэты заводзік. Сюды мала хто хадзіў, мала хто ездзіў, і яны жылі тут спакойна, без клопату. Хапала на іх і лазы, і карэньчыкаў, і травы. Тут была іх маленькая радзіма.

Але стары бабёр ведаў, што сюды яны прыйшлі. Прыйшлі з вялікае, прасторнае рэчкі, не раўня гэтаму раўчуку, які праз пяць кіламетраў прападае ў чыстым полі.

Сюды паўз лес, па глыбокай лагчыне, якою ўвесну, як на рацэ, шумела расталая вада, была дарога да вялікае рэчкі, дзе жылі спрадвеку вольна і неабсяжна бабры. Стары бабёр памятаў і ведаў гэта. Цяпер ён сабраўся пайсці туды. Ён шукаў дарогу да свайго прасторнага спрадвечнага пасялення.

Ісці трэба было цяпер. Стары бабёр адчуваў, што трэба ісці не пазней чым гэтым летам. Бо пазней невядома, ці астанецца ў яго сіла, каб прывесці туды маладую сваю сям'ю, пабудавацца і пакінуць іх там, на спрадвечным месцы. А зрабіць гэта можа толькі ён адзін, бо ён памятае пра тое, што яму расказвалі старыя бабры, яго бацькі, і толькі ён адзін можа знайсці дарогу.

Дарогу гэту яму трэба цяпер пазнаць, пазнаць тое месца, пра якое яму расказвалі старыя бабры, дзе было гэтак прасторна і адкуль іх выгналі вялікія машыны, якія не пакінулі на рацэ ні прысадаў, ні травы, ні самой глыбокай ракі. Тады яны пакінулі сваю радзіму. І ўвесь час яны расказвалі пра яе. І стары бабёр памятаў іх расказы. Стары бабёр хацеў вярнуцца назад, туды, дзе было гэтак вольна і шчасліва. А там, дзе вольна, здавалася, што і сіла будзе другая, і другое будзе здароўе, і там ён будзе жыць вечна.

Стары бабёр ішоў павольна, сапраўды старэчаю хадою, бо хадзіць бабры не любяць і не ўмеюць...

Стары бабёр выйшаў нарэшце з поплаву... За поплавам пачыналася ворная зямля. Поле. Пераступаючы палявую мяжу, ста-

[1] *Заво́іна* — невялікая затока.



Правообладатель Национальный институт образования

ры бабёр азірнуўся — ён быццам пераступаў у новы свет, чужы, з якога невядома, ці можна будзе вярнуцца. За ўсё жыццё стары бабёр нікуды далёка не хадзіў, тым больш не выходзіў у чыстае поле, з аднаго боку якога стаяў пахмуры ранішні лес. Яго аднолькава палохаў і лес сваёй дрымучасцю і непрыступнасцю, невядомасцю таго, што хавалася там, у яго прыцемненых шатах. Палохала і поле — сваёй адкрытасцю, раўнатою, на якой нідзе няма вады, і таму схавацца яму, калі што, не будзе дзе.

Поле, на якое выйшаў стары бабёр, было засеяна лубінам. Густы, як дрот, калючы зялёнымі струкамі, ён як знарок заблытваў падарожніка, калоўся. І тое, што спачатку нырнуў у лубін, як у ваду, цяпер не цешыла бабра. Цяпер ён зразумеў, што ў яго не стане сілы прабівацца скрозь гэты зараснік. Трэба было выходзіць з лагчыны да лесу, на горку. Але ён ведаў, што выходзіць туды небяспечна. Трэба ісці логам. І ён ішоў, пакуль неспадзявана не спатыкнуўся ў вымыты дажджавою вадою раўчук. Вада некалі прайшла тут нахабна, зляжыла па дарозе лубін, намыла на яго пяску і пакінула пасярод поля, па лагчыне, пакручастую дарогу-прамыіну, над якою сыходзілася зялёнае поле.

Стары бабёр з палёгкаю ўздыхнуў — след вады не абмане, прывядзе да вады. Даўным-даўно, мабыць, тут, дзе гэта лагчына, цякла вялікая рэчка... Але гэта так даўно было, што памятае пра той час, мабыць, адна толькі зямля, больш ніхто не памятае...

У зялёным лубянішчы бабру здалося, што ён плыве ў зялёнай вадзе тае, даўняе, рэчкі і што яна прывядзе да вольнага спрадвечнага месца. Ён ішоў, упарта, цвёрда.

З-за цёмнага лесу пырснула першым праменем ранняе летняе сонца...

...Стары бабёр з палёгкаю нырнуў пад густыя шаты алешніку, адкуль чутна была вада, знаёмы пах вільгаці. Тут, у зарасніку травы, крапівы і на макрэйшых месцах сітнягу, пачыналі сачыцца крыніцы. Бабёр ішоў паволі: дарога была закідана ламаччам, гразкая, і па тым тоненькім ручайку, які пракладвалі сабе крыніцы, нельга было яшчэ плысці. Але адыходзіць ад вады ён не мог: стары бабёр чуў, што побач вёска...



Правообладатель Национальный институт образования



Неўзабаве алешнік парадзеў, сталі пападацца на дарозе сухія алешыны, і стары бабёр разумеў, што тут часта стаіць высокая вада. І зусім нечакана, яшчэ ў алешніку, перад ім пачалася вузкая, метры на паўтара, палоска чыстае вады, над якой нахілялася асака.

Стары бабёр амаль подбегам кінуўся да вады, ад радасці забыўшыся пра асцярогу, нырнуў, быццам не верыў, што скончылася яго сухая дарога. Амаль хвіліну ён плюхаўся, даваў нырца, нават фыркаў, так што адплыліся далей ад канавы ў зараснік травы і вастралісту са сваім выводкам качкі.

Толькі калі нацешыўся, стары бабёр спахапіўся і ціха, так, што нават не аставалася на вадзе следу, паплыў на агледзіны возера.

Яно было невялікае. Стары бабёр спачатку абплыў, агледзеў азерца — адзіны таемны выхад з яго быў толькі ў крыніцу, па той канаве, з якое ён увайшоў у возера. Толькі адтуль і можна было сплавіць крыху дрэў.

Пасля агляду стары бабёр ужо ведаў, што ў возеры нямала жыве андатры.

Стары бабёр пакарміўся карэннем рагозу[1], травы, перачакаў, пакуль доўга — аж за абед пераваліла — купалася чародка хлапчукоў і купала прыведзенага з імі белага сабачку, які баяўся вады і адчайна, колькі ставала сілы, звінеў брэхам. Потым прыехаў на матацыкле чалавек і доўга хадзіў па грэблі, шлёгаў спінінгам па вадзе.

---

[1] *Рагóз (рагóзнік)* — шматгадовая травяністая балотная расліна.



Правообладатель Национальный институт образования

Гэты плёскат, шум, брэх, якія так моцна ішлі па вадзе, былі чутны з вёскі, турбавалі старога бабра, не давалі яму супакоіцца. Хаця і пакарміўся, выплаваўся ў вадзе, крыху адпачыў, ён адчуваў сябе тут усё ж няўтульна ў гэтым шумным суседстве.

Пасля абеду стары бабёр перайшоў грэблю і падаўся далей па крыніцы. Яна была яшчэ шырэйшая, пахла халодным, крынічным, жалезнаю рудою. Потым павузела, пацякла новаю вузкаватаю канаваю, над якой раслі роўныя і стройныя алешыны. Тут было далей ад вёскі, ціха, з аднаго боку ішло поле, з другога была пасеяна трава.

Стары бабёр спяшаўся ўслед за вадою. Яна нечакана вывела яго да лагчыны, парослай маладымі кустамі лазняку. У гэтай лагчыне і канчалася крыніца. За лагчынаю яна ручайком упадала ў роўна выкапаную, ужо старую, парослую па берагах лебядою і высокім чырванаватым драсёнам[1] канаву.

Над самаю вадою ў канаве густа сышлася трава. Стары бабёр пайшоў услед і за гэтаю вадою. Па дарозе ён спалохаў чародку курапатак, якія карміліся ў зарасніках лебяды, крапівы і драсёну.

Па гэтай канаве стары бабёр дайшоў да большай, з зарослымі травою берагамі. Канава была крышку шырэйшая, у ёй можна было і плысці, таму стары бабёр апусціўся ў ваду і паплыў насустрач халоднай плыні.

Выйшаў ён з канавы на бераг там, дзе агледзеў купчастыя зараснікі лазняку. Там ён знайшоў на запруджанай паводкаю канаве многа трыснягу, рагозніку і травы. Непадалёку дзічалі некалішнія кар'еры, у якіх капалі торф.

На гэтай канаве і пераначаваў стары бабёр. Назаўтра ён яшчэ раз абышоў і абгледзеў усё навокал, пасля гэтага сабраўся і тою ж самаю дарогаю пайшоў назад... Вярнуўся дадому і прывёў з сабою на новае селішча двух маладых баброў.

1. Вы прачыталі твор, у якім галоўны герой — стары бабёр. Як абмаляваны гэты персанаж? Якія якасці бабра раскрываюцца праз яго паводзіны? Каго ён вам нагадвае?

---

[1] *Драсён* — травяністая, звычайна аднагадовая расліна сямейства драсёнавых.



Правообладатель Национальный институт образования

2. Якім паказвае пісьменнік жыццё бабрынай сям'і? Знайдзіце апісанне малой радзімы бабровай калоніі і выразна прачытайце гэты ўрывак.
3. Чым не задавальняла баброў іх жытло? Чаму стары бабёр вымушаны быў выправіцца ў рызыкоўную вандроўку?
4. Раскажыце пра даўнія ўспаміны бабра, што цешылі яго і ад якіх небяспечная дарога рабілася неабходнай і жаданай. Пракаменціруйце радкі: *Стары бабёр хацеў вярнуцца назад, туды, дзе было гэтак вольна і шчасліва. А там, дзе вольна, здавалася, што і сіла будзе другая, і другое будзе здароўе, і там ён будзе жыць вечна.*
5. Хто вінаваты ў тым, што ў жыцці баброў не стала спакою? Як пра гэта гаворыцца ў творы?
6. Якое выйсце знайшоў стары бабёр для сваёй сям'і? Зачытайце адпаведныя радкі.
7. Пісьменнік выразна абмалёўвае паводзіны і характар гаспадара бабровага сямейства. Якія пачуцці жывой істоты ён выяўляе і як перадае іх?
8. Адшукайце вобразна-выяўленчыя сродкі мовы, выкарыстаныя аўтарам з мэтай зрабіць апісанні прыроды жывымі, зрокава выразнымі, яркімі.
9. Для чаго пісьменнік выкарыстоўвае памяншальна-ласкальныя словы (*туманок, хатка, ручаёк* і інш.)? Якія пачуцці яны дапамагаюць выказаць?
10. Перачытайце найбольш яркія пейзажныя замалёўкі. Пастарайцеся ўявіць краявід або вобраз паводле таго ці іншага апісання. Падрыхтуйце сваю ілюстрацыю да твора, дайце ёй назву.
11. Дакажыце на прыкладах з тэксту, што Алесь Жук — глыбокі знаўца жывой прыроды.
12. Вызначце тэму і мастацкую ідэю твора.
13. Падрыхтуйце план твора: падзяліце яго на сэнсава закончаныя часткі, прыдумайце ім загалоўкі.
14. Што, на вашу думку, аб'ядноўвае творы Івана Пташнікава «Алені» і Алеся Жука «Стары бабёр»?
15. Падрыхтуйце вуснае выказванне «Зямля мая — зялёны дом».
16. Прачытайце артыкул «Бабры», адкажыце на пытанне.



Правообладатель Национальный институт образования

# *Янка МАЎР*



Хто сам не творыць дабраты,
На дабрату не мае права.
*Алесь Бачыла.*

Янка Маўр (Іван Міхайлавіч Фёдараў) (1883—1971) нарадзіўся ў горадзе Лібава (цяпер горад Ліепая, Латвія) у сям'і сталяра. Вучыўся ў настаўніцкай семінарыі. Пазней настаўнічаў, спрабаваў свае сілы ў літаратурнай творчасці. Янка Маўр прыгадваў: «Я і сам, мусіць, стаў пісьменнікам толькі дзякуючы кнігам. Яны мне адкрылі свет і людзей, яны абудзілі тое, што пасля назвалі фантазіяй».

Янка Маўр — заснавальнік прыгодніцкага і фантастычнага жанраў у беларускай літаратуры. Ён аўтар раманаў, аповесцей, апавяданняў для дзяцей і моладзі. Пісьменнік расказаў пра замежныя краіны, дзівосныя прыгоды, незвычайных, цікаўных і вынаходлівых герояў у творах «Чалавек ідзе», «У краіне райскай птушкі», «Амок», «Сын вады», «Вандраванне па зорках», «Палескія рабінзоны» і інш. Апавяданне пісьменніка «Багіра» было ўпершыню надрукавана ў 1945 годзе ў часопісе «Бярозка».

Што такое міласэрнасць, дабрыня? Што значыць быць міласэрным? Падбярыце сінонімы да слова *міласэрнасць*.

## Багіра

Вы, вядома, чулі гэтае імя. Пэўна, ведаеце чорную пантэру, прыяцельку Маўглі.

Але цяпер гутарка будзе ісці хоць і пра дальнюю сваячку, але ўсё ж такі не пра пантэру, а пра кошку. Звычайную кошку, толькі, вядома, чорную і, мусіць, не менш разумную, як тая Багіра.

Трапіла яна да нас самым незвычайным чынам. Раз у марозны веснавы вечар, досыць позна, вярталіся мы з дачкой дахаты.



Правообладатель Национальный институт образования

Жылі тады на ўскраіне горада. Людзей хадзіла мала. Свяціў месяц, хрумсталі падмерзлыя лужыны.

І вось тут прычапілася да нас чорная кошка, жаласна мяўкае, трэцца каля ног. А як толькі мы спынімся, яна, азіраючыся, ідзе назад. Пойдзем мы далей — яна зноў даганяе нас, крычыць, блытаецца між ног, забягае наперад, нібы не пускае ісці ў той бок. Справа ясная: яна хоча, каб мы пайшлі з ёю кудысьці назад. Нічога не зробіш: калі яна так выразна і настойліва патрабуе — трэба ісці.

Як толькі мы зрабілі пару крокаў назад, яна ўзрадавалася, шпарка паскакала ў той бок і знікла. Што яна: жартуе з намі? Мы сталі. Тады кошка зноў з'явілася і зноў пачала мяўкаць і цярціся. Мы зноў пайшлі за ёю — і зноў яна пабегла наперад, мяўкаючы здалёк.

Тым часам на бліжэйшым двары забрахаў сабака і кінуўся ў наш бок. Але тут раздаўся такі сык, так люта накінулася на яго кошка, што бедны сабака з жаласным скавытаннем паляцеў як мага далей. А кошка выбегла на тратуар і хуценька скруцілася на зямлі.

Калі мы падышлі бліжэй, то ўбачылі, што яна абкруцілася вакол кацяняці. Адкуль яно ўзялося? Мы толькі што ішлі па гэтым самым месцы — і нічога на тратуары не мелася. Значыцца, кацянё спачатку было недзе схаванае, мусіць, за плотам. Калі кошка ўбачыла нас, то парашыла звярнуцца па дапамогу, спыніла нас, прымусіла павярнуць назад, а сама тым часам вынесла на дарогу сваё дзіця ды яшчэ паспела прагнаць сабаку. Разам з тым яна не забывалася, што кацянятка толькі што нарадзілася і не павінна было мерзнуць на холадзе... І вось кошка нават на тую хвілінку, пакуль мы падыходзілі, абкруцілася вакол свайго дзіцяці і сагравала яго. Можна было б пажадаць і кожнаму добраму чалавеку столькі спрыту і энергіі.

— Ну што ж, — сказаў я, — нічога не зробіш, хадзем ужо да нас.

— Не хочацца толькі браць у рукі гэтае мокрае кацянё, — сказала дачка.

Але кошка і не збіралася прасіць нас аб гэтым. Яна сама ўзяла сваё дзіця зубамі за карак і пайшла побач з намі. Так мы прыстойнай сямейкай і прыйшлі ў сваю хату.



Правообладатель Национальный институт образования

У кухні пліта была яшчэ цёплая, і тут жа быў чалеснік[1] рускай печкі. Кошка адразу знайшла сабе месца, дзе ёй будзе лепей за ўсё, — у печцы, ля цёпленькай пліты.

— Ну і добра, — сказалі мы, — жыві сабе тут. Толькі, мусіць, павячэраць табе трэба даць.

Але не паспелі мы падрыхтаваць ёй вячэру, як яна выскачыла з печкі і пачала прасіцца за дзверы. Мы сталі ўгаворваць яе:

— Ды пачакай трохі. Куды ты?

Але яна і слухаць не хацела — усё крычала і драпала дзверы.

Тады мы сцямілі, што перашкаджаць ёй не трэба: яна, відаць, з прыстойнай сям'і, добра выхавана і хоча выйсці на двор на хвілінку.

Выпусцілі яе. Прайшло колькі хвілін, чуем — скрабецца яна ў дзверы. Адчынілі — і бачым: яна прынесла другое кацянё. І зараз жа з ім у тую самую печку.

Не скажу, каб мы былі надта ўжо рады, што сям'я наша так хутка павялічваецца, але кошку ўсё ж такі пахвалілі:

— Добрая маці.

А дачка дадала:

— Маладзец, Багіра.

Тут мы ўсе заўважылі, што яна сапраўды нагадвае Багіру, і аднагалосна зацвердзілі гэтае імя.

Дачка зноў хацела даць ёй вячэраць — і зноў Багіра стала прасіцца за дзверы. Ці не хоча яна яшчэ прынесці нам дзіця? Дзякуем за ласку.

Але што з ёю рабіць? Не пускаць за дзверы, ці што? Прыйшлося зноў выпусціць. А праз некалькі мінут яна сапраўды прынесла трэцяе кацянё...

Такім чынам праз якія паўгадзіны сям'я наша адразу павялічылася на чатыры адзінкі. Сказаць, што мы былі рады, — ніяк нельга. Але да кошкі-маткі адчулі вялікую павагу. Якая яна была сур'ёзная, руплівая. Як ні павернецца, што ні зробіць — усё правільна, разумна, таксама як зрабіў бы кожны з нас. За гэты час яна ніводнай мінуты не патраціла дарэмна і не зрабіла нічога

[1] *Чале́снікі* — адтуліна за прыпечкам.



Правообладатель Национальный институт образования

лішняга, не сунула свой нос, куды ёй не трэба, не пацікавілася нічым, апрача сваёй справы.

Мы гаворым, што ў жывёл не розум, як мы яго разумеем, а інстынкт, гэта значыць, прывычныя, але несвядомыя рухі і дзеянні, патрэбныя ім для жыцця. Пчала робіць сваю ячэйку, зусім не думаючы, што, як і дзеля чаго яна робіць. Мурашка цягне ў свой бок галінку, а яе зямляк падбяжыць дапамагаць і пачне цягнуць у другі бок — і яны абое так і будуць тузацца, не ведаючы, што яны робяць. Мы самі, калі дакранаемся рукой да агню, то зараз жа інстынктыўна торгаем руку назад, а потым ужо сваім розумам цямім, у чым тут справа. Усё гэта — праявы інстынкту. Няўжо ж і наша кошка затрымлівала на вуліцы людзей, прасіла іх вярнуцца і памагчы яе дзіцяняці, сачыла, каб дзіця не замерзла, памятала пра іншых сваіх дзяцей і прыносіла іх у хату, адным словам, развіла шырокую дзейнасць, зусім не разумеючы, што і дзеля чаго яна робіць? Не, хай сабе вучоныя людзі гавораць, што хочуць, а мы не згодны з гэтым. Наша кошка, відаць, зусім разумная асоба, і з ёю жыць можна будзе. Нездарма яна нагадвае Багіру, а тая, калі верыць Кіплінгу, магла разважаць лепш за якога-небудзь не надта разумнага чалавека.

Але на другі ж дзень выявілася, што наша Багіра, можа, наогул і вельмі разумная, у арыфметыцы ўсё ж крыху адстала. Дзеці, гуляючы на суседнім двары, знайшлі там мёртвае маленькае кацянё. Відаць, яно замерзла ў гэтую ноч. Не было ніякага сумнення, што гэтае кацянятка — родны брат трох нашых. Кошка, прынёсшы да нас першага, ведала, што там у яе яшчэ ёсць дзеці. Ведала яна гэта і пасля другога. А пасля трэцяга ўжо не ведала. Выходзіць, што яна ўмела лічыць толькі да трох. Але няхай сабе і так. Усё роўна не ў кожным доме знойдзеш кошку, якая ўмее табе лічыць да трох.

Такім чынам зажылі мы ўсе разам дружнай сям'ёй. Наша Багіра карміла і песціла сваіх дзяцей, як лепей і быць не можа. І ў якой чысціні яна іх трымала! Лізала іх безупынна і ўсюды, не спыняючыся ні перад якім брудам. Затое ж і блішчалі яны ў яе, як цацкі. Ды яны для нас і сапраўды былі цацкамі.

Хто не ведае, якімі мілымі і пацешнымі бываюць малыя кацяняты! Асабліва калі разгуляюцца. Колькі смеху было нам, калі



Правообладатель Национальный институт образования

аднаго разу двое з іх пацалаваліся як мае быць: абнялі лапкамі адно аднаго за шыю і тыцнуліся насамі. Не было такога чалавека, які мог бы прайсці міма іх, калі яны дурэюць. Затое іх маці трымала сябе аж занадта сур'ёзна: ні разу не скокнула, не пажартавала, нават ні разу не ўсміхнулася. Вельмі важная і разумная была Багіра. Як жа было яе не шанаваць!

А праз некаторы час яна паказала яшчэ, што мае і высакароднае сэрца. На наш двор аднекуль прыблудзіла чужое чорнае кацянё. Узросту яно было прыблізна такога, як і нашы, толькі надта брыдкае і няшчаснае: худое, аблезлае, пузатае, з хворымі вачыма і абарваным вухам. Дзеці яго гналі, штурхалі, а яно ледзь рухалася. Ішла раз міма яго Багіра: кацянё пасунулася было да яе, але кошка грэбліва ўхілілася ад яго. А праз дзень бачым — вядзе яго да нас у хату, корміць, ліжа.

Гэтага толькі не хапала. Поўная хата катоў, а тут яшчэ нейкага бруднага прымай. Але як было нам, добрым і разумным людзям, праганяць няшчаснае кацянё, калі нават жывёліна пашкадавала яго? Няўжо мы будзем горшымі за жывёлу? Тады нам сорамна будзе глянуць у вочы паважанай Багіры. Тады і яна, і суседскія куры засмяюць нас. Ды і не мы будзем яго гадаваць. Хай сама Багіра і ставіць яго на ногі. Так яна і зрабіла.

Калі кацяняткі падраслі, мы сталі аддаваць іх у людзі. Цэлая чарга стварылася з нашых суседзяў па доме. Калі аддалі першую шэранькую кошачку ў кватэру сёмую, Багіра нібы не заўважыла яе адсутнасці. А вось калі аддалі другое кацянё, у кватэру чацвёртую, і ў нас засталося ўсяго два, тады маці адразу заўважыла, бо лічыць жа да трох умела. Крычыць, шукае па ўсіх кутках, не дае есці тым, што засталіся з ёю, імкнецца за дзверы. Так, галосячы, і з хаты пайшла.

Вярнулася спакойная. Глянула гаспадарскім вокам у адзін куток, у другі, пакарміла дзяцей, памыла іх — і зноў пайшла. Ніякага гора, ніякага крыку. Мала таго — нават начаваць не прыйшла дадому. Што гэта з ёю? Можа, так пакрыўдзілася, што зусім пакіне нас?

Але на другі дзень яна прыйшла. І нават мышку прынесла. Пагасцявала трохі, дагледзела дзяцей — і зноў пайшла гуляць. Вось табе і паважаная Багіра. Трымае сябе, як немаведама хто… А калі праз колькі дзён мы аддалі яшчэ адно кацянё, у кватэру



Правообладатель Национальный институт образования

шостую, і ў нас засталося ўсяго адно, то наша Багіра аднеслася да гэтага так, нібы такая справа яе зусім не датычылася. Толькі яшчэ радзей стала наведваць нас. Што такое з ёю здарылася?

Але трэба сказаць праўду: дзіця яе ад гэтага ані трохі не цярпела. Усё ж такі некалькі разоў на дзень маці прыйдзе, накорміць, памые, нават паляжыць трохі з ім, — а потым зноў пойдзе.

Глядзім мы раз праз акно — нясе Багіра мышку свайму дзіцяці. Мы пайшлі адчыняць ёй дзверы, але яна… прайшла міма нас і панесла мышку ў кватэру шостую…

Дык вось у чым справа. Вось чаму наша Багіра не гаравала…

Яна даглядала сваіх дзяцей ва ўсіх кватэрах разам…

У кожнай кватэры лічылі, што кошка толькі і ведае, што іхняе кацянё: прыходзіць, корміць, мые, прыносіць мышэй, гуляе з дзіцем — нібы ў яе іншага клопату няма. А яна гэткім чынам працавала аж на чатыры кватэры. Вось чаму яна была такая заклапочаная, не траціла дарэмна часу, доўга не бавілася ў нашай хаце.

Цікава было яшчэ тое, што мышэй і пацукоў яна насіла па чарзе ва ўсе кватэры, нікога не крыўдзіла. Аднаго разу было так: скрабецца яна ў нашы дзверы, просіцца; яе сынок пачуў і падбег ужо да дзвярэй. Адчынілі мы, глядзім: прынесла Багіра мышку, якую наш каток зараз жа і схапіў. Маці тады завярнулася і пайшла сабе назад: прынесла, аддала — навошта ёй і ў хату ісці? І без таго работы многа: і ў чацвёртай кватэры чакаюць, і ў сёмай, і ў шостай — хоць ты разарвіся.

Можа, хто захоча спытацца: якім чынам Багіра магла абслугоўваць чатыры кватэры, калі сама ўмела лічыць толькі да трох? Нялёгка, вядома, адказаць на такое запытанне замест Багіры, але думаем, што яна сваю хату не лічыла — вось тады і застанецца тры.

Як бы там ні было на самай справе, а мы лішні раз пераканаліся, што наша Багіра — найлепшая кошка ў свеце. Мы нават гатовы былі прасіць у яе прабачэння за тое, што падумалі, нібы яна сапсавалася і загуляла.

Нарэшце прыйшоў час, калі Багіра зусім пакінула ўсіх сваіх дзяцей і забылася на іх. Мы ахвотна аддалі людзям і апошняга катка, каб жыць толькі з адной іхняй маткай. Ды і хто не хацеў бы жыць з такой разумнай асобай!



Правообладатель Национальный институт образования

Але хутка ў нас з ёю пачаліся непаразуменні. Калі яна пазбавілася клопату аб дзецях і ёй больш не было чаго рабіць, яна пачала ўмешвацца ў нашы гаспадарчыя справы, ды так нахабна, што ніякай рады нельга было даць. Калі хоць трохі адвернешся, недагледзіш — яна зараз жа нашкодзіць. Нічога ад яе не схаваеш — усюды дабярэцца. Калі збан малака накрыты сподкам — яна сподак скіне, калі завязаны — яна перакуліць. Калі буфет зачынены не зусім шчыльна — яна сама яго адчыніць. А раз ухітрылася выцягнуць з закрытай каструлі мяса — і каструля засталася закрытай. А ноччу часам адбываліся такія выбухі ад скінутых рэчаў, што, здавалася, самалёты робяць бамбёжку.

Ужо ж як мы яе ўгаворвалі, сарамілі, выхоўвалі, дрэсіравалі — нічога не выйшла, ніяк не маглі з ёю дагаварыцца. Нічога яна не магла ці не хацела зразумець, хоць і ўмела лічыць да трох.

І цяпер мы шкадуем, што так яе расхвалілі на ўвесь свет.

1. Які жыццёвы выпадак стаў асновай сюжэта апавядання?
2. Што незвычайнае было ў паводзінах кошкі на вуліцы, калі яна заўважыла прахожых? Як Багіра прымусіла людзей выканаць яе просьбу-патрабаванне?
3. Чым кошка надзвычай здзівіла сваіх гаспадароў, калі трапіла ў гарадскую кватэру? Як пачувалася на новым месцы?
4. Ці змянілася жыццё сям'і пасля з'яўлення ў ёй кошкі з кацянятамі? Чаму гаспадары *да кошкі-маткі адчулі вялікую павагу*?
5. Што гаворыць аўтар пра ролю інстынкту ў паводзінах людзей і жывёл? Як Багіра сваімі дзеяннямі абвергла навуковыя высновы?
6. Раскажыце пра жыццёвы ўрок, які дала кошка людзям.
7. Чаму гаспадары і іх суседзі вымушаны былі лічыцца з мацярынскімі правамі і абавязкамі Багіры?
8. Якія перамены адбыліся ў паводзінах кошкі, калі яе дзеткі падраслі?
9. Апавяданне пра Багіру заканчваецца словамі: *І цяпер мы шкадуем, што так яе расхвалілі на ўвесь свет*. Ці можна пагадзіцца з такім сцвярджэннем? Свой адказ абгрунтуйце.
10. Прыдумайце займальную гісторыю пра свайго хатняга сябра (сабаку, ката, іншую жывёліну або птушку) і раскажыце яе ў класе. Ахарактарызуйце паводзіны, звычкі, уменні свайго гадаванца.
11. Выканайце заданне па тэме.



Правообладатель Национальный институт образования



# І дасціп, і мудрасць

## Якуб КОЛАС

Не той дужы, хто коней стрымлівае,
а той, хто сябе стрымлівае.

*Прыказка.*

Якуб Колас — майстар не толькі пейзажнай лірыкі, паэтычнага эпасу, але і аўтар гумарыстычных, сатырычных твораў. Ён стварыў дасціпныя, іранічныя і вясёлыя байкі.

Байка «Конь і сабака» была напісана ў красавіку 1907 года, змешчана ў кнізе «Другое чытанне для дзяцей беларусаў».

### Конь і сабака

Свабодны конь гуляў на волі,
І хвост, і грыву распусціў,
Іржаннем ён сваім будзіў
І лес стары, і чыста поле.

Убок прахожы стараніўся,
Яму дарогу уступаў.
Ад страху Рудзька прытуліўся
І толькі ціхенька брахаў.



Правообладатель Национальный институт образования

Каня злавілі, прывязалі,
На вобруць[1], беднага, ўзялі,
Аборкай[2] ногі абвілі
І борзды бег яго стрымалі.

З-за вугла вылазіць Рудзька:
— Гаў-гаў-гаў! — давай брахаць.
За хвост каня кусае цюцька —
Не адцягнуць, не адагнаць!

Малыя дзеці тут гулялі,
Дзівіліся многа і казалі
(Па дурнаце не разбіралі —
Дзіця малое, як ягня):
— А Рудзька дужшы за каня!

1. Пры дапамозе якіх мастацкіх сродкаў мовы аўтар стварыў вобразы персанажаў байкі — дужага і незалежнага каня і палахлівага цюцькі Рудзькі?
2. Чаму сабака Рудзька баяўся каня на волі? Прыгадайце, як Рудзька раптам асмялеў.
3. Назавіце рысы характару людзей, што ўвасобіў пісьменнік у вобразе каня.
4. Якія чалавечыя заганы высмейваюцца ў байцы?
5. Ці правільна ацанілі паводзіны Рудзькі малыя дзеці? Прачытайце з захаваннем адпаведнай інтанацыі заключныя словы байкі: *А Рудзька дужшы за каня!* Чаму гэта ацэнка ўспрымаецца недарэчнай?
6. Падрыхтуйце выразнае чытанне байкі. Вызначце ў ёй *лагічныя паўзы* і расстаўце *лагічныя націскі*. Прадумайце тэмп, рытм і інтанацыю чытання байкі па ролях.
7. Вывучыце байку Якуба Коласа «Конь і сабака» на памяць.

[1] *Во́бруць (абро́ць)* — частка вупражы, надзяваецца каню на галаву.
[2] *Або́рка (пу́та)* — кароткая вяроўка.



Правообладатель Национальный институт образования



# Алесь ЗВОНАК

З кім павядзешся, ад таго і набярэшся.

*Прыказка.*

Алесь (Пётр Барысавіч) Звонак (1907—1996) нарадзіўся ў Мінску. Дзяцінства будучага паэта было бязрадаснае, пэўны час хлопчык гадаваўся ў прытулку. Пазней Алесь Звонак успамінаў: «...Дзіцячы дом ніхто нічым не забяспечваў, і ўсе яго выхаванцы апынуліся на мінскіх вуліцах... Я ж апынуўся на вёсцы, на радзіме маці, дзе з поспехам засвоіў прафесію падпаска, вадзіў на начлег коней... Але быў і светлы праменьчык у маім юным жыцці. Ішоў ён ад святла газнічкі, пры якой па начах чытаў я кнігі... Асабліва чаравала маю юную душу паэзія. Я зачытваўся вершамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Міхася Чарота... Чытаў усё, што трапляла ў рукі. Горка плакаў я, чытаючы “Мцыры” Лермантава. І тады ўпершыню нарадзілася жаданне самому пісаць вершы. Скончыў я сямігодку і паступіў на агульнаадукацыйныя курсы, якія давалі поўную сярэднюю адукацыю, пачаў сам пісаць вершы... Так на ўсё жыццё звязаў я свой лёс з песняю майго народа».

Алесь Звонак выдаў больш дзясятка зборнікаў паэзіі. Напісаў кнігу артыкулаў і ўспамінаў «Неспакойныя сэрцы». Выступаў як байкапісец.

1. Чым адрозніваюцца байкі ад вершаў? Хто ці што можа быць персанажам у байцы?
2. Якія алегарычныя вобразы вы ведаеце з фальклорных твораў?



Правообладатель Национальный институт образования

## Гарбуз



Здараецца ж такое: на гародзе
Пад сонцам вырас велікан-гарбуз!
Прыгожы, круглы, важкі — дзіва, й годзе! —
Нібыта не гарбуз, а важны туз!

Глядзеў звысоку ён пры ўсім народзе
На землякоў, нібы на чарвякоў:
— Вы — драбяза, ды пры такой пародзе
Вас не адрозніш нават ад гуркоў!

Так выхваляўся ён, так надзімаўся —
Чуваць было, бадай, за тры вярсты!
Ды вось бяда — нябога не ўтрымаўся
І лопнуў, нібы выстрал халасты.

Выснова гэткая: калі зазнаўся —
То сам, як той гарбуз, нутром пусты!

1. Што адметнае было ў гарбуза ў параўнанні з іншымі насельнікамі агарода? Як ён сябе паводзіў?
2. Чым закончыліся для гарбуза яго пахвальба і ганарыстасць? Ці выпадкова напаткала яго такая доля?
3. Паразважайце, чалавека з якімі якасцямі паказаў аўтар у вобразе гарбуза. Як паэт ставіцца да гэтага персанажа?
4. У якіх радках заключаны галоўны сэнс твора Алеся Звонака?
5. Пра якога чалавека можна сказаць, што ён *нутром пусты*?
6. Знайдзіце ў тэксце параўнанні. Падумайце, як яны дапамагаюць ахарактарызаваць героя байкі і яго паводзіны.
7. У чым павучальнасць байкі?
8. Падрыхтуйце выразнае чытанне твора. Пастарайцеся перадаць аўтарскую інтанацыю.
9. Патлумачце, як звязаны са зместам байкі наступныя прыказкі:
*Не ганарыся званнем, а ганарыся ведамі.*
*Не ўсё тое золата, што блішчыць.*
*Парожняя бочка моцна грыміць.*



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРА БАЙКУ

Жанр байкі ўзнік у Старажытнай Грэцыі. Першы славуты байкапісец — Эзоп. Жыў ён прыкладна ў VI—V стагоддзях да нашай эры. Эзопавы творы карысталіся вялікай папулярнасцю, бо захаплялі людзей сваім праўдалюбствам, мудрасцю і досціпам.

Байка — адзін з самых любімых у народзе жанраў мастацкай творчасці. Яе героі нагадваюць людзей, іх паводзіны і нораў. Мэта байкі — высмейванне чалавечых заган і недахопаў, усяго дрэннага ў навакольным жыцці, выказанае не ў прамой, а ў іншасказальнай (алегарычнай) форме. Гэтаму спрыяе і выбар персанажаў байкі. Героі баек — жывёлы, расліны, птушкі, з'явы прыроды, адухоўленыя рэчы, што маюць чалавечыя характары, увасабляюць людскія заганы.

***Байка*** — невялікі, часцей вершаваны твор сатырычнага зместу з алегарычным сюжэтам і павучальнай канцоўкай (мараллю).

Ацэнку паводзін і ўчынкаў персанажаў, якую выказвае ў творы аўтар, называюць ***мараллю*** байкі. Вывад (мараль) звычайна падаецца ў канцы байкі, радзей — у пачатку твора.

Ад іншых камічных твораў байка адрозніваецца тым, што ў ёй прысутнічае *сатыра* — з'едлівы, выкрывальны смех. У гумарыстычных творах (анекдотах, гумарэсках) смех, як правіла, нязлосны, добразычлівы, пацяшальны. Чалавек або нейкая з'ява паказваюцца ў камічным, дабрадушна-смешным выглядзе. З дапамогай гумару асобныя, нязначныя недахопы ў паводзінах ці характары персанажа, нейкія жыццёвыя з'явы выклікаюць у чытача ўсмешку, ствараюць вясёлы настрой. У байцы ж смех шматаблічны: пацяшальны, крытычны, выкрывальны.

У розных краінах свету вядомы таленавітыя стваральнікі баек. Праслаўленым байкапісцам Францыі з'яўляецца Лафантэн, у рускай літаратуры — Іван Андрэевіч Крылоў.



Правообладатель Национальный институт образования

Першыя беларускія байкі напісалі Францішак Багушэвіч і Альгерд Абуховіч. Да гэтага жанру звярталіся класікі нашай літаратуры — Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч. Самы славуты беларускі байкапісец — Кандрат Крапіва.

1. Што такое байка? Калі і дзе яна ўзнікла?
2. Якіх беларускіх байкапісцаў вы ведаеце?

## Уладзімір КОРБАН



Дзе спяваюць — туды ідзі, дзе сварацца — абыдзі.

*Прыказка.*

Уладзімір Іванавіч Корбан (1910—1971) нарадзіўся ў пасёлку Барань (цяпер Аршанскі раён Віцебскай вобласці) у сям'і рабочага. Сярэднюю адукацыю атрымаў у вячэрняй школе, завочна вучыўся ў Мінскім юрыдычным інстытуце. Пазней Уладзімір Корбан успамінаў: «Ахвота да чытання кніжак прыйшла, калі я толькі зразумеў, як з літар складваюцца словы. А потым, у школе, часта перападала ад настаўнікаў, бо не радзей аднаго разу на тыдзень мяне лавілі за чытаннем кніжак на ўроках. Ужо, здаецца, у трэцім класе я прынёс свайму настаўніку вершык пра ката і вераб'я. Ён пахваліў мяне і нават некуды адаслаў вершык».

Уладзімір Корбан працаваў токарам на Ленінградскім суднабудаўнічым заводзе, служыў у Чырвонай Арміі. У гады Вялікай Айчыннай вайны камандаваў стралковай ротай, удзельнічаў у баях пад Бранскам і Арлом, вызваляў Беларусь.

Пасля вайны быў галоўным рэдактарам часопіса «Вожык». Першая яго байка з'явілася ў рэспубліканскім друку ў 1946 годзе.



Правообладатель Национальный институт образования

На творчым рахунку пісьменніка каля двух дзясяткаў кніг баек, вершаў, апавяданняў. Байкі Уладзіміра Корбана па-мастацку яркія, дасціпныя, вясёлыя, яны актуальныя і ў наш час. Некалькі яго кніг адрасаваны юным чытачам.

### Малпін жарт

Пасля начной адказнае работы
Трызор і Мурза спалі каля плота.
Тым часам Малпа не драмала,
Убачыўшы сабак, цішком
Падкралася да іх і матузком
Хвасты звязала.
Сама ж схавалася за вугал і глядзіць,
Каменьчыкамі кідзь ды кідзь, —
Стараецца іх пабудзіць.
Што тут было, калі прачнуліся абое!
Трызора Мурза рве, а Мурзу рве Трызор!
Умомант гырканне ўзнялі такое, —
Ажно гудзе ўвесь двор.
А Малпа ледзьве не кладзецца —
І скача, і крыўляецца, й смяецца,





Правообладатель Национальный институт образования

Сабачы бой
Так па душы прыйшоўся ёй.
Нарэшце развязаліся хвасты,
Сабакі сціхлі, раны залізалі,
Агледзеліся і затым
На Малпу, скеміўшы, напалі,
Што з той ажно пасыпалася поўсць.

---

І між людзьмі такія ёсць:
Звядуць дваіх, наладзяць склоку[1],
А потым збоку
На цяганіну пазіраюць
І рукі паціраюць.

1. Як паводзіла сябе Малпа, калі сабакі распачалі сварку і бойку?
2. Што вы думаеце пра Мурзу і Трызора? Яны выклікаюць у вас шкадаванне, спагаду, здзіўленне, асуджэнне ці іншае пачуццё?
3. Якую важную думку аўтар імкнецца данесці да чытачоў?
4. Вызначце ў тэксце прыкметы байкі. Знайдзіце ў ім зачын, аповед пра падзеі, мараль.
5. Адшукайце фразеалагізм у маралі байкі. Растлумачце яго значэнне.
6. Падрыхтуйце выразнае чытанне байкі. Улічыце лагічныя націскі, эмацыянальны стан і пачуцці, якія неабходна перадаць голасам, тэмп чытання.
7. Складзіце невялікую замалёўку «Чаму сябры не павінны сварыцца».
8. Разгадайце рэбус.
9. Разгадайце крыжаванку.

[1] *Скло́ка* — сварка, непрыязныя адносіны.



Правообладатель Национальный институт образования



# Святло далёкай зоркі

Прымі прывітанне, бясконцы сусвет
Далёкіх Цэнтаўраў і Львоў,
Далёкі таварыш, далёкі паэт
З няходжаных Млечных Шляхоў.

*Аркадзь Куляшоў.*

## ПРА ФАНТАСТЫКУ

Фантастычнае праяўляецца ў казках, легендах і ў асаблівых жанрах — навукова-фантастычных творах. Пісьменнікі дзякуючы свайму ўяўленню, фантазіі ствараюць неверагодныя карціны і сітуацыі, гэта значыць, яны нерэальныя, прыдуманыя. Аўтарская фантазія можа перамясціць нас, чытачоў, у мінулае або ў будучыню. З фантастычных гісторый перад намі паўстаюць невядомыя і загадкавыя краіны, на старонках твораў фантастыкі разгортваюцца падзеі на далёкіх планетах. Аўтары апісваюць звышнатуральныя з'явы, паказваюць розныя цуды на Зямлі, людзей, якія трапляюць у незвычайныя, а то і неверагодныя жыццёвыя абставіны, і асабліва часта запрашаюць на пошукі дзівоснага ў космас. У літаратурнай фантастыцы нас захапляюць займальныя сюжэты, адмысловыя падзеі і рэаліі, выдуманыя героі — робаты, іншапланецяне, незвычайныя жывёлы і чалавекападобныя істоты.



Правообладатель Национальный институт образования

Пры стварэнні якой-небудзь дзівоснай гісторыі пісьменнікі-фантасты часта звяртаюцца да чарадзейных казак, міфаў, легенд і чэрпаюць адтуль вобразы, уражанні, займальны матэрыял для пабудовы сюжэта твора. Гэтак, як і ў казцы, чытач робіцца саўдзельнікам цікавых вандровак, таямнічых здарэнняў, нечаканых пераўтварэнняў.

***Фантастыка*** — літаратурныя творы, у якіх адбываюцца падзеі, немагчымыя ў рэальным жыцці.

У фантастычных творах уздымаюцца важныя для нас пытанні і праблемы.

Нярэдка пісьменнікі апавядаюць пра грандыёзныя навуковыя адкрыцці або навуковыя ідэі, увасабленне якіх мяняе (або здольнае перайначыць) жыццё, рэчаіснасць, лёс чалавецтва. Творы з такім зместам называюць *навуковай фантастыкай*.

Аўтары малююць незвычайных персанажаў, апавядаюць пра дзівосныя планеты і жыццё на іх. Кожны з аўтараў надае сюжэту твора займальнасць, прыгодніцкі характар. Пісьменнікі даносяць да нас думку пра неабходнасць прыгожага, мудрага ўладкавання жыцця на планеце Зямля і ў Сусвеце, пра тое, як важна цаніць і берагчы ўсё непаўторнае, цудоўнае, унікальнае, не забываць пра дабрыню, чуласць і спагаду да іншых.

Вы маеце магчымасць пазнаёміцца з выбранымі старонкамі кнігі беларускай пісьменніцы Раісы Баравіковай «Аповесць чатырох падарожжаў». Разам з героямі пісьменніцы мы пабываем на далёкіх планетах, сустрэнем там невядомых істот, зробімся сведкамі незвычайных падзей і цудаў. Аўтар спалучае свет чужых планет і свет роднай Беларусі.

1. Як вы разумееце слова *фантастыка*? У чым адметнасць фантастычных твораў?
2. Якія сюжэты найбольш распаўсюджаны ў фантастычных творах?
3. З якіх крыніц пісьменнікі часта запазычваюць фантастычныя вобразы?



Правообладатель Национальный институт образования



# *Раіса БАРАВІКОВА*

*А сёння я небу гукаю: не хмарся!*
*Народжаны ў нас жыхары ўжо для Марса.*

*Пімен Панчанка.*

Раіса Андрэеўна Баравікова нарадзілася 11 мая 1947 года ў вёсцы Пешкі Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

«Памятаю, як усю краіну ўскалыхнулі падзеі, звязаныя з баржай, якая згубілася недзе ў акіяне, — успамінае пісьменніца. — Лёс экіпажа, маладых матросаў непакоіў усіх... І неяк адразу ў мяне напісаўся верш: пра акіян, пра чалавечае выжыванне, пра барацьбу са смерцю. Мне хацелася, каб тыя матросы выжылі, каб іх адшукалі. Менавіта барацьба за жыццё маладых маракоў стала асноўнай тэмай майго першага верша. Яго я паказала сваёй настаўніцы... Яна сама і аднесла мой верш у рэдакцыю раённай газеты. Яго адразу надрукавалі. І падпісалі: вучаніца 6 «А» класа. Гэты факт мяне вельмі акрыліў: я яшчэ з большым жаданнем наведвала школьны гурток, пісала вершы».

Раіса Баравікова працавала на кінастудыі «Беларусьфільм», у рэспубліканскім друку, узначальвала часопіс «Маладосць».

Творчасць пісьменніцы жанрава і тэматычна разнастайная. Яна актыўна выступае ў паэзіі і прозе. На яе аўтарскім рахунку зборнікі вершаў, паэмы, аповесці, драматычныя творы. Раіса Баравікова плённа працуе ў галіне фантастыкі. Яе займае прага высокага чалавечага ідэалу, яна выказвае сваё разуменне праблемы дабра і зла, разам са сваімі героямі шукае сапраўднае шчасце і адказы на адвечныя пытанні.

Раіса Баравікова напісала для дзяцей казкі, апавяданні, аповесці. Яе кніга «Казкі астранаўта», у якой змешчана «Аповесць чатырох падарожжаў», выйшла з друку ў 2006 годзе.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Прыгадайце фантастычныя творы, што вы чыталі. У чым іх адметнасць?
2. Якая роля ў фантастычных творах належыць нерэальным, казачным элементам?

## Гальштучнік
### *(Урывак з «Аповесці чатырох падарожжаў»)*

Люблю назіраць за кнігаўкамі... Недалёка ад іх кружыць невялічкая птушка гальштучнік, — таксама з сямейства кулікoвых. Але варта прымружыць вочы, як уяўляецца сядзіба доктара Савіча і тая дзіўная істота, што спрытна падхапіла з зямлі капялюш...

*З нататніка астранаўта.*

Калі мы вярталіся на Зямлю з планеты Антарыс-5, якая знаходзіцца ў сузор'і Скарпіёна, то ўвесь наш экіпаж быў расчараваны. Справа ў тым, што гэтая планета мае чырвоны колер, чым нагадвае Марс. Але, як мы высветлілі, з Марсам нічога агульнага ў яе няма. Паўсюдна — горы і горы. Мы ледзь знайшлі больш-менш роўную пляцоўку, каб пасадзіць наш карабель. Затрымлівацца на планеце, якая ўяўляе сабою каменную глыбу, не мела сэнсу. І мы рушылі да бліжэйшай планетнай сістэмы, куды ўжо даволі часта адпраўляліся экспедыцыі з Зямлі, дзе можна было нейкі тыдзень адпачыць у гатэлі.

Вось тады і з'явілася на нашых экранах тая маленечкая зялёная планета, якая нагадвала невялікі шарык з ранняй сакаўной травы. Нідзе, ні на якіх зоркавых картах яна не значылася, таму цалкам верагодна, што мы маглі быць першымі, хто натрапіў на яе ў касмічнай бясконцасці. Няцяжка здагадацца, што мы вырашылі зазірнуць на тую планету. Што і зрабілі.

Першае ўражанне было такое, нібыта мы трапілі ў Белавежскую пушчу ці Бярэзінскі запаведнік. Альбо і ўвогуле ў нейкі агромністы здзічэлы сад дзе-небудзь пад Нароўляю ці пад Слуцкам.

Але такім было толькі першае ўражанне. Пад кронамі магутных дрэў была не такая ўжо і дзікая паверхня, — месцамі відавочна расчышчаная, месцамі выпаленая: хтосьці раскладваў вогнішча.



Правообладатель Национальный институт образования

— Магу паспрачацца, тут мы сустрэнем гуманоідаў, — сказаў нехта з членаў экіпажа.

— Магчыма, — пагадзіўся камандзір і тут жа запытаўся: — Мне загадаць ці ёсць ахвотнікі спусціцца на паверхню?

Ахвотнік знайшоўся. Гэта быў наш доктар Савіч. Камандзір паглядзеў на мяне:

— Ну, а што наш батанік? Тут ёсць што даследаваць.

І я не пярэчыў, хаця ведаў: тое, што здавалася на паверхні планеты дрэвамі, травою, кустамі, магло быць нечым іншым. Так здаралася не аднойчы. Але на гэты раз камандзір не памыляўся. Як толькі мы з доктарам Савічам ступілі на цвёрды грунт, зразумелі, што расліннасць наўкол самая што ні на ёсць сапраўдная. Праўда, на Зямлі я такой не сустракаў, і вельмі здзіўляла, што паўсюль быў адзін толькі зялёны колер: зялёная кара дрэў, зялёнае лісце, зялёныя пялёсткі кветак.

А тым часам мы ўжо выйшлі на вялікую паляну і я, было, падышоў да адной з такіх кветак, якая нагадвала зямную лілею, каб насуперак усім інструкцыям дакрануцца да зялёных пялёсткаў, але не паспеў... Адусюль — з-за кожнага дрэва, з-за кожнага куста (о, дайце веры!) — выбягалі людзі, праўдзівей было б сказаць — дзікуны, і, наколькі гэта можна было зразумець, твары іх свяціліся радасцю. Даўгія валасы, у многіх — бароды, шчокі, зарослыя шчэццю... Толькі на шыі ў кожнага з гэтых людзей чарнела палосачка, а хутчэй, гальштук-бабачка, так часта называюць падобныя гальштукі на Зямлі, якія надаюць святочнаму гарнітуру яшчэ большую ўрачыстасць. Тут, на гэтай Зялёнай планеце, як я яе назваў у думках, гэты гальштук нікому нічога не дадаваў. Адно — глядзеўся на шыі недарэчна і смешна. Праўда, нам з доктарам Савічам было не да смеху, невядома, як павядуць сябе дзікуны? Але яны выказвалі выключную прыязнасць. А адзін з іх выйшаў наперад і пачаў нешта хутка-хутка гаварыць...

Як жа я быў уражаны, калі доктар Савіч адазваўся ў адказ. Паміж ім і натоўпам завязалася ажыўленая гаворка. Аказалася, што жыхары Зялёнай планеты размаўлялі на лацінскай мове, якая на Зямлі ўжо даўно выкарыстоўвалася толькі ў медыцыне і якою, зразумела, добра валодаў доктар Савіч.



Правообладатель Национальный институт образования

— Што яны табе кажуць? — запытаўся я ў яго.

Доктар пацiснуў плячыма:

— Нiяк не ўцямлю, дзiкасць нейкая. Самая сапраўдная дзiкасць. Яны шкадуюць, што мы не можам бачыць тых цудоўных кварталаў, плошчаў, вулiц, якiя бачаць яны. Маўляў, тут паўсюль вакол нас — навуковыя цэнтры, зоны адпачынку, офiсы i спальныя раёны...

— Офiсы, навуковыя цэнтры вакол нас? Ды яны — вар'яты! — засмяяўся я i раптам задумаўся. — А зрэшты... Адкуль у iх гэтыя веды? Што iм вядома пра офiсы, зоны адпачынку? Хто яны, нарэшце? Перасяленцы з iншых планет? Цi, можа, зямляне? Нашчадкi тых цывiлiзацый, што iснавалi на Зямлi яшчэ да Вялiкага патопу? Вось толькi ў iхнiм аблiччы нiчога не засталося ад цывiлiзаванага свету. Племя дзiкуноў! Першая прыступка развiцця чалавецтва.

Гэтымi сваiмi думкамi я хацеў падзялiцца з доктарам Савiчам, але ён з вялiкай цiкавасцю размаўляў з гуманоiдам, якраз з тым, хто самы першы ўступiў з намi ў кантакт. Iх гаворка цягнулася доўга. Я нават пачаў тое-сёе даследаваць з навакольнага раслiннага свету. Але вось доктар падышоў да мяне, i тое, што ён сказаў, адразу прымусiла згадаць пра наш карабель, падумаць пра небяспеку. А цi не час нам вяртацца?

— Бачыш таго, бялявага, — паказваў доктар Савiч на высокага хударлявага бландзiна. — Яго ўнук вынайдзе тут праз паўстагоддзя камп'ютар. А вунь той... нiзенькi, што размаўляе з самым кудлатым з iх. Ён — мастак. Генiй! Толькi пра гэта сам яшчэ не здагадваецца. Але праз дваццаць гадоў яго карцiны будуць самымi каштоўнымi не толькi на гэтай планеце. Глядзi, бачыш, той, што залез на дрэва... Ён праз дзесяцiгоддзе будзе тут самым славутым архiтэктарам. Пачне з каменных пiрамiд i закончыць праектамi з жалезабетону. О-о, а гэты, што блiжэй за ўсiх стаiць да нас, як нi цяжка ў гэта паверыць, але ён стане вынаходцам рухавiкоў, i першыя аўтамабiлi тут будуць называцца яго iмем.

Мне стала млосна. Розум адмаўляўся што-небудзь разумець.



Правообладатель Национальный институт образования

— Нам ужо трэба вяртацца на карабель. Там, напэўна, хвалююцца нашы, — сказаў я доктару Савічу. — Развітвайся з гуманоідамі, і пойдзем адсюль.

Але перш чым развітацца, доктар прыняў падарунак ад жыхароў гэтай нязвыкла зялёнай планеты. Яны завязалі яму на шыю гальштук, такі ж самы, што насілі самі, — чорны гальштук-бабачку.

З гэтага моманту і пачалася трагедыя доктара Савіча. Гэтак я назваў для сябе ўсе далейшыя падзеі. А разгортвалася ўсё наступным чынам.

Зялёную планету мы пакінулі хутка. Можна сказаць, пасля вяртання на карабель неўзабаве і стартавалі. Прыйшоў загад з Зямлі тэрмінова вяртацца. Вось тут доктар Савіч і павёў сябе выключна невытлумачальна. Маўляў, які можа быць загад з Зямлі, якое вяртанне, калі мы можам ляцець да сузор'я Дзевы, дзе на адной з планет, трошкі ўбок ад самай яркай зоркі гэтага сузор'я — Спікі, жывуць браты па розуме, бо тая планета не што іншае, як копія нашай Зямлі. А потым наш шлях можа пралегчы да сузор'я Шаляў. І там на адной з планет у сістэме тых зорак, якія складаюць сузор'е, ужо даўно вынайшлі машыну часу, якую, калі хто-небудзь з нас пажадае, можа выпрабаваць.

Спачатку да ўсіх гэтых разважанняў доктара мы ставіліся несур'ёзна, чаго не здараецца ад эмацыянальных перагрузак! Але ён пачаў паводзіць сябе агрэсіўна. Спрабаваў прарвацца ў адсек кіравання палётам, каб змяніць курс. І тады мы задумаліся, што ж адбываецца з нашым доктарам? Адказ напрошваўся сам сабою: у доктара ўсе прыкметы лёгкага псіхічнага расстройства, якое з'явілася пасля таго, як ён пачаў насіць на шыі падораны яму гальштук-бабачку. Як толькі мы прыйшлі да такой высновы, адразу ж прапанавалі доктару зняць яго. Гэтая наша прапанова рассмяшыла доктара.

— Ды вам усім і не снілася, што гэты гальштук уяўляе сабою, — сказаў ён. — Гэта — Праграма, завезеная на Зялёную планету прадстаўнікамі адной з самых высокаразвітых сусветных цывілізацый. Усё выключна проста. Таму, хто носіць гэты гальштук,



Правообладатель Национальный институт образования

спачатку выдаецца міраж, мара жыцця. Адсюль і тыя дзівосныя гарады, навуковыя цэнтры, зоны адпачынку, якія бачылі наўкол сябе жыхары Зялёнай планеты. Ты ж чуў, батанік. Я табе перакладаў, — звярнуўся ён да мяне і працягваў: — Але ўсялякую мару трэба ўвасобіць у жыццё, зрабіць явай. І гэта прадугледжана Праграмай. Яна выдае ўстаноўкі, падрабязнае тлумачэнне, як і што трэба рабіць, каб гэтую мару здзейсніць. Ну, скажам, нехта хоча стаць вялікім кампазітарам і яму даецца магчымасць уявіць сябе ім. А потым пачынаецца шлях да гэтай вяршыні, па якім і вядзе Праграма.

Доктар Савіч блытаўся, але яго словы гучалі пераканаўча, хаця хтосьці з нас і запытаўся з недаверам:

— Ну, а цябе асабіста куды выводзіць яна?

— Я ж вам усё растлумачыў! У сузор'е Дзевы, дзе мы сустрэнемся з братамі па розуме і па эвалюцыйным развіцці. Трэба памяняць курс, і мы вернемся на Зямлю з грандыёзнай сенсацыяй.

— Гэты твой гальштук сам па сабе ўжо і ёсць сенсацыя, — сказаў я і тут жа папрасіў: — Дай панасіць яго, хаця б на некалькі гадзін.

— Разагнаўся!.. Гэтага ні ў якім разе рабіць нельга, — і далей доктар Савіч засцярог: — Можа здарыцца бяда. Праграма дзейнічае ў станоўчым кірунку толькі тады, калі гэты гальштук дорыцца. Яго трэба атрымаць у падарунак. Інакш спрацоўвае адмоўная энергія, і дзеянні Праграмы робяцца непрадказальнымі.

— Ды глупства ўсё гэта, — сказаў наш бортмеханік. — Казачкі для ідыётаў. Хоць ты, Савіч, і сам доктар, але табе, відавочна, патрэбна медыцынская дапамога.

І гэтыя яго словы сталі апошнімі ў той нашай размове з доктарам Савічам. А калі вярнуліся на Зямлю, хутка дачуліся, што ў Міжнароднай асацыяцыі зоркавых палётаў нашага доктара звольнілі. Для яго пачалося зямное жыццё. Ну, а мы, усе астатнія члены экіпажа, неўзабаве адправіліся ў новае міжпланетнае падарожжа.

Міналіся гады, і, напэўна, ужо праз некалькі дзесяцігоддзяў я вырашыў месяц-другі адпачыць на Зямлі. Космас стамляе. Тады



Правообладатель Национальный институт образования

і ўспомніўся мне доктар Савіч. Дзе ён, што з ім? Звярнуўся ў даведачнае бюро Асацыяцыі, дзе адразу ж атрымаў інфармацыю: доктар Савіч жыве недалёка ад Мінска. Мае сваю сядзібу і даўно ўжо адышоў ад лекарскай справы. Мне хацелася пабачыцца з ім, што я і зрабіў неадкладна.

Помню, быў сонечны дзень. Я пакінуў машыну далёка ад доктаравай сядзібы. Вырашыў прайсціся пешшу, сабрацца з думкамі. Згадвалася наша апошняе падарожжа з ім. І, вядома ж, з'яўлялася пытанне, ці захаваў доктар той свой гальштук-бабачку, які атрымаў у падарунак ад жыхароў Зялёнай планеты. Па ім, тым чорным гальштуку на загарэлай шыі, я і пазнаў доктара. Ён у вялікім саламяным капелюшы і ў адных толькі шортах штосьці перасаджваў у гародзе недалёка ад двухпавярховай драўлянай будыніны, якая глядзелася ледзь не палацам. Праходзяць дзесяцігоддзі, а на Зямлі мала што змяняецца.

— Доктар Савіч! Доктар Савіч! — гукнуў я.

І хапіла толькі некалькіх імгненняў, каб доктар пазнаў мяне і кінуўся насустрач. Яго перапаўняла такое радаснае хваляванне, што, здавалася, ён вось-вось задыхнецца. Яму відавочна не хапала дыхання, і, каб было лягчэй бегчы, ён спачатку сцягнуў з галавы капялюш, кінуў на сцежку, а пасля (ці можна было паверыць вачам) сарваў з шыі і гальштук-бабачку, які таксама шпурнуў у траву. А я ж помніў, як тады, на караблі, ён упарціўся, нізавошта не хацеў яго здымаць.

Мы абняліся, як добрыя сябры. На вочы набягалі слёзы, такою радаснай была наша сустрэча. І тут я заўважыў, што з будыніны выбегла нейкая дзіўная істота, хутчэй за ўсё, малпачка. Спрытна падняла з зямлі капялюш, а потым і гальштук і хуценька скіравала да дома, куды неўзабаве падаліся і мы.

— Ты тут жывеш не адзін? — запытаўся я ў доктара і дадаў: — Я паспеў заўважыць нейкае калматае стварэнне. Няўжо гэтак змяніўся клімат на Зямлі, што ў Беларусі пачалі жыць малпы?

— Гэта не зусім малпа, — адказаў доктар Савіч. — Я тады яшчэ не лётаў з вамі. Мяне пасылалі ў блізкія падарожжы. І вось падчас аднаго з тых маршрутаў на Месяцы мы натрапілі на не-



Правообладатель Национальный институт образования

вядомы міжпланетны карабель, які пацярпеў катастрофу. Як ні аглядалі, ніякіх жывых істот не знайшлі. Але ў адным з адсекаў адшукалі прабіркі, у якіх былі зародкі. Ты здагадваешся, што адну з тых прабірак я прывёз на Зямлю. З зародка, што быў у ёй, і з'явілася на свет істота, якую ты назваў малпаю. Але паўтараю, гэта, далібог, не малпа, таму што вельмі хутка яна засвоіла ўсе зямныя мовы. А галоўнае тое, што больш надзейнага, вернага стварэння я не сустракаў. Зараз пазнаёмішся з гэтым маім адданым сябрам.

Мы ўвайшлі ў будыніну, адчынілі дзверы ў адзін з пакояў, і тое, што пабачылі, нас уразіла неймаверна. У шыбіну стукалася, білася крыламі невялікая птушка з чорнай палосачкай-гальштукам на валляку…

— Гальштук! Мой гальштук! — закрычаў доктар Савіч у вялікай роспачы. — Як жа я мог сарваць яго!.. Ты разумееш, што адбылося?! Ён, напэўна, падняў гальштук, начапіў сабе на шыю, і вось здарылася бяда. Ты ж помніш, Праграма, што хавалася ў ім, станоўча спрацоўвала толькі тады, калі гальштук хтосьці атрымліваў у падарунак. Ва ўсіх іншых выпадках гэта — адмоўная энергія. Мой добры сябар стаў птушкаю! — і доктар Савіч адчыніў фортку…

Птушку мы назвалі гальштучнікам. Яе і цяпер можна сустрэць у Беларусі на вялікіх спустошаных лугах-пашах, куды выганяюць пастухі свае статкі. Толькі гальштучнік не заўважае гэтай спустошанасці. Яму, напэўна, бачацца наўкол зялёныя гаі ды парослыя сакаўною травою паляны. Але справа ўжо не ў гальштучніку…

— Дык тое, пра што ты нам тады расказваў, усё ж было праўдаю? — запытаўся я ў доктара пасля таго, як птушка вылецела ў фортку.

— А ты што, сумняваўся?

— Мы ўсе сумняваліся, — сказаў я. — Думалі, ты страціў розум. Таму цябе і звольнілі.

Тым жа днём я расказаў доктару, што Міжнародная асацыяцыя зоркавых палётаў рыхтуе вялікую экспедыцыю з адной



Правообладатель Национальный институт образования

толькі мэтай — расшукаць у касмічных глыбінях братоў па розуме, хто прайшоў падобную да зямной эвалюцыю ў сваім развіцці.

— Трэба ляцець да сузор'я Дзевы, — сказаў доктар і праз невялікую паўзу запытаўся: — Як ты думаеш, мне не адмовяць, калі я папрашуся ў гэтае падарожжа?

Ён сапраўды папрасіўся праз нейкі час. І яму не адмовілі. Мы зноў былі членамі аднаго экіпажа і неўзабаве ляцелі ў сузор'е Дзевы на планету, якая ўяўляе сабою копію Зямлі. Ва ўсялякім разе, мы гэтак думалі.

1. Якое ўражанне на астранаўтаў зрабіла Зялёная планета? Апішыце планету, на якую трапілі астранаўты.
2. Раскажыце пра сустрэчу экіпажа касмічнага карабля з жыхарамі незнаёмай планеты. Зачытайце фрагмент тэксту з апісаннем знешняга выгляду гуманоідаў. Як яны ўспрынялі гасцей-зямлян?
3. Які незвычайны падарунак атрымаў доктар Савіч ад гуманоідаў? Чаму гэты падарунак паўплываў на яго паводзіны?
4. Прыгадайце, якая таямніца звязана з гальштукам. Знайдзіце адказы ў тэксце і зачытайце іх.
5. Як склалася жыццё Савіча пасля касмічнай вандроўкі на Зялёную планету?
6. Што неверагоднае, чароўнае адбылося на сядзібе доктара Савіча?
7. Як выглядала птушка гальштучнік?
8. Вызначце ролю гісторыі з ператварэннем малпачкі ў птушку гальштучніка ў раскрыцці мастацкай ідэі твора.
9. Чаму твор Раісы Баравіковай лічыцца фантастычным?
10. Падзяліце ўмоўна тэкст на часткі. Падбярыце да кожнай з іх загаловак.
11. Прыдумайце фантастычную гісторыю «Падарожжа на міжпланетным караблі». Падбярыце да яе ілюстрацыю або намалюйце сваю ўласную.
12. Прачытайце артыкул «Гальштучнік, або Зуёк вялікі», выканайце заданне па тэме.
13. Разгадайце крыжаванку.



Правообладатель Национальный институт образования

## КАРОТКІ СЛОЎНІК ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫХ ТЭРМІНАЎ

**Алего́рыя** — іншасказанне; мастацкі прыём, калі ідэя, думка, рыса характару раскрываюцца праз паводзіны жывёл, асаблівасці раслін, з'яў ці прадметаў. Алегорыя абапіраецца на абагульненне розных жыццёвых з'яў: *воўк — злосць, нелюдзімасць, прагнасць, жорсткасць; дуб — моц, сіла, трываласць; ліса — хітрасць; заяц — баязлівасць; асёл — упартасць.*

**Апавяда́льнік** — асоба, ад імя якой вядзецца аповед.

**Апавяда́нне** — невялікі празаічны твор, у якім расказваецца пра асобную падзею, выпадак або здарэнне ў жыцці героя.

**Апіса́нне** — спосаб паказу жыцця, мастацкая характарыстыка абставін, месца дзеяння, абмалёўка знешняга выгляду героя, карцін прыроды.

**Апо́вед** — паведамленне, расказ пра падзеі, паводзіны, учынкі герояў і іх узаемаадносіны; рух і развіццё дзеяння ў творы.

**Апо́весць** — мастацкі твор, пераважна празаічны, у якім расказваецца пра шэраг падзей, што адбываюцца на працягу значнага перыяду жыцця галоўнага героя, паказваюцца яго ўзаемаадносіны з іншымі персанажамі.

**Ба́йка** — невялікі, часцей вершаваны твор сатырычнага зместу з алегарычным сюжэтам і павучальнай канцоўкай (мараллю).

**Во́браз літарату́рны** — мастацкае адлюстраванне з дапамогай слова чалавечых характараў, падзей, прадметаў, з'яў у канкрэтнай, індывідуальна-пачуццёвай форме.

**Геро́й літарату́рны** — мастацкі вобраз чалавека, які паказаны ў творы. Ужываюцца таксама паняцці: персанаж, дзейная асоба, літаратурны характар.

**Гіпе́рбала** — моцнае пераволічэнне ўласцівасцей, якасцей прадмета або з'явы з мэтай мастацкай выразнасці: *Узмахне крылом — быццам бор шуміць, // Узмахне другім — што мяцель гудзіць* (Максім Багдановіч).

**Гу́мар** — паказ героя ў камічным, нязлосным, дабрадушна-смешным выглядзе: *Унук паказвае бабулі сшытак: // — Ці добра я напісаў? // — Дрэнна. // — Цяпер, бабуля, я сапраўды бачу, што ў цябе слабы зрок* (Рыгор Барадулін).



Правообладатель Национальный институт образования

**Дэта́ль** — рыса, выразная падрабязнасць у паказе паводзін, учынкаў, перажыванняў, апісанні знешнасці героя, яго адзення, абстаноўкі. У якасці дэталі можа выступаць прадмет, колер, пах, гук і інш. Важны сродак характарыстыкі героя, паказу ўзаемаадносін персанажаў. Надае карціне, эпізоду эмацыянальную афарбоўку. *Побач ляжала яго торбачка* ***з раструшчаным пад салдацкім ботам пеналам****. Ды выпалі з-за пазухі і* ***ляжалі ў пыле запазнелыя восеньскія васількі*** (М. Лынькоў).

**Іро́нія** — спосаб камічнага паказу жыцця, у аснове якога ляжыць стоеная, прыхаваная насмешка: ужываецца слова ў значэнні, супрацьлеглым асноўнаму, прамому яго сэнсу, — гаворыцца нібыта добрае, а падразумяваецца зусім адваротнае *(тоненькі, як бочка; весела, як рыбцы на кручку)*. Іронія можа быць дабрадушнай або злой, з'едлівай.

**Кампазі́цыя** — будова літаратурнага твора, размяшчэнне і спалучэнне ўсіх яго частак, раздзелаў, эпізодаў, сцэн.

**Маста́цкая ідэ́я** — галоўная думка, асноўны сэнс літаратурнага твора, тое, што аўтар хацеў сказаць сваім творам.

**Мета́фара** — перанясенне ўласцівасцей адной з'явы на другую, чым-небудзь падобную на яе: *А* ***дзень гарыць****, а* ***дзень палае*** (Якуб Колас).

**Міф** — старажытны народны аповед пра паходжанне свету, жыццё прыроды і чалавека.

**Паралелі́зм** — кампазіцыйны прыём, пры якім два вобразы раскрываюцца ў супастаўленні, паралельна, у выглядзе **разгорнутага параўнання**. *Ты лесам ідзі — дробным дожджыкам, // Ты лугам ідзі — буйным ветрыкам.* Сустракаецца так званы **адмоўны паралелізм***: Ой, не мамка дзеваньку выдавала, // Выдавала дзеваньку цёмная ночка.*

**Параўна́нне** — мастацкі прыём, характарыстыка аднаго прадмета, з'явы пры дапамозе супастаўлення яго з іншым на аснове іх падабенства: *Зямля Беларусі!* ***Вачамі азёраў*** *//* ***Глядзіш*** *ты ў празрыстыя высі нябёс, // Начамі,* ***што яблыкі****, падаюць* ***зоры****…* (Пятрусь Броўка).

**Пейза́ж** — малюнак прыроды ў літаратурным творы, які дае магчымасць уявіць месца дзеяння, характарызуе душэўны стан героя, яго паводзіны.

**Пе́сня** — вершаваны і музычны твор для выканання голасам (спявання).

**Пе́сня літарату́рная** — песня, створаная на словы паэта (напрыклад, «Жураўлі на Палессе ляцяць» Алеся Ставера).

**Рытм** — раўнамернае паўтарэнне, чаргаванне вершаваных радкоў, а ўнутры радкоў — націскных і ненаціскных складоў: *Зямлі не чуеш пад сабою // І ловіш белы пух рукою.*



Правообладатель Национальный институт образования

**Ры́фма** — сугучнасць канчаткаў радкоў у вершаваным творы: *Толькі звон крыгалому ачах — // Брод шукаюць бярозы-бяглянкі // І трымаюць на ніцых плячах, // Як дзяцей палахлівых, буслянкі* (Рыгор Барадулін).

**Саты́ра** — вострае, з'едлівае выкрыццё адмоўных з'яў жыцця і недахопаў чалавечага характару; выкрывальны смех. Часцей сустракаецца ў байках.

**Сі́мвал** — умоўнае абазначэнне думкі, ідэі, перажывання, з'явы праз мастацкі вобраз, які нечым нагадвае іх. Напрыклад: *жыта — сімвал жыцця, мірнай працы, шчасця; крыж — сімвал веры; хлеб-соль — сімвал гасціннасці*.

**Страфа́** — частка вершаванага тэксту, якая змястоўна аб'ядноўвае некалькі радкоў: *Было ў салдата два полі, // поле, дзе кветкі ірваў, // бегаў з сябрамі на волі, // і поле, дзе ён ваяваў* (Анатоль Вярцінскі).

**Сюжэ́т** — паслядоўнае разгортванне падзей, у якіх выяўляюцца характары і ўзаемаадносіны герояў. Выдзяляюць асноўныя элементы сюжэта: *экспазіцыя, завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя, развязка*.

**Троп** — ужыванне слова ў пераносным значэнні (эпітэт, параўнанне, метафара, сімвал, гіпербала, алегорыя і інш.). Тропы дапамагаюць пісьменніку вобразна, маляўніча перадаць жыццёвыя з'явы.

**Тэ́ма** — жыццёвая з'ява або кола з'яў, пра якія ідзе размова ў творы.

**Увасабле́нне** — мастацкі прыём, калі нежывым, неадушаўлёным прадметам і з'явам надаюцца ўласцівасці чалавека або жывых істот: ***Уцякала*** ***зіма*** *ад вясны, //* ***Уцякала*** *па рэках, азёрах, //* ***Лёд*** *затрэскаў,* ***закрэктаў, заныў****, //* ***Здрадзіў*** *лёд — і вада на prасторы* (Рыгор Барадулін).

**Фанта́стыка** — літаратурныя творы, у якіх адбываюцца падзеі, немагчымыя ў рэальным жыцці.

**Эпі́тэт** — мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе з'яву, прадмет, чалавека: *У* ***лагодным*** *сонечным святле гарэлі* ***сумным адвечным*** *полымем ліпы і бярозы каля хат...* (Іван Мележ).

Спіс выкарыстаных крыніц

Правообладатель Национальный институт образования

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Бельскі** Алесь Іванавіч
**Навумчык** Мікалай Іванавіч
**Цітова** Людміла Канстанцінаўна

**БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА**

Вучэбны дапаможнік для 6 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Н. М. Мамчыц*
Вокладка мастака *В. М. Горбач*
Мастацкі рэдактар *В. М. Горбач*
Мастакі *В. В. Дударэнка, З. П. Болцікава*
Камп’ютарная вёрстка *І. У. Шутко*
Карэктары *Н. В. Федарэнка, Г. М. Мазіна*

Падпісана да друку 19.07.2022. Фармат 70×90/16.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 17,55.
Ул.-выд. арк. 11,5. Тыраж 132 594 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Правообладатель Национальный институт образования